Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя П.М. Машэрава”

А.С. Дзядова

МАСТАЦКІ ТЭКСТ ЯК КРЫНІЦА ЛІНГВАКРАІНАЗНАЎЧАЙ ІНФАРМАЦЫІ

Манаграфія

Віцебск
ВДУ імя П.М. Машэрава
2022

УДК 811.161.3’42:908(476)
ББК 81.411.3-55+83.001
Д43

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”. Пратакол № 2 ад 05.01.2022.

Адобрана навукова-тэхнічным саветам ВДУ імя П.М. Машэрава. Пратакол № 4 ад 14.03.2022.

Аўтар: дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства ВДУ імя П.М. Машэрава, кандыдат філалагічных навук, дацэнт **А.С. Дзядова**

Р э ц э н з е н т ы :
рэктар ДУ ДАД “Віцебскі абласны інстытут развіцця адукацыі”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт *В.В. Лапацінская;*
дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства ВДУ імя П.М. Машэрава, кандыдат філалагічных навук *К.С. Півавар*

Дзядова, А.С.
Д43 Мастацкі тэкст як крыніца лінгвакраіназнаўчай інфармацыі : манаграфія / А.С. Дзядова. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2022. – 155 с.
ISBN 978-985-517-890-4.

Манаграфія напісана ў рэчышчы прынятага сучаснай лінгвістыкай антрапацэнтрычнага падыходу да вывучэння мовы і з’яўляецца адным з першых навуковых даследаванняў, прысвечаных аналізу таго, якім чынам лінгвакраіназнаўчая інфармацыя адлюстроўваецца праз прызму мастацкага тэксту. У працы праведзены аналіз лінгвакраіназнаўчага патэнцыялу мастацкіх твораў, аўтарамі якіх з’яўляюцца пісьменнікі Віцебшчыны: У. Караткевіч, В. Быкаў, Р. Барадулін, Г. Бураўкін.

Навуковае выданне можа быць выкарыстана выкладчыкамі вышэйшых навучальных устаноў, студэнтамі філалагічных факультэтаў, настаўнікамі ў працэсе выкладання беларускай мовы і літаратуры, правядзення факультатыўных заняткаў у агульнаадукацыйных установах.

УДК 811.161.3’42:908(476)
ББК 81.411.3-55+83.001

ISBN 978-985-517-890-4

© Дзядова А.С., 2022
© ВДУ імя П.М. Машэрава, 2022

ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ ……. 4
РАЗДЗЕЛ 1. НАЦЫЯНАЛЬНАЯ КАРЦІНА СВЕТУ БЕЛАРУСАЎ ПРАЗ ПРЫЗМУ МОВЫ МАСТАЦКАГА ТЭКСТУ ……. 7
1.1 Культурна-моўны феномен мастацкага тэксту …….. 7
1.2 Беларускі мастацкі тэкст як носьбіт этнакультурнай інфармацыі і выразнік нацыянальнага менталітэту ……..... 9
1.3 Моўна-культурная спецыфіка перакладу мастацкага твора ……. 13
РАЗДЗЕЛ 2. ЛІНГВАКРАІНАЗНАЎЧЫ КАМПАНЕНТ У ПРОЗЕ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА …….. 18
2.1 Уладзімір Караткевіч як прэцэдэнтнае імя ў беларускай лінгвакультуры …… 18
2.2 Мастацкі тэкст Уладзіміра Караткевіча як транслятар лінгвакраіназнаўчай інфармацыі …….. 21
2.3 Лінгвакраіназнаўчая адметнасць перакладаў твораў Уладзіміра Караткевіча на рускую мову …… 29
РАЗДЗЕЛ 3. ЛІНГВАКРАІНАЗНАЎЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ТВОРАЎ ВАСІЛЯ БЫКАВА …… 50
3.1 Лінгвакраіназнаўчая спецыфіка твораў Васіля Быкава ……. 50
3.2 Лінгвакраіназнаўчы кампанент у перакладах твораў Васіля Быкава на рускую мову …… 56
РАЗДЗЕЛ 4. НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАЯ СПЕЦЫФІКА ПАНЯЦЦЯ “РАДЗІМА” Ў МОВЕ ТВОРАЎ РЫГОРА БАРАДУЛІНА …… 68
4.1 Лінгвакраіназнаўчы змест паняцця “Беларусь” ……..... 69
4.2 Семантызацыя паняцця “народ” …….. 73
4.3 Семантызацыя традыцыйнай народнай культуры ……..... 80
4.4 Рэпрэзентацыя хрысціянскага светапогляду беларусаў …… 96
4.5 Семантызацыя гістарычнага мінулага беларускага народа …….. 102
4.6 Семантызацыя прыродных рэалій …… 106
РАЗДЗЕЛ 5. ЛІНГВАКРАІНАЗНАЎЧЫЯ РЭАЛІІ Ў ПАЭЗІІ ГЕНАДЗЯ БУРАЎКІНА …….. 117
5.1 Лінгвакраіназнаўчы змест паняцця “Радзіма” …… 117
5.2 Рэпрэзентацыя культурна-гістарычнай спадчыны беларускага народа ……... 121
5.3 Рэпрэзентацыя прыродна-ландшафтных асаблівасцей Беларусі 133
ЗАКЛЮЧЭННЕ ……..... 137
СПІС НАВУКОВЫХ ПУБЛІКАЦЫЙ АЎТАРА ……. 140
СПІС СКАРАЧЭННЯЎ ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ …… 143
ЛІТАРАТУРА …… 146

УВОДЗІНЫ

Змена навуковых парадыгмаў у сучасным мовазнаўстве абумовіла лінгвакраіназнаўчы падыход да аналізу моўнага матэрыялу, у тым ліку і да мовы мастацкіх твораў, якія выступаюць адным са шляхоў спасціжэння этнакультурнай і сацыяльна-гістарычнай адметнасці народа.

Сёння лінгвістычныя даследаванні мастацкіх тэкстаў праводзяцца не толькі ў плане вывучэння моўна-стылістычных сродкаў, якія функцыянуюць у творах, але і, згодна з антрапацэнтрычным падыходам, з пункту гледжання таго, наколькі яны сваім зместам рэпрэзентуюць звесткі сацыяльна-гістарычнага і нацыянальна-культурнага характару, асаблівасці менталітэту, рэлігійнага светапогляду таго ці іншага народа, даюць вытлумачэнне яго нацыянальнай карціны свету, сістэмы вербальных адзнак і сімвалаў, выяўляюць сацыяльныя адносіны ў грамадстве.

Выкарыстанне моўных элементаў з нацыянальна-культурным кампанентам семантыкі ў мастацкім дыскурсе пісьменніка ўяўляе цікавасць у першую чаргу для тых даследчыкаў, якія займаюцца праблемамі вывучэння мовы мастацкага тэксту як культурнага кода нацыі з пазіцыі лінгвакультуралогіі і лінгвакраіназнаўства. На сучасным этапе развіцця мовазнаўчай навукі лінгвістыка тэксту характарызуецца актыўным павелічэннем навуковых прац такога характару. Па словах Г.А. Арцямёнка, “не выклікае сумнення, што адпаведны аспект лінгвістычных даследаванняў асабліва актуальны для параўнальна «маладых» дзяржаў і этнасаў, чыя палітыка-эканамічная адметнасць і культурная спецыфіка маюць патрэбу ў далейшым развіцці і ўмацаванні” [4, с. 7]. Між тым да сённяшняга часу ў беларускім мовазнаўстве адсутнічаюць сур’ёзныя навуковыя напрацоўкі па пытаннях даследавання мовы мастацкіх твораў у лінгвакраіназнаўчым аспекце.

Да таго ж заўважым, што ў айчыннай лінгвістыцы недастаткова распрацаваным і асэнсаваным застаецца нацыянальна-культурны і сімвалічны аспект функцыянавання беларускай мовы ў рэгіянальным соцыуме. Як адзначае прафесар В.А. Маслава, “распрацоўка рэгіянальных лінгвістычных праблем заканамерная ў межах агульнай вялікай праблемы вар’іравання мовы ў прасторы. Таму на першы план у цэлым шэрагу навук – ад эканомікі да лінгвістыкі – выступае рэгіён як асноўная адміністрацыйна-палітычная і культурна-моўная адзінка” [102, с. 5].

Вывучэнне мовы рэгіянальных мастацкіх тэкстаў уяўляецца сёння дастаткова перспектыўным з пазіцый развіцця рэгіянальнай лінгвістыкі ў процівагу працэсам глабалізацыі, якія актыўна адбываюцца ў сучасным свеце. З гэтай прычыны актуальнасць тэматыкі манаграфіі абумоўлена якраз неабходнасцю вывучэння моўных адметнасцей Віцебскага рэгіёна, у тым ліку даследавання лінгвакраіназнаўчай спецыфікі мастацкіх твораў,

якія выступаюць як адзін са складнікаў захавання гістарычнай памяці, разумення гістарычнага мінулага, этнічнай культуры і сацыяльна-эканамічнага жыцця беларускага народа ў цэлым і спосаб рэпрэзентацыі нацыянальнай карціны свету жыхароў Віцебшчыны ў прыватнасці.

Навуковая навізна нашага даследавання заключаецца ў тым, што ў манаграфіі ўпершыню праведзены комплексны аналіз лінгвакраіназнаўчага патэнцыялу празаічных і вершаваных мастацкіх тэкстаў агульнапрызнаных нацыянальных майстроў беларускага слова, творчасць якіх займае пачэснае месца ў нацыянальнай літаратурнай традыцыі, – пісьменнікаў, радзімай якіх з'яўляецца Віцебшчына: У. Караткевіча, В. Быкава, Р. Барадуліна, Г. Бураўкіна.

У якасці аб'екта даследавання выступаюць моўныя адзінкі з лінгвакраіназнаўчай семантыкай. У працы назіраецца сувязь іх значэння з сацыяльна-гістарычнымі фактарамі жыцця, нацыянальна-культурнымі стэрэатыпамі свядомасці і паводзін нашага народа. Пры выяўленні лінгвакраіназнаўчага зместу лексічных адзінак акцэнтавана ўвага на "нацыянальную прыроду" мастацкага слова, адлюстраванне ў яго семантыцы ведаў і найбольш цікавых фактаў пра матэрыяльную і духоўную культуру, гісторыю, краіназнаўчыя рэаліі і традыцыі беларусаў, інавацыі апошняга часу, абумоўленыя зменамі ў жыцці грамадства за перыяд існавання Беларусі як самастойнай дзяржавы, увогуле працэсы пазамоўнай рэчаіснасці.

У манаграфіі знайшла асэнсаванне не толькі лінгвакраіназнаўчая спецыфіка арыгінальных празаічных твораў У. Караткевіча і В. Быкава, але і нацыянальна-культурная адметнасць перакладаў іх прозы на рускую мову. Трэба заўважыць, што, нягледзячы на шматлікія пераклады твораў гэтых аўтараў на розныя мовы свету (найперш на рускую), у навуковых працах сучасных лінгвістаў пакуль не атрымала грунтоўнага асэнсавання вывучэнне таго, як праз мову перакладаў адбываецца трансляцыя краіназнаўчых рэалій, характэрных для нашага народа ў старажытныя часы або ў той ці іншы гістарычны перыяд.

Манаграфія напісана ў межах распрацоўкі праблем навуковай тэмы кафедры беларускага мовазнаўства ВДУ імя П.М. Машэрава "Функцыянаванне сучаснай беларускай мовы ў вуснай камунікацыі і пісьмовым тэксце: сацыяльна-дзяржаўны, нацыянальна-культурны і краязнаўча-рэгіянальны параметры" (2021–2025 гг.) і ўносіць уклад у распрацоўку пытанняў вывучэння беларускай мовы ў лінгвакраіназнаўчым аспекце.

Вынікі, атрыманыя аўтарам у манаграфіі, прайшлі апрабацыю на міжнародных, рэспубліканскіх і рэгіянальных навуковых і навукова-практычных канферэнцыях, семінарах і надрукаваны ў 25-ці навуковых артыкулах па пытаннях даследавання лінгвакультуралагічнай, этналінгвістычнай і лінгвакраіназнаўчай адметнасці твораў згаданых вышэй пісьменнікаў Віцебшчыны.

Навуковае даследаванне, выкананае ў рэчышчы міждысцыплінарнага падыходу да разгляду мовы, можа быць скарыстана выкладчыкамі і студэнтамі пры вывучэнні такіх дысцыплін, як лінгвакраіназнаўства, этналінгвістыка, лінгвакультуралогія, лінгвістыка тэксту, кагнітыўная лінгвістыка, філалагічны аналіз тэксту, тэорыя і практыка перакладу і інш. Факталагічныя дадзеныя, прыведзеныя ў манаграфічнай працы, і іх апісальны, інтэрпрэтацыйны бок могуць быць запатрабаваны пры складанні слоўнікаў мовы пісьменнікаў, а таксама слоўнікаў лінгвакультуралагічнага і лінгвакраіназнаўчага тыпу.

Вядомы айчынны вучоны-метадыст В.У. Протчанка заўважаў: “Без этнічнай памяці няма традыцый, без традыцый – культуры, без культуры – духоўнасці, без духоўнасці – выхавання, без выхавання – асобы, а без асобы – кансалідаванага грамадства, здольнага вытрымаць любыя павароты гісторыі” [95, с. 15]. Таму відавочна, што фарміраванне этнічнай самасвядомасці асобы павінна адбывацца на аснове звароту да нацыянальных вытокаў і культурна-гістарычных здабыткаў нашых продкаў, у тым ліку і да найлепшых узораў высакаякаснай беларускай мастацкай літаратуры.

Паколькі ў сучасных агульнаадукацыйных установах навучальная парадыгма з апорай на этнакультуру выступае адной з першачарговых задач вывучэння прадметаў гуманітарнага цыкла, у працэсе моўнай і літаратурнай адукацыі вучні павінны атрымаць уяўленне пра нацыянальную моўную і літаратурную спадчыну беларусаў як феномен культуры і сродак яе спасціжэння, выпрацаваць уменні карыстацца краіназнаўчымі звесткамі з мэтай забеспячэння паўнавартаснай камунікацыі.

У святле сказанага змест нашай навуковай працы можа забяспечыць не толькі пазнавальныя, але і камунікацыйныя патрэбы вучняў і студэнтаў, настаўнікаў і выкладчыкаў, што, несумненна, паспрыяе фарміраванню ў іх сацыякультурных кампетэнцый і будзе садзейнічаць успрыманню слова як нацыянальна-культурнага фактару ў мастацкім тэксце, больш глыбокаму вывучэнню мовы як сацыяльна значымай катэгорыі на розных узроўнях моўнай адукацыі.

Раздзел 1
НАЦЫЯНАЛЬНАЯ КАРЦІНА СВЕТУ БЕЛАРУСАЎ ПРАЗ ПРЫЗМУ МОВЫ МАСТАЦКАГА ТЭКСТУ

Народ выражае сябе найпаўней
і найдакладней у мове сваёй…
І.І. Сразнеўскі

1.1 Культурна-моўны феномен мастацкага тэксту

Мова – гэта сацыяльна значымая катэгорыя, у якой рэпрэзентуюцца каштоўнасныя дамінанты пэўнага народа, яго нацыянальная свядомасць, культурныя коды, этнічныя арыенціры і нормы. Мове належыць самая актыўная роля ў пазнанні чалавекам навакольнай рэчаіснасці і сябе ў ёй. Кожная нацыянальная мова па-свойму адлюстроўвае свет і выражае тое, што не здольна выразіць іншая. Кожная нацыянальная культура мае такі моўны матэрыял, які дазваляе ёй перадаць гістарычны вопыт свайго народа наступным пакаленням. Мова служыць не толькі камунікатыўным мэтам, але і з'яўляецца крыніцай інфармацыі, назапашанай этнічным калектывам, які жыве ў пэўным прыродным асяроддзі і сацыяльных умовах.

Моўная культура беларускага народа надзвычай багатая, па-свойму арыгінальная і самабытная. Яна ўвасоблена ў песнях, міфах і легендах, паданнях, у загадках і замовах, у трапных народных выслоўях, казках, творах мастацкай літаратуры. Гэтыя моўныя скарбы раскрываюць нашу гісторыю, далучаюць нас да маральных і эстэтычных каштоўнасцей, створаных беларусамі за стагоддзі. Захоўваючы духоўную спадчыну народа, замацоўваючы ў слове ўсё тое, што прынята называць гісторыяй і культурай, мова яднае нашчадкаў і продкаў, звязвае мінулае з сучасным і будучым.

Слова выступае не толькі як моўны знак, які мае значэнне, замацаванае ў лексікаграфічных даведніках. Слова – гэта яшчэ і сімвал. Менавіта таму ў мастацкім тэксце, у тым ліку і перакладным, дзе яно пачынае гучаць ва ўзаемасувязях з іншымі лексічнымі адзінкамі, слова дастаткова часта робіцца "неадназначным", абрастае дадатковым сэнсам і канатацыяй. Адчуць гэтую шматзначнасць дастаткова лёгка ў сваёй роднай мове, да якой мы прывыклі, на якой думаем і разважаем. Нацыянальная прырода слова блізкая і зразумелая яго носьбітам.

Сума ведаў этнічнай супольнасці людзей пра прадметы аб'ектыўнай рэчаіснасці называецца *нацыянальнай карцінай свету* (тэрмін *карціна свету* быў у свой час запазычаны лінгвістамі з прыродазнаўчых навук). Уяўленні чалавека пра свет, адлюстраваныя ў значэннях розных слоў і выразаў, складваюцца ў пэўную сістэму поглядаў і "навязваюцца" ў якасці

абавязковых усім носьбітам мовы. Інакш можна сказаць, што мы ўспрымаем свет у вобразах той мовы, на якой гаворым. Сукупнасць ведаў пра свет, выражаных у моўнай форме, называецца *моўнай карцінай свету.*

Вядома, што этнакультурная інфармацыя назапашваецца пераважна ў намінатыўных адзінках мовы, якія пэўным чынам семантызуюць тыя ці іншыя прадметы, з'явы, якасці. Адметнасць кожнай мовы ствараюць вобразныя сродкі, што падкрэсліваюць яе індывідуальнасць і самабытнасць. Моўныя адзінкі, якія акумулююць у сваім значэнні краіназнаўчую інфармацыю, выступаюць у якасці крыніцы разнастайных ведаў пра нацыянальную гісторыю і культуру этнасу, сведчаць пра яго сацыяльныя прырытэты, знаёмяць з маральнымі і эстэтычнымі каштоўнасцямі, дапамагаюць зразумець народную філасофію. Як адзначае Г.А. Арцямёнак, "намінатыўныя адзінкі мовы змяшчаюць у сваёй семантычнай структуры не толькі агульначалавечы паняццевы змест, але і нацыянальна-культурны кампанент, рэлевантны для пэўнай мовы, нацыі, краіны" [4, с. 7].

Нягледзячы на тое, што ў кожнай мове зафіксавана ўласцівая толькі ёй карціна свету, пазамоўная рэчаіснасць мае аб'ектыўны характар. Менавіта таму і магчымы пераклад з адной мовы на другую, нягледзячы на відавочныя адрозненні паміж моўнымі сістэмамі. З гэтага вынікае, што нацыянальная моўная карціна свету ўяўляе сабой суб'ектыўны вобраз аб'ектыўнага свету.

Мастацкія тэксты, якія даюць вытлумачэнне нацыянальнай карціны свету, найбольш поўна і ўсебакова адлюстроўваюць культурныя коды народа, сістэму яго вобразных сродкаў і вербальных адзнак, нацыянальную ідыяматыку, дапамагаюць чытачу ў знаёмстве з нацыянальнай моўнай культурай і краіназнаўчымі рэаліямі. Па сутнасці ў кожным пасапраўднаму нацыянальным мастацкім тэксце рэалізуецца прынцып узаемадзеяння мовы і культуры, іншымі словамі, заключана інфармацыя, якая садзейнічае спасціжэнню этнакультурных адметнасцей народа.

Па словах К.С. Півавар, "тэкст адлюстроўвае індывідуальны спосаб інтэрпрэтацыі нацыянальнага светабачання, адначасова адлюстроўвае і псіхалагічныя, суб'ектыўна-ацэначныя, эмацыянальныя характарыстыкі свядомасці моўнай асобы, і дух нацыі. Гэта аўтаномная карціна свету асобы, вынік індывідуальнай катэгарызацыі калектыўна здабытых этнасам ведаў пра свет" [90, с. 16]. Апрача таго, як заўважае даследчыца, "індывідуальна-нацыянальныя рысы менталітэту адлюстроўваюцца ў лексічных, марфалагічных, сінтаксічных і кампазіцыйных характарыстыках тэксту (яго тэматыцы, канцэптуальнай структуры) [90, с. 16].

1.2 Беларускі мастацкі тэкст як носьбіт этнакультурнай інфармацыі і выразнік нацыянальнага менталітэту

Даследаванне мастацкай творчасці пісьменнікаў з'яўляецца неабходнай умовай для спасціжэння карціны свету пэўнай нацыі. На думку прафесара В.А. Маславай, "галоўным захавальнікам духоўнага багацця народа з'яўляюцца мастацкія тэксты, моўная прастора якіх адлюстроўвае ўнутраны свет аўтара і асэнсаваны ў яго свядомасці свет знешні" [81, с. 126].

З аднаго боку, мастацкі тэкст выступае як частка агульнанацыянальнай культуры, а з другога, як нацыянальна-культурная рэалія, прадукт нацыянальнага. Менавіта таму ён з'яўляецца каштоўным матэрыялам для даследаванняў асаблівасцей мыслення, псіхікі і ментальнасці пэўнай нацыі, грамадска-эканамічнага ўкладу і пэўных сацыяльных рэалій. Кожная нацыянальная літаратура адлюстроўвае духоўны вопыт свайго народа, асаблівасці яго культуры – тое, што Максім Багдановіч назваў "нацыянальнай душой", а Уладзімір Дубоўка – "спрадвечнай існасцю".

Нацыянальны мастацкі тэкст – гэта своеасаблівае люстэрка жыцця і працы, гаспадарчай дзейнасці, грамадскага і культурнага развіцця народа, адлюстраванне яго жыццёвага вопыту, самапазнання і светаўспрымання, асаблівасцей мыслення і псіхікі, маральна-этычных і эстэтычных нормаў. Менавіта з'яўленне нацыянальнага мастацкага тэксту выступае паказчыкам духоўнага нараджэння нацыі і яе этнакультурнага самаўсведамлення.

Між тым семантыка паняцця "нацыянальнае" ў моўнай прасторы мастацкага тэксту надзвычай няпростая. Нацыянальнае "я" ўвасоблена як у сферы матэрыяльнага свету – асаблівасцях народнага побыту, адзення, прыроднага асяроддзя, так і ў сферы духоўнага – традыцыях і звычаях, рэлігійных святах, этнічных асаблівасцях паводзін і характару, элементах вуснай народнай творчасці. Нацыянальны спосаб мыслення ў творы рэалізуецца праз стыль мастацкага тэксту.

У творчасці сапраўды народнага пісьменніка заўсёды знаходзіць сваё выяўленне свет нацыянальнага быцця. Нават калі прадметам мастацкага адлюстравання выступаюць далёкія ад знешніх праяў нацыянальныя рэаліі, яно, нацыянальнае, усё роўна нібы пранізвае ўсю вобразную сістэму твора. Адлюстраванне ў літаратуры нацыянальнай ментальнасці надае ёй самабытнасць, арыгінальнасць, нацыянальную адметнасць і робіць сапраўднай выразніцай духоўнай існасці народа.

Тыя ці іншыя асаблівасці ментальнасці этнасу і навакольнага асяроддзя, у якім ён знаходзіцца, выяўляюцца ў характары жыццёвага матэрыялу, што адбіраецца пісьменнікамі. Калісьці Міхаіл Прышвін заўважаў, што ў Расіі можна стаць паэтам, услухоўваючыся ў народнае маўленне і з томікам вершаў А.С. Пушкіна ў руках. Увага мастакоў слова да аднатыпных вобразаў, з'яў, рэалій з'яўляецца невыпадковай і дае падставы да пэўных мастацкіх абагульненняў. У творы чытач сустракаецца

са сферай падсвядомага нацыянальнага “я”, у аснове якога ляжыць *архетып* (ад грэч. *arche* ‘пачатак’, *typos* ‘вобраз’) – вобразы, сфарміраваныя на працягу гістарычнага развіцця нацыі і ўласцівыя яе псіхіцы. Заўважым, што архетып – гэта сукупнасць калектыўных вобразаў, якія ствараюцца народам падсвядома, актывізуюць яго ўяўленне, рэалізуюцца ў міфах, рэлігійных сістэмах, літаратурна-мастацкай творчасці. Аднак архетыпы – гэта не закончаныя вобразы, а толькі іх своеасаблівыя схемы, якія, ператвараючыся ў мастацкія вобразы, сюжэты, матывы, вар’іруюцца ў мастацкай творчасці самабытных народаў. Архетыпы нясуць у сабе кодавыя, найбольш сутнасныя прыкметы светабачання этнасу. У дачыненні да мастацкага тэксту яны выяўляюцца ў выбары пэўных тэм, ідэй, сюжэтных ліній, у стварэнні аднатыпных псіхалагічных сітуацый, у якія трапляюць героі твораў.

Як слушна зазначыў філосаф, гісторык і літаратурны крытык У. Конан, універсальным “беларускім мастацкім архетыпам стала Радзіма, малая Бацькаўшчына, або «Родны кут», паводле Я. Коласа” [63, с. 24]. Сапраўды, цяжка знайсці сёння беларуса, які б не ведаў радкоў Я. Коласа “Мой родны кут, як ты мне мілы”.

Для большасці беларускіх пісьменнікаў тэма роднага краю, сваёй Бацькаўшчыны з’яўляецца адной з вызначальных у творчасці. Пачынаючы з Ф. Скарыны, М. Гусоўскага, С. Полацкага, сімвал роднай зямлі скразны ў беларускай літаратуры. Тэма Радзімы выяўляе адну вельмі істотную і паказальную рысу ў свядомасці беларусаў – імкненне чалавека вызначыцца, знайсці сябе, мець акрэсленае месца ў свеце, дзе можна адчуваць сябе самастойна і незалежна. Як адзначае В. Каваленка, “уяўленне пра родную зямлю – гэта важны духоўны набытак народа. І ўзнікае яно не адразу. Патрэбна не толькі гаспадарчая, але і ўнутраная абжытасць мясцовасці, каб яна выклікала эмоцыі замілавання” [52, с. 22].

Стварэнне ў беларускай літаратуры асаблівасцей нацыянальнага светапогляду належыць пісьменнікам-класікам – Я. Купалу, Я. Коласу, М. Гарэцкаму, К. Чорнаму. Быццёвы, матэрыяльны пачатак выражаны ў адлюстраванні гэтымі мастакамі слова найперш рэчыўнага, побытавага свету, будзённых рэалій жыцця, паэтызацыі беларускай прыроды. Вядома, што прыродны свет, навакольнае асяроддзе, ва ўлонні якога народ сцвярджае сваё гістарычнае быццё, аказваюць значнае ўздзеянне на фарміраванне нацыянальнага светапогляду, самабытнай культуры і спосабу мыслення прадстаўнікоў пэўнага этнасу.

Беларусь спрадвеку лічылася краінай сялянскай культуры, што і прадвызначыла, абумовіла своеасаблівы лад традыцыйнай народнай культуры і ментальнасці беларускай нацыі. Для беларуса-працаўніка імкненне мець уласную зямлю – гэта жаданне прывесці жыццё ў адпаведнасць са сваёй сутнасцю. Страту зямлі героі твораў вельмі часта ўспрымаюць як парушэнне гармоніі, страту жыццёвай асновы, грунту пад нагамі. Такія матывы адчуваліся яшчэ ў паэзіі аднаго з пачынальнікаў

новай беларускай літаратуры XIX ст. Ф. Багушэвіча (вершы “Мая хата”, “Ахвяра”), а пасля ў творчасці М. Багдановіча (верш “Слуцкія ткачыхі”), драме Я. Купалы “Раскіданае гняздо” і інш. Культ зямлі, апяванне чалавека на зямлі, зямлі як асновы ўсяго існага з’яўляецца асноўнай, вызначальнай тэмай шматлікіх твораў беларускай літаратуры (“Новая зямля” Я. Коласа, “Зямля” К. Чорнага, “Палеская хроніка” І. Мележа, творы В. Адамчыка, І. Пташнікава і інш.). Між тым стварэннем нацыянальнай ідэі беларускага народа наша літаратура абавязана У. Караткевічу, творчасць якога прасякнута мноствам культурных кодаў нашага народа, змяшчае ў сабе інфармацыю пра яго гісторыю, этнаграфічныя адметнасці, нацыянальныя паводзіны і псіхалогію – усё, што складае змест этнічнай культуры беларусаў.

Аб’ектам нашай увагі ў манаграфіі сталі лінгвакраіназнаўчыя адзінкі, якія семантызуюць беларускую гісторыю і культуру як цэласныя моўныя знакі. Гэта перш за ўсё датычыць лексічных адзінак з “нацыянальным фонам” – назваў рэалій і паняццяў са феры матэрыяльнай і духоўнай культуры нашага народа, жывёльнага і расліннага свету Беларусі, прэцэдэнтных імёнаў і геаграфічных назваў, у змесце якіх рэпрэзентаваны спецыфічныя адметнасці менталітэту і светаўспрымання беларусаў, іх сацыяльных паводзін.

Даследаваныя мастацкія творы У. Караткевіча, В. Быкава, Р. Барадуліна і Г. Бураўкіна праз сістэму моўных сродкаў даволі поўна і глыбока адлюстроўваюць духоўныя здабыткі і маральныя арыенціры беларусаў як нацыі з багатым гістарычным мінулым, а таксама іх традыцыйнае мысленне, якое абумоўлена нацыянальна-культурным светабачаннем і менталітэтам. Лінгвакраіназнаўчую інфармацыю ў мастацкіх тэкстах гэтых аўтараў нясуць разнастайныя нацыянальна маркіраваныя моўныя адзінкі – словы і спалучэнні слоў, народныя параўнанні, фразеалагізмы і афарызмы, якія рэпрэзентуюць тыя ці іншыя гістарычныя рэаліі беларускага народа, асаблівасці тэрыторыі і месца яго пражывання, культурнай і гаспадарчай дзейнасці. Так, да нацыянальна афарбаваных моўных адзінак, якія нясуць у сабе лінгвакраіназнаўчую інфармацыю, адносяцца наступныя:

1) лексіка са феры матэрыяльнай культуры, словы-этнаграфізмы *(асвер, бульба ў панчошках, бульбянішча, варыўня, ватоўка, вілачнік, грубка, жалейка, кубелка, клямка, крупнік, намітка, падстрэшша, паплеціна, пасталы, пачынак, рэзгіны, цабэрак, цярновачка, шапка-кучомка);*

2) лексіка са сферы духоўнай культуры *(Вадзянік, Вадохрышча, Велес, вяснянка, Грамніцы, Дамавік, заручыны, Змітраўскія дзяды, Каложская царква, Каляды, Купалле, Куцця, манастыр Барыса і Глеба, Масленіца, папараць-кветка, Русальны тыдзень, Сафійка, Сёмуха, Русальны тыдзень, Янава ноч);*

3) найменні гістарычнага характару, назвы грамадска-палітычных і гаспадарчых рэалій *(Грунвальд, калгас, капá, Котлас, Курапаты, маршалак, паншчына, талака, шлях “з вараг ў грэкі”);*

4) назвы прыродных з’яў і аб’ектаў *(багна, балота, бусел, баравінка, валун, вербалоз, грыбасей, жыта, заяц, знічка, зубр, імжака, імшарнік, маладзік, рунь, тарфянішча, твань);*

5) антрапонімы *(Багдановіч, Барбара Радзівіл, Браніслаў Тарашкевіч, Еўфрасіння Полацкая, Колас, Купала, Куляшоў, Марк Шагал, Мележ, Скарына, Язэп Драздовіч);*

6) тапонімы *(Беразяны, Вушача, Верасовачка, Віцебск, Гародня, Гліняны, Дзвіна, Залоззе, Лісічанская пушча, Лясіны, Мінск, Нёман, Слуцк, Ушаччына,Чарнобыль);*

7) этнічныя, у тым ліку лінгвістычныя, паняцці, тэрміны і номены *(балцкая кроў, беларуская мова, беларусы, кірыліца, мова-крывічанка, радаводнае дрэва, родная мова);*

8) розныя другасныя онімы *(“Купалінка”, “Лябедзік”, “Ветрык”, “Перапёлачка”, “Лявоніха”, “Хроніка Быхаўца”);*

9) устойлівыя моўныя выразы і народныя афарызмы *(адзін як вока ў ілбе; вянок з гароху надзець; неба з аўчынку; кукіш у кішэні; грыбоў – хоць закладай касу; першая чарачка – як сінічка, другая – як жавараначка; хварэць на пана; які клапот, такі і ўмалот);*

10) вобразна-выяўленчыя сродкі мовы з нацыянальна-культурнай канатацыяй:

– словы-сімвалы *(бусел, валошка, васілёк, крумкач, лён);*

– эпітэты *(Беларусь завадская, зубрыная; васільковы спакой; вочкі-зорачкі; гаі белакорыя; гасцінны край; даланя кляновая; жарэбная чарнобыльская хмара; жаўрукова мова; жытняе слова; край ласкава-лясны; планета бульбападобная; край сінявокі; купалаўскае дрэва; купальскія вянкі; лес-беларус; песня-крынічанька);*

– метафары *(веснаплынных вятроў талака; воз жыцця; вочы хат; даланя засланкі; ланцуг туману; інваліды – асколкі вайны; загінае палец серп; слова крывічоў; смяецца печ – апора хаты);*

– метанімія *(бяліла лён на світку Каліноўскаму);*

– параўнанні *(азёры, як неба сінія; зямля сухая, як далонь земляроба; госць у хаце – Бог у хаце; як яблык, крамянае і хрупаткое слова “Беларусь”);*

– іншыя сродкі мастацкай выразнасці *(гаварыць – серабро, маўчаць – золата; зямля пад белымі крыламі; лён – апошні сінявокі беларус; ільновалосыя Селянінавічы).*

Гэтыя і іншыя лінгвакраіназнаўчыя адзінкі ў мастацкай тканіне даследаваных тэкстаў семантызуюць унікальнасць матэрыяльнай і духоўнай культуры, традыцыйныя маральныя каштоўнасці, мудрасць і таленавітасць беларусаў як самастойнай нацыі, якая фарміравалася і развівалася ў пэўным сацыяльна-культурным асяроддзі.

1.3 Моўна-культурная спецыфіка перакладу мастацкага твора

Як заўважае руская даследчыца Т.Г. Фаміна, “любая этнічная культура – гэта вобраз свету, гэта ўпарадкаваная, збалансаваная, гарманічная схема Космасу, гэта тая прызма, праз якую чалавек глядзіць на свет. Вобраз светабудовы выражаецца праз філасофію, літаратуру, мову, матэрыяльную культуру, а таксама выяўляецца ва ўчынках людзей, нормах іх паводзін” [113, с. 107].

Пераклады мастацкіх твораў, якія з’яўляюцца каштоўным матэрыялам не толькі з пункту гледжання вывучэння асаблівасцей мыслення, псіхікі, жыцця і побыту таго ці іншага народа, але і для этналінгвістычных і лінгвакраіназнаўчых даследаванняў, варта разглядаць як адзін з магчымых каналаў міжкультурнай камунікацыі. “Пераклад, – адзначае даследчык І.В. Галубенка, – садзейнічае камунікацыі паміж прадстаўнікамі розных культур, а выбар сродкаў для данясення пэўнага зместу ўплывае на ступень іх узаемаразумення” [38, с. 47].

Пераклад мастацкіх тэкстаў – гэта частка сусветнай літаратуры і надзвычай важны элемент “супрацоўніцтва”, узаемадзеяння культур і развіцця кожнай з іх. Гэта свайго роду трансфармацыя зместу твора ў новую моўную і сацыяльна-культурную рэальнасць і разам з тым моўна-творчы працэс, які патрабуе захавання “нацыянальнага духу” арыгінальнага тэксту. Пры перакладзе супастаўляюцца, актыўна ўзаемадзейнічаюць не толькі дзве мовы, але і дзве нацыянальныя культуры, што пацвярджаюць якраз словы В.П. Рагойшы: “Мастацкі пераклад – гэта не толькі «перанос» твора з адной мовы ў іншую, але і «перанос» яго з адной нацыянальнай культуры ў іншую” [96, с. 12]. Гэта не толькі замена мовы, але і функцыянальная замена культуры. Прычым такая замена, як правіла, ніколі не бывае поўнай, бо “ажыццяўленне перакладу тэксту з адной мовы на другую – гэта заўсёды вынік цэлага комплексу прыёмаў расшыфроўкі і кадзіравання на семантычным, сінтаксічным і прагматычным узроўнях” [38, с. 50].

Пераклад мастацкага тэксту ў мовазнаўстве лічыцца адной з найбольш складаных формаў камунікацыі. І гэта зразумела: выкарыстоўваючы мову як камунікатыўны сродак, перакладчык ажыццяўляе камунікацыю не толькі на аснове разумення моў і культур, але і на аснове ведаў пра рэчаіснасць, якая апісваецца мовай арыгінала (такія веды называюцца “фонавымі”). Паколькі арыгінальны тэкст, як заўважалася вышэй, у пэўнай ступені выступае паказчыкам светапогляду народа, яго этнакультурнай свядомасці, пры перакладзе твора вельмі важна захаваць яго нацыянальную спецыфіку, мастацкую непаўторнасць і моўны каларыт. Аднак патрабаванне адносна таго, каб пераклад чытаўся так, як арыгінал, наўрад ці можна ажыццявіць поўнасцю. Тэкст перакладу заўсёды нясе адзнакі “бікультурнасці”, бо ён у нейкай ступені адаптаваны да нормаў іншай культуры.

Паміж тэкстам арыгінала і перакладу заўсёды ёсць пэўны “сацыяльна-культурны” бар’ер, абумоўлены адрозненнямі грамадскага жыцця і культурных традыцый аўтара тэксту і яго перакладчыка. Так, адрозненні ў нацыянальных культурах могуць праяўляцца ў тым, што ў розных мовах словы, якія маюць аднолькавую прадметную суаднесенасць і супадаюць па дэнатаце, могуць адрозніваццa канататыўнай семантыкай, г.зн. сваімі эмацыйна-ацэначнымі адценнямі, нацыянальна-культурнымі асацыяцыямі. Культура чалавецтва не ведае абсалютна непаўторных кодаў, але своеасаблівыя неадпаведнасці, несупадзенні тых ці іншых культурных рэалій заўсёды выяўляюцца ў працэсе міжкультурнай камунікацыі. Пры перакладзе тэкстаў з адной мовы на другую пераадолець гэтыя складанасці дапамагаюць разнастайныя гісторыка-культурныя і этнаграфічныя каментарыі [11, с. 5].

Аднак найбольшыя практычныя цяжкасці перакладчыцкай дзейнасці звязаны найперш з тым, што перакладчыку, працуючы з тэкстам, даводзіцца “дабірацца” да “неперакладальных” мясцін, якія знаёмяць чытача з побытам чужога народа або яго гісторыяй ці духоўнай культурай. З гэтага вынікае, што перакладчык фактычна выступае ў якасці пасрэдніка як паміж мовамі, так і паміж культурамі народаў. Выкарыстоўваючы мову як сродак зносін, ён павінен ажыццяўляць камунікацыю на аснове ведаў і разумення моў і культур. Іншымі словамі, перакладчык павінен валодаць лінгвакраіназнаўчымі ведамі, добра ведаць культуру народа, на мову якога перакладае тэкст. Натуральна, што спачатку трэба зразумець, пра што гаворыцца ў мове арыгінала, а ўжо затым перадаць сэнс выказвання на мове перакладу з улікам таго, што нейкая культурная з’ява ці факт рэчаіснасці могуць адсутнічаць у паўсядзённым жыцці носьбітаў мовы, на якую перакладаецца тэкст. Без ведаў культурнага асяроддзя ніякая камунікацыя праз перакладчыка ўяўляецца немагчымай. Як слушна заўважыў П. Садоўскі, “…занядбанне перакладчыкам пэўных культурна-гістарычных каштоўнасцей арыгінала закранае ўжо сферу адносін паміж перакладчыкам і чытачом не толькі як «спажыўцом» пэўнай мастацкай інфармацыі, але і як з носьбітам адпаведнай сацыяльна-гістарычнай свядомасці” [100, с. 198].

Адной з найважнейшых задач пры перакладзе тэксту з’яўляецца вывучэнне дыялагічных структур у зносінах паміж людзьмі, што складае прастору інтэртэксту. Тэкст як адзінка перакладу выступае ў якасці пасрэдніка ў працэсе міжкультурнай камунікацыі, які адначасова належыць дзвюм сістэмам – культуры рэцыпіента і зыходнай культуры. Разуменне тэксту, яго ўспрыманне – гэта складаны шматэтапны працэс кодавага пераўтварэння знешняй лінгвістычнай інфармацыі ва ўнутраныя веды.

Адрозненне паміж мовамі, абумоўленае адрозненнем культур, найбольш відавочнае ў лексіцы і фразеалогіі. Таму паняцце міжкультурнай камунікатыўнай кампетэнцыі перакладчыка традыцыйна звязваецца з яго ўменнем пераадольваць культурную інтэрферэнцыю на ўзроўні слоў

і ўстойлівых словазлучэнняў. Фонавыя веды неабходныя перакладчыку для таго, каб правільна перадаць значэнні рэалій, пра якія ідзе размова ў арыгінале. Таму найбольш “цяжкімі” мясцінамі пры перакладзе з’яўляецца найперш безэквівалентная лексіка, дыялектызмы і фразеалагізмы з нацыянальна-культурным кампанентам значэння, якія, між іншым, у перакладных тэкстах маюць найбольшую лінгвакраіназнаўчую каштоўнасць.

Безэквівалентная лексіка, у асноўным, абазначае спецыфічныя з’явы мясцовай культуры. Экзатызмы ж не столькі раскрываюць ці тлумачаць чужую культуру, колькі сімвалізуюць яе. Некаторыя экзатызмы з’яўляюцца гістарызмамі. Яны таксама не паддаюцца перакладу, напрыклад: *андарак, панарод, пастаў* як віды ткацкіх станкоў на Беларусі ў ранейшыя часы. А між тым гэта ключ да разумення мінулага культуры. Такія “прабелы”, ці “белыя плямы на семантычнай карце мовы”, называюцца лакунамі, якія могуць быць абумоўлены не толькі адсутнасцю ў адной з моў адпаведнага дэнатата, але і тым, што мове быццам бы не так важна адрозніваць тое, што адрознівае іншая мова (напрыклад, двум англійскім найменням *bank* ‘бераг ракі’ і *shore* ’бераг мора’ адпавядае ў беларускай мове адно слова *бераг*. Рускія даследчыкі Я.М. Верашчагін і В.Р. Кастамараў адзначаюць, што “калі безэквівалентнае слова нельга перадаць на замежнай мове пры дапамозе дакладнага адпаведніка, аднаслоўнага перакладу, то лексічныя паняцці даводзіцца апісваць” [25, с. 58].

Своеасаблівыя “лексічныя прабелы” ўяўляюць сабой этнаграфічныя лакуны, якія непасрэдна звязаны з пазамоўнай нацыянальнай рэальнасцю, з адрозненнямі этналінгвістычнага і нацыянальна-культурнага характару. Спецыфічнай адметнасцю этнаграфічных лакун з’яўляецца адсутнасць у адной з моў слова ці ўстойлівага выразу для выражэння пэўнага паняцця.

Што да дыялектных слоў у мове арыгінала, то яны або літаральна перадаюцца пры перакладзе, або замяняюцца лексічнымі адпаведнікамі. Безумоўна, у перакладзеным тэксце захаванне дыялектных формаў і слоў не заўсёды прымальнае. Таму задача перакладчыка якраз і заключаецца ў тым, каб знайсці для дыялектызмаў агульналітаратурныя лексічныя адпаведнікі, якія б “не зацямнялі” нацыянальна-культурны каларыт арыгінала.

У свеце няма мовы, якой быў бы не характэрны такі тэзаўрусны складнік, як фразеалогія. Устойлівыя адзінкі, з’яўляючыся элементамі моўнай сістэмы, найбольш ярка і дакладна адлюстроўваюць побыт народа, яго традыцыі, асаблівасці мыслення і ўспрыняцця навакольнага свету. З гэтай прычыны фразеалагізмы таксама выклікаюць пэўныя цяжкасці пры перакладзе. Тлумачыцца гэта, зразумела, яшчэ і тым, што гэтыя моўныя адзінкі дастаткова часта выражаюць асаблівасці светапогляду народа, утрымліваючы ў сваім значэнні пэўную этнакультурную інфармацыю.

Пры перакладзе фразеалагічных і парэміялагічных адзінак з адной мовы на другую перакладчыкі, як правіла, карыстаюцца наступнымі спосабамі: 1) перадача фразеалагізма фразеалагізмам: бел. *як жару*

ўхапіўшы – рус. *как на пожар*; бел. *збіць з панталыку* – рус. *сбить с толку*; 2) замена прыказкі прыказкай: рус. *о вкусах не спорят; на вкус и цвет товарища нет* – бел. *дзеду міла, а ўнуку гніла; каму падабаецца поп, каму пападдзя, а каму – папова дачка*; рус. *язык до Киева доведет* – бел. *хто пытае, той не блудзіць*; рус. *насильно мил не будешь* – бел. *даганяючы не нацалуешся*; 3) замена фразеалагізма словам ці свабодным словазлучэннем: бел. *як Піліп з канапель; як чорт з табакеркі* – рус. *неожиданно, внезапно*; бел. *падняць на ногі* – рус. *взбудоражить*; 4) замена асобнага слова ці словазлучэння фразеалагізмам: бел. *служыць* – рус. *тянуть лямку*; бел. *уцячы* – рус. *дать драпака*.

Спецыялісты ў галіне перакладчыцкай дзейнасці заўважаюць, што перакладаць з блізкароднасных моў цяжэй, чым з моў, далёкіх па сваіх генетычных вытоках. Любы пераклад, як бы кваліфікавана ён ні быў выкананы, змяшчае пэўную колькасць адхіленняў ад эталона. Успрымаючы перакладзены тэкст, чытач выкарыстоўвае набор правіл, уласцівых толькі яго мове і культуры, бо кожнаму народу ўласцівы свой “вобраз свету”. “Нацыянальны вобраз свету” беларусаў абумоўлены іх народна-побытавай сферай, гісторыка-культурнымі традыцыямі, прыродным асяроддзем, у якім яны жывуць і працуюць. Уваходжанне ў беларускі “свет культуры”, удзел у дыялогу культур магчымы толькі пры ўмове разумення кодаў беларускай культуры, якія вызначаюцца “нацыянальным вобразам свету”, этнічным складам псіхікі, мыслення, геаграфічным становішчам Беларусі.

Ужыванне нацыянальных моўных элементаў з’яўляецца ў перакладзе абгрунтаваным і мэтазгодным, калі яно адпавядае агульнаму стылістычнаму характару твора і нормам той мовы, на якую перакладаецца тэкст. Напрыклад, свядомае ўжыванне беларускіх моўных элементаў у рускамоўным кантэксце можа выконваць пэўныя функцыі. Беларусізмы могуць выкарыстоўвацца як сродак стварэння мясцовага каларыту: *заціркa, ваўкалака, дзядзькаванне* (у перакладах твораў У. Караткевіча на рускую мову) або сродак індывідуалізацыі моўных паводзін персанажаў, бо, ствараючы моўныя характарыстыкі герояў, беларусізмы фарміруюць пэўны нацыянальны фон твора. Так, у перакладах рамана І. Пташнікава “Мсціжы”, выкананых В. Кудзінавым і М. Гарбачовым, шырока ўжываецца беларускі выклічнік *ат*: *“А-ат! Как-нибудь разберёмся”*; часціцы *аж* і *хай*, якія надаюць рэплікам персанажаў адценне размоўнасці: *“Аж дрожь берёт, как вспомнишь… Хай медведя Внук сам кусает”*. Як сродак узмацнення выразнасці і экспрэсіўнасці мовы выкарыстоўваецца (у змененым выглядзе) устойлівы выраз-параўнанне *как гарбузов на грядках*: *“У него самого было уже трое детей – сыновей, что желтых гарбузов на грядках: мал мала меньше”*. У якасці сродку стварэння этнаграфічнага фону і перадачы нацыянальнага каларарыту ў быкаўскіх і караткевічаўскіх перакладах твораў на рускую мову функцыянуюць такія лексічныя адзінкі, як *батька, хлопчик,*

житьё, бульба, богун, чугунок, шкодить, коваль, гультай, гостевать і інш. Заўважым, што тры апошнія словы ў рускай мове кваліфікуюцца як дыялектызмы, у той час як у беларускай мове яны з'яўляюцца літаратурнай нормай. Выкарыстанне беларусізмаў у перакладах на рускую мову з'яўляецца аб'ектыўным і заканамерным, таму што беларускія моўныя элементы адпавядаюць структурна-кампазіцыйнай і моўнай пабудове мастацкай тканіны твораў.

Такім чынам, мастацкі пераклад значна ўзбагачае мову, актывізуючы яе ўласныя лексічныя, формаўтваральныя, сінтаксічныя магчымасці, павышае культуру роднага слова. Ён выступае своеасаблівай формай міжнацыянальных культурных сувязей і відам міжлітаратурнай камунікацыі, сродкам духоўнага ўзбагачэння і збліжэння народаў [44, с. 3].

Вывады

Такім чынам, мова з'яўляецца апорай нацыянальна-адметнага спосабу мыслення і светабачання кожнага з нас, бо менавіта праз яе чалавек успрымае свет. Іншымі словамі, мова – гэта свайго роду "інструмент" упарадкавання свету, сродак замацавання этнічнага светапогляду народа. Спасціжэнне мовы – гэта не толькі выкарыстанне яе ў якасці сродку зносін. Гэта яшчэ і адначасовае далучэнне да мастацкай творчасці нацыі. З'яўляючыся першаэлементам літаратуры, мова вызначае нацыянальную прыналежнасць твора.

Беларускі мастацкі тэкст нясе ў сабе багатую і цікавую этнакультурную інфармацыю пра беларускі народ і яго нацыянальны менталітэт. Гэта дасягаецца за кошт ужывання моўных адзінак з лінгвакраіназнаўчым зместам. Да іх ліку можна аднесці лексіку са сферы матэрыяльнага, духоўнага і сацыякультурнага жыцця беларусаў, назвы гістарычнага і грамадска-палітычнага характару, найменні-рэпрэзентанты прыроднага і навакольнага свету, анамастычную лексіку, фразеалагічныя і парэміялагічныя адзінкі, вобразна-выяўленчыя сродкі мовы з нацыянальна-культурным кампанентам значэння.

Мастацкія тэксты, якія найбольш поўна і ўсебакова адлюстроўваюць культуру таго народа, з мовы якога ажыццяўляецца пераклад, даюць вытлумачэнне карціны свету, сістэмы вобразных сродкаў і нацыянальнай ідыяматыкі, што садзейнічае знаёмству прадстаўнікоў іншага моўнага і культурнага асяроддзя з краіназнаўчымі рэаліямі і нацыянальнай культурай іншага народа.

Раздзел 2
ЛІНГВАКРАІНАЗНАЎЧЫ КАМПАНЕНТ У ПРОЗЕ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

Праўдзівы Майстра, чысты як сляза,
Паэце, Ты ёсць, Ты будзеш!
Вечна. Крынічна. Зорна.
Рыгор Барадулін

2.1 Уладзімір Караткевіч як прэцэдэнтнае імя ў беларускай лінгвакультуры

На працягу сваёй гісторыі кожны народ мае такіх дзеячаў, у асобе і творчасці якіх найбольш поўна ўвасоблены нацыянальная ідэя, нацыянальны характар народа і яго этнічная самабытнасць. Для нас, беларусаў, гэта Уладзімір Караткевіч – адзін з самых адметных і арыгінальных прадстаўнікоў беларускай літаратуры XX ст., таленавіты паэт і празаік, публіцыст і драматург, перакладчык і кінасцэнарыст. Па словах А.І. Бутэвіча, "прозвішча Уладзіміра Караткевіча з'яўляецца не толькі сведчаннем сапраўднай, якаснай літаратуры, але і апазнавальнай прыкметай нашай Беларусі" [19, с. 50].

У сваёй творчасці У. Караткевіч, імкнучыся сцвердзіць нацыянальную самаідэнтычнасць беларусаў як самастойнага этнасу, здолеў глыбока зразумець і асэнсаваць сацыяльныя рэаліі і гістарычнае мінулае нашых продкаў. У яго творах "можна адшукаць адказы на тыя пытанні, перад якімі бяссільныя акадэмічныя падручнікі, вопытныя настаўнікі…" [111, с. 6].

Як пачынальнік беларускай гістарычнай прозы, пісьменнік шмат зрабіў для нацыянальнага духоўнага жыцця, у тым ліку для вяртання беларускаму народу яго гістарычнай памяці. Наш слынны зямляк так тлумачыў сваю ўлюбёнасць у гістарычную тэму: "А для нас жа, беларусаў, гісторыя – у многім нязведанае. Мы пакуль што мала ведаем аб жыцці, звычаях, побыце нашых продкаў. І кожны, хто ведае, хто можа ведаць, павінен збіраць гэтыя падрабязнасці і перадаваць іх іншым".

Сёння можна з поўным на тое правам сцвярджаць, што імя У. Караткевіча з'яўляецца прэцэдэнтным у беларускай лінгвакультурнай супольнасці, бо ў Беларусі фактычна "ён выканаў тую гістарычную місію, што Вальтэр Скот у Англіі, Генрык Сянкевіч у Польшчы, Алаіс Ірасек у Чэхіі" [19, с. 3]. Нагадаем, што "лінгвакультура – гэта культура, увасобленая і замацаваная ў знаках мовы. Змест беларускай лінгвакультуры складае сукупнасць ведаў яе носьбітаў пра гістарычнае мінулае нашага народа, яго духоўныя арыенціры, нацыянальныя сімвалы, увасобленыя ў змесце прэцэдэнтных тэкстаў і прэцэдэнтных імёнаў" [42, с. 35].

У чым жа феномен творчасці гэтага пісьменніка? Думаецца, адказ на гэтае пытанне будзе наступным. У. Караткевіч здолеў паказаць (і даказаць!), што беларускі народ, нягледзячы на шматлікія пакуты і выпрабаванні, трагічныя падзеі ў яго гісторыі, застаўся памяркоўным, свабодалюбівым і мужным, гордым і таленавітым, разумным і гасцінным, што пацвярджаюць наступныя радкі з кнігі нарысаў "Зямля пад белымі крыламі": *"...беларусам прыродна ўласцівая павага да іншых народаў і памяркоўнасць да таго, хто думае іначай"; "Добры, верны сябрам і страшны ворагам, вольналюбівы, чысты і горды"; "Народ... Жывы, разумны і вольналюбівы"; "Наш народ спявучы, таленавіты, горды"; "Госць у хаце – Бог у хаце" – і ганьба таму дому, дзе не зробяць усяго, нават немагчымага, каб госць быў задаволены".* З пачуццём вялікага гонару за свой народ – народ з вялікай гісторыяй і самабытнай культурай – пісьменнік звяртаецца да сучаснікаў: *"Вазьмі у звычай, сын герояў і багоў, не пагарджаць святым сваім мінулым, а заслужыць яшчэ, і вартым быць яго".*

Акрамя асноўнага прызвання – ствараць цікавыя, высокамастацкія творы, У. Караткевіч быў цудоўным апавядальнікам і акцёрам, спеваком і мастаком, у тым ліку і сапраўдным мастаком слова. Паэтызуючы гісторыю, ён ніколі не забываў пра духоўнае жыццё свайго народа і яго мову. "Мова – душа народа, і толькі на ёй можа народ найбольш поўна выказаць сябе", – сцвярджаў пісьменнік, разважаючы пра няпростую (ужо ў той час) моўную сітуацыю ў Беларусі. Любоў да роднай мовы і незвычайнае адчуванне яе прыгажосці, чуйнасць да беларускага слова і клопат пра захаванне яго нацыянальнай адметнасці і непаўторнасці – усё гэта знайшло адлюстраванне ў творах У. Караткевіча. Нацыянальная спецыфіка яго мовы выразна выяўляецца праз сістэму лексічных і фразеалагічных адзінак, трапных народных выслоўяў, якія ў сваёй семантыцы даволі поўна і глыбока рэпрэзентуюць тыя ці іншыя краіназнаўчыя рэаліі, а таксама этнічную адметнасць матэрыяльнай і духоўнай культуры нашага народа – ад прадметаў хатняга ўжытку да замкаў і вежаў, храмаў і абразоў, народных песень.

Праз мастацкі тэкст караткевічаўскіх твораў перад намі ўзнікаюць сацыяльна абумоўленыя малюнкі з жыцця беларусаў у мінулыя часы – ад сялянскай хаты і карчмы да панскіх шыкоўных палацаў. Узяўшы за аснову тыя ці іншыя гістарычныя факты, аўтар здолеў праўдзіва паказаць жыццё розных сацыяльных слаёў тагачаснай Беларусі – ад простага люду, рамеснікаў, гандляроў да паноў і магнатаў.

Уладзімір Караткевіч з'яўляецца адным з духоўных сімвалаў сучаснага беларускага адраджэння. Яго ўнёсак у развіццё нашай нацыянальнай літаратуры і культуры, абуджэнне гістарычнай памяці беларусаў надзвычай вялікі. Гістарычная проза пісьменніка атрымала шырокую папулярнасць і прызнанне чытачоў не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Пераклад твораў пісьменніка ажыццёўлены больш чым на дваццаць моў свету, у тым ліку на рускую, украінскую, польскую, англійскую, нямецкую, іспанскую, французскую ды інш.

Ушанаванне пісьменніка і высокая ацэнка нашчадкамі таго, што зроблена ім, знайшлі сваё ўвасабленне ў многіх сферах жыцця нашага грамадства. Імя У. Караткевіча дарагое нам, сучаснікам, як імя пісьменніка, які, шчыруючы на ніве беларушчыны, прымусіў усвядоміць значэнне найбагацейшай гісторыі нашага народа, вывучаць яе і ганарыцца ёю. У 1986 г. выйшаў падрыхтаваны ім самім да друку паэтычны зборнік з сімвалічнай назвай "Быў. Ёсць. Буду". У прадмове да зборніка Р. Барадулін сказаў пра свайго сябра і калегу так: "Любая літаратура можа сказаць, што яна багатая і сталая, калі мае свайго Уладзіміра Караткевіча. Ты пісаў як дыхаў. Сваім асабістым прыкладам творцы паказваў узор служэння Радзіме, Народу, Мове…" [56, с. 4].

І сёння наш зямляк жыве ў сваіх творах і ў творах, прысвечаных яму пісьменнікамі і мастакамі, кампазітарамі і рэжысёрамі. Вобраз У. Караткевіча паўстае перад намі ў эсэ Я. Брыля "Наш Караткевіч", рамане-эсэ А. Лойкі "Уладзімір Караткевіч, або Паэма Гарсія Лойкі", вершах-прысвячэннях В. Аколавай "Каля помніка Уладзіміру Караткевічу", Э. Акуліна "Памяці Уладзіміра Караткевіча", Р. Барадуліна "Акафіст Уладзіміру Караткевічу", "Валун Караткевіча", "У вянок жалобы Уладзіміру Караткевічу", С. Законнікава "Касцёр: памяці У. Караткевіча", А. Канапелькі "Хрыстос прызямліўся ў Гародні: Уладзіміру Караткевічу", А. Салтука "Памяці У.С. Караткевіча", Я. Сіпакова "Заўжды", В. Шніпа "Балада Уладзіміра Караткевіча" і інш. У апошні час выйшлі з друку шматлікія навуковыя працы, манаграфіі, літаратурна-крытычныя артыкулы, прысвечаныя У.С. Караткевічу [19; 24; 74; 98; 99].

У сучасным літаратуразнаўстве ўсё часцей выкарыстоўваецца паняцце "караткевічазнаўства", што сведчыць пра павышэнне цікавасці навукоўцаў да асобы і творчасці пісьменніка. Дзякуючы намаганням супрацоўнікаў Віцебскай абласной бібліятэкі ў 2010 г. убачыла свет выданне "Уладзімір Караткевіч у творах мастацтва", якое з'яўляецца бібліяграфічным паказальнікам, дзе змешчаны назвы твораў мастацтва, якія адлюстроўваюць асобу У. Караткевіча як чалавека і творцу [111].

Інфармацыя пра пісьменніка ўключана таксама ў бібліяграфічны даведнік М. Півавара "Краязнаўцы Віцебшчыны 2-й паловы XX – пачатку XXI ст. [94, с. 140].

На сцэнах беларускіх тэатраў неаднаразова ажыццяўляліся пастаноўкі п'ес У. Караткевіча. Так, у Беларускім тэатры оперы і балета былі пастаўлены оперы "Сівая легенда" і "Дзікае паляванне караля Стаха". Спектаклі "Дзікае паляванне караля Стаха", "Ладдзя Роспачы", "Званы Віцебска" былі прадстаўлены гледачам на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драмтэатра імя Я. Коласа ў Віцебску.

Пісьменніку прысвечаны відэафільмы "Успамін", "Рыцар і слуга Беларусі", дакументальныя стужкі "Быў. Ёсць. Буду", "Акафіст Уладзіміру", а таксама мастацкія фільмы па матывах аднайменных твораў

“Чорны замак Альшанскі”, “Хрыстос прызямліўся ў Гародні”, “Маці ўрагану”, спектаклі Беларускай студыі тэлебачання “Ладдзя Роспачы”, “Лісце каштанаў”, “Сіняя-сіняя…”.

Сёння па ініцыятыве грамадскіх аб’яднанняў і літаратурных арганізацый, устаноў адукацыі і культуры праводзяцца шматлікія кніжныя выставы, літаратурныя вечарыны, чытанні і конкурсы сярод дзяцей і моладзі, прысвечаныя памяці У. Караткевіча. Яго імя носіць Фонд дапамогі маладым пісьменнікам, а таксама прэмія выдавецтва “Мастацкая літаратура”. На радзіме вялікага майстра слова, у Оршы, дзейнічае музей У. Караткевіча, пры якім працуе навукова-даследчы цэнтр, што займаецца вывучэннем творчасці пісьменніка. Яго імя носяць вуліцы ў такіх гарадах, як Віцебск, Орша, Рагачоў, Гродна, Астравец, а такскама дзіцячая бібліятэка ў Оршы, гарадская бібліятэка ў Віцебску, бібліятэка-філіял ў Наваполацку, супрацоўнікі якіх робяць вельмі многа для папулярызацыі жыцця і творчасці нашага слыннага земляка.

Сказанае вышэй дае падставы разглядаць У. Караткевіча, творы якога глыбока выяўляюць нацыянальную рэчаіснасць беларускага народа, рэпрэзентуючы яго этнічныя стэрэатыпы і нацыянальны характар, як прэцэдэнтнае імя ў беларускай лінгвакультуры.

2.2 Мастацкі тэкст Уладзіміра Караткевіча як транслятар лінгвакраіназнаўчай інфармацыі

Даследаванне літаратурных твораў У. Караткевіча – выдатнага майстра беларускага слова, гісторыка, этнографа – раскрывае багацце нацыянальна-культурнай семантыкі беларускай мовы як на ўзроўні моўна-выяўленчых сродкаў, так і на ўзроўні па-свойму адмысловага спосабу фарміравання думкі, які складваецца пад уплывам этнакультурнага кантэксту. У прозе пісьменніка на гістарычным матэрыяле даецца “характарыстыка нацыянальнага быцця, філасофія станаўлення нацыянальнай свядомасці” [7, с. 95]. Яго творы – гэта “жывая гісторыя народа, у якой не толькі займальнасць падзей, але і нацыянальны характар, сапраўднае жыццё народа і натуральны патрыятызм…” [19, с. 50].

Пісьменнік мэтанакіравана дамагаўся стварэння нацыянальнага міфа, любіў “сівыя” легенды і таленавіта, па-майстэрску выкарыстоўваў іх у сваіх творах. Можна сказаць, што ён паэтызаваў гісторыю, ніколі не забываючы пра духоўнае жыццё народа і яго родную мову. Практычна ўсё створанае “вялікім рупліўцам Адраджэння” [50] прасякнута клопатам пра лёс Бацькаўшчыны.

У. Караткевіч адкрываў у сваёй творчасці гісторыю Беларусі перш за ўсё для саміх беларусаў. У яго прозе знайшлося месца і для апісання сацыяльна-гістарычных падзей, і для карцін побыту, нораваў, і для апісання

абрадаў і народных святаў нашых продкаў. Этнаграфічныя звесткі глыбока і змястоўна рэпрэзентуюцца ў яго літаратурна-мастацкіх творах праз семантыку моўнага знака. Так, у аповесці “Дзікае паляванне караля Стаха” пра падзеі і людзей расказвае фалькларыст Беларэцкі; у “Чорным замку Альшанскім” аповед вядзецца ад імя гісторыка Антона Косміча; у рамане “Каласы пад сярпом тваім” этнаграфічны фон “апраўданы” тым, што маладыя героі рамана спасцігаюць свет увогуле і свой нацыянальны свет у прыватнасці, а ў рамане “Хрыстос прызямліўся ў Гародні” – імітацыяй формы Евангелля. Варта адзначыць, што найбольш насычана этнаграфізмамі мова менавіта тых твораў, у якіх расказваецца пра мінулае нашага народа.

Кароткім мастацкім летапісам гісторыі і этнаграфіі Беларусі даследчыкі называюць раман “Каласы пад сярпом тваім”. Па словах А.У. Русецкага, “гэта бадай што першы ў сучаснай беларускай літаратуры буйны шматпланавы, нават панарамны твор пра гістарычнае мінулае беларускага народа” [99, с. 77], паколькі ў цэнтры яго – гісторыя індывідуальнага лёсу і гісторыя беларускай зямлі. У рамане “Каласы пад сярпом тваім” шырока прадстаўлены побыт як шляхты і арыстакратычных колаў тагачаснага грамадства, так і сялянства. Аўтар згадвае найважнейшыя падзеі беларускай гісторыі з канца XVIII да сярэдзіны XIX ст. Змест твора ўтрымлівае ў сабе звесткі пра язычніцкіх багоў – *бога холаду Зюзю, бога смерці і чумы Паляндру*, пра аднаго з нячысцікаў – *Лазніка*, які жыве ў лазні і інш. Згадвае аўтар і беларускія назвы зорак і планет, народныя калядныя, жніўныя і велікодныя песні, звычаі *(кувада, дзядзькаванне, паводзіны пры смерці чараўніка)* і інш. [7, с. 100].

Адной з адметных рыс моўнага майстэрства У. Караткевіча з’яўляецца яго блізкасць да глыбінных вытокаў народнай моватворчасці. У свой час празаік падкрэсліваў, што вусная народная творчасць – гэта трапяткое слова народа, якое захоўвае моўнае багацце ў яго першароднай прыгажосці. Што да рамана “Каласы пад сярпом тваім”, то, здаецца, твор наскрозь пранізаны стыхіяй народнай паэзіі. Адчуваецца, што аўтар глыбока ведае і шануе гісторыка-культурную спадчыну свайго народа. Мова рамана напеўная, меладычная, на яго старонках нібы гучыць песеннае “шматгалоссе” – песні *“далёкія і даўнія, як сама бяздольная прыдняпроўская зямля”* [Каласы пад сярпом тваім], жніўныя і вясновыя, ваенныя і бытавыя, вясельныя і калядныя, песні пра каханне, калыханкі і песні лірнікаў. Яны пададзены аўтарам як цалкам, так і ва ўрыўках. Пісьменнік выдатна ўсведамляе, што ў песні заключана *“найвышэйшая мудрасць”*, што *песня* – гэта *“жывая крынічка”* [Каласы пад сярпом тваім].

У мастацкую тканіну рамана аўтарам уведзена шмат народных песень, якія нясуць у сваім змесце цікавыя лінгвакраіназнаўчыя звесткі сацыяльна-гістарычнага характару. Гэта вельмі разнастайныя, пераважна лірычныя і ліра-эпічныя песні каляндарна-абрадавага і сямейна-абрадавага цыклаў, якія, апрача адлюстравання душэўнага стану герояў, выяўляюць

нацыянальны характар беларускага народа ў цэлым. Непераўзыдзенымі шэдэўрамі з'яўляюцца для Алеся калыханкі, якія ён спяваў сваім дзецям Юрасю і Тоньцы. Цудоўным "музычным суправаджэннем" да размовы Гелены і Майкі выступае песня жней *"Закурыўся дробненькі дожджык"*, дзе вядзецца гаворка пра ліхое замужжа і нешчаслівую жаночую долю. Перажываннням Алеся падчас разладу з Майкай адпавядала пачутая ім песня *"За рэчанькай за быстраю ў цымбалы б'юць"*, змест якой шчыра і прачула перадае перажыванні юнака, які *"кахаў, ды не ўзяў"*. Уражваюць трагізмам *галашэнні* па Стафане Кагуце. Заўважым, што на самым пачатку твора пад ліру выконваў сваю песню Даніла Кагут. І на свіслацкім кірмашы сляпы жабрак-лірнік спяваў пра турэцкага караля і Андрэеўну, якая сябе забіла. Сваёй "прысутнасцю" ў творы лірнікі выяўлялі істотныя грані народнага жыцця.

Блізкасць мастацкіх тэкстаў У. Караткевіча да вуснай народнай творчасці адчуваецца ў творах, у моўнай прасторы якіх выкарыстоўваюцца загадкі: *Што расце без кораня, а людзі не бачаць?* [Каласы пад сярпом тваім]; казачна-байкавыя выразы : *на край свету* [Каласы пад сярпом тваім]; *на ўсе чатыры вятры* [Каласы пад сярпом тваім]; *бывай, свет ясны* [Каласы пад сярпом тваім]; *сапраўдная воля за сямю пячацямі* [Каласы пад сярпом тваім]; семантычная супрацьпастаўленасць слоў-антонімаў у межах аднаго выразу: *блізка – далёка; вузка – шырока* [Каласы пад сярпом тваім]; *не на жыццё, а на смерць* [Каласы пад сярпом тваім]; *ні цёплы, ні халодны* [Каласы пад сярпом тваім] і інш. Сустракаюцца выпадкі з увядзеннем іншасказальнай мовы, што ў пэўнай ступені характэрна для фальклорных твораў: *"На пэўнай хароміне хутка чырвоны Будзімір заскача, шэранькага Варгана да кучаравых божых авечак пусціць... той, хто трэба, уцёк. З таго месца ўцёк, дзе людзі шышкі ядуць, а ў бочцы плаваюць"* [Каласы пад сярпом тваім]. Трэба адзначыць, што, паводле народных уяўленняў, Будзімір – гэта певень, які будзіць раніцай свет (рус. *мир*); чырвоны певень – гэта агонь; кот Варган – гэта дым. Менавіта так герой паведамляе пра пажар, які павінен адбыцца ў хуткім часе, а таксама перадае звесткі адносна таго, што з катаргі ўцёк Корчак. Гэтыя моўныя сродкі выразнасці надаюць твору не толькі своеасаблівую эмацыйна-стылістычную афарбоўку, але і змяшчаюць у сабе лінгвакраіназнаўчую інфармацыю пра спрадвечную духоўную культуру беларусаў.

Дастаткова часта пісьменнік уключае ў змест сваіх твораў казкі і байкі. Варта нагадаць байку, як Бог дзяліў землі паміж народамі, якую (са слоў старога Вежы) Алесь Загорскі расказвае сябрам, або казку пра балотных паноў, што перамяшчаюцца па дрыгве, як па сухой зямлі. Відавочна, што моўныя скарбы свайго народа, якія арганічна ўваходзяць у тканіну мастацкіх тэкстаў, ствараючы ў іх асаблівы этнаграфічны фон, У. Караткевіч падвяргае ў пэўнай ступені пераапрацоўцы і скарачэнню.

Звяртаючыся ў рамане "Каласы пад сярпом тваім" да легенд і паданняў, аўтар імкнуўся паказаць глыбінныя асновы сівой мінуўшчыны,

народнага жыцця, зразумець таямніцу народнай душы. Усё гэта паўстае перад чытачом, калі апавядаецца пра забойства Маркам Кагутом свайго бацькі Рамана, які лічыўся ведзьмаком; калі згадваецца звычай *дзядзькавання*, што некалі быў шырока вядома на Беларусі; калі падаецца размова дзяцей на начлезе пра розныя страшныя здарэнні, чары і дзівосы; калі ствараюцца малюнкі *Сёмухі* і *Русальнага тыдня*; калі перадаюцца калядныя і велікодныя абрады. І ва ўсім гэтым адчуваецца сапраўды народны, нацыянальны беларускі дух.

Стыль рамана "Каласы пад сярпом тваім" вызначаюць таксама і вершы, якія прыводзяцца ў ім. Вершаваныя тэксты прысутнічаюць у п'есе "Гарыслава і Людамір", што ідзе ў тэатры старога Вежы. Алесь, як паэтычная натура, і сам піша вершы, якія прасякнуты трывогай і болем за лёс роднай зямлі. Адзін напісаны з іх, верш "Мова", ён чытае ў Пецярбургу перад Шаўчэнкам і сваімі сябрамі.

Вельмі разнастайная мастацкая палітра пісьменніка. Шчодра "сыпле" пісьменнік нацыянальна-маркіраванымі метафарамі і параўнаннямі, выкарыстоўваючы назвы тых ці іншых абрадавых свят. Звернемся да аўтарскага тэксту: *"Спачатку выпусцілі свае коцікі вербы. Потым, перад Вялікаднем, пачалі сачыцца празрыстым сокам пні ссечаных бяроз. Пасля пупышкі сталі зялёныя, а лясы – цёмныя. Пазней заплакалі перад Купаллем травы: меліся назаўтра загінуць. А затым прыйшла чарга палегчы каласам"* [Каласы пад сярпом тваім]. У рамантычна-алегарычнай форме такім чынам паказваецца набліжэнне будучага паўстання.

З пункту гледжання лінгвакраіназнаўства ўзорным у плане знаёмства з народнай музычнай культурай Беларусі ў мінулым можа служыць апісанне каляднай музыкі: *"Гулі дзве скрыпкі, пявуча вохкаў бас, мядзведзем раўла дуда, пяшчотна сапла жалейка, звонка ўдаралі цымбалы, і, вышэй за ўсё іншае, узлятаў, заліваўся і ўздыхаў бубен"* [Каласы пад сярпом тваім]. Голага малога Юрася Кагута аўтар называе чалавекам *"мужэска полу"*, а пра п'янага інспектара з Пецярбурга кажа, што той адправіўся ад Загорскага-Вежы *"еле можаху"*. Галаву мядзведзя пісьменнік апісвае з дапамагой параўнання, называючы яе *"трохкутнай, цяжкай, як валун"*, а царскі маніфест характарызуе наступным чынам: *"Дакумент гэты быў, акрамя ўсяго, напісаны дрэннай рускай моваю. Нібы бараною карэнні рве на лясной сцежцы"*. Як бачым, для У. Караткевіча надзвычай важна было перадаць у сваіх творах нацыянальны каларыт, атмасферу грамадскага жыцця на Беларусі ў мінулыя часы.

Надзвычай шмат гістарычных апісанняў, этнаграфічных і побытавых замалёвак у аповесці "Дзікае паляванне караля Стаха". Згадаем, напрыклад, танцы ў маёнтку Яноўскай *("Лябедзік", "Ветрык")* або напоі і стравы, якімі частавалі Беларэцкага ў доме Дубатоўка *(гарэлка на дваццаці сямі травах "трыс дзівінірыс" ("тройчы дзевяць"); ласіныя губы ў падсалоджаным воцаце)*. Прыгадваюцца *дрыканты* (вельмі рэдкая парода коней), на якіх

выязджалі прадстаўнікі вышэйшых саслоўяў на “дзікае паляванне”, а таксама ложак, *“шырокі, як поле бою пад Койданавам”*, у якім спаў Беларэцкі ў Балотных Ялінах і які звычайна засцілалі з дапамогаю асаблівай палкі.

Вельмі ўважліва пісьменнік ставіўся да выбару імёнаў для персанажаў сваіх твораў. Так, галоўныя героі аповесці “Дзікае паляванне караля Стаха” – Андрэй Беларэцкі і Андрэй Свеціловіч – аднадумцы, якія дамаўляюцца сумесна змагацца супраць дзікага палявання і ўсякай іншай “поскудзі”. Відаць, невыпадковым з’яўляецца супадзенне іх імёнаў. Заўважым, што імя *Андрэй*, якое пісьменнік неаднаразова дае героям сваіх твораў (Беларэцкі, Свеціловіч), у перакладзе з грэчаскай мовы азначае “мужны”. Традыцыі нацыянальнага іменаслова выяўляе імя *Алесь* (у перакладзе з грэчаскай мовы азначае “абаронца людзей”), якое мае галоўны герой рамана “Каласы пад сярпом тваім” Алесь Загорскі. Сапраўды, гэтыя героі ўвасабляюць у сабе найлепшыя рысы характару беларусаў-змагароў за праўду і справядлівасць. І ў прозвішчы *Свеціловіч* заключаны пэўны сэнс: яго носьбіт – чалавек новых, і перадавых поглядаў. Думаецца, і прозвішча *Беларэцкі* ўтрымлівае ў сабе пэўны нацыянальна-культурны змест. Варта толькі змяніць у ім дзве літары – і атрымаецца *“Беларускі”*. Прозвішча *Надзеі Яноўскай* таксама сімвалічнае. *Яноўская* – ад даволі распаўсюджанага на Беларусі ў былыя часы імя *Ян (Янка)*.

Аўтар нярэдка выкарыстоўвае шляхецкія прозвішчы, што “засведчаны ў розных афіцыйных і неафіцыйных дакументах з часоў Вялікага Княства Літоўскага” [117, с. 65]. Да іх ліку можна аднесці такія антрапонімы, як *Высоцкі, Яроцкі* і інш. У аповесці “Чазенія” прозвішча галоўнага героя *Севярына Будрыса* сугучнае з прозвішчамі герояў балады А. Міцкевіча “Тры Будрысы”.

У цэлым мове твораў У. Караткевіча ўласціва своеасаблівая шматпланавасць. Актыўна функцыянуюць лексічныя сродкі сучаснай беларускай мовы, устарэлая лексіка сацыяльна-гістарычнага зместу, фразеалагізмы біблейскага паходжання, афарызмы з нацыянальна-культурным значэннем і інш. Менавіта праз гэтыя моўныя сродкі выяўляецца грамадзянская пазіцыя аўтара, глыбокае і трывалае веданне і разуменне ім краіназнаўчых рэалій, гісторыі і культуры беларускага народа.

Своеасаблівы і непаўторны стыль Караткевіча-празаіка характарызуецца ўменнем выявіць, адабраць і выкарыстаць патэнцыйныя магчымасці роднай мовы з уласцівай ёй этнакультурнай адметнасцю, адшукаць неабходнае слова, выраз, надаўшы ім у тэксце дадатковую сэнсавую і эмацыйную нагрузку. Менавіта таму творы У. Караткевіча вызначаюцца мастацкай дасканаласцю, а іх мова – ужываннем лексічных і фразеалагічных адзінак з лінгвакраіназнаўчым кампанентам значэння.

Так, для перадачы нацыянальнага каларыту у сваіх творах аўтар прыводзіць апісанне беларускага касцюма незалежна ад таго, шляхецкі ён ці сялянскі. Усё накіравана на тое, каб узмацніць сацыяльную

характарыстыку дзейных асоб, паказаць іх адносіны да розных груп насельніцтва. Прывядзём прыклады назваў адзення і галаўных убораў заможных сялян: *кунтуш* ‘старадаўняя адзежына ў выглядзе кафтана з шырокімі адкіднымі рукавамі’, *жупан* ‘у мінулыя часы верхняе мужчынскае адзенне з каляровага сукна’, *сурдут* ‘мужчынская двухбортная вопратка з доўгімі поламі, якая цесна аблягае цела’, *кафтан* ‘даўнейшая мужчынская і жаночая вопратка з доўгімі поламі’ і інш. У моўным кантэксце твораў назвы адзення і галаўных убораў функцыянуюць разам з азначэннямі, якія выяўляюць сацыяльную дыферынцыяцыю заможных слаёў насельніцтва.

Надзвычай вялікая колькасць лексічнага матэрыялу з нацыянальна-культурнай і сацыяльна-гістарычнай афарбоўкай сустракаецца ў мове рамана “Хрыстос прызямліўся ў Гародні”, пра што сведчыць наступны кантэкст: *“Над Гародняй білі званы. Глуха бухаў дамініканскі касцёл, пагражаў бернардынскі, надрываліся званы Каложы і манастыра Барыса і Глеба, трывожна гудзелі святыя Ганна і набрамная Зафея, стагналі званы францысканцаў”* [Хрыстос прызямліўся ў Гародні], дзе *Каложская царква, манастыр Барыса і Глеба* з’яўляюцца ў пэўнай ступені культурна-гістарычнымі сімваламі Беларусі.

У творы нярэдка сустракаюцца біблейскія матывы, што пацвярджае пачатак рамана: *“Будучы на схіле дзён, рыхтуючыся да агульнай чашы чалавечай – яе ж ніхто не праміне, – ведаючы, што за крэсам не сустрэнемся зноў, бо веры мы рознай, а магчыма, і за крэсам ляжыць «можа быць» ці ўвогуле «нішто», вырашылі мы, адзін пісьменны, а другі памятлівы, распавясці вам, людзі, аб Юрасю Братчыку, якога царква назвала «лжэ-Хрыстом»,* а таксама заключныя радкі, у якіх адлюстравана прытча пра сейбіта: *“Выйшаў сейбіт сеяць на нівы свая”*. Хрысціянскі светапогляд беларусаў рэпрэзентуе таксама і такі моўны матэрыял, як *“і не было яснасці ў душы ягонай”; “рачоны Хрыстос у Гародню зайшоў”; “ныня і мы разам з вамі”; “паўсюль пытаў ён аб жанчыне, якую шукаў, і нідзе ані слова не пачуў пра яе, і ў адчаі ўсё больш злаваўся на подласць роду людскога”* і інш. Нярэдкаснай моўнай з’явай, як заўважалася вышэй, з’яўляецца ўжыванне нацыянальна афарбаванай устарэлай лексікі: *ратман* ‘назва пасады ў органах мясцовага самакіравання’, *каноны* ‘царкоўныя правілы’, *карбач* ‘бізун, плётка’, *корд* ‘абарончая зброя’ і інш.

Свет нацыянальнага ў творах дапамагаюць перадаць – назвы побытавых рэалій, прылад і прадметаў гаспадарчай дзейнасці: *адрына* ‘халодная будыніна для захоўвання кармоў, сельскагаспадарчых прылад працы; пуня’, *вятрак* ‘ветраны млын’, *кілім* ‘шарсцяны бязворсавы саматканы дыван’, *лузанцы* ‘арэхі, якія самі вылушчыліся’, *свіран* ‘халодны будынак, прызначаны для захоўвання збожжа, мукі, а таксама розных гаспадарчых рэчаў’, *кадаўбец* ‘драўляная пасудзіна, выдзеўбаная з тоўстай калоды’, *капá* сена ці снапы, складзеныя конусам’, *мэндлік* ‘пяць снапоў аўса ці ячменю,

пастаўленыя кучкай каласамі ўгору для прасушвання і накрытыя распасцёртым снапом зверху';

– назвы адзення, абутку і галаўных убораў: *кашуля* 'мужчынскае адзенне з лёгкай тканіны на верхнюю частку цела', *світка* 'доўгая сялянская вопратка з даматканага сукна', *кажух* 'доўгая верхняя вопратка з выробленых аўчын', *намітка* 'ў мінулыя часы галаўны ўбор замужніх жанчын', *магерка* 'круглая высокая мужчынская шляпа з лямцу, якую насілі раней сяляне', *ходні* 'лапці';

– назвы народна-побытавых свят, абрадаў і звычаяў беларусаў: *Каляды* 'народнае зімовае свята дахрысціянскага паходжання – з 6 студзеня па 21 студзеня', *Куцця* 'ў беларусаў абрадавая страва ў выглядзе кашы з ячных круп', якую гатуюць на памінкі, а таксама на Дзяды, Радаўніцу і іншыя памінальныя дні', *Сёмуха* 'завяршальнае веснавое свята, якое супадае з царкоўным святам – днём Святой Тройцы', *Купалле* 'старажытнае народнае земляробчае свята, звязанае з летнім сонцастаяннем, росквітам прыроды і летняй цеплыні; адзначаецца ў ноч з 6 на 7 ліпеня'; *Русальны тыдзень* 'наступны тыдзень пасля Тройцы', *дзядзькаванне* 'старадаўні звычай на беларускіх землях канца XVI – пачатку XVIII ст. аддаваць дзяцей шляхты ў сялянскія сем'і, каб выхаваць у іх станоўчыя духоўныя і фізічныя якасці простага люду: працаватасць, сілу, непатрабавальнасць да ежы і адзення, любоў да зямлі і вернасць ёй;

– найменні сацыяльных і грамадска-палітычных рэалій і паняццяў: *маршалак* 'прадвадзіцель дваранства', *паншчына* 'ў часы прыгоннага права прымусовая дармавая праца сялян на пана' і інш.

У моўным кантэксце гістарычнай прозы пісьменніка актыўна функцыянуюць фразеалагічныя адзінкі з нацыянальна-культурным кампанентам значэння, у структурным складзе якіх звяртаюць на сябе ўвагу назвы, якімі беларусы спрадвеку карысталіся ў сваёй гаспадарчай дзейнасці і побытавай сферы. Напрыклад, *усякага жыта па лапаце* 'ўсяго патроху': *"Людзі калісь будуць жыць нават даўжэй за мяне, і ім не будзе горка за жыццё: усё ў ім было, усякага жыта па лапаце, усё я зведаў..."* [Дзікае паляванне караля Стаха]; *як на карове сядло* 'нязграбна, дрэнна, не аблягаючы цела': *"І тут пад'ехаў на паршывым сваім варанку гэты хам у магнацкай вопратцы, якая сядзела на ім як на карове шытае сядло"* [Хрыстос прызямліўся ў Гародні]; *атрымаць гарбуза* 'атрымаць адмову ў якасці адказу', *кулагу варыць* 'цягнуць час, марудзіць' і інш. (пра іх размова пойдзе далей).

Як сведчыць даследаваны моўны матэрыял, можна выдзеліць цэлую групу фразеалагічных адзінак стараславянскага паходжання, якія семантызуюць асаблівасці хрысціянскага светапогляду беларусаў. Некаторыя з іх нават захавалі архаічныя формы, якія выразна падкрэсліваюць іх этымалогію. Напрыклад, *кесарава кесараві, а божае богаві* (*кесарева кесареви, а Бжіа Бгови)* (Матф., 22, 15–21) 'кожнаму належнае тое, што

заслужыў’ [50, с. 9]. Прывядзём прыклад ужывання гэтага ўстойлівага выразу ў мове аповесці “Чазенія”: *“І ці не быў ён шчаслівейшы, каб аддаў кесарава кесараві, а божае богаві”* [Чазенія]. Цікавы выпадак адзначаны таксама пры выкарыстанні пісьменнікам стараславянскага па паходжанні фразеалагізма *глас вопиющего в пустыне* (Исаия, 40, 3; Марк, 1, 3; Матф., 3, 3; Иоанн, 1, 23) [50, с. 9], што азначае ‘марны заклік да чаго-небудзь, які застаецца без увагі ці без адказу’. Паколькі ў сучаснай беларускай мове гэтая фразеалагічная адзінка з’яўляецца малаўжывальнай, У. Караткевіч перадае яе змест апісальна: *“Ён ведаў, усё гэта будзе голасам, які лямантуе ў пустыні, і як раней, будзе штамп і бюракратызм, і мярцвячына, і зноў забароняць выезд за мяжу…”* [Каласы пад сярпом тваім]. У караткевічаўскай мастацкай прозе фразеалагізмы, якія паходзяць са стараславянскай мовы, садзейнічаюць індывідуалізацыі вобразаў, удзельнічаюць у стварэнні моўнай характарыстыкі герояў. Варта адзначыць, што ўжыванне ўстойлівых выразаў біблейскага паходжання, як правіла, было характэрна ў тыя часы для “найбольш адукаванага” асяроддзя – шляхты, студэнцтва і інш.

Вельмі шырока прадстаўлены ў мове аўтара народныя афарызмы, нацыянальна-культурны змест якіх ствараецца іх асобнымі структурнымі кампанентамі. Напрыклад: *паміраць збірайся, а жыта сей.* У мастацкую тканіну твораў празаікам уключаны і такія народныя выслоўі з лінгвакраіназнаўчым кампанентам значэння, што зараз ужываюцца рэдка або не ўжываюцца зусім. Напрыклад: *“Ад Копшы яшчэ ніхто не ўцёк, ні каралева, ні святая дзева”* [Каласы пад сярпом тваім]; *“Васька Вашчыла па тваёй хаце не хадзіў”* [Каласы пад сярпом тваім] і інш. Іх нацыянальна-культурная адметнасць выяўляецца дзякуючы асобным структурным кампанентам – імёнам гістарычных дзеячаў, вядомых людзей таго часу, апелятыўным назвам людзей паводле сацыяльнай прыналежнасці *(Копша, Васька Вашчыла, каралева).* Ужываюцца таксама і творча абноўленыя ці створаныя самім аўтарам фразеалагічныя і парэміялагічныя адзінкі. Напрыклад: *рукі лізаць* [Чорны замак Альшанскі]; *у атрадзе з трох – адзін здраднік* [Каласы пад сярпом тваім]; *злы чалавек не бывае мужным* [Каласы пад сярпом тваім]; *асёл на чатырох нагах дый той спатыкаецца* [Чорны замак Альшанскі]; *мець на плячах хаця нейкае падабенства галавы* [Чорны замак Альшанскі].

Галоўная роля народных афарызмаў у творах У. Караткевіча – даць характарыстыку настрою, духоўнаму абліччу дзейных асоб, іх поглядаў на навакольны свет ці пэўныя падзеі. Так, стары Кагут на пытанне млынара, у якога хаваецца Корчак, ці бачыў ён што, адказвае: *“Не… не данясу”*. А сам робіць вывад, які аўтар падае ў форме прыказак з выразным нацыянальна-культурным кампанентам значэння: *еш боршч з грыбамі, а язык трымай за зубамі; хто моўча, у таго дума не воўча* [Каласы пад сярпом тваім]. У гэтай сцэне той жа млынар Паківач, хаця і хавае Корчака, упікае апошняга, што не своечасова пачалі бунт, што *“воўк не нападае ў Янаву ноч”* [Каласы

пад сярпом тваім] (дзе *Янава ноч* абазначае ноч на свята Купалле), што ў паўстанцаў няма аніякай арганізацыі, а таму не *“з іхнімі зубамі арэхі есці”* [Каласы пад сярпом тваім]. На што Корчак адказвае таксама народнай мудрасцю ў выглядзе афарыстычнага выслоўя: *“Адных шчанюкоў нам з імі не пладзіць”* [Каласы пад сярпом тваім], што трэба *“з ваўкамі – па-воўчы*” [Каласы пад сярпом тваім].

Трэба адзначыць, што ў моўнай прасторы мастацкіх тэкстаў У. Караткевіча шырока ўжываюцца народныя выслоўі, у складзе якіх выкарыстоўваюцца прастамоўныя словы ці выразы, аўтарскія параўнанні – простыя, натуральныя, часам арыгінальныя і незвычайныя: *“...аж ногі да зямлі прыкіпелі, і неба здалося з літоўскі кажух”* [Хрыстос прызямліўся ў Гародні]; *“Зямля была чорная. Уся ў сетцы трэшчын, у глыбокіх расколінах, сухая, як далонь земляроба і як порах”* [Хрыстос прызямліўся ў Гародні]; *“...юрод, падобны на цюк анучніка, калматы, худы, як віца”* [Хрыстос прызямліўся ў Гародні]; *“Горад гудзеў, як вулей, у які нейкі гарэза кінуў каменьчык”* [Хрыстос прызямліўся ў Гародні].

Сустракаюцца выпадкі, калі пісьменнік дае спасылкі на *“старыя паданні”* [Каласы пад сярпом тваім] або на крыніцу, адкуль узята тое ці іншае трапнае народнае выслоўе, каб надаць, мабыць, большую абгрунтаванасць і дакладнасць выказванню: *“Праўду кажуць, на дурня і бог ласкавы”* [Каласы пад сярпом тваім]; *“Валіся дрэва на дрэва”, – кінуў дзед вечную шкалярскую прыказку”* [Каласы пад сярпом тваім]; *“...а то зусім выйдзе па прыказцы: “Шумі-гудзі, дуброва, едзе князь па дрова”* [Каласы пад сярпом тваім]; *“...ведаеш, бы ў песні: “Як ён мяне пацалуе – тры дні ў губе цукар чую* [Каласы пад сярпом тваім].

Такім чынам, арыгінальным творам У. Караткевіча ўласціва вялікая колькасць разнастайных моўна-выяўленчых сродкаў з нацыянальна-культурнай афарбоўкай і выразным лінгвакраіназнаўчым зместам.

2.3 Лінгвакраіназнаўчая адметнасць перакладаў твораў Уладзіміра Караткевіча на рускую мову

Нагадаем, што рускамоўная мастацкая літаратура Беларусі з’яўляецца той сферай, дзе відавочнымі выступаюць актыўныя працэсы ўзаемадзеяння беларускай і рускай моў. Галоўны вынік такога ўзаемадзеяння – наяўнасць у фанетычных, граматычных, лексіка-семантычных і стылістычных структурах мовы мастацкіх твораў пэўнай сукупнасці беларускіх элементаў. Падставай для ўключэння беларускамоўных адзінак у тэкст твораў на рускай мове звычайна з’яўляецца нацыянальная рэчаіснасць, якую адлюстроўвае аўтар арыгінала.

Як сведчыць тэорыя і практыка перакладчыцкай дзейнасці, лексічная інтэрферэнцыя – натуральная і непазбежная з’ява пры перакладзе мастацкага

твора. Нацыянальна маркіраваныя моўныя адзінкі на старонках перакладу прадстаўлены як словамі, якія не маюць лексічных адпаведнікаў у рускай мове (безэквівалентныя найменні, дыялектная і размоўная лексіка), так і словамі, якія маюць адпаведныя семантычныя аналагі.

Аб'ектам нашага даследавання ў гэтым раздзеле з'яўляюцца беларускамоўныя элементы з лінгвакраіназнаўчай семантыкай, якія функцыянуюць у перакладах твораў У. Караткевіча на рускую мову. У якасці асноўнай крыніцы выступае пераклад на рускую мову рамана "Каласы пад сярпом тваім", зроблены В. Шчадрыной. Фіксуецца таксама моўны матэрыял, узяты з рускамоўных перакладаў раманаў "Чорны замак Альшанскі", "Хрыстос прызямліўся ў Гародні", аповесцей "Дзікае паляванне караля Стаха", "Чазенія" і інш. [гл. спіс скарачэнняў выкарыстаных крыніц].

Паколькі для герояў У. Караткевіча – жыхароў Беларусі – роднай мовай выступае беларуская мова, а ў мастацкіх тэкстах дастаткова часта прысутнічаюць этнаграфічныя і сацыяльна-бытавыя кантэксты, дзякуючы якім адбываецца стварэнне прадметнага свету літаратурнага тэксту, непазбежным у перакладах беларускамоўных твораў на рускую мову з'яўляецца выкарыстанне беларусізмаў, падпарадкаванае вырашэнню пэўных ідэйна-эстэтычных задач. Наяўнасць беларускамоўных элементаў тлумачыцца рознымі прычынамі. Найчасцей у перакладзе гэта адбываецца з мэтай стварэння дадатковай сэнсавай ці эмацыйна-экспрэсіўнай характарыстыкі вобраза або моўнай характарыстыкі персанажа. Ужыванне беларусізмаў можна лічыць апраўданым таксама пры адлюстраванні пэўнага сацыяльнага ці прафесійнага асяроддзя, а таксама для стварэння этнаграфічнага фону і перадачы нацыянальнага каларыту.

Як адзначалася ў папярэднім раздзеле, каб больш дакладна і выразна перадаць аўтарскі "малюнак" жыцця розных слаёў грамадства напярэдадні паўстання 1863 г.: сялянства, памешчыкаў, разначынцаў, царскай адміністрацыі – і апісаць тую гістарычную эпоху, у якую жылі героі твора, У. Караткевіч выкарыстоўвае шматлікія словы з лінгвакраіназнаўчым кампанентам значэння. Вялікая частка намінацый такога тыпу мае семантычныя адпаведнікі ў рускай мове, якія і скарыстоўвае перакладчык. Напрыклад: бел. *свіран* – рус. *амбар*, бел. *кадаўбец* – рус. *бочонок*, бел. *кручок* (*гарэлкі*) – рус. *рюмка*, бел. *кажух* – рус. *полушубок*, бел. *вяндліна* – рус. *ветчина*, бел. *Сёмуха* – рус. *Троица* і інш. Адзначым, што пераклад асобных лінгвакраіназнаўчых адзінак тыпу *байда* 'рыбацкая, крыху большая за човен лодка', *кофар* 'скрынка з векам і замком для захоўвання тканіны, адзежы і каштоўнасцей', *путра* 'кіслая мучная страва тыпу саладухі', пэўна, выклікаў у В. Шчадрыной цяжкасці, бо ў якасці лексічных эквівалентаў ёю падабраны словы з рускай мовы, якія, на нашу думку, не зусім адэкватныя ў семантычным плане: бел. *байда* – рус. *челнок*, бел. *кофар* – рус. *корзина*, бел. *путра* – рус. *квас*. Параўнаем, напрыклад: *"Пад гэты звон ... пакідала горад*

брычка, у якой, заціснутыя між чамаданамі і кофрамі, сядзелі два хлопцы” [Каласы пад сярпом тваім]. – *“Под этот звон ... покидала город бричка, в которой, зажатые чемоданами и корзинами, сидели два хлопца”* [Колосья под серпом твоим]. Відавочна, што ўжыванне назоўніка *корзины* недакладнае і наўрад ці апраўдана ў прыведзеным рускамоўным кантэксце. Аднак выпадкі няўдалага, штучнага ўжывання падобных слоў у перакладзе даволі рэдкія. У цэлым адчуваецца, што перакладчык добра ведае гісторыю, этнічную культуру беларусаў і асаблівасці іх светапогляду. Таму невыпадкова, што ў рускамоўным варыянце “Каласоў...” шырока ўжываюцца лексемы з нацыянальна-культурнай афарбоўкай.

Выразную этнакультурную інфармацыю праз моўную тканіну перакладных твораў У. Караткевіча нясе ў сабе безэквівалентная лексіка. Паколькі безэквівалентныя намінацыі не маюць аднаслоўных адпаведнікаў у рускай мове, для перадачы іх семантыкі перакладчык ужывае розныя спосабы і прыёмы. Даволі частым спосабам перакладу безэквівалентных слоў з’яўляецца словазлучэнне ці апісальны выраз: бел. *кляштар* – рус. *католический монастырь*, бел. *покуць* – рус. *передний угол*, бел. *рубка* – рус. *белая длинная рубашка до икр*. Нярэдка ў рускамоўным тэксце рамана выкарыстоўваюцца безэквівалентныя лексемы-беларусізмы: *крупничок* ‘спирт, сваренный с мёдом, пряностями и кореньями, белорусский хмельной напиток’, *праснак* ‘толстый блин с пресного теста’, *дядькованье* ‘обычай отдавать дворянских детей на воспитание в крестьянские семьи’, *ваўкалака* ‘согласно преданию, человек, способный превращаться в волка’. Прывядзём прыклады ўжывання безэквівалентных лексічных адзінак у рускамоўным кантэксце: *“Это князя Загорского сын, – словно извиняясь, сказал Выбицкий. – В Озерище был в дядькованье”* [Колосья под серпом твоим]; *придомок* ‘прыстаўка да прозвішча’: *“А почему вы добавили к фамилии вашего предка этот придомок «жысь»?”* [Дикая охота короля Стаха]; *нагбом* ‘праз край пасудзіны (піць)’: *“Пей один. Нагбом?”* [Колосья под серпом твоим]; *“«Кто такой?» – спросил Мстислав. – «Ваўкалака», – оскалив зубы, сказал Кондрат”* [Колосья под серпом твоим]. Ужыванне назоўніка *ваўкалака* суправаджаецца тут каментарыем-спасылкай:*“волк-оборотень. Благородный герой-разбойник белорусского фольклора”*.

У тэксце арыгінала для абазначэння тых ці іншых рэалій У. Караткевіч нярэдка ўжывае дыялектызмы тыпу *путра* (гл. вышэй), *кабцікі* ‘высокія саф’янавыя боцікі’, *таптуха* ‘від рыбалоўнай сеткі’, *старык* ‘старое рэчышча’ і інш., для перакладу якіх В. Шчадрына шукае розныя спосабы: знаходзіць семантычна блізкае слова ў рускай мове (*путра – квас*), прыводзіць літаратурны рускамоўны адпаведнік (*старык – старица*), выкарыстоўвае апісальны выраз (*капцікі – сафьяновые сапожки*) ці пакідае дыялектнае слова без змен (*таптуха – топтуха*). Зрэдку ў перакладзе рамана сустракаецца размоўная лексіка, напрыклад: *рыззё* ‘старая порванная одежда’: *“Дети надевают рыззё и идут с ... топтухой”*

[Колосья под серпом твоим]. Ужыванне дыялектнай і размоўнай лексікі ў згаданым прыкладзе невыпадковае: яна спрыяе стварэнню мясцовага каларыту, а таксама дакладнаму паказу сялянскага побыту. Нацыянальна афарбаваныя дыялектызмы, якія ў структуры караткевічаўскага як арыгінальнага, так і перакладнога мастацкага тэксту набываюць статус спецыфічных тэкставых адзінак у сувязі са стратай іх функцыянавання ў літаратурнай мове, можна разглядаць як свайго роду экзатызмы.

Як факт лексічнай інтэрферэнцыі ў перакладзе "Каласоў..." трэба разглядаць шматлікія беларусізмы: *олей, бульба, гайня, плот, хата, хлопец, ланцужок, панщина, вечерять, робить* і інш. Многія беларускамоўныя лексічныя адзінкі забяспечаны ў тэксце адпаведнымі спасылкамі: *дрыкгант* 'особая порода белорусских и польских коней', *починок* 'хата в нетронутом лесу; начало, почин деревни', *корбач* 'короткая толстая плеть', *маршалок* 'предводитель дворянства в Беларуси', *капá* 'средневековое собрание общины в Беларуси', *пряглы* 'вид пирожков или ватрушек', *закалот* 'заговор', *нагбóм*, 'через край большой посудины, ведра'. У працэсе моўнай эвалюцыі частка названых беларусізмаў перайшла ў разрад устарэлай лексікі *(паншчына, пачынак, карбач, маршалак, капá).*

Беларускае нацыянальнае слова напаўняе мастацкую тканіну перакладу неабходнымі асацыяцыямі, дапамагае чытачу зразумець этнакультурныя асаблівасці нашых продкаў, сацыяльна-бытавыя ўмовы іх жыцця ў мінулым. Увядзенне беларусізмаў апраўданае яшчэ і з той прычыны, што яны "не выбіваюцца" з рускамоўнага тэксту, а арганічна ўпісваюцца ў яго, захоўваюць эстэтычную каштоўнасць арыгінала, надаюць выказванням аўтара свежасць і непаўторнасць, з'яўляюцца сродкам індывідуалізацыі моўных паводзін персанажаў. Напрыклад: *"Венчанье <u>под плотóм</u>, а свадьба потом"* [Колосья под серпом твоим]; *"Что, дети, лили ли вы <u>олей в бульбу</u> или не лили?"* [Колосья под серпом твоим] і інш.

Непаўторнасць, самабытнасць і эмацыйнасць раману "Каласы пад сярпом тваім" ствараюцца дзякуючы выкарыстанню аўтарам фразеалагізмаў, якія перакладзены В. Шчадрыной на рускую мову рознымі спосабамі. Часцей гэта арыентацыя на семантычна тоесныя ўстойлівыя выразы дзвюх моў ці захаванне асаблівасцей беларускага варыянта: бел. *за вушамі трашчала* – рус. *за ушами трещало*; бел. *парсюкоў хрысціць* – рус. *поросят крестить*. Радзей сустракаюцца суадносныя ўстойлівыя выразы, якія ў беларускай і рускай мовах адрозніваюцца асобнымі кампанентамі: бел. *пускаць пал* – рус. *пускать красного петуха* або суадносяцца па значэнні, але цалкам адрозніваюцца па сваім лексічным складзе: бел. *ледзь ліпець* – рус. *сводить концы с концами*. Пераважная большасць фразеалагічных адзінак ужываецца ў дыялогу і служыць сродкам характарыстыкі персанажаў. Напрыклад: *"Я з табою што, <u>парсюкоў хрысціў</u>, што ты ў размову дарослых лезеш?"*

[Каласы пад сярпом тваім]. – *“Я с тобою поросят крестил, што ты в разговор взрослых лезешь?”* [Колосья под серпом твоим].

І канешне ж, спецыфічны этнакультурны каларыт у перакладным тэксце стварае ўжыванне фразеалагізмаў, паходжанне якіх звязана з народнымі традыцыямі і абрадамі беларусаў. Напрыклад, *атрымаць гарбуза* ‘атрымаць адмову ў якасці адказу’: *“Ты ж ведаеш, што ён да яе сватаўся і атрымаў гарбуза”* [Дзікае паляванне караля Стаха]. – *“Ты же знаешь, что он сватался к Надейке и получил гарбуза”* [Дикая охота короля Стаха]. Неабходна адзначыць, што ў некаторых паўднёвых рэгіёнах Беларусі здаўна існаваў звычай даваць маладому або яго свату гарбуз як знак нязгоды дзяўчыны браць шлюб. З цягам часу ў выніку пераасэнсавання свабоднага словазлучэння ўзнік фразеалагізм *атрымаць гарбуз (гарбуза).* Як бачым, перакладчык “Дзікага палявання караля Стаха” захоўвае беларускамоўны фразеалагізм, бо, відаць, у сувязі з адсутнасцю такога звычаю ў насельніцтва рускіх зямель В. Шчадрына была пазбаўлена магчымасці адшукаць рускамоўны фразеалагічны адпаведнік. Арыгінальны ўстойлівы выраз з адметнай нацыянальна-культурнай семантыкай, у якім сімвалам адмовы выступае назоўнік *гарбуз* як назва гародніны (спелы гарбуз часта бывае полым унутры), утрымлівае ўяўленне пра рэаліі традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў, у прыватнасці, пра элементы акцыянальнага і прадметнага кодаў вясельнай абраднасці.

Дастаткова цікавым і пазнавальным, на наш погляд, з’яўляецца выкарыстанне фразеалагізма *кулагу варыць* ‘цягнуць час, марудзіць’: *“Страляйце хутчэй, хопіць вам кулагу варыць”* [Дзікае паляванне караля Стаха]. – *“Быстрей стреляйте, хватит кулагу варить”* [Дикая охота короля Стаха], дзе безэквівалентны назоўнік *кулага*, які абазначае традыцыйную беларускую страву, мае ў рускай мове значэнне ‘каша со ржаной муки с ягодами’. На старонках перакладнога твора ў зносцы падаецца этнаграфічны каментарый да гэтага слова: “Для стравы, якое называецца кулагой, мука павінна была кіснуць мінімум суткі” [Черный замок Ольшанский]. Каб падкрэсліць прыналежнасць Дубатоўка з “Дзікага палявання караля Стаха” да старажытнага беларускага роду (а прыведзеныя ў якасці прыкладу словы належаць менавіта яму) і перадаць яго сакавітую, прыгожую беларускую мову, перакладчык уводзіць беларускамоўны фразеалагізм у перакладны тэкст. Апрача таго, захаванню фразеалагізма ў перакладзе паспрыяла яшчэ, відаць, і тое, што ў рускай мове адсутнічае аднаслоўны лексічны адпаведнік да намінацыі *кулага*.

З захаваннем беларускамоўных графічных і фанетычных асаблівасцей ужываюцца таксама фразеалагізмы *ад брамы ды прама* ‘выбірайся адсюль, ідзі прэч’: *“...ну и топай, дорогой, прочь, ад брамы ды прама...”* [Черный замок Ольшанский]; *лахі пад пахі* ‘свае пажыткі з сабой’: *“...то хоть ты возьми лахі пад пахі и приезжай ко мне”* [Черный замок Ольшанский].

З мэтай моўнай характарыстыкі персанажаў у перакладах караткевічаўскіх твораў з беларускай мовы на рускую шырока ўжываюцца шматлікія беларусізмы, якія таксама ствараюць спецыфічны “лінгвакраіназнаўчы фон” у мастацкім тэксце. Рускамоўны чытач, знаёмячыся са зместам твора, мае магчымасць прычыніцца да самабытнай мовы беларускага народа, яго гаваркога, трапнага народнага слова. Нярэдка ў ролі беларусізмаў выступаюць службовыя словы, займеннікі і прыслоўі, часціцы. Напрыклад: *вельми добре* (рус. *очень хорошо*): *“Он, в случае чего, подаст нам сигнал. Вельми добре свистит”* [Дикая охота короля Стаха]; *унь* (рус. *вон*), *туды* (рус. *туда*): *“Два всадника пробегали верхом…, – сказал Стафан, – унечки туды… Ды не, не туды, а унь туды, бачите, где мокрый лес”* [Колосья под серпом твоим]; *гэна* (рус. *это*): *“Гэна… як яно…”, – мямлил Стафан* [Колосья под серпом твоим]; *зараз* (рус. *сейчас*): *“Они, дедуля, зараз!” – крикнула Яня”* [Колосья под серпом твоим]; *нема* (рус. *нет*): *“Видно, и сам бог понимает, что тут что-то не так и справедливости тут нема…”* [Колосья под серпом твоим]; *нехай* (рус. *пусть*): *“Сжечь Кроеровы скирды... Нехай знает”* [Колосья под серпом твоим]; *треба* (рус. *необходимо, нужно*): *“Все они живут в ожидании, и, скажу вам, большинству так и треба”* [Дикая охота короля Стаха]; *хиба* (рус. *разве*): *“Хиба только палить?”* [Колосья под серпом твоим]; *откуль* (рус. *откуда*): *“А откуль мне знать? Хиба он дите, пане, чтоб говорить, куда идет”* [Дикая охота короля Стаха].

Разглядаючы дзеяслоўныя беларусізмы ў моўным кантэксце перакладных твораў У. Караткевіча на рускую мову, найперш трэба мець на ўвазе не іх камунікатыўную функцыю, а функцыю вобразна-эстэтычнага ўздзеяння на чытача, асабліва калі дзеяслоў уваходзіць у склад размоўнай лексікі. Напрыклад: *“Хорошо, что хоть не минет нашу хату та невестка”* [Колосья под серпом твоим];*“Михал Ильяш меня кличут”* [Христос приземлился в Гродно]; *“Не всей же хатой три дня панщину отроблять”* [Колосья под серпом твоим]; *“Пане, пане. Ручки-ножки пацалую, не нада…”* [Дикая охота короля Стаха]; *“Дак что же зробишь?”* [Колосья под серпом твоим] і інш.

Заўважым, што беларускамоўныя дзеясловы, назоўнікавая і займеннікавая лексіка, службовыя словы і іншыя часціны мовы захоўваюцца менавіта ў мове персанажаў. Тым самым перакладчык падкрэслівае сацыяльны стан дзейных асоб твора. Звычайна гэта сяляне, людзі непісьменныя ці малаадукаваныя. Напрыклад: [Селянін]: *“Да какой он христианин?! Падла он! Как же… Сгон даром робили”* [Колосья под серпом твоим]; [Жанчына-жабрачка]: *“Может у пана есть хоть трошки хлеба?.. Не знаю его фамилии, а вёска тут, за лесом. Добрая вёска. У нас и гроши были, пять рублей. Но согнали”* [Дикая охота короля Стаха]; [Селянін Рыгор]: *“Это не привиды. Они слишком хорошо знают потайные стежки через Волотову прорву”* [Дикая охота короля Стаха];*“С верхушки дуба вдруг*

послышался голос Левона: «Човен с этими двумя» [Колосья под серпом твоим]. Гэты прыём шырока выкарыстоўваецца перакладчыкам у рамане "Каласы пад сярпом тваім" і аповесці "Дзікае паляванне караля Стаха". Жыхары беларускіх вёсак з'яўляюцца асноўнымі персанажамі твораў, а таму адлюстраванне нацыянальных асаблівасцей іх мовы ў перакладзе на рускую мову абгрунтаванае і мае мастацкую мэтазгоднасць.

Даволі пашыраным спосабам раскрыцця семантыкі беларускамоўных элементаў у перакладзе з'яўляецца іх тлумачэнне на старонках твора (у самім тэксце ці пры дапамозе зноскі) сродкамі рускай мовы. Напрыклад: *"Кутняя, угловая – она и есть угловая, в углу крайняя"* [Черный замок Ольшанский]; *"Ни одной птицы-посметюхи не встретилось нам на дороге…"* [Дикая охота короля Стаха], дзе бел. *пасмяцюха* – рус. хохлатый жаворонок; *"Там житье попам и долокопам"* [Колосья под серпом твоим], дзе бел. *долокоп* абазначае рус. *могильщик*; *"А-а, горлачи-горлачи-горлачи! Звенят, как колокола, звенят, как войтова голова!"* [Колосья под серпом твоим], дзе ўжытаму беларускамоўнаму слову *горлачи* ў рускай мове адпавядае назоўнік *крынки.* Лексічная адзінка *поплечник* (рус. *соратник*), выкарыстаная ў перакладзе аповесці "Чорны замак Альшанскі", утворана ад беларускамоўнага прыслоўя *поплеч: "Да и разве поплечники? Поплечник – это плечом к плечу. Поплеч – рядом"* [Черный замок Ольшанский]. Як бачна, семантызацыя гэтага беларусізма даецца непасрэдна ў мове тэксту шляхам тлумачэння ўнутранай формы слова.

Лінгвакраіназнаўчая спецыфіка рускамоўных перакладаў твораў У. Караткевіча ствараецца выкарыстаннем не толькі ў мове персанажаў, але і ў аўтарскай мове назоўнікаў-беларусізмаў, якія паводле свайго значэння належаць да розных лексіка-семантычных груп. Напрыклад: бел. *гайня* – рус. *стая собак: "Бежит гайня – побегу и я"* [Колосья под серпом твоим]; бел. *мроя* – рус. *грезы*: *«Мроя», – говорит кто-то"* [Колосья под серпом твоим]; бел. *морд* – рус. *убийство: "Морд! Морд! Морд!" – надтреснуто кричали в деревнях колокола"* [Колосья под серпом твоим]; бел. *пярун* – рус. *удар грома: "Пальчиком шевельнет – перуны смалят, кулачок сожмет – громницы бьют"* [Колосья под серпом твоим]; бел. *рапуха* – рус. *жаба: "Слушай ты рапуху эту, мало ли что она верещит"* [Черный замок Ольшанский]; бел. *сивец* (расліна) – рус. *белоус: "…Я видел, что на нем кое-где растет сивец"* [Дикая охота короля Стаха]; бел. *спарыши* – рус. *два горшка, соединенные ручкой: "Был там старый чайник-самовар…, разные кувшинчики, очень старые спарыши…"* [Черный замок Ольшанский]; бел. *шалянец* – рус. *настой "кошачьих лапок": "Глотни шалянца, мужик, – сурово сказала женщина"* [Колосья под серпом твоим] і інш.

Сярод лексічных беларусізмаў трэба вылучыць словы, якія ўваходзяць у склад лексічнай сістэмы рускай мовы з пэўнымі стылістычнымі паметамі: абласное, размоўнае, прастамоўнае. У беларускай мове яны адносяцца да стылістычна-нейтральнай лексікі, а ў рускай –

да стылістычна абмежаванай. Да разраду дыялектных найменняў у рускай мове належаць такія ўжытыя перакладчыкам словы, як *батька: "...Я вспомнил, что уже три дня не могу дописать батьке письмо"* [Черный замок Ольшанский]; *хлопец: "Нет у нас тишины, хлопцы", – сказал Клеоник"* [Христос приземлился в Гродно]; *шлях: "Шлях камнем вымостили ироды эти"* [Колосья под серпом твоим]; *"...Собирай все силы и выводи на то место, где сливаются Лидский и Виленский шляхи"* [Христос приземлился в Гродно]; *татка: "Не кусай усы, мой татка..."* [Колосья под серпом твоим].

У склад рускамоўнай размоўнай лексікі ўваходзяць словы тыпу *сховать: "И бумагу сховал. Чтоб от тебя твои дети так хлеб на старости ховали, как ты от меня ту бумагу"* [Дикая охота короля Стаха]; *чуть: «Чуете?» – спросила вдруг женщина"* [Колосья под серпом твоим]; *хата: "Позади нее стояли замшелые замки, курные хаты и древние белые звонницы"* [Колосья под серпом твоим]; *"Или даже и не это, а просто сосновые иголки в чайнике, дымные, черные хаты..."* [Дикая охота короля Стаха]; *хвороба*: *"И он ничего не мог поделать, потому, видать, что хвороба была новая"* [Колосья под серпом твоим]. Такія словы ў перакладным творы фарміруюць па-свойму спецыфічную атмасферу беларускай "сялянскасці". Іх функцыянаванне не стварае перашкод для разумення твора іншамоўным чытачом – носьбітам іншай культуры, што можна растлумачыць даволі шырокім функцыянаваннем той ці іншай лексічнай адзінкі ў вуснай мове прадстаўнікоў рускай этнакультуры.

Перакладаючы тыя ці іншыя фальклорныя элементы, напрыклад, песні, якія з'яўляюцца арганічным элементам мастацкага тэксту арыгінала, перакладчык імкнецца не толькі данесці да іншамоўнага чытача змест твора, але і па магчымасці захаваць яго нацыянальна-культурную адметнасць, у чым дапамагае ўжыванне тых ці іншых беларусізмаў:

Были у мати три сына на роду,
Приказали да всем трем на войну.
Ой да старшему не хочется,
Молодшему не приходится.
Ну, а средний меч берет, собирается,
С батькой, с матерью прощается.
– Не кусай усы, мой татка, при мне,
Не плачь, моя родная матка, при мне,
Не плачь, не плачь, моя матушка, при мне.
Наплачешься, моя мамка, без мяне,
Наголосишься, наплачешься,
С сиротами накугачишься [Колосья под серпом твоим].

Нацыянальна-культурны змест перакладных твораў У. Караткевіча падкрэсліваюць лінгвакраіназнаўчыя адзінкі, якія выяўляюць асаблівасці прыроднага асяроддзя нашай Радзімы і спецыфіку беларускай

традыцыйнай культуры. Напрыклад, назоўнікі *криничка, вёска, стежка, стреха, бульба, певни*, прыметнікі *селянские (хаты), жнивные (песні)* пакінуты ў мове рускамоўных тэкстаў, паколькі яны проста неабходныя перакладчыку, каб па-мастацку дасканала і этнаграфічна праўдзіва апісаць паўсядзённае жыццё і народны побыт беларускага селяніна. Напрыклад: *"А дети тем временем нашли в самой глубине оврага… криничку"* [Колосья под серпом твоим]: *"А вёска тут, за лесом"* [Дикая охота короля Стаха]; *"Мстислав заставил Алеся отступить от стежки, а сам сделал шаг вперед"* [Колосья под серпом твоим]; *"Потом, уже в пути, я догадался, какого Будимира они на чью-то стреху пускать хотели"* [Колосья под серпом твоим]; *"«Вот и печку, в которой прошлым летом бульбу пекли, разрушил Днепр», – пряча глаза, сказал Алесь"* [Колосья под серпом твоим]; *"Не запели еще и певни…"* [Колосья под серпом твоим]; *"И на этом коне я поеду к починкам и хатам селянским"* [Колосья под серпом твоим]; *"…Протяжные жнивные песни слышны над полями"* [Дикая охота короля Стаха].

Беларусізмы з лінгвакраіназнаўчым зместам, якія маюць народныя вытокі, у рускамоўным перакладзе могуць выступаюць у якасці сродку ўзмацнення выразнасці і экспрэсіўнасці мовы персанажаў. Напрыклад, формулы моўнага этыкету тыпу *будьте ласковы: "И уже совсем по-хозяйски мальчик добавил: Будьте ласковы, отдайте это коню"* [Колосья под серпом твоим]; *бывай: "Бывай, князь, – басом говорит Иван* [Колосья под серпом твоим]; сродкі мастацкай выразнасці: *боженькин ленок* (бел. *божанькаў лянок* 'залішне лагодны чалавек'): *"Боженькин ленок, – сказала Майка, – свил с ланцужком ланцужок"* [Колосья под серпом твоим]; *крама: "Но я не мог допустить, чтобы в храме, как в краме"* [Черный замок Ольшанский] і інш.

У мове перакладаў твораў У. Караткевіча на рускую мову сустракаецца выкарыстанне зваротка, выражанага формай былога клічнага склону назоўніка, што і сёння з'яўляецца адметнасцю размоўнага стылю беларускай мовы, а таксама асобных гаворак паўднёва-заходняга дыялекту Беларусі. Напрыклад, *батько: "«Эй, батько, поешь больно сладко!» – крикнул дударь"* [Христос приземлился в Гродно]; *брате: "«Спасибо, брате», – сказал Северин…"* [Чозения]; *княже: "Княже, – сказал он, – этого мы вам никогда не забудем…"* [Колосья под серпом твоим]; *панове: "Панове, – говорил Дуботовк, – прогуляйтесь немного…"* [Дикая охота короля Стаха]; *сыне: "Это усыпальница Загорских, сыне"* [Колосья под серпом твоим]; *хлопче: "За эту ошибку, хлопче, – мрачно сказал второй, – с нас Ликол голову снимет"* [Дикая охота короля Стаха].

Устарэлая лексіка. Гістарычная тэматыка твораў У. Караткевіча абумовіла шырокае функцыянаванне ў іх моўнай тканіне ўстарэлай лексікі, выкарыстанне якой выклікана найперш неабходнасцю паказу тых ці іншых сацыяльна-гістарычных рэалій ці падзей, а таксама для стварэння

і перадачы гістарычнага каларыту. Прыкладам такіх лексічных адзінак з'яўляюцца, як вядома архаізмы і гістарызмы, якія далучаюць чытачоў да гістарычнай рэчаіснасці, тым самым даючы ім магчымасць адчуць дыстанцыю ў часе. Устарэлая лексіка такога тыпу, якая ўжываецца для апісання пэўнага часу ці гістарычнай эпохі, нават калі ў ёй прысутнічае фармальная адпаведнасць у выглядзе асобнай лексічнай адзінкі, часта стварае цяжкасці пры перадачы на іншую мову нават пры ўмове супадзенняў у стылістычнай і экспрэсіўнай афарбоўцы ці спосабе выкарыстання.

Спынімся на характарыстыцы ўстарэлых лексічных адзінак лінгвакраіназнаўчага тыпу ў перакладах твораў пісьменніка на рускую мову. Зафіксаваныя на старонках рускамоўных караткевічаўскіх тэкстаў устарэлыя назвы можна раскласіфікаваць у межах наступных лексіка-семантычных груп:

1) грамадска-палітычная і сацыяльна-эканамічная лексіка;
2) ваенная лексіка;
3) побытавая лексіка.

У першай групе звяртаюць на сябе ўвагу назвы асоб паводле выканаўчых службовых функцый. У іх ліку найменні асоб, якія служылі непасрэдна пры двары князя або пана. Напрыклад: *дворня* 'прыслуга пры панскім двары: *"Алесь слыхал и про нее, дворня рассказывала"* [Колосья под серпом твоим]; *псарец* 'псяр, наглядчык за паляўнічымі сабакамі і ўдзельнік у паляванні': *"И пусть нас оттуда достанет... псарец"* [Черный замок Ольшанский]; *гайдук* 'лакей часы прыгону': *"А потом пели, как молодой Вовколака пошел отбивать у гайдуков отцовских волов"* [Колосья под серпом твоим].

Дастаткова пашыранымі выступаюць найменні асоб па прафесіі ці родзе заняткаў, якія ў мінулыя часы займаліся рознымі промысламі. Сярод іх такія назоўнікі, як *бортник* 'чалавек, які займаўся пчалярствам, здабычай мёду дзікіх пчол', *смолокур* 'спецыяліст па смолакурэнні': *"Тряс лесников, искал и избивал бортников и лесных смолокуров"* [Колосья под серпом твоим]; *кожемяк* 'гарбар', *гребенщик* 'майстар па вырабе грэбняў': *"Тьфу! Ты иди глянь, как в Могилеве лупаловские кожемяки живут! Как гребенщики в Подуспенье!"* [Колосья под серпом твоим].

У ліку назваў асоб паводле выканання службовых абавязкаў ці адносін да рэлігіі ўжываюцца такія нацыянальна-маркіраваныя ўстарэлыя словы, як *войт* 'асоба, якая ўзначальвае мясцовае кіраванне': *"Он войт города?"* [Христос приземлился в Гродно]; *подсудок* 'намеснік, потым памочнік суддзі земскага': *"Обойдемся... без судьи и подсудка..."* [Черный замок Ольшанский]; *копный судья* 'суддзя на сходзе сялян, які разглядаў судовыя справы і зямельныя спрэчкі паміж імі': *"Имеется свидетельство копного судьи Станкевича, что погоня княжеская была…"* [Черный замок Ольшанский]; *радцы* 'выбарныя члены ад багатых

гарадскіх вярхоў у раду’: *“«Ну вот, паны радцы», – обращается он к воинам”* [Черный замок Ольшанский]; *купник* ‘удзельнік копнага суда’: *“А свидетели Язеп Гороцук, купник, да Протас Леванович”* [Черный замок Ольшанский]; *будочник* ‘гараднічы, які сачыў за парадкам на вуліцы, знаходзячыся ў спецыяльным памяшканні – будцы’: *“…был похож на будочника, а будочники – на разбойников”* [Колосья под серпом твоим]; *мытник* ‘зборшчык падаткаў, пошлін’: *“Почему не мой Микола? Не грамота Жигимонта мытникам – там, ведь один ковчег чего стоит!”* [Черный замок Ольшанский]; *ларник* ‘кіраўнік архіва’: *“Это был Марьян Пташинский, один из немногих моих друзей, «ларник ученый», один из лучших в стране знатоков архивного дела…”* [Черный замок Ольшанский]; *текач* ‘ганец, вястун, скараход’: *“Так что мне, текачов к самому Жигимонту Третьему посылать?”* [Черный замок Ольшанский]; *скарбник* ‘захавальнік дзяржаўнага скарбу, кіраўнік казначэйства’: *“«Гонец к скарбнику Марьяну», – сказал я”* [Черный замок Ольшанский]; *проуст* ‘свяшчэннік, часцей за ўсё каталіцкі’: *“И проусты над ним месяцами петь будут…”* [Черный замок Ольшанский].

Апрача праілюстраваных устарэлых назваў асоб, у мове мастацкага дыскурсу даследаваных перакладных твораў функцыянуюць таксама іншыя лексічныя адзінкі, якія характарызуюць персанажаў у сацыяльных адносінах. Так, класавую структуру грамадства Беларусі розных часоў семантызуюць намінацыі *князь, купец, шляхтиц, дворянин, мужик, пан*, з якіх тры апошнія паводле актыўнасці свайго ўжывання найбольш частотныя. Пэўную ступень “нацыянальнай прымацаванасці” дэманструюць прыклады грамадска-палітычнай лексікі: *судба* ‘суд, правасуддзе’, *баниция* ‘выгнанне’, *пакон* ‘закон’, *истинствовать* ‘гаварыць праўду’ і інш.

Назвы тэрытарыяльна-адміністрацыйных адзінак адносна нешматлікія: *местечко* ‘пасёлак гарадскога тыпу’, *застенок* ‘невялікае сельскае паселішча дробнай шляхты на землях Заходняй Беларусі ў мінулыя часы’, *повет* ‘адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, якая ўваходзіла ў губерню’ і інш. Выкарыстанне перакладчыкам гэтых найменняў дазваляе надаць творам канкрэтнасць, зрабіць апавяданне больш пераканаўчым і рэалістычным з гістарычнага боку.

Некаторыя зафіксаваныя ў тэкстах перакладаў найменні можна аб’яднаць, па словах У. Махоня, у “нацыянальную серыю” [83, с. 16]. У “беларускую нацыянальную серыю” навукоўцам аб’яднаны не толькі словы, што адсутнічаюць у рускай мове, але і якія ўваходзяць у яе лексічны склад і зафіксаваныя лексікаграфічнымі даведнікамі рускай мовы. Так, напрыклад, лексічныя адзінкі *пан, паненка, пани, паныч, местечко* семантычна, фанетычна і граматычна даўно ўжо асвоеныя рускай мовай, але ў тлумачальных слоўніках рускай мовы адзначаецца, што яны маюць адносіны да пэўнага народа. Напрыклад, *местечко, пан* – рэаліі беларускага (а таксама ўкраінскага і польскага) жыцця ў адносінах

да рускага народа і яго мовы, таму выкарыстанне іх у перакладных тэкстах функцыянальна значымае [83, с. 16].

Наяўнасць у рускамоўных тэкстах сацыяльна-эканамічнай лексікі, якая рэпрэзентуе становішча беларускага насельніцтва, – неабходны элемент падачы матэрыялу сацыяльна-гістарычнага характару. Напрыклад: *однодворцы* ‘падатковая катэгорыя сялян’: *“А через десять лет, после восстания, начали всех гнать в однодворцы”* [Колосья под серпом твоим]; *купа* ‘доўг’: *“А почему ты к кому-нибудь из панов не пойдешь да купу не возьмешь?”* [Христос приземлился в Гродно]; *вольная* ‘дакумент, які даваўся адпушчанаму на волю прыгоннаму яго гаспадаром’: *“Получишь с женою вольную”* [Колосья под серпом твоим]; *клейноты* ‘матэрыяльныя каштоўнасці, якія перадаваліся ў спадчыну’: *“Вам были нужны только родовые клейноты”* [Черный замок Ольшанский] і інш. Устарэлая сацыяльна-эканамічная лексіка, ужытая ў перакладных караткевічаўскіх тэкстах, арганічна ўпісваецца ў змест твораў, дапамагае рэальна ўявіць сацыяльнае становішча беларускага насельніцтва ў пэўны гістарычны перыяд.

Другую лексіка-семантычную групу складае ўстарэлая лексіка, якая семантызуе рэаліі і паняцці, звязаныя з вайсковай справай. У прыватнасці, шырока прадстаўлены назвы розных відаў зброі, якія ў нашых продкаў былі “папулярныя” падчас ваенных сутычак. Гэта тлумачыцца тым, што ў большасці прааналізаваных намі твораў У. Караткевіча адлюстраваны ваенныя дзеянні ці ўзброеныя паўстанні беларускага народа супраць сацыяльнага, нацыянальнага і рэлігійнага прыгнёту. Гэтая акалічнасць дазваляе даволі шырока выкарыстоўваць перакладчыку гістарызмы ваеннай семантыкі для канкрэтнага і рэалістычнага апісання гістарычных падзей мінулых эпох. Напрыклад, *корд* ‘кароткі меч’: *“У одного при бедре длинный меч, у второго, меньшего, корд”* [Черный замок Ольшанский]; *багнет* ‘штык’: *“Пологим частоколом розовели поднятые вверх багнеты”* [Колосья под серпом твоим]; *гизавра* ‘сякіра’: *“В его руках очутилась старая боевая секира – гизавра”* [Колосья под серпом твоим]; *чекан* ‘баявы молат’: *“...Роман вскочил и разбил череп хищника своим боевым чеканом”* [Дикая охота короля Стаха]; *гаковница* ‘ручная агнястрэльная зброя’: *“И те лихие люди не из воинов, но из простых разбойников были, потому что не имели гаковниц, а имели луки со стрелами отравленными”* [Черный замок Ольшанский]; *аркебуз* ‘ручная агнястрэльная зброя, што зараджалася з дула’: *“Рыцари этой дамы носили когда-то меч Мюнцера, цепь Вощилы и аркебуз гезов”* [Колосья под серпом твоим].

У склад трэцяй лексіка-семантычнай групы ўваходзяць устарэлыя побытавыя назвы, якія абазначаюць розныя краіназнаўчыя рэаліі матэрыяльнай культуры беларусаў у даўнія часы. Гэта найменні адзення, абутку і галаўных убораў. Напрыклад: *риза* ‘адзенне, якое надзявае святар пры набажэнстве’: *“Совлеките с них ризы…”* [Черный замок Ольшанский]; *бурка* ‘шырокая доўгая адзежына з даматканага сукна з башлыком’:

“Дядькина бурка, на которую пялили глаза окрестные мальчишки, пахла табаком, как и парадный мундир” [Колосья под серпом твоим]; *андарак* ‘саматканая паласатая або ў клетку спадніца‘: *“...женщины в андараках прядут и поют бесконечную песню”* [Дикая охота короля Стаха]; *чуга* ‘вузкі кафтан’: *“Чуга висела свободно”* [Дикая охота короля Стаха]; *“Сребротканная чуга падает широкими складками”* [Черный замок Ольшанский]; *кабушки* ‘боцікі’*: “Ленты, разноцветные кабушки на ногах…”* [Христос приземлился в Гродно]; *рубок* ‘хустка’: *“На плечах был тонкий рубок из белого табина”* [Дикая охота короля Стаха]; *намитка* ‘жаночы галаўны ўбор з вышытай тканіны’: *“Намитки женщин ... наливались мерцающим багрянцем”* [Колосья под серпом твоим]; *магерка* ‘мужчынскі галаўны ўбор з белага лямцу’: *“Многие сняли магерки”* [Христос приземлился в Гродно] і інш.

Лінгвакраіназнаўчую інфармацыю адносна жыцця і побытавага ўкладу жыцця розных слаёў беларускага насельніцтва змяшчаюць у сабе назвы з іншай семантыкай, якія ўжываюцца для стварэння пэўнага “гісторыка-культурнага фону”. Напрыклад: *балаганы* ‘вандроўныя тэатры’: *“А Алесь сводил его в балаганы, потому что с деньгами у нового знакомого, видимо, было не густо”* [Колосья под серпом твоим]; *майорат* ‘родавы маёнтак’: *“Это майорат Яновских на протяжении трех столетий или даже больше”* [Дикая охота короля Стаха]; *починок* ‘адна ці дзве хаты, пачатак новай вёскі’: *“...расспросил дорогу до ближайшего починка, вышел из дома”* [Дикая охота короля Стаха], а таксама словы *альмарию* ‘скрыня, шафа’, *братины* ‘пасудзіна ў форме гаршка, у якой падавалі напоі’, *вацок* ‘сумка, кашалёк’, *саженые (ткани)* ‘тканіны, вышытыя каштоўнымі камянямі’, *ужи* ‘вяроўкі’, *кантычка* ‘каталіцкі малітоўнік’, *корста* ‘труна’ і інш.

Антрапонімы. Асобную тэматычную групу слоў, якія ствараюць нацыянальна-гістарычны фон у перакладах гістарычных раманаў і аповесцей пісьменніка на рускую мову, складае анамастычная лексіка. Унутры яе самы вялікі ў колькасных адносінах пласт утвараюць антрапонімы, якія, як вядома, з’яўляюцца адным з кампанентаў, што характарызуюць этнакультурную спецыфіку нацыі ў пэўны гістарычны перыяд і з’яўляюцца своеасаблівымі “маркерамі” эпохі; “у іх застыў сам час, некаторыя асаблівасці (гістарычныя, сацыяльныя, геаграфічныя) жыцця народа” [96, с. 138].

Асабовыя імёны, як вядома, уяўляюць сабой вялікую функцыянальна і сацыяльна значымую частку слоўніка любой мовы. Даследаванне творчага майстэрства пісьменніка паказвае, што асабовыя імёны адыгрываюць істотную ролю пры стварэнні мастацка-вобразнай мадэлі твора. У літаратурных імёнах адлюстроўваецца бачанне аўтарам сваіх герояў, іх характараў, дзеянняў і ўчынкаў.

У рускамоўных мастацкіх кантэкстах твораў У. Караткевіча антрапонімы, як правіла, захоўваюць асаблівасці нацыянальнага беларускага іменаслова. Трэба адзначыць, што пры перакладзе асабовае імя, як правіла, запазычваецца, транскрыбіруецца. Пры транскрыпцыі перакладчык звычайна імкнецца да максімальнай фанетычнай блізкасці з такім разлікам, каб імя пры перанясенні ў іншае моўнае асяроддзе зазнала мінімальныя страты.

Звяртаюць на сябе ўвагу варыянты імён, якія маюць выразную этнакультурную адметнасць. У перакладах твораў У. Караткевіча знаходзім дастаткова пашыраныя на Беларусі ў мінулыя часы імёны людзей. Напрыклад: *Альжбета* замест рус. *Елизавета; Арсен* замест рус. *Арсений; Данила* замест рус. *Даниил; Евген* замест *рус. Евгений; Змитер* замест рус. *Дмитрий; Левон* замест *рус. Леонтий; Марка* замест рус. *Марк; Ничипор* замест рус. *Никифор; Пилип* замест *рус. Филипп; Тэкля* замест рус. *Фёкла; Якуб* замест рус. *Яков; Янка* замест рус. *Иван.*

Асобныя імёны ўжываюцца ў размоўна-бытавым варыянце: *Анела* (бел. *Анелія*), *Антось* (рус. і бел. *Антон*), *Базыль* (рус. *Василий* і бел. *Васіль*), *Вацак* (рус. *Вацлав* і бел. *Вацлаў*), *Винцук (рус. Викентий* і бел. *Вікенцій*), *Гринь* (рус. *Григорий* і бел. *Рыгор*), *Ильюк* (рус. *Илья* і бел. *Ілья*), *Матей* (рус. *Матвей* і бел. *Мацвей*), *Марыля* (рус. *Мария* і бел. *Марыя*), *Цыпрук* (рус. *Куприян* і бел. *Купрыян*), *Ярош* (рус. *Ерофей* і бел. *Ерафей*) і інш. Вельмі прадуктыўныя ў моватворчасці пісьменніка формы мужчынскіх асабовых імён з фіналямі *-есь, -ась, -усь, -ось*, якія захоўваюцца ў перакладах і надаюць нацыянальны каларыт мове твораў: *Алесь, Юрась, Кастусь, Антось, Игнась, Михась, Стась.*

Можна меркаваць, што перакладчык пакідае беларускамоўныя антрапонімы свядома, паставіўшы перад сабой канкрэтную задачу – захаваць нацыянальны каларыт твора, перадаць духоўныя набыткі беларусаў, гістарычныя ўмовы іх жыцця, бо менавіта ў творах мастацкай літаратуры “імёны персанажаў адыгрываюць ролю арыенціраў у часе і прасторы цэлага тэксту” [10, с. 41]. Несумненна, што мілагучныя і пявучыя беларускія імёны павышаюць мастацкую вартасць перакладу.

Спынімся на асаблівасцях ужывання ў мове перакладаў на рускую мову некаторых імёнаў. Так, іменаванне галоўнага героя “Каласоў…” – двараніна Алеся Загорскага – не афіцыйным іменем *Аляксандр*, а размоўна-бытавым беларускім варыянтам *Алесь* успрымаецца ў мове арыгінала натуральна. У перакладах рамана на рускую мову побач з афіцыйным іменем *Александр* ужываецца *Алесь*, а таксама памяншальна-ласкальнае *Алесик* і *Алеська*. Між тым імя *Александр* маюць і тыя дзейныя асобы твора, якія не з’яўляюцца беларусамі, – губернатар, паручнік. Персанажы-“небеларусы” звяртаюцца да галоўнага героя Загорскага як да *Александра: “«Что, пан Александр, вы не ожидали встретить меня здесь?» – спросил Мусатов”* [Колосья под серпом твоим]; *“«А вы что же думали, уважаемый Александр*

Георгиевич?» – почти ласково сказал Мусатов” [Колосья под серпом твоим]; *“Вот, Буланцов, – сказал жандарм, – рекомендую, князь Александр Загорский”* [Колосья под серпом твоим]. *Алесем* ці *Алеськой* яго называюць бацькі і сябры: *“От площадки с качелями долетел голос Ядзеньки: “Алеська! Куда это ты исчез? Иди к нам”* [Колосья под серпом твоим]; *“«Добрый день, пан Алесь», – ответил Выбицкий”* [Колосья под серпом твоим]; *“Вот счастье какое, – наивно сказала Янька. – А мы как раз хотели в Милое ехать, чтоб тебя повидать, Алеська”* [Колосья под серпом твоим].

Не ўступае па частотнасці ўжывання ў перакладзе мастацкага тэксту і размоўная форма імені *Юрась*, якой іменаваны некалькі персанажаў ў раманах У. Караткевіча. Для Юрася Братчыка, аднаго з герояў рамана “Хрыстос прызямліўся ў Гародні”, такая форма імені з’яўляецца асноўнай і выключае з кантэксту іншыя формы. Перакладчык пакідае гэтую форму і ў мове аўтара, і ў мове персанажаў: *“И Юрась приказал раскинуть табор под пятью-шестью большими дубами, буквально возле стен*” [Христос приземлился в Гродно]; *“И неожиданно женщина взвилась: “Ю-рась! Христос! Христо-ос!”* [Христос приземлился в Гродно]. Форма *Юрась* ужываецца і пры называнні дзяцей – Юрася Кагута і Юрася, сына Гелены Карыцкай: *“За нею важно, откинувшись назад, словно круглое пузо могло перевесить, двигался голыш «мужеска пола» Юрась Когут”* [Колосья под серпом твоим]; *“Гелена жила в новом доме в Ведричах, ожидала, пока малыши Юрась и Тонька подрастут, и считала необходимым участвовать в каждой пьесе, которую ставил театр в Веже”* [Колосья под серпом твоим]. Вясковыя дзеці клічуць прыяцеля *Василём*, новы знаёмы Севярына Будрыса прадстаўляецца як *Василь Павлов*, а селянін Корчак называе свяшчэнніка *попом Василием*. Пра абшарніка-беларуса аўтар гаворыць як пра *Миколу Браниборского*, пра сышчыка з Пецярбурга – *Николай Буланцов*.

Шырока пададзены ў перакладах размоўныя формы, утвораныя ад імён *Петр (Петрак, Петрок, Петро, Петрусь), Павел (Павелка, Павёлка, Павлюк, Павлючок), Константин (Кастусь, Кастучек), Янина (Яна, Янечка, Янька), Владислав (Владь, Владька, Владак), Иван (Янук, Янучок, Януш), Иосиф (Язэп, Язэф, Юзик), Ядвига (Ядвиська, Ядвинька, Ядвиня, Ядзя, Ядзенька).*

Пры перадачы памяншальна-ласкальных імён выкарыстаны як формы, характэрныя для рускага і беларускага іменаслова *(Наталочка, Наталка, Майка, Маечка, Сашка)*, так і формы, уласцівыя толькі беларускай іменаслоўнай традыцыі *(Андрейка* – рус. *Андрюша; Кондратка* – рус. *Кондратик)*.

Такім чынам, беларускія размоўныя варыянты імён у перакладах твораў У. Караткевіча на рускую мову пададзены вельмі шырока. Побач з афіцыйна-кніжнымі, уласцівымі ў аднолькавай ступені рускай і беларускай мовам, на старонках перакладных мастацкіх твораў выкарыстоўваюцца размоўна-бытавыя і словаўтваральна-экспрэсіўныя формы, характэрныя толькі для самабытнага беларускага іменаслова.

Прозвішчы з'яўляюцца найбольш познім па часе ўзнікнення кампанентам іменавання ўсходніх славян. Беларускія прозвішчы як самастойны клас антрапаніміі склаліся прыкладна ў XVI–XVII стст., але гэты працэс у асяроддзі сялянства працягваўся і пазней, нават у XIX ст. Знатныя дваранскія роды на Русі і ў Вялікім Княстве Літоўскім мелі сталыя родавыя найменні ўжо з XV ст.

Як правіла, кожны антрапонім як самастойная адзінка мовы мае лексічнае значэнне, бо ў яго аснове заўсёды адчуваецца суаднесенасць з тым ці іншым прадметам, з'явай, прыметай. Паходжанне многіх беларускіх прозвішчаў, выкарыстаных У. Караткевічам, даволі празрыстае: у іх лёгка "праглядваюцца" адэкватныя апелятывы – назвы той ці іншай расліны, жывёлы, птушкі або насякомага, якія знаёмяць чытача з асаблівасцямі расліннага і жывёльнага свету Беларусі. У мове рускамоўных тэкстаў такія антрапонімы атрымалі значнае пашырэнне. Напрыклад: *Грибок* (ад *грыб*): *"На четвертом этаже живет вдовец… а напротив него Ростик Грибок"* [Черный замок Ольшанский]; *Шалфейчик* (ад *шалфей*): *"Смотри лучше, как Шалфейчик хорошо висит"* [Христос приземлился в Гродно]; *Каток* (ад *кот*): *"У Яна Катка вырос большой и сияющий павлиний хвост"* [Христос приземлился в Гродно]; *Жаба* (ад *жаба*): *"Жаба перебирал толстыми пальцами радужный шалевый пояс, лежащий у него не на животе, а под грудью"* [Христос приземлился в Гродно]; *Пацук* (ад *пацук*)*: "Гляди, Пацук, это не тот!"* [Дикая охота короля Стаха]; *Щука* (ад *шчука*): *"Если уж так, то я сейчас позвоню Щуке, – ведь мы приятели"* [Черный замок Ольшанский]; *Ворона* (ад *варона*)*: "Итак, гости все поехали, а Роман… со своим старым верным доезжачим Алехно Вороной… поехали на болотную рысь"* [Дикая охота короля Стаха]; *Комар* (ад *камар*): *"Для вас у меня есть фамилия, пан Комар"* [Христос приземлился в Гродно].

Нацыянальна-культурную адметнасць перакладным творам надаюць прозвішчы, утвораныя ад назваў канкрэтных прадметаў хатняга ўжытку і прылад працы. Напрыклад: *Горлач* (ад *гарлач* 'гліняны гладыш з вузкім горлам для малака'): *"Первый не выдержал Василь Горлач"* [Колосья под серпом твоим]; *Лопата* (ад *лапата* 'прылада для капання зямлі'): *"И тогда он вспомнил, что в Озерище живет родственник Цыпрук Лопата"* [Колосья под серпом твоим]; *Конавка* (ад бел. *конаўка* 'невялікая круглая пасудзіна з ручкай для піцця вады ці квасу'): *"Лявон Конавка", – с бахвальством представился человек"* [Христос приземлился в Гродно]; *Кадушкевич* (ад бел. *кадушка* 'невялікая кадзь'): *"Чего честный?! Зачем?! Среди таких людей да честный?! Я не честный, я – мытарь! Мытарь я! Мытарь!.. Даниил Кадушкевич моё прозвище"* [Христос приземлился в Гродно].

Пры ўважлівым "прачытанні" і "расшыфроўцы" антрапонімаў можна даведацца таксама пра сацыяльны стан, знешні і ўнутраны воблік носьбіта прозвішча. Напрыклад: *Босяцкий* (ад *босы*): *"Ну, ты что? – спросил*

Босяцкий. – Может, хоть ты честный человек?" [Христос приземлился в Гродно]; *Болванович* (ад *балван*): *"Не можем же мы лишить нашего и приятной беседы отца Болвановича…"* [Христос приземлился в Гродно]; *Змогитель* (ад *змагацца*): *"А ты не будь в горячей воде купанным, Змогитель…"* [Черный замок Ольшанский]; *Лопотуха* (ад *лапатаць* 'хутка, нязвязна гаварыць'): *"А-а. Людвиг Лопотуха, – сказал грустно Шаблыка. – Помешанный"* [Черный замок Ольшанский].

Даследаваныя нацыянальна афарбаваныя прозвішчы змяшчаюць у сабе шмат інфармацыі пра прафесію ці род заняткаў чалавека. Напрыклад: *Гайдучик* (ад бел. *гайдук* 'выязны лакей памешчыка ў часы прыгону'); *Гончарёнок* (ад бел. *ганчар* 'майстар, які вырабляе з гліны посуд і іншыя рэчы'); *Жернокрут* (ад бел. *жорны;* млынар); *Кухарчик* (ад бел. *кухар* 'работнік, які працуе на кухні'); *Вестун* (ад бел. *вястун* 'чалавек, які прыносіць ці агучвае нейкія весткі, навіны'; *Бискупович* (ад бел. *біскуп* 'святар, архірэй').

Тапонімы. У сучаснай анамастыцы тапонім разглядаецца ў якасці згорнутага нацыянальна-культурнага кантэксту, асноўны змест якога нярэдка знаходзіцца на "прыхаваным" узроўні. Яшчэ вядомы рускі пісьменнік К. Паўстоўскі пісаў, што назвы геаграфічных аб'ектаў у краіне вельмі яскрава гавораць нам пра характар народа, яго гісторыю, схільнасці і асаблівасці побыту.

На беларускай зямлі, бадай, не знойдзеш ніводнай народнай назвы, якая б узнікла выпадкова. Калі ўважліва прыгледзецца, то можна вызначыць, што назва вынікае з нейкіх асаблівасцей прыроднага асяроддзя, умоў вытворчай дзейнасці жыхароў пэўнай тэрыторыі і вельмі часта звязана з гістарычным мінулым народа. Даследчык гісторыі І.П. Філевіч вызначыў геаграфічныя назвы як "мову зямлі", якая "гаворыць нам часта больш, чым творы старажытных і сярэдневяковых аўтараў, больш, чым прыгадвае сваю гісторыю сам народ, блытаючыся, прыхарошваючы і фантазіруючы, больш, чым важкія штудыі мастацкіх даследчыкаў" [122, с. 159]. Тапонімы любой этнічнай тэрыторыі ў сваёй абсалютнай большасці індывідуальныя, непаўторныя і самабытныя. Звернемся да аналізу нацыянальна-культурнай адметнасці тапанімічных адзінак, выяўленых у рускамоўных перакладах твораў У. Караткевіча.

Даволі выразна і поўна мясцовы каларыт на старонках перакладаў ствараюць айконімы (назвы вёсак, мястэчкаў), у якіх увасоблены геаграфічныя і прыродна-кліматычныя своеасаблівасці беларускага краю. Напрыклад, *Суходол* (ад спалучэння *сухі дол*): *"В Суходоле два года тому назад было мужчин две тысячи без двухсот, женщин – полторы тысячи да сотня"* [Колосья под серпом твоим]; *Крутогорье* (ад спалучэння *крутая гара*): *"Данила возглавлял смертный отряд в Крутогорье"* [Колосья под серпом твоим]; *Крутое* (ад прыметніка *круты* 'абрывісты, няроўны'): *"Люди пошли туда и дорогой подняли еще деревню Крутое"*

[Колосья под серпом твоим]. Зазначым, што назва вёскі *Суходол*, на думку аднаго з даследчыкаў беларускай тапаніміі І.Я. Яшкіна, паходзіць ад назвы сенажаці на нізкім, але сухім месцы, ці ад назвы мясцовасці, якая ніколі не заліваецца вадой [123, с. 640]. Тэрыторыя, на якой размяшчаюцца вёскі *Крутогорье* і *Крутое*, маюць няроўны, узгорысты рэльеф.

Вёскі *Милое* і *Миловиды* маглі атрымаць свае назвы ад прывабнага, "мілага для вока" выгляду мясцін гэтых вёсак. Звернемся да тэксту: *"...молельня была закрыта, священник изгнан в Милое, в старую церковь-крепость, самую неуютную и сырую из всех церквей, какие были и его владениях"* [Колосья под серпом твоим]; *"Миловиды, – сказал он. – Это не городок. Это деревня"* [Чозения].

Назва *Озерище* ўтварылася ад назоўніка *возера*. Паколькі жыццё беларусаў яшчэ са старажытных часоў цесна звязана з вадой, г.зн. з воднымі аб'ектамі, якіх на Беларусі вельмі многа, людзі імкнуліся будаваць свае паселішчы непадалёку ад рэк і азёр. Калі апошнія з іх былі вялікімі па памерах, за імі замацоўвалася пэўная назва, якая магла перадавацца і назве паселішча. У многіх жа выпадках найменне проста ўключала ў сябе само слова *возера: "Так, наверно, и уплыли все бревна из Озерища аж в самый Суходол, где полуголодные мещане и щепки не пропускали"* [Колосья под серпом твоим].

У даследаваных перакладах звяртаюць на сябе ўвагу назвы вёсак, у аснову якіх нашымі продкамі пакладзены найменні розных парод дрэў, найбольш распаўсюджанымі з якіх былі лісцевыя пароды, асабліва бяроза, дуб, ліпа, вяз. Напрыклад, *Мокрая Дубрава:"В церкви деревни Мокрая Дубрава, самой близкой к Раубичам и Озерищу, шла всенощная по великой субботе"* [Колосья под серпом твоим]; *Липичи: "Кавалькада из шестисот человек ринулась на Липичи"* [Колосья под серпом твоим]; *Липично, Березовая воля, Дубрава: "Может, теплые огни деревень, названия которых и до сих пор какой-то теплой болью входят в мое сердце: Липично, Сорок Татар, Березовая Воля, урочище Разбитый Рог, Помяречь, Дубрава...?"* [Дикая охота короля Стаха].

Да паселішчаў, назвы якіх семантычна суадносяцца з найменнямі дрэў, можна аднесці таксама айконім *Вязыничи*, паходжанне якога, магчыма, звязана з месцам, дзе раслі густыя зараснікі вязу: *"У хлопцев были в руках топоры на длинных древках, и уже по одному этому можно было узнать – с Вязыничей"* [Колосья под серпом твоим]; назву хутара *Памяречь* (блізкая па гучанні з назвай *Мярэча*, што, на думку даследчыка тапаніміі І.Я. Яшкіна, тлумачыцца як 'нетры, гушчар'; буралом у густым лесе; непралазнае балота і зараснік асакі [123]): *"Знаете хутор Памяречь?"* [Колосья под серпом твоим]. Нярэдка продкі беларусаў адзначалі некалькі істотных ландшафтных прыкмет сваёй мясцовасці і сумяшчалі іх у назве паселішча. Так, у "Дзікім паляванні караля Стаха" продкі Яноўскіх пабудавалі свой маёнтак на балоцістай мясціне, на якой раслі пераважна

елкі. Адсюль і назва мясцовасці – *Болотные Ялины: “Вы в имении Болотные Ялины”* [Дикая охота короля Стаха].

Беларускія лясы спрадвеку славіліся не толькі каштоўнай драўнінай, але і дзікім зверам. Зразумела, што гэтая акалічнасць магла таксама паўплываць на ўтварэнне назваў паселішчаў. Паказальным у гэтых адносінах выступае айконім *Вавёрки* – вёска, назва якой паходзіць ад апелятыва *вавёрка:“Может, теплые огни деревень, названия которых и до сих пор какой-то теплой болью входят в мое сердце: Липично, … Березовая Воля, …Вавёрки?”* [Дикая охота короля Стаха].

Відаць, можна сцвярджаць, што амаль у кожнай назве населенага пункта, зафіксаванага ў рускамоўных перакладах твораў У. Караткевіча, паказаны пэўны бок грамадскага жыцця беларусаў. Сустракаюцца назвы вёсак, паходжанне якіх звязана з хрысціянскай рэлігіяй. Напрыклад, назва вясковага паселішча *Святое: “Вскоре туда же последовали и попы из Вежи, Святого и Витахмо”* [Колосья под серпом твоим]; назвы, у семантыцы якіх рэпрэзентуецца цяжкае сацыяльнае жыццё чалавека ці яго паднявольны стан у мінулыя гістарычныя эпохі. Напрыклад, айконімы з выразнай матывацыяй *Недобылиха: “Знаю, – ответил Павел. – Возле Недобылихи”* [Колосья под серпом твоим]; *Горипятичи: “Идут в Горипятичи бить с тамошней колокольни набат”* [Колосья под серпом твоим] і інш.

У мове перакладаў функцыянуюць айканімічныя найменні, у якіх адлюстраваліся тыя ці іншыя гістарычныя падзеі, у тым ліку мангола-татарскае нашэсце, якое зведала на сабе ў XIII ст. паўднёвая частка Беларусі. Заўважым, што на беларускіх землях татары пасяліліся напрыканцы XIV–XV стст. у выніку ўнутрыпалітычных канфліктаў у Залатой Ардзе. Татары, у сваёй большасці прадстаўнікі шляхетных татарскіх родаў, якія сяліліся ў ВКЛ, прыходзілі з Залатой Арды і Крыма. Прычыны міграцыі былі розныя – запрашэнне на ваенную службу, стан ваеннапалонных, уцёкі ад міжусобіц і інш. Надзвычай выразна гэта праяўляецца ў анамастычных назвах – асабовых імёнах, прозвішчах і асабліва ў тапонімах і мікратапонімах. Са шматлікіх анамастычных лексічных адзінак, якія трапляюцца на геаграфічнай карце Беларусі, вельмі частымі з’яўляюцца тыя, што ўтвораны ад слова *татарын* [59]. Гэта пацвярджаюць назвы *Татарская Гребля: “Так прошло пять лет, пока в Загорщине, Витахмо, Озерище, Татарской Гребле… и других деревнях князя не заревели, разрываясь, пушки”* [Колосья под серпом твоим]; *Сорок Татар: “Может, теплые огни деревень, названия которых и до сих пор какой-то теплой болью входят в мое сердце: Липично, Сорок Татар…?”* [Дикая охота короля Стаха] і інш.

Тапонімы на *-ічы, -ычы* тыпу *Смиловичи, Дреговичи, Ведричи,* ужытыя ў моўным кантэксце перакладу “Каласоў…”, лічацца патранімічнымі, бо яны абазначаюць патомкаў па імені іх продкаў, што жылі ў гэтых паселішчах або былі іх ўладальнікамі. Прыналежнасць вёскі ці мястэчка пэўнаму гаспадару ці нават роду можна заўважыць і ў назве

наступных скарыстаных перакладчыкам айконімаў: *Браниборщина, Маевщина, Загорщина, Кроеровщина.* Безумоўна, іх ужыванне ў кантэксце арыгінальных і перакладных твораў У. Караткевіча невыпадковае. Напрыклад, *Маевщина* (уладальнікам гэтай вёскі быў род Маеўскіх): *"И почему это только у нас да в Маевщине покормники есть?"* [Колосья под серпом твоим]; *Загорщина* (назва ўтворана ад прозвішча князёў Загорскіх): *"Жандармский поручик Мусатов собственной персоной заглянул в Загорщину"* [Колосья под серпом твоим]; *Кроеровщина* (назва ўтворана ад прозвішча пана Кроера): *"А когда это ничего не дало и в окрестностях поутихло, закрылся в Кроеровщине и начал измываться над своими"* [Колосья под серпом твоим]; *Браниборщина* (уладальнікам прыгонных сялян у вёсцы быў у свой час дваранін Браніборскі): *"Началось с того, что в Браниборщину привезли уставные грамоты"* [Колосья под серпом твоим]; *Витахмо* (назва ўтворана ад прозвішча Вітахмовіч): *"Так прошло пять лет, пока в Загорщине, Витахмо, Озерище ... и других деревнях князя не заревели, разрываясь, пушки"* [Колосья под серпом твоим]; *Янушполе* (гаспадаром гэтай мясцовасці, магчыма, быў чалавек па імені Януш): *"Война помогает деньгами крестьянам глухой деревни Янушполе"* [Колосья под серпом твоим].

У перакладзе аповесці "Дзікае паляванне караля Стаха" ўзгадваецца *застенак Кобыляны.* Заўважым, што засценкам раней называлі невялікае, тыповае для Беларусі пасяленне. Па словах Л.М. Лыча, спачатку ў XVI ст. засценкамі называлі ворныя і сенакосныя землі, якія апынуліся па-за межамі, за сцяной сялянскіх надзелаў пасля "Устава на валокі" 1557 г. Пазней засценкамі сталі называць невялікія (некалькі двароў) пасяленні, у якіх, арандуючы такія землі, жыла засцянковая шляхта [70, с. 28].

Для дакладнага ўзнаўлення геаграфічных асаблівасцей тэрыторыі беларускіх зямель перакладчык захоўвае мікратапонімы, якія выкарыстоўвае У. Караткевіч у сваіх арыгіналах. Напрыклад, речка *Озеранка: "Еще три дня тому назад он спрятал ружье в дупле дерева у мостика через Озеранку, по дороге на Суходол"* [Колосья под серпом твоим]; *Волотова прорва: "Это же вы, наверное, из Волотовой прорвы вырвались…"* [Дикая охота короля Стаха]; *Черный ров:"..ехали жнивьем до Черного рва, глубокого и длинного, версты на три, оврага в поле"* [Колосья под серпом твоим].

Такім чынам, ужыванне разнастайных тапонімаў з выразнай лінгвакраіназнаўчай семантыкай набліжае пераклад мастацкага тэксту да яго арыгінала, "удзельнічае" ў перадачы нацыянальна-культурнай інфармацыі, якая змяшчаецца ў беларускамоўных творах У. Караткевіча.

Вывады

Даследаванне мастацкіх тэкстаў У. Караткевіча з лінгвакраіназнаўчага пункту гледжання раскрывае багацце нацыянальна-культурнай семантыкі беларускай мовы як на ўзроўні моўна-выяўленчых сродкаў, так і на ўзроўні

спосабу фарміравання і фармулявання думкі, які складаецца пад уплывам этнакультурнага кантэксту. Ужыванне этнаграфізмаў выступае адным з найбольш важных складнікаў лінгвакраіназнаўчага зместу даследаванай гістарычнай прозы пісьменніка.

Выкарыстанне беларускамоўных элементаў з нацыянальна-культурным кампанентам значэння ў арыгінальных караткевічаўскіх творах і іх перакладах на рускую мову (безэквівалентныя словы, дыялектызмы, фразеалагічныя адзінкі і народныя афарызмы, элементы вуснай народнай творчасці) абгрунтаванае і мэтазгоднае: яны адлюстроўваюць дух эпохі, даюць аб'ектыўную інфармацыю пра нацыянальную рэчаіснасць нашага народа ў мінулыя часы.

Устарэлая лексіка, якая шырока функцыянуе ў мове прозы У. Караткевіча, характарызуецца разнастайнай лінгвакраіназнаўчай семантыкай і ахоплівае шырокае кола прадметаў і рэалій нацыянальнай рэчаіснасці беларускага народа ў мінулым. Нацыянальна-маркіраваныя ўстарэлыя словы арганічна ўключаюцца ў мастацкі кантэкст, не ствараючы кантрасту з сучаснымі лексічнымі сродкамі, "адпраўляюць" сучасніка ў пэўную гістарычную эпоху, знаёмяць з некаторымі сацыяльна-гістарычнымі падзеямі і этнаграфічнымі рэаліямі.

Сістэма антрапонімаў (імён і прозвішчаў) герояў літаратурных твораў дазваляе не толькі пранікнуць у іх духоўны свет. Ужыванне антрапанімічнай лексікі падпарадкавана захаванню этнакультурнай спецыфікі мастацкага тэксту (у тым ліку перакладнога), і яго нацыянальнай адметнасці. Праз ужытыя ў моўным кантэксце мастацкіх твораў У. Караткевіча лінгвакраіназнаўчыя адзінкі-тапонімы семантызуюцца пэўныя геаграфічныя аб'екты, назвы якіх рэпрэзентуюць асаблівасці прыроднага асяроддзя, расліннага і жывёльнага свету Беларусі.

Як сведчыць даследаваны матэрыял, вывучэнне найбольш распаўсюджаных у мастацкіх тэкстах У. Караткевіча этналінгвістычных і моўна-культурных з'яў выступае шляхам да тэарэтычнага і практычнага вывучэння таго, як у мове ўвасабляюцца этнічныя асаблівасці светабачання, пэўныя краіназнаўчыя рэаліі, транслюецца культура народа і ў цэлым выяўляецца яго нацыянальная ідэнтычнасць.

Раздзел 3
ЛІНГВАКРАІНАЗНАЎЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ТВОРАЎ ВАСІЛЯ БЫКАВА

Васіль Быкаў – феномен чыста беларускі.
М. Тычына

3.1 Лінгвакраіназнаўчая спецыфіка твораў Васіля Быкава

Імя Васіля Быкава з'яўляецца знакавым для ўсёй беларускай літаратуры. Яго па праву называюць духоўным прарокам нацыі. Сапраўды, для Беларусі ён быў геніем, які стварыў літаратурныя шэдэўры, поўныя глыбокай філасофіі гуманізму. Народны пісьменнік Беларусі В. Быкаў – адзін з самых папулярных мастакоў слова XX ст. не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі. Яго творчасць успрымаецца сучаснікамі не толькі як унікальная з'ява беларускай прозы, але і як вялікае дасягненне сусветнай літаратуры. У сваіх творах ён сцвярджае агульначалавечыя каштоўнасці, аднолькава важныя для прадстаўнікоў усіх народаў ва ўсе часы, імкнецца аднавіць даўнія сувязі нашай нацыянальнай культуры са здабыткамі агульначалавечай культуры.

Падчас свайго актыўнага грамадскага жыцця пісьменнік адгукаўся на самыя вострыя і надзённыя пытанні гісторыі і сучаснасці, у тым ліку і на праблемы звужэння сфер ужытку беларускай мовы ў грамадстве. Родную мову ён разглядаў як "самае каштоўнае багацце нацыі", "душу народа", "своеасаблівы генафонд нацыянальнай культуры". У свой час у адным з інтэрв'ю В. Быкаў зазначаў, што страта беларускай мовы можа азначаць страту беларускага народа як самастойнай нацыі, якая знікне "з твару зямлі, як некалі зніклі летапісныя яцвягі, якія насялялі паўночна-заходнюю Беларусь".

Васіль Быкаў лічыцца адным з тых празаікаў, які ў сваіх творах жыў стыхіяй нацыянальнай мовы. Лінгвакраіназнаўчую інфармацыю ў яго мастацкіх тэкстах нясуць разнастайныя нацыянальна-маркіраваныя моўныя адзінкі. Многія з іх змяшчаюць у сабе звесткі пра ўнікальнасць матэрыяльнай і духоўнай культуры нашага народа.

Так, у межах даследаванай намі нацыянальна афарбаванай лексікі асабліва звяртаюць на сябе ўвагу:

– найменні прадметаў і з'яў традыцыйнага беларускага побыту: *пунька* 'вялікі будынак для захоўвання сена, адрына', *капец* 'куча агародніны (бульбы, буракоў і інш.), якая ўкрываецца на зіму саломай, сенам ці галінкамі хвойных парод дрэў', *калаўрот* 'прыстасаванне для ручнога прадзення, якое прыводзіцца ў рух панажом', *даёнка* 'пасудзіна, у якую дояць малако', *качарэжнік* 'у сялянскай хаце месца паміж печчу і сцяной, куды ставяць чапялу, вілкі, качаргу і інш.';

– назвы адзення і галаўных убораў: *ватоўка* ‘ватовая фастрыгаваная куртка або безрукаўка’, *дзяга* ‘рэмень, паясная папруга’, *картуз* ‘мужчынскі галаўны ўбор з аколышкам і цвёрдым казырком’, *кажушок* ‘цёплая верхняя вопратка, пашытая з аўчын’;

– назвы ежы і страў: *лапун* ‘вялікі тоўсты мучны блін’, *аладка* ‘невялікі тоўсты мучны або бульбяны блін’, *шкварка* ‘невялікія засмажаныя кавалачкі сала ці тлустага мяса’ і інш.

Прывядзём прыклады ўжывання некаторых лексічных адзінак такога тыпу. Напрыклад, *дранікі* ‘бліны з дранай бульбы’: *“Каля яе клапатала бабка Мелання – пякла дранікі”* [Сотнікаў]; *крупнік (крупенік)* ‘крупяны суп, крупеня: *“Елі тут. Крупенік”* [Знак бяды]; *крупы* ‘прадукт харчавання з сечаных зярнят розных культур’, *ступа* ‘драўляная або металічная пасудзіна, у якой таўкуць што-небудзь таўкачом’: *“Не забыцца натаўчы ў ступе круп – назаўтра мелася варыць крупнік”* [Знак бяды]; *пасталы* ‘даўні мяккі сялянскі абутак з цэлага кавалка скуры, які насілі з анучамі і прывязвалі да ног аборамі’: *“Ён, аднак, не спыняўся, з роспачным намаганнем выдзіраючы з твані свае пасталы, дабрыў да лазняку і пралез між кустоўя”* [Аблава] і інш.

У мове прааналізаваных твораў вельмі шырока ўжываюцца лексічныя адзінкі, якія семантызуюць штодзённую сельскагаспадарчую працу вяскоўцаў, іх заняткі і земляробчыя клопаты. Праілюструем асаблівасці ўжывання некаторых слоў на прыкладзе моўных кантэкстаў, узятых з твораў В. Быкава. Напрыклад, *варыўня* ‘кладоўка для захавання агародніны’:*“Ураджай выдаўся неблагі, зернем засыпалі ўсе карабы ў Аўдоццінай варыўні”* [На чорных лядах]; *жорны* ‘ручны млын з двух гладка абчэсаных круглых камянёў, пры дапамозе якіх пераціраюць зерне на муку’: *“Пад жорнамі ціхенька мацаў пацук…”* [Знак бяды].

Аўтар знаходзіць таксама неабходныя словы і выразы, каб перадаць законы народнай маралі, спецыфіку традыцыйнай духоўнай культуры, паказаць “жывучасць” традыцыйных народных прыкмет, адметнасць сялянскай псіхалогіі. Пра гэта сведчаць, напрыклад, назвы народных танцаў, якія здаўна былі характэрны для традыцыйнай народнай культуры беларусаў. Гэты найменні тыпу *“Казачок”* ‘беларускі і ўкраінскі народны танец-пляска’, *Лявоніха* ‘беларускі народны танец або музыка да гэтага танца’, *кракавяк* ‘польскі народны танец’: *“…перайграў ім і «Казачка», і «Лявоніху», «кракавяк»”* [Знак бяды].

Як сродак стварэння мясцовага каларыту ў мове аповесцей В. Быкава часта выкарыстоўваюцца дыялектныя лексічныя адзінкі з лінгвакраіназнаўчым кампанентам значэння. Да іх ліку аднясём назоўнікі тыпу *падворышча* ‘двор, участак зямлі паміж гаспадарчымі будынкамі’; *калі́ўе* ‘бульбоўнік’, *чуні* ‘пяньковыя, вяровачныя лапці’ і інш.

Унікальную нацыянальна-культурную інфармацыю акумулюе ў сваёй семантыцы безэквівалентная ў рускамоўным дачыненні лексіка,

якая дастаткова часта ўжываецца ў мове празаічнага радка В. Быкава. Напрыклад, *гмах* ‘вялікі і высокі будынак’ (рус. *большое высотное здание*): *“За ладна расфарбаваным дамком з прыгожымі вокнамі зноў высіўся шэры гмах…”* [Знак бяды]; *асвер* ‘частка калодзежнага жураўля ў выглядзе доўгай жэрдкі, пры дапамозе якой дастаюць вядро з вадой’ (рус. *журавль у колодца; приспособление для доставания воды*): *“Ужо стала відаць у прыцемках крывая вярба ля варот, студня з асверам”* [Воўчая зграя]; *бульбоўнік* ‘націнне бульбы’ (рус. *картофельная ботва*): *“Ён левай рукой пачаў выдзіраць бульбоўнік…”* [Воўчая зграя]; *кубелка* ‘дзежка з вушкамі і векам для захоўвання прадуктаў і рэчаў’ (рус. *закрывающаяся крышкой кадка*): *“Яны пачалі пераварочваць дагары ўсё дзежкі, кубелкі”* [Знак бяды]; *цабэрак* (памянш. ад *цэбар* ‘шырокая драўляная пасудзіна з клёпак з двума вушкамі’) (рус. *небольшой ушат*): *“Сцепаніда раззлавана памянула свайго нядбайнага мужа і пасунула цабэрак”* [Знак бяды]; *шнур* ‘вузкая палоска зямлі’ (рус. *узкая полоса земли*): *“Заставалася выбраць баразён з пяць на шнурку, як, разагнуўшыся, Грыбаед убачыў на краі алешнічку чалавека, які моўчкі махаў да яго рукой – клікаў падысці”* [Воўчая зграя]; *цагельня* ‘прадпрыемства, на якім вырабляецца цэгла’ (рус. *кирпичный завод*): *“...цэгла была нехуцавая, дрэнна абпаленая, ён бачыў гэта тады, як купляў, ды на Савацееўскай цагельні не было лепшай…”* [Аблава].

Безэквівалентныя ў рускамоўным дачыненні лексічныя адзінкі, якія семантызуюць у сваім значэнні тыя ці іншыя лінгвакраіназнаўчыя прадметы і рэаліі, уласцівыя для прыроднага свету, наваколля, штодзённага жыцця чалавека, дастаткова свабодна функцыянуюць у моўнай прасторы быкаўскага тэксту пры характарыстыцы думак, пачуццяў і перажыванняў герояў на ўлонні прыроды, а таксама пры апісанні навакольнага асяроддзя. Напрыклад, *азіміна* (рус. *озимая пшеница*): *“Хістаючыся, пабрыў наўкось па азіміне…”* [Аблава]; бел. *баравінка* (рус. *возвышенный участок леса в бору*): *“Але ў гэтым раўнінна-забалочаным краі нідзе ніякай баравінкі…”* [На чорных лядах]; *бульбянішча* (рус. *поле, на котором растет или рос картофель*): *“Але гэта там, далей на ўзлеску, а тут дзецца ёй не было куды: невысокая насыпка дарогі ды голы прасцяг бульбянішча – тут можна і пасядзець у спакоі”* [Знак бяды]; *котлішча* (рус. *насиженное место, родовая усадьба*); *падворак* (рус. *двор около дома*); *падмуроўка* (рус. *подведение каменной или кирпичной кладки под фундамент*): *“Як ён і здагадваўся, котлішча не было заарана, некратаным застаўся падворак, ацалелі падмуроўка ад хаты і вуглавыя камяні ад свірна”* [Аблава].

Да разгледжаных вышэй безэквівалентных назваў беларускай мовы далучаюцца іншыя ўжытыя аўтарам найменні з лінгвакраіназнаўчым зместам, якія не маюць аднаслоўных аналагаў у рускай мове: *ржышча* (рус. *ржаное поле*); *тарфянішча* (рус. *осушенное торфяное болото*); *цалік* – (рус. *нетронутый снеговой наст*); *патарчака* (рус. *сучья и корни*);

буслянка (рус. *гнездо аиста*); *застаронак* (рус. *место в гумне для складывания соломы, мякины, снопов*); *пасуднік* – (рус. *ящик для посуды*); *дрывотня* (рус. *дровяной сарай*).

Уяўленне пра геаграфічныя асаблівасці прыроднага асяроддзя даюць такія выкарыстаныя В. Быкавым шматлікія прасторавыя найменні (у тым ліку і безэквівалентныя), як *бальшак* ‘вялікая дарога (у адрозненне ад прасёлачнай)’, *поплаў* ‘луг у пойме ракі’: *“На пагорачку ў змешаным рэдкалессі ён павярнуў управа – убок да бальшака і поплаву…”* [Аблава]; *выган* ‘месца каля вёскі, дзе пасецца жывёла’*: “Над полем і выганам памалу ўсталёўвалася сцюдзёнаватая восеньская ноч”* [Аблава]; *узлесак* ‘край лесу’: *“Праз нейкі нядоўгі час* [месяц] *выкаціўся ў іншым месцы, і на гэты раз свяціў доўга і ярка, абліваючы поле, узлесак, чалавека на абмежку бліскучым прывідным святлом”* [Аблава]; назвы нябесных свяціл накшталт *маладзік* ‘малады месяц’: *“Раніцай і яшчэ ў першую квадру месяца, на маладзік, як некалі казала маці”* [У тумане]; *поўня* ‘фаза Месяца, калі відзён увесь (поўны) яго дыск’: *“На небе ў ірваным ашмоцці хмараў з’явіўся бліскучы кругляк поўні…”* [Аблава].

Здзіўляюць сваёй разнастайнасцю выкарыстаныя аўтарам назвы балоцістай мясцовасці, характэрнай для ландшафту Беларусі. Так, у моўнай тканіне аповесці “Аблава” сустракаюцца шматлікія сінанімічныя назвы. У іх ліку такія, як *балота* ‘нізкае багністае месца з застаялай вадой’: *“Пасля дажджоў прырэчнае балота шырока разлілося…”* [Аблава]; *імшарына* ‘мохавае балота’: *“Ззаду на цвёрдым беразе за імшарынай гучала галасістая гамана, брахаў сабака, мабыць, там сышліся загоничыкі”* [Аблава]; *багна* ‘топкае балота, дрыгва’: *“Цяжкія ногі ў нязносных сырамятных пасталах адразу памкнулі яго ў глыб багны, ён захліпнуўся”* [Аблава]; *твань* ‘дрыгва, багністае месца’: *“Ці яны згубілі яго, ці баяліся лезці ў сцюдзёную, смярдзючую твань?”* [Аблава]; *дрыгва* ‘тое самае, што і твань’: *“Але мох дужа не правальваўся, дрыгвы тут не было”* [Аблава] і інш.

Адным з найбольш цікавых відаў традыцыйнай беларускай культуры з’яўляюцца земляробчыя святы і святы рэлігійнага календара. Здаўна яны лічыліся не толькі спосабам пакланення звышнатуральным сілам, але і паказчыкам моцы народнай душы. Пісьменнік ужывае лексічныя адзінкі, праз якія трансліруецца багацце духоўнай культуры нашага гарода. Гэта назвы рэлігійных свят*: Вадохрышча* ‘свята рэлігійнага календара, якое адзначаецца 19 студзеня і звязана з культам вады і яе асвячэннем’, *Вербніца* ‘апошняя нядзеля перад Вялікаднём’, *Благавешчанне* ‘свята рэлігійнага календара, якое адзначаецца 7 красавіка ў гонар Божай Маці і лічыцца ў народзе святам прылёту буслоў’.

У аповесці “Знак бяды” пры характарыстыцы народна-культурных вытокаў беларусаў аўтарам звернута ўвага на такія святы, як *Вербніца, Юр’еў дзень* і інш. Заўважым, што земляробчы каляндар усходніх славян, у тым ліку і беларусаў, толькі фармальна быў звязаны з царкоўнымі

святамі. У аснове яго фарміравання ляжала сялянская праца. Зрэшты, яшчэ ў "Жураўліным крыку" аўтар зрабіў спробу акрэсліць ролю каляндарна-абрадавай паэзіі ў жыцці чалавека. Калі Іван Пшанічны на сваім апошнім франтавым рубяжы ўспамінае мінулае, то розныя даўнія падзеі ён суадносіць са значнымі момантамі гаспадарчага календара – *Вялікаднём, Пятровым днём, Сёмухай.* А ў "Знаку бяды" Пятрок і Сцепаніда Багацькі, святочна апрануўшыся на *Юр'я*, робяць абрадавы агляд свойскай жывёлы, адпаведны абход зямельнага надзелу, выконваюць шэраг магічных дзеянняў, скіраваных супраць шкоднага ўплыву злых духаў на гаспадарку. Падчас агледзінаў поля імі быў знойдзены мёртвы жаўранак – знак непазбежнай для чалавека бяды. Калі сям'ю Багацькаў неўзабаве сапраўды напаткае трагічны лёс, Сцепаніда не раз успомніць *"нядаўнія агледзіны поля і таго нежывога жаўраначка пад мяжой".*

Апрача выкарыстання лексікі з выразнай лінгвакраіназнаўчай маркіраванасцю, своеасаблівую нацыянальную адметнасць надае мастацкаму тэксту ўжыванне пісьменнікам фразеалагічных адзінак і фразеалагізаваных выказванняў – праклёнаў і зламысных пажаданняў са значэннем маўленчых паводзін. Гэтыя ўстойлівыя моўныя адзінкі дастаткова выразна семантызуюць розныя эмоцыі чалавека падчас маўлення. Што да праклёнаў, дык актыўнасць іх выкарыстання нашымі продкамі была абумоўлена, відаць, складанымі гістарычнымі ўмовамі жыцця ў старажытнасці, а таксама вялікай колькасцю выпрабаванняў, з якімі беларусам давялося сутыкнуцца ў мінулым падчас шматлікіх войнаў. Напрыклад, у час роспачы і адчаю героі В. Быкава кідаюць у адрас іншых такія словы: *"А-яй! Гадаўё вы! – дзіка закрычала Дзёмчыха. – Каб вам струцянець да вечара! Каб вашыя вочыругаиы паклявалі! Ах, каб вас пярун забіў!"* [Сотнікаў]; *"Разведка – хрэн ёй у вочы, шнапсу, відаць, надулася!"* [Мёртвым не баліць]; *"Хай яна спрахне, тая малатарня, навошта ён з ёю звязаўся!"* [Аблава]; *"Каб цябе, ваўкарэзіна!.."* [Воўчая зграя]; *"Падсуропілі, начальнікі! Ну ладна, трасцу вашай матары!"* [Воўчая зграя]; *"К чортавай матары! Людзі гінуць! – крычыць ён на возе і паварочваецца да ездавога, які спалохана трымае коней. – Ану, скідай хутчэй!"* [Мёртвым не баліць], а таксама *ліха з ёй; каб ты спрах* і інш.

Заўважым, што вера ў звышнатуральныя сілы захавалася ў беларусаў яшчэ з часоў язычніцтва, калі чалавек адухаўляў нежывыя прадметы, у якіх потым пры неабходнасці прасіў заступніцтва. Менавіта таму ў праілюстраваных вышэй праклёнах "у якасці заступнікаў" могуць выступаць назвы жывёл, раслін, хвароб, якія здольныя нанесці шкоду здароўю іншага чалавека, напрыклад: *хрэн у вочы* (дзе хрэн – расліна з мясістым горкім коранем, якая выкарыстоўваецца як вострая прыправа) 'выказванне незадавальнення, абурэння'; *трасца яго (вашай) матары* (дзе *трасца* – ліхаманкавая хвароба, малярыя) і інш.

Ужыванне ў мове быкаўскай прозы фразеалагізмаў з нацыянальна-культурным складнікам значэння – гэта абсалютна натуральная

і заканамерная з'ява. Умелае і апраўданае выкарыстанне празаікам устойлівых выразаў робіць літаратурны твор больш эмацыйным, дапамагае чытачу адчуць думкі і перажыванні герояў. Напрыклад, у апавяданні "Дваццаць марак" замест дзеяслова *напіцца* (гарэлкі) ужываецца фразеалагізм з адмоўнай канатацыяй *заліць вочы (гарэлкай)*, што дапамагае пісьменніку стварыць праўдзівую і пераканаўчую карціну жыцця асацыяльнага асяроддзя, якое з часоў М. Горкага ў мастацкай літаратуры называюць "дном".

Даволі шырока прадстаўлены ў мове В. Быкава прыказкі і прымаўкі, якія адзінкамі свайго лексіка-семантычнага складу адлюстроўваюць нацыянальную культуру і менталітэт беларусаў: *першая чарачка – як сінічка, другая – як жавараначка; з ваўкамі жыць – па ваўчынаму і выць; сорак год – бабін век; які клапот, такі і ўмалот; што зробіш, тое і заробіш* і шматлікія іншыя. У даследаваных мастацкіх тэкстах цяжка пераацаніць ролю трапных народных выразаў, якія канцэнтруюць жыццёвую мудрасць і вопыт беларусаў. У гаворцы ж літаратурнага персанажа адпаведная прыказка часам можа замяніць цэлы разгорнуты маналог: *"На чужым і дармовым шчэнсця не бэндзе"* [Знак бяды], – па-прарочы гаворыць пан Яхімоўскі сваім былым парабкам.

Ужо ў саміх загалоўках аповесцей В. Быкава часта прасочваюцца народнае светаадчуванне, традыцыйныя вераванні і ўяўленні людзей. Нагадаем назвы аповесцей: "Праклятая вышыня", "Пайсці і не вярнуцца", "Знак бяды" і інш. З прычыны энцыклапедычнасці ў паказе жыцця беларускага сялянства аповесць В. Быкава "Знак бяды" даследчыкі параўноўваюць з паэмай Якуба Коласа "Новая зямля". Героі твораў пісьменніка ўспрымаюць многія рэаліі жыцця ў кантэксце трывалых на Беларусі міфалагічных уяўленняў. Напрыклад, Васілевіч з аповесці "Мёртвым не баліць" успрымае Вечны агонь не як сімвал памяці пра тых, хто загінуў, а як сродак магічнага *"ачышчэння і ахвярнасці"*. Гэта яшчэ раз пацвярджае, што старажытная славянская міфалогія, высокія хрысціянскія памкненні з'яўляюцца асновай беларускай народнай маралі і эстэтыкі.

У творах В. Быкава пераважна на "ваенным" матэрыяле асэнсоўваюцца спрадвечныя духоўныя ісціны, каштоўнасці, традыцыйныя ўяўленні прадстаўнікоў нашага народа пра дабро і зло, справядлівасць і несправядлівасць, жыццё і смерць, радасць і пакуты, прыгожае і пачварнае. Філасофскі роздум аўтара грунтуецца на народнай мудрасці і праўдалюбстве, на пошуках маральнага ідэалу. Народны маральны кодэкс, як вядома, праўдзіва ўвасоблены ў беларускім фальклоры, што знаходзіць пацверджанне і ў быкаўскім мастацкім тэксце. Паводле ўспамінаў Марыі, гераіні рамана "Кар'ер", яе бацька быў актыўным збіральнікам фальклору, беручы нярэдка з сабой у экспедыцыі і дачку. Дзяўчыну вабілі народны побыт і вусная народная творчасць, асабліва песні: *"Жніўныя, калядныя, вясельныя, абрадавыя і яшчэ бог ведае якія…"* [Кар'ер].

3.2 Лінгвакраіназнаўчы кампанент у перакладах твораў Васіля Быкава на рускую мову

Як адзначалася вышэй, творы В. Быкава, увайшоўшы ў скарбніцу сусветнай літаратуры, сталі вядомымі далёка за межамі нашай краіны. На сённяшні дзень яны перакладзены больш чым на пяцьдзясят моў свету. Пераклады быкаўскіх твораў на рускую мову былі здзейснены ў свой час В. Рудавым, Г. Куранёвым і інш. Урэшце пісьменнік сам узяўся перакладаць свае творы на рускую мову. У іх ліку варта адзначыць такія аповесці, як “Дажыць да світання”, “Яго батальён”, “Сотнікаў”, “Воўчая зграя”, “Знак бяды”, раман “Кар’ер” і інш. Сёння аўтапераклады В. Быкава на рускую мову сталі вядомымі і папулярнымі не толькі ў нашай краіне, але і ў Расіі.

Прадметам нашага даследавання з’яўляюцца асаблівасці функцыянавання беларускамоўных моўных адзінак з лінгвакраіназнаўчым кампанентам значэння ў аўтарскіх перакладах твораў В. Быкава на рускую мову. Зразумела, што ў сваёй перакладчыцкай дзейнасці ён не зазнаў цяжкасцей, выкліканых адсутнасцю лінгвакраіназнаўчых ведаў ці няведаннем “чужога” побыту і культуры. У працэсе перакладу В. Быкаў вельмі “ашчадна” ставіўся да створаных ім арыгінальных тэкстаў, добра ўсведамляючы, што знаёміцца з яго творамі будуць носьбіты іншай этнакультуры, іншага моўнага асяроддзя. Чытаючы быкаўскія творы на рускай мове, адчуваеш, наколькі майстар слова бездакорна валодае лексічным матэрыялам дзвюх моў, наколькі ён уважліва ставіцца да падбору слова пры перакладзе, з якім замілаваннем і ўлюбёнасцю ў свой край і яго народ апавядае свету пра Беларусь і беларусаў.

Як і ў мове перакладаў твораў У. Караткевіча на рускую мову, у аўтаперакладах В. Быкава выразную этнакультурную афарбоўку маюць антрапонімы – імёны і прозвішчы герояў. І гэта невыпадкова, бо “ў кожнай мове ёсць пэўны сэнсавы арэол, пэўнае значэнне, замацаванае за ўласным імем, агульнае для носьбітаў мовы” [10, с. 40].

Заўважым, што папярэдне мы не спыняліся на асаблівасцях функцыянавання антрапаніміных адзінак у беларускамоўных творах пісьменніка. Відавочна, што ў працэсе перакладчыцкай дзейнасці В. Быкаў сутыкнуўся не з праблемай падбору асабовых імёнаў (гэта вырашана ў арыгінале), а з праблемай іх адэкватнага перакладу, якая выклікана неабходнасцю выяўлення ідэйна-мастацкіх і нацыянальных асаблівасцей арыгінала.

Захаванню нацыянальна-культурнай спецыфікі аўтарскага тэксту ў перакладах твораў на рускую мову садзейнічае выкрыстанне безэквівалентных у рускамоўным дачыненні найменняў. Напрыклад, *подстрешье* (бел. *падстрэшша*) – рус. *место под нижним краем крыши какого-либо строения: “Когда из-за повети грохнул очередной выстрел, пуля,*

сверкнув в подстрешье, навылет пронизала крышу…" [Волчья стая]; *молодик* (бел. *маладзік*) – рус. *растущая луна: "Утром да еще в первую четверть месяца, на молодик, как некогда говорила мать…"* [В тумане]; *стреха* (бел. *страха*) – рус. *соломенная крыша: "Только дождь усиливается и шуршит в соломе на стрехах"* [Обелиск] і інш.

У даследаваных перакладных тэкстах зафіксаваны таксама выпадкі ўжывання розных тыпаў дыялектнай лексікі беларускай мовы. Напрыклад, *мабуть* (бел. літ. *мабыць* – рус. *может*): *"Мабуть, без привычки? Научишься!"* [Сотников]; *обора* (бел. літ. *хлеў для кароў, кароўнік* – рус. *коровник*): *"На скотном дворе с оборой их уже ждали подносчики боеприпасов из батальона"* [Карьер]; *охфицер* (бел. літ. *афіцэр* – рус. *офицер*): *"Охфицер! – догадался Петрок"* [Знак беды]; *ровар* (бел. літ. *веласіпед* – рус. *велосипед*): *"…это был его велосипед, "ровар" по-здешнему…"* [Обелиск]. Дыялектызмы ўжываюцца ў рускамоўным тэксце, хутчэй, з мэтай адлюстравання рэгіянальных традыцый маўлення беларусаў і надання зместу твора своеасаблівага мясцовага каларыту. Прывядзём іншыя прыклады выкарыстання дыялектызмаў тыпу *парубок* 'малады хлопец': *"Внешне он напоминал обычного сельского парубка"* [Альпийская баллада]; *паночек (паночки)* 'форма ветлівага звароту': *"Ай, паночки, простите! Простите дурной бабе, я ж не хотела…"* [Сотников]; *гуторить* 'гаварыць, размаўляць': *"Да уже ясно, свои, гуторят смелей, и русский маток послышался"* [Карьер];

Сярод беларусізмаў, пакінутых у рускамоўным тэксце без змен з мэтай захавання нацыянальнай адметнасці арыгінала, найперш трэба вылучыць словы, якія маюць адпаведнікі ў рускай мове. Напрыклад, *бульбочка* (рус. *картошечка*): *"«Может, бульбочки сварить?» – спросила старостиха"* [Сотников]; *вёска* (рус. *деревня*): *"«Во и вёска», – сказал ездовой"* [Волчья стая]; *стежка* (бел. *сцежка*; рус. *тропинка): "Он без задержки дошел до огородов, от гумна по стежке"* [Альпийская баллада]. Як бачым, гэтыя беларускамоўныя лексічныя адзінкі, як правіла, выкарыстоўваюцца ў якасці сродкаў моўнай характарыстыкі персанажа і знаёмяць рускамоўнага чытача з моўнымі скарбамі жывога беларускага маўлення. Пры аналізе лексічных сродкаў такога тыпу можна вылучыць іншыя беларусізмы рознай семантыкі і часцінамоўнай прыналежнасці. Напрыклад, назвы асоб (часта з адмоўнай канатацыяй): *гультай* (рус. *лентяй*): *"Лодырь проклятый! Гультай чертов!"* [Журавлиный крик]; *бульбоеды* (рус. *картофелееды*): *"Я так считаю: что Смоленщина, что Белоруссия – один черт. Бульбоеды"* [Карьер]; *татка* (рус. *папка*): *"Меня Алесь Иванович к себе взял, а то мой татка дерется"* [Обелиск]; дзеясловы *казаць* (рус. *говорить*): *"Я ж кажу… Хороший ага"* [Знак беды]; *захварэць* (рус. *заболеть*): *"«Так и захварэць можна», – сквозь слезы пошутил разговорчивый Зыль"* [Карьер]; *чакать* (рус. *ждать*): *"Чакай, чакай! Ходи сюда"* [Волчья стая]; *уратовать* (рус. *спасти*): *"Всех побили, попалили,*

а гэный уцелел. Немец уратовал” [Волчья стая]; *бачыть* (рус. *видеть*): *“Бачыли? Там она собирала что-то…”* [Волчья стая]; займеннікі *чым*: *“Чым тольки кормиться будем?”* [Волчья стая]; *гэты: “Вунь за соснячком ров, ручей гэты”* [Волчья стая]; прыслоўе *дуже: “Партизанов не дуже побьешь – сдачи дать могут”* [Волчья стая]; безасабова-прэдыкатыўныя словы *ничога, добра: Ничога. Все добра* [Волчья стая]; службовыя часціны мовы *ды, ужо, кали: “«Ды ўжо ж, кали такое дело», – смущенно ответил Грибоед…”* [Волчья стая]; *як: “Влезли, як дурни якия. Як теперь вылезем?”* [Волчья стая]; мадальнае слова *можа: “«Что? Учительница? Можа, и была», – сказал мужчина”* [Карьер]; формулы беларускага моўнага этыкету *кали ласка* (рус. *пожалуйста*): *“Кали ласка. Молоко в кувшине…”* [Карьер]; *да пабачэння* (рус. *до свидания*): *“А я тогда нарочно. Мне – до свидания, а я – да пабачэння”* [Карьер]; *дякуй* (рус. *спасибо*): *“Дякуй табе, сынок, дякуй. Я ж в долгу не останусь, отблагодарю”* [Карьер].

Сустракаюцца выпадкі, калі пры перакладзе В. Быкаў выкарыстоўвае фанетычныя варыянты лексічных эквівалентаў беларускай літаратурнай мовы: *“Ничога. Галовнае – дитёнок ёсть. Ладный таки. Вырасте. Война проклятая скончится, все наладится. У малых все хутка налаживается. Не треба убивать”* [Волчья стая]. Тым самым ствараецца не толькі моўная, але і этнасацыяльная характарыстыка героя. Такое беларуска-рускае змешанае маўленне характэрна, як правіла, для вясковых жыхароў, сялян, часта людзей малаадукаваных, якім і з’яўляецца, напрыклад, Грыбаед – адзін з герояў аповесці “Воўчая зграя”.

Адносна мэтазгоднасці ўжывання ў перакладах на рускую мову асобных беларускамоўных элементаў В. Быкаў заўважаў так: “У шэрагу выпадкаў тая ці іншая думка або вобраз атрымлівае большую выразнасць менавіта на рускай мове, у іншых жа – наадварот: дакладнаму беларускаму выразу так і не ўдаецца знайсці рускі эквівалент” [20, с. 101].

Асобна трэба разгледзець выпадкі, калі аўтар пакідае мову арыгінала без змен: *“Эх, если бы можно было остановить время, перекроить жизнь заново, «сабраць з дарог каменні тыя, што губяць сілы маладыя»”* [Журавлиный крик]; *“Степанида даже подсказывала ей: «Да працы ўсе, хто чуе сілу, пад сцяг чырвоны, вольны сцяг», – а та все равно не могла запомнить”* [Знак беды]; *“Даже несколько песен сама записала от теток и бабок на Любанщине. Вот послушай:*

Мая матуля збедавала:
Дзе мая дачка заначавала?
Заначавала ў цёмным бару
Пад каліною,
Пад каліною,
Белыя ручкі пад галавою…” [Карьер].

Выкарыстанне ўрыўкаў з беларускіх народных песень і афарыстычных выслоўяў з мастацкай літаратуры ў перакладах твораў тлумачыцца

настойлівым імкненнем В. Быкава не толькі перадаць ідэйна-мастацкія асаблівасці арыгінала, але і захаваць нацыянальна-культурны фон сваіх твораў.

У прааналізаваных рускамоўных тэкстах знайшлі сваю рэалізацыю шматлікія антрапонімы з захаваннем тых ці іншых фанетычных асаблівасцей жывой беларускай мовы. Гэта перадача акання – *Терешка: "Таким был и ваш соотечественник Иван Терешка"* [Альпийская баллада]; *Богатька: "Плохо, значит, живешь, Богатька. И при советах на богател…"* [Знак беды]; устаўны гук *в* паміж галоснымі ў сярэдзіне слова – *Левон: "...сельсоветский председатель одноглазый, Левон Богатька, посылал Потапку"* [Знак беды]; прыстаўны гук *г* – *Ганна: "«Што ж, проверымо, Ганна!» – крикнул Гриц"* [Альпийская баллада]; зычны *м* замест *н* – *Микола:"Микола сказал: "Во, Артуров брат"* [Карьер]; зычны *п* замест *ф* – *Пилип: "Дядька Пилип не серчал…"* [В тумане]; спалучэнне зычных *хв* замест *ф* – *Хведар: "И бабка Хведара сбегала через три хаты к хромому Змитроку..."* [В тумане]; зычны *х* замест *к* – *Христина: "…приходила к ним бобылка Христина с прижитым ею без мужа ребенком…"* [В тумане] і інш.

Марфалагічныя асаблівасці беларускай мовы выразна выяўляюцца ў асабовых найменнях тыпу *Аркадь* (замест *Аркадий*), *Василь* (замест *Василий*) з адпадзеннем фіналі *-ий*. Напрыклад: *"…демобилизованный красноармеец, безземельный Василь Гончарик…"* [Знак беды].

Нацыянальную спецыфіку беларускай мовы ў перакладах выяўляюць таксама шматлікія эмацыянальна-ацэначныя формы асабовых імён, утвораныя пры дапамозе суфіксальных фармантаў *-к-, -ік-, -утк-,-ачк-, ок(-ёк)* і інш., тыпу *Потапка: "…Степанида признала в нем выселковского подростка Потапку"* [Знак беды]; *Иванка: "…тринадцатилетний Иванка возвращался на хутор"* [Журавлиный крик]; *Миколка: "Подросток* Миколка *жег рядом костерок…"* [Облава]; *Янинка: "…Янинка* [звать меня]. *А вас, если не военная тайна?"* [Дожить до рассвета]; *Стёпка: "Обострённым обанянием Стёпка улавливал соблазнительный запах жареного…"* [Круглянский мост]; *Лёник: "…Гэлька возьми Лёника!" – крикнула она старшей…"* [Сотников]; *Гришутка: "Это был крик ребенка, Сущеня узнал его сразу, так мог плакать только его сынишка Гришутка …"* [В тумане]; *Насточка, Василёк: "Она долго и радостно играла с Насточкой, гладила по голове Василька"* [Журавлиный крик]. Асобныя імёны рэалізуюцца ў кантэксце перакладаў на рускую мову ў разнастайных варыянтах, у тым ліку і размоўна-бытавых. Напрыклад, *Иван – Янка – Янушка: "Сдерживая дыхание, Иван прислушался: сзади доносились крики и выстрелы, заливались овчарки, но это там, на заводе, за ним же, кажется, еще не гнались"* [Альпийская баллада]; *"Степанида поняла, что это Янка"* [Знак беды]; *"Янушка, бывший колхозный бригадир"* [Альпийская баллада].

Асобную групу антрапонімаў, якія ствараюць нацыянальна-культурны фон у перакладах В. Быкава, складаюць запазычаныя з польскай мовы імёны, якія на працягу доўгага часу выкарыстоўваліся

беларусамі пры іменаванні. Напрыклад, *Ядя: "Не беда, говорю, пани Ядя, авторитет от того не убавится…"* [Обелиск]; *Тэкля: "Вот их описывайте! Маня, Тэкля, Гануля, сюды!"* [Знак беды]; *Ванда:* "*Дзенькую, пани Ванда,– в свою очередь церемонно поблагодарила Янинка"* [Дожить до рассвета]; *Франя:* "*Стоя за столиком, Франя готовила маленькие, со спичечный коробок, бутерброды"* [Полюби меня, солдатик]; *Анэля: "Анэля скрылась в запечье, слыхать было, что-то разорвала там…"* [В тумане]; *Гелена: "Мы с мамкой к тётке Гелене ходили"* [Сотников]; *Гэлечка* (памянш.-ласк. ад *Гэля*): *"Деточки мои родненькие, золотенькие мои! Гэлечка моя, как же ты будешь?"* [Сотников].

Традыцыі нацыянальнага іменаслова беларусаў, самабытнасць і натуральнасць нашай роднай мовы ў перакладах выяўляюць такія жаночыя і мужчынскія імёны, як *Авгинья, Демьян* [Сотников], *Алесь, Тимох* [Обелиск], *Антось, Степанида, Корнила, Янка* [Знак беды], *Петро* [В тумане], *Данила* [Круглянский мост], *Михалина* [Облава] і інш. Напрыклад: *"...ты знаешь, где Алесь Иванович? Пусть спасает мальчиков"* [Обелиск]; *"...Степанида поняла, что это Янка..."* [Знак беды]; *"Значит, ваш папка Демьян?.."* [Сотников]; *"Михалина, Шуркина мать, плачет, не дает снимать, и Шурка ничего поделать не может…"* [Облава].

Жывасць, прастату, своеасаблівы нацыянальны каларыт рускамоўнаму тэксту быкаўскіх аповесцей надаюць размоўна-бытавыя варыянты беларускіх імён тыпу *Гануля: "Спали тут старики, а иногда грелась его Гануля"* [Облава]; *Змитрок: "И бабка Хведара сбегала через три хаты к хромому Змитроку..."* [В тумане]; *Яшка: "Иван увидел наполовину скошенный лужок, а в конце его – отца и Яшку Тереха"* [Журавлиный крик]; *Петрок: "На хуторе остался Петрок"* [Знак беды]; *Стёпка: "Проснулся Стёпка на рассвете"* [Круглянский мост], а таксама *Настуся, Анюта* [Альпийская баллада], *Лукаш* [Карьер], *Яшка* [Журавлиный крик].

Імкненне да захавання традыцый нацыянальнага беларускага іменаслова дазволіла перакладчыку максімальна поўна адлюстраваць нацыянальную спецыфіку арыгіналаў. Далікатныя і мілагучныя імёны персанажаў (часта ў размоўных варыянтах) з захаваннем тых ці іншых нацыянальных асаблівасцей арганічна ўпісваюцца ў рускамоўны тэкст і нясуць у сабе не толькі сэнсавую, але і эстэтычную інфармацыю, ствараючы моўную карціну свету беларусаў, "адыгрываюць ролю арыенціраў у часе і прасторы цэлага тэксту" [10, с. 41].

Даволі багатым і каларытным уяўляецца падбор В. Быкавым прозвішчаў для сваіх герояў, бо "прозвішчы характарызуюць літаратурны персанаж паводле нацыянальнай прыналежнасці, грамадскага становішча, адносін да калектыву" [112, с. 110]. У моўнай тканіне быкаўскіх перакладаў вельмі шырока прадстаўлены беларускія прозвішчы, якія ўтвораны ад апелятываў – назваў раслін, жывёл, птушак, рыб, насякомых. Напрыклад, *Грак: "Старшина роты Грак и командир взвода…"*

[Его батальон]; *Дрозд: “«Ясно», – несколько бодрее, чем прежде ответил Дрозд”* [Его батальон]; *Шпак: “Шпак Данила – здешний человек, насквозь знает все ходы-выходы”* [Круглянский мост]; *Сыч: “А староста этот, говоришь, Сыч?”* [Сотников]; *Гусак: “И еще послали в село Гусака, у которого там проживал свояк…”* [Обелиск]; *Барсук: “Хотя были и красноармейцы, из окружений которые, командир Барсук”* [Сотников]; *Заяц: “За Шелудяком переминался с ноги на ногу важный красивый Краснокуцкий, …, за ним застыл молчаливый Заяц”* [Дожить до рассвета]; *Окунь: “А какие у вас связи с этой… Окунь Авгиньей”* [Сотников] і інш.

Паходжанне асобных прозвішчаў звязана з назвамі тых ці іншых побытавых прадметаў ці рэалій – *Толкач* (ад *таўкач* ‘кароткая прылада з патоўшчаным круглым канцом, якой таўкуць што-небудзь’)*: “…его спутали с одним партизанским связным, тоже по фамилии Толкач, который где-то выдал отрядных разведчиков…”* [Круглянский мост]; *Гуж* (ад *гуж* ‘пятля ў хамуце з вяроўкі ці скуры, пры дапамозе якой прымацоўваюць аглоблі да вупражы’): *“Да, это были Гуж с Колонденком…”* [Знак беды]; *Качан* (ад *качан* ‘плод капусты: шчыльна звітыя ў галоўку капусныя лісты’): *“А Пётра Качан. Он теперь старостой тут…”* [Сотников]; *Кісель* (ад *кісель* ‘студзяністая вадкая страва’): *“Кисель! Кинь «бычка»!”* [Волчья стая]; назвамі людзей у залежнасці ад іх прафесіі, роду дзейнасці ці заняткаў – *Бондарь* (ад *бондар* ‘майстар, які займаецца вырабам драўлянага посуду – бочак, дзежак і інш.’): *“Появился перед глазами непоседа Алешка Бондарь, а с ним – детские их забавы…”* [Журавлиный крик]; *Рыбак* (ад *рыбак* ‘чалавек, які займаецца рыбнай лоўляй як промыслам, а таксама аматар рыбнай лоўлі’): *“Все время, пока они шли лесом, Рыбак слышал за спиной его глуховатый, простудный кашель…”* [Сотников]; *Пивоваров* (ад *піваварэнні*) ‘спецыяліст па піваварэнні’): *“Пивоваров, у вас есть палатка?”* [Дожить до рассвета]; *Грибоед* (матывавана словамі *грыб* і *есці*): *“«Як жа в ту сторону?» – подумав не согласился Грибоед…”* [Волчья стая]. Этнакультурную адметнасць нясуць у сабе прозвішчы, утвораныя ад гутарковых формаў беларускіх імён: *Иван Терешка* [Альпийская баллада], *Яшка Терех* [Журавлиный крик], *Лукашев* [Дожить до рассвета].

У агульнай сістэме прозвішчаў быкаўскіх герояў нацыянальна-моўную спецыфіку выразна выяўляюць беларускамоўныя прозвішчныя мадэлі на -*онок-(ёнок)* тыпу *Ходоронок*: *“Это самое, говорят, Ходоронок их, которого ночью ранили, сдох”* [Сотников]; *Филиппёнок: “Филиппёнок младший. Сидел за поножовщину, да пришел в первые дни, как началось”* [Сотников]; *Колондёнок: “Да, это были Гуж с Колондёнком”* [Знак беды]; *Игналёнок: “Таких можно было увидеть разве что у самых никудышных хозяев – Цыпрукова Змитера и у Игналёнка”* [Облава]; *Микитёнок: “Микитенок тоже увлекался техникой и перед войной выучился на шофера”* [В тумане],

а таксама прозвішчы на *-эня-(еня) – Сущеня: "Что будет дальше, Сущеня не представлял…"* [В тумане].

Важным элементам моўнай структуры перакладаў з'яўляецца тапанімічная лексіка, дзякуючы якой быкаўскі мастацкі тэкст у рускамоўным афармленні набывае ярка выражаную этнічную афарбоўку.

Трэба адзначыць, што тапанімія з'яўляецца своеасаблівай часткай культурнага асяроддзя народа, яго светаадчування і светаразумення. Тапанімічныя найменні любога рэгіёна змяшчаюць у сабе звесткі пра найважнейшыя этапы гісторыі, матэрыяльнай і духоўнай культуры народа, якая яго сфарміравала. Амаль за кожным анамастычным фактам стаіць гістарычная – рэальная або выдуманая – нацыянальная рэчаіснасць, адносна якой у носьбітай мовы ўзнікаюць тыя ці іншыя краіназнаўчыя асацыяцыі. Тапонімы, ужытыя пісьменнікам у прааналізаваных намі творах, рэальна суадносяцца з геаграфічнай прасторай Беларусі, прадстаўляюць нашу краіну сваім зместавым напаўненнем і займаюць асаблівае месца ў моўнай карціне свету герояў В. Быкава, якія пражываюць у той ці іншай мясцовасці.

У мове даследаваных літаратурных твораў тапонімы выконваюць не проста намінатыўную функцыю – перш за ўсё яны ўказваюць на рэгіянальную прыналежнасць аб'екта, на тое, дзе, у якіх мясцінах Беларусі адбываюцца апісаныя падзеі: *Брест, Витебск, Двинск, Кобрин, Лида, Минск, Орша, Полоцк, Слоним.* Напрыклад, *Лида: "Пленных они уже видели на шоссе, под Лидой"* [Карьер]. Мяркуюць, што ўзнікненне тапоніма *Ліда* (горад у Гродзенскай вобласці) звязана з асаблівасцямі мясцовасці, якія некалі абумовілі ўзнікненне гэтага геаграфічнага наймення. Назва паходзіць ад праславянскага слова *ляда* 'дзялянка высечанага лесу, лясны выцераб, высечка; расчышчанае месца ў лесе пад пасеў або пад сенажаць'. Паселішча ўзнікла на той выцерабленай мясціне, дзе некалі шумеў лес.

Што да назвы *Слонім*, то трэба адзначыць наступнае: паводле тапанімічных звестак, гэты горад на Гродзеншчыне атрымаў сваю назву ад старабеларускага слова *ўслон* 'прыслонены да дзвярэй цытадэлі вялізны камень для аховы'. З цягам часу прыставачнае *у* знікла, у выніку чаго і з'явілася сучасная назва *Слонім*: *"Двенадцать суток пробиралась из-под Слонима на восток небольшая группа артиллеристов…"* [Сотников].

У гэтую групу тапонімаў можна аднесці і назву горада *Гродна*, у аснове якой ляжыць слова *горад*, якім у старажытнасці абазначалася абгароджаная мясціна, дзе сяліліся людзі, будавалі замкі, памяшканні, каб жыць і займацца рамёствамі: *"Через неделю в Сельцо выезжает следователь, участковый, какое-то духовное начальство из Гродно"* [Обелиск].

Паходжанне назвы *Гомель* таксама звязана з асаблівасцямі мясцовасці. Яна паходзіць ад верхнялужыцкага слова *гомила* 'ўзгорак, насыпаны над пахаваным нябожчыкам, магіла'. Можна меркаваць, што першаму чалавеку, які заклаў тут паселішча, пасля яго смерці

насыпалі курган (гамілу) і пачалі называць *Гоміл*, што з цягам часу загучала як *Гомель: "«Где родился?» – «Под Гомелем»"* [Сотников].

Дастаткова вялікая колькасць назваў населеных пунктаў звязана сваім паходжаннем з гідронімамі – імёнамі, утворанымі ад найменняў воднага басейна – ракі, возера, балота і інш. Сярод іх – назва *Мінск*, якая сустракаецца ў мове рамана В. Быкава "Кар'ер": *"Знаю Марию, в Минске живет. Окончила иняз, работает в школе"* [Карьер] (тапонім паходзіць ад назвы ракі *Менка (Мень)*. Ад гідронімаў, як лічаць даследчыкі, паходзяць таксама назвы такіх гарадоў, як *Віцебск* (ад назвы ракі *Віцьба* – прытока Заходняй Дзвіны): *"Это приехали какие-то экспедиторы из Витебска…"* [В тумане]; *Полацк* (ад назвы ракі *Палата*): *"Родители были под боком, в Полоцке, но я все решала сама"* [Карьер]; *Орша* (на рацэ *Рша* – ад *Ржа, Ржаўка,* што азначае 'рака з іржавай вадой'): *"…мотался в Оршу к знакомому железнодорожному начальнику…"* [В тумане]; *Двинск* (ад назвы ракі Дзвіна): *"Одно время он жил под Двинском, в десяти верстах от города"* [Карьер]; *Лепель* (паводле адной з версій, назва паходзіць ад латышскага *ліепа (ліпа)* у значэнні 'возера сярод ліпавых лясоў': *"…он отправился в деревню под Лепель, где, помним, была какая-то родственница…"* [Круглянский мост]; *Слуцк* (ад назвы ракі *Случ*): *"А едва вспыхнуло это восстание за независимость, подался в Слуцк…"* [На черных лядах] і інш.

Найбольш поўна мясцовы каларыт ствараюць айконімы (назвы вёсак, мястэчкаў, станцый), большасць з якіх яскрава выяўляе асаблівасці прыродна-ландшафтнага характару Беларусі. Некаторыя тапанімічныя назвы такога тыпу адлюстоўваюць сацыяльна-культурныя адметнасці жыцця беларусаў і ўспрымаюцца як абсалютна натуральная і заканамерная з'ява ў "айканімічным ландшафце" быкаўскай прозы.

У залежнасці ад паходжання гэтыя назвы можна падзяліць на некалькі груп:

1) назвы, паходжанне якіх звязана з асаблівасцямі прыродна-ландшафтнага характару мясцовасці. Да ліку такіх тапанімічных найменняў варта аднесці назвы *Зарудичи* (можна меркаваць, што беларуская назва *Зарудзічы* ўтварылася ад слова *руда* 'балота з камякамі, глыбамі, пластамі вокісаў жалеза, жалезістай іржы'; сама вёска знаходзілася за балотам): *"Вунь был в Зарудичах выпадок…"* [Волчья стая]; *Загора́ны* (вёска, якая знаходзілася за гарой): *"Ну, больше деревень не будет, – вздохнул Маслаков. – Загораны спалены…"* [Круглянский мост]; *Озерки* (відаць, у мясцовасці, дзе знаходзіцца гэтая вёска, шмат азёр): *"Вчера под Озерками, когда нас танки турнули…"* [Журавлиный крик]; *Круглянка* (ад дыял. *круглянка* 'азярына круглай формы на лузе'; таму можна меркаваць, што назва вёскі звязана нейкім чынам з круглай формай паселішча): *"В Круглянку треба пойти. Целая веска была"* [Волчья стая]; *Кругляны* (назва суадносіцца з папярэдняй назвай і тлумачыцца формай паселішча ў выглядзе круга): *"Кругляны показались*

еще издали – длинный ряд разномастных крыш на пригорке с дорогой” [Круглянский мост]; *Корчевка* (паходжанне назвы звязана са словам *корч* ‘пень, вывернуты з зямлі з карэннем’): *“Рыбак мог оказаться в той их Корчевке – маленькой, глуховатой деревеньке у леса”* [Сотников]; *Лясины* (відаць, вёска была акружана лясамі, знаходзілася ў лясістай мясцовасці, сярод лесу)*: “Лясины. Лясины деревня”, – полная внимания и еще не прошедшего испуга отвечала тетка”* [Сотников]; *Глиняны* (магчыма, вёска знаходзіцца ў гліністай мясцовасці): *“Правда, Рыбак чувствовал, что после неудачи в Глинянах они немного запаздывают…”* [Сотников]; *Березянка* (сваё найменне вёска атрымала ад назвы рэчкі *Беразянка*, па абодвух берагах якой стаялі хаты): *“Тут такое дело. Должен появиться один мужик из Березянки… Деревня такая в шести километрах”* [Карьер]; *Шнуры* (ад слова *шнур* ‘надзел у выглядзе вузкай палоскі зямлі’): *“Был кто в Шнурах? …Славная деревушка на горе при лесочке”* [Круглянский мост].

2) назвы, паходжанне якіх звязана з асаблівасцямі расліннага свету Беларусі. Да іх ліку аднясём такія найменні вясковых паселішчаў, як *Залозье* (можна меркаваць, што вёска была размешчана за лазнякамі): *“Залозье тут где-то, – отвернувшись, сказал ездовой. – Не спалено еще было”* [Волчья стая]; *Зубровка* (ад *зуброўка* ‘шматгадовая травяністая расліна, якую выкарыстоўвалі для прыгатавання настоек, гарэлкі’): *“…они бы с облегчением поехали в Зубровку, где были свои люди и где можно было обогреться…”* [В тумане]; *Шипшиновичи* (ад назвы дзікай ружы *шыпшына*): *“…Шипшиновичи невядома, уцалели али нет? При лесе стоять”* [Волчья стая]; *Подосиновики* (назва матывуецца назоўнікам *падасінавік*): *“Вон зимой Маланчука в Подосиновиках застрелил”* [Круглянский мост]; *Смоляны* (ад слова *смала*, бо побач з вёскай знаходзіўся смалісты бор): *“…боковая дорожка через лужок – прямо в деревню Смоляны возле соснового бора”* [Карьер] і інш.

3) назвы, паходжанне якіх звязана з сацыяльна-культурнымі асаблівасцямі жыцця беларусаў. Напрыклад, *Хотули* (ад слова *хатуль* (разм.) вялікі клунак рэчаў, звязаных у хустку ці посцілку, які звычайна носяць за плячамі’): *“Сбор на северной окраине деревни Хотули. Понятно?”* [Карьер]; *Выселки, Слободские Выселки* (ад *выселкі* ‘невялікае паселішча на новым месцы, якое выдзелілася з іншага населенага пункта’): *“Грибоед с семьей жил на Выселках – так называлась деревня, стоявшая в стороне от больших дорог”* [Волчья стая]; *“В Слободских Выселках тоже все было тихо…”* [Знак беды]; *Княжево* (можна меркаваць, што вёска была заснавана выхадцамі з княжацкага роду, які некалі пражываў на яе месцы): *“Километрах в трех от райцентра, может, знаешь, есть село Княжево”* [Обелиск]; *Купцы* (магчыма, асноўную частку насельніцтва, якое пражывала на тэрыторыі вёскі, складала купецтва): *“После разгрома в ночном бою под Купцами он отбился от полка…”* [Дожить до рассвета].

Сустракаюцца назвы вёсак, паходжанне якіх без цяжкасцей тлумачыцца зместам твора. Напрыклад, *Недолище: "Это произошло, когда сын перебрался в район и совсем забыл дорогу в Недолище"* [Облава]. Вядома, што лёс галоўнага героя аповесці "Аблава" быў вельмі цяжкім: усе родныя і блізкія яму людзі памерлі, а адзіны сын адрокся свайго бацькі. У канцы твора загінуў і сам герой. Нядоля, пастаянныя страты, жыццёвыя няўдачы, гора суправаджалі яго на працягу ўсяго жыцця (магчыма, гэта адбывалася таму, што ён нарадзіўся ў вёсцы з назвай *Нядолішча*).

Выклікаюць цікавасць таксама такія ўжытыя В. Быкавым як у арыгінале, так і ў перакладзе айканімічныя назвы *Сяльцо* (рус. *Сельцо*) і *Стараселле* (рус. *Староселье)*. Маючы агульны корань *сел-*, уласныя назоўнікі семантычна звязаны з абазначэннем розных паняццяў: так, *Сяльцо* – гэта невялікае па памеры вясковае паселішча, а *Стараселле* абазначае ранейшае, даўнішняе паселішча, на якім раней былі хутары. Абедзве гэтыя назвы сустракаюцца ў кантэксце быкаўскага перакладу: *"Так в Сельце завелися школьные собаки"* [Обелиск]; *"Осенью в Староселье на засаду нарвались"* [Круглянский мост].

Для мастацка-рэалістычнага апісання, дакладнага ўзнаўлення геаграфічных, прыродных умоў жыцця герояў твораў пісьменнік выкарыстоўвае мікратапонімы – назвы невялікіх геаграфічных аб'ектаў, што знаходзяцца побач з населенымі пунктамі. Сярод ужытых у перакладах мікратапонімаў можна вылучыць шэраг назваў геаграфічных аб'ектаў з выразным лінгвакраіназнаўчым кампанентам значэння. Сярод іх звяртаюць на сябе ўвагу наступныя групы тапанімічнай лексікі:

1) назвы лясоў і пушчаў тыпу *Боровский лес* (лес калісьці належаў пану Бароўскаму): *"Каким-то необъяснимым чутьем лейтенант понял это сразу, как только увидел его на подернутой утренним туманом просеке в Боровском лесу"* [Дожить до рассвета]; *Крыжовский лес* (ад *крыжняк* 'хвойны лес паміж дзвюх дарог' [123, с. 356]): *"Осенью в Крыжовском лесу тот был ранен осколком в живот…"* [Сотников]; *Лисичанская пуща: "И сестры нету. Убили весной в Лисичанской пуще"* [Волчья стая]; *Козельская пуща: "Первого уже нет, а второй раненым остался где-то в Козельской пуще"* [Круглянский мост]; *Воловская пуща: "Хотелось скорее вернуться назад, в Воловскую пущу, к своим шалашам…"* [В тумане]. Паходжанне трох апошніх тапанімічных найменняў звязана з назвамі дзікіх звяроў ці свойскіх жывёл – *ліса, казёл, вол* адпаведна.

2) назвы рэк і азёр тыпу *Деревянка* (назва рэчкі паходзіць ад слова *дерево*): *За сосняком самолеты разбомбили мост через болотистую Деревянку* [Знак беды]; *Залесское озеро* (знаходзіцца за лесам): *"Он едва держался за край кузова своей полуторки, стремительно катившийся под углом по дороге к Залесскому озеру"* [В тумане]; *Круглянка* (рака мае звілістае, кругападобнае рэчышча): *"Где-то там, петляя между болотистых берегов, текла речка Круглянка"* [Круглянский мост].

3) назвы ўрочышчаў. Напрыклад, *Чернолесское урочище* (ад *чарналессе* ‘лісцёвы лес’): *“Левчуку живо припомнился теперь страшный расстрел Грибоеда и его удивительное воскресение в Чернолесском урочище…”* [В тумане]; *Волчьи ямы* (ад *ямы* – паглыбленыя участкі зямлі, дзе, па чутках, знаходзяцца логавы ваўкоў): *“Первые несколько месяцев просидели в лесу на Волчьих ямах – урочище так называется…”* [Обелиск].

4) назвы мастоў. Напрыклад, *Круглянский мост* (ад назвы рэчкі *Круглянка*): *“Ничего! На Круглянский мост хватит, – успокоил его командир”* [Круглянский мост]; *Выспянский мост* (ад *выспа* ‘пясчаны насып у рацэ, які намыты вадой; высокае пясчанае месца’): *“А тут новый начальник перебрасывает их на железнодорожное закругление перед Выспянским мостом…”* [В тумане].

Сустракаюцца таксама назвы хутароў, якія семантызуюць асаблівасці сацыяльнага ўкладу і вядзення беларусамі гаспадарчай дзейнасці ў мінулыя часы. Напрыклад, *Старый Двор: “Приволоклись мы в Старый Двор – хутор такой близ леса…”* [Обелиск].

Такім чынам, выкарыстанне тапанімічнай лексікі ў перакладах твораў В. Быкава тлумачыцца, у асноўным, неабходнасцю мастацка-рэалістычнага апісання, дакладнага ўзнаўлення геаграфічных асаблівасцей пэўнай тэрыторыі, а таксама тым, што з дапамогай тапонімаў даецца шырокае апісанне падзей Вялікай Айчыннай вайны на Беларусі, называюцца месцы ваенных сутычак і баявых дзеянняў. Апрача таго, многія героі нярэдка распавядаюць пра сваё жыццё, успамінаючы пры гэтым назвы гарадоў, вёсак, мястэчкаў, дзе яны нарадзіліся, пабывалі, жылі, змагаліся з ворагам. Даследаваны з пункту гледжання лінгвакраіназнаўчай спецыфікі корпус тапанімічных назваў, якія функцыянуюць у перакладах твораў В. Быкава на рускую мову і служаць для ідэнтыфікацыі тых ці іншых геаграфічных аб’ектаў, нясе рускамоўнаму чытачу ўнікальную інфармацыю пра нацыянальную рэчаіснаснасць беларускага народа.

Вывады

У цэлым выкарыстанне на старонках празаічных твораў В. Быкава моўных адзінак з нацыянальна-культурнай афарбоўкай “працуе” на захаванне этнакультурнай спецыфікі як арыгінальнага, так і перакладнога тэксту, стварэнне нацыянальнай карціны свету беларусаў, сведчыць пра лінгвакраіназнаўчую адметнасць і нацыянальную непаўторнасць быкаўскага мастацкага тэксту, дазваляючы пранікнуць у духоўны свет герояў.

Усе разгледжаныя вышэй моўныя адзінкі, што функцыянуюць у творах В. Быкава (у тым ліку і перакладах на рускую мову), – гэта толькі частка таго багатага і разнастайнага фактычнага матэрыялу, які змяшчае

ў сабе ўнікальную лінгвакраіназнаўчую інфармацыю, адлюстроўваючы глыбіні народнага духу, культуры, свядомасці, звычаяў і вераванняў беларускага сялянства.

Надзвычай цікавую і пазнавальную з лінгвакраіназнаўчага пункту гледжання інфармацыю нясуць у сабе такія моўныя адзінкі, як найменні прадметаў і з'яў традыцыйнага беларускага побыту, безэквівалентныя ў рускамоўным дачыненні словы з рознай семантыкай, анамастычная лексіка з нацыянальна-культурнай афарбоўкай.

У перакладах прозы В. Быкава на рускую мову лінгвакраіназнаўчую маркіраванасць атрымалі шматлікія беларусізмы, ужытыя перакладчыкам не толькі з мэтай больш дакладнай перадачы "нацыянальнага" ў змесце твораў, але і з мэтай знаёмства прадстаўнікоў іншай моўнай супольнасці з фонавай лексікай, што служыць для абазначэння прадметаў і з'яў рэчаіснасці, якія маюць аналагі ў культуры рускага народа, але характарызуюцца нацыянальнымі адметнасцямі іх функцыянавання. Выкарыстанае В. Быкавым беларускае нацыянальнае слова ў рускамоўным тэксце спрыяе захаванню спецыфічнай этнабытавой атмасферы перакладу.

Прааналізаваны з пункту гледжання лінгвакраіназнаўчай спецыфікі моўны матэрыял, выбраны з аўтарскіх перакладаў твораў Васіля Быкава на рускую мову, сведчыць пра тое, наколькі глыбока ў перакладным мастацкім тэксце могуць атрымаць моўнае ўвасабленне нацыянальныя асаблівасці рэчаіснасці беларусаў як лінгвакультурнай супольнасці, іх культурна-этнаграфічныя традыцыі і сацыяльна-бытавыя ўмовы жыцця ў мінулым.

Раздзел 4
НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАЯ СПЕЦЫФІКА ПАНЯЦЦЯ “РАДЗІМА” Ў МОВЕ ТВОРАЎ РЫГОРА БАРАДУЛІНА

Слова паэта – народа працяг.
С. Панізнік

Рыгор Барадулін… Паэт з Ушаччыны…

Яго літаратурная творчасць складае гонар і славу сучаснай беларускай паэзіі. У сусветнай літаратуры ён годна прадставіў Беларусь, якая мае багаты скарб – таленавіты, горды, працавіты і гасцінны беларускі народ са сваёй Мовай і Культурай. Барадулінскія літаратурныя творы адлюстроўваюць і ўвасабляюць непаўторнае этнакультурнае аблічча нас, беларусаў.

У айчыннай літаратуры Р. Барадулін – народны паэт Беларусі, крытык, перакладчык, грамадскі дзеяч – выступае як адзін з тых паэтаў, феномен творчасці якога выяўляе шанаванне ўсяго свайго, беларускага, крывіцкага.

Наш зямляк, творчасць якога жывілі ўшацкія азёры і крыніцы, на ўвесь голас, па-свойму, па-беларуску заявіў: “Глядзіце ўсе, якія мы, беларусы!” І зрабіў гэта на той мове, на якой, на жаль, не маглі расчытаць у шведскай Акадэміі яго ўнікальны жыццёвы даробак – зборнік духоўнай паэзіі “Ксты”, за які ў 2006 годзе Р. Барадулін быў намінаваны ў галіне літаратуры на званне Нобелеўскага лаўрэата.

Паэтычны тэкст Р. Барадуліна – гэта ўнікальны і па-свойму непаўторны спосаб пазнання свету і спасціжэння краіназнаўчых рэалій і этнакультурнай адметнасці беларусаў, у тым ліку іх нацыянальнага менталітэту. Барадулінская паэтычная спадчына дае надзвычай каштоўны матэрыял для рэпрэзентацыі нацыянальнай карціны свету беларускага народа, прадстаўніком якога ён з’яўляецца.

Творчасць нашага паэта-земляка нясе ў сабе вялікі лінгвакультуралагічны патэнцыял. Таму, відаць, невыпадкова сучасны беларускі паэт М. Скобла пераканаўча сцвярджае: “…Барадулін рана ці позна стане культурным брэндам Беларусі” [6, с. 8]. Паэтычны талент Р. Барадуліна, якога літаратурныя крытыкі справядліва называюць “каралём метафары”, вызначаецца артыстычнай моватворчасцю і віртуозным валоданнем мовай.

Трэба адзначыць, што метафарычнае бачанне свету з’яўляецца адной з вызначальных рыс барадулінскай паэзіі. Багацце яркіх і дакладных метафар у мове твораў сведчыць пра яго неардынарнае мысленне, своеасаблівае ўспрыняцце свету, навізну і нечаканасць поглядаў пісьменніка на звыклыя і будзённыя для беларусаў прадметы і рэаліі навакольнай рэчаіснасці.

4.1 Лінгвакраіназнаўчы змест паняцця “Беларусь”

У моўнай тканіне паэтычных твораў Р. Барадуліна паняцце “Беларусь” рэпрэзентуецца ў асноўным праз наступныя лексічныя адзінкі: *Беларусь, Радзіма, Бацькаўшчына, Айчына*. З пералічаных лексічных сродкаў, дзякуючы якім адбываецца рэпрэзентацыя паняцця “Беларусь”, самай распаўсюджанай у мове паэзіі з’яўляецца лексічная адзінка *Беларусь*. Напрыклад: *“З сабой Беларусь насіў па белым свеце, дзе толькі я ступаў, там і яна была”* [Збор твораў 2]; *“Імя тваё нашчадкам з нетраў выплыве – сівых стагоддзяў рэха: – Беларусь!..”* [Збор твораў 1]; *“Дзятлінка снежнарутая, як сляза па Радзіме, чыстая… Таксама і Беларусь мая на ўзмежках цвіла і выстаяла”* [Белая яблыня грому]. У апошнім прыкладзе важную сэнсавую нагрузку нясе займеннік *мая*, праз які паэт падкрэслівае сваю знітаванасць з Радзімай.

Хочацца звярнуць увагу на наступны паэтычны радок, пабудаваны на аснове разгорнутага параўнання: *“Як яблык, крамянае і хрупаткое слова марознае: «Беларусь»”* [Белая яблыня грому]. У прыведзеным прыкладзе найбольшую вобразнасць утрымліваюць у сабе прыметнікі *крамяны* і *хрупаткі*. Крамянае – гэта значыць моцнае, поўнае сілы і непадуладнае нікому; хрупаткое – гэта значыць кволае, далікатнае, тое, што трэба аберагаць і шанаваць.

Варта адзначыць, што Р. Барадулін пры ўжыванні назоўніка *Беларусь* часта выкарыстоўвае прыметнік *святая,* тым самым падкрэсліваючы чысціню, высакароднасць і ўзвышанасць сваіх пачуццяў да Радзімы: *“Веру, і тым жыву, веру, і тым існую, у Богам дадзеную, а значыць святую Беларусь праўкрасную самую”* [Збор твораў 3];*“Наша зямля святая: не жалезны характар руды мае наша зямля святая* [Евангелле ад Мамы] і інш.

Трэба заўважыць, што этнонім *Беларусь* у якасці афіцыйнай назвы нашай краіны стаў ужывацца параўнальна нядаўна. Нагадаем, што ў XIX ст. у складзе Расіі беларускія землі канчаткова страцілі сваю этнічную назву, ператварыўшыся ў паўночна-заходнюю ўскраіну імперыі (“северо-западный край”). Доўгі час не ўжывалася нават слова *беларусы*. У рускамоўным друку выкарыстоўвалася назва *“белорусцы”* (для жыхароў усходняй часткі Беларусі), жыхароў заходніх земляў называлі *“литвинами”* ці *“литвяками”*. Назва *“северо-западный край”* як частка Заходняга краю Расійскай імперыі выкарыстоўвалася ў тыя часы ў адносінах да шасці губерняў – Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай. Царскі ўрад ігнараваў не толькі дзяржаўную самастойнасць, але і этнічную, моўную, культурна-рэлігійную адметнасць беларускага народа. Беларускую мову называлі дыялектам *(“наречием”)* велікарускай мовы.

Пра гэта з дакорам гаворыць Р. Барадулін: *“Северо-западным назвалі край і дыялектам людскую мову”* [Збор твораў 3]. Зусім па-іншаму, з замілаваннем і ўлюбёнасцю гаворыць паэт пра сваю родную зямлю,

выкарыстоўваючы для яе назву *Белая Русь*: *“На Белай Русі днеюць белыя світкі”* [Абсяг]. Паводле розных меркаванняў, назва *“Белая Русь”* паходзіць ад прыметніка *белы* – менавіта такім быў колер вопраткі насельніцтва этнічных зямель Беларусі, а таксама колер валасоў нашых продкаў. Апрача таго, *белая* – значыць чыстая, свабодная Русь, незалежная ў старажытнасці ад мангола-татар і літоўскіх феадалаў.

У паэтычнай мове Р. Барадуліна назоўнік *Радзіма*, які выкарыстоўваецца ў якасці яшчэ адной назвы Беларусі, рэалізуецца ў двух значэннях: 1) ‘краіна, якая гістарычна належыць пэўнаму народу’: *“Настальгія па настальгіі – гэта й ёсць да Радзімы любоў”* [Збор твораў 2]; 2) ‘месца нараджэння паэта’: *“З радзімак тых складаецца Радзіма, але Радзіма ў кожнага – свая”* [Вечалле]. Пры аналізе моўнага матэрыялу звяртае на сябе ўвагу прадстаўленая разнастайнымі лексічнымі сродкамі група намінацый, праз якія семантызуецца лексічная адзінка *Радзіма* ў першым значэнні: *“Без Радзімы, як стэп, усмяг, знасіліся чорныя бровы”* [Збор твораў 3]; *“Радзіма – дол і паднябессе тое, дзе ходзіць слова Бога пехатою”* [Ксты]; *“Радзіма будзе жыць без мяне, мяне без Радзімы не будзе”* [Вечалле].

Сярод іншых найменняў Беларусі Р. Барадулін дастаткова часта выкарыстоўвае назоўнікі *Айчына: “І як бы чужакі ні хацелі зруйнаваць Айчыну, напякуць упарта праснакі духу напаміну і ўспаміну”* [Трэба дома бываць часцей]; *“Тут са стагоддзямі вялі вайну, не толькі палявалі на дзічыну. Адстрэльвалі святую даўніну, тут выбівалі думку пра Айчыну”* [Евангелле ад Мамы]; *Бацькаўшчына: “Гараць бальзамінкі зоркамі малалецтва ў цёплым космасе незабытай бацькаўшчыны”* [Збор твораў 2]; *“Нас турылі з Бацькаўшчыны, з Дзедзіны…”* [Збор твораў 2] і інш. Глыбокую сэнсавую нагрузку нясуць у сабе моўна-выяўленчыя сродкі, якія канкрэтызуюць разгледжаныя вышэй лексічныя адзінкі *Беларусь, Айчына, Бацькаўшчына.* У мове паэзіі Р. Барадуліна сустракаюцца наступныя эпітэты-азначэнні ў спалучэнні з названымі словамі: *беларуская; святая; Богам дадзеная (Беларусь); незабытая (Бацькаўшчына); забраная (Айчына)* і інш.

Асобнай увагі заслугоўваюць аналітычныя двухкампанентныя найменні са значэннем ‘Радзіма як краіна, якая гістарычна належыць пэўнаму народу і якую гэты народ насяляе’. Напрыклад, *родная зямля: “Нам у вольных дрэваў павучыцца, як за родную зямлю трымацца”* [Ксты]; *родная старана: “Яго забрала, як вайна, у рэкруты святая справа – даць думку роднай старане”* [Трэба дома бываць часцей]; *родная хата: “Ці ў роднай хаце, рубленай з вякоў, мы будзем глухнуць, быццам кватаранты”* [Евангелле ад Мамы]; *родны край*: *“Змагайся, родны край з бядой”* [Трэба дома бываць часцей]. У прыведзеных прыкладах галоўным сэнсаўтваральным кампанентам выступае прыметнік *родны (родная)*. Паэт ужывае гэтае слова, каб падкрэсліць сваю знітаванасць з Радзімай.

У наступных двухкампанентных найменнях, дзе галоўная сэнсаўтваральная функцыя належыць прыметніку *крывіцкі*, Р. Барадулін адзначае, што на тэрыторыі Беларусі некалі пражывала старажытнае племя крывічоў, з якога і паходзіць частка беларускага народа. Існуе меркаванне, што назоўнік *крывічы* ўтварыўся ад слова *кроў* (г.зн. ‘сваякі па крыві’, ‘крэўныя людзі’). Як вядома, крывічы – гэта старажытнае племя, якое ў старажытнасці пражывала на тэрыторыі паўночнай часткі сучаснай Беларусі. Напрыклад, *крывіцкі край: “Пароўну поўдню, поўначы і ўсходу, і захаду, каб у вачах азёр крывіцкі край раскалыхаў лагоду”* [Евангелле ад Мамы]; *“Як восеньскі туман, ляны, на ўскрайку вечнасці крывіцкі край абжыты быў паганскімі багамі”* [Руны перуновы]; *зямля крывіцкая: “І зямля крывіцкая звыкае бачыць прыходняў, як сны благія”* [Руны Перуновы]; *хата крывіцкая: “Хай беларус беларуса будзе любіць як брата. Светлая імем Ісуса наша крывіцкая хата”* [Міласэрнасць плахі]; *глыбінна-крывіцкая старана*: *“Наша глыбінна-крывіцкая старана з балцкай падсветкай плыла часцяком лодкаю”* [Міласэрнасць плахі].

Паняцце малой радзімы выступае неад’емнай часткай аўтарскага асэнсавання Беларусі. Для называння малой радзімы – Ушаччыны – Р. Барадулін ужывае разнастайныя двухкампанентныя найменні тыпу *вушацкія мясціны: “Збіраюся ў вушацкія мясціны”* [Евангелле ад Мамы]; *родныя мясціны: “Мясціны родныя чытаю запоем”* [Збор твораў 3]; *край маленства: “Дыміся бульбай, край маленства”* [Збор твораў 2]; *ушацкі край: “І ўшацкі край, што ў непагадзі выстаяў, як шчыт надзейна-родны за спіной”* [Збор твораў 2]; *вушацкая хата: “Не адлучаўся я зусім з вушацкай хаты анікуды”* [Руны Перуновы]; *“У вушацкай хаце за спагадным сталом сяджу і Дамавіка чакаю”* [Збор твораў 3]; *ушацкая старана: “Завецца Ушацкай старана, там Селішчы і Старына, Бычкі, і Дольцы, і Гарані, і Чарапоўшчына* [Трэба дома бываць часцей]; *далечы родныя: “І асланяючы далечы родныя, толькі сарока бялее з куста…”* [Міласэрнасць плахі]; *матчына хата: “Неба роднае толькі над матчынай хатай”* [Ксты]; *“Зноў адзін пакідаю матчыну хату, ганак самотны, журботны ранак”* [Белая яблыня грому]; *бацькава хата: “Быццам у дзверы глухія, посахам грукаю ў дол, дзе стаяла бацькава хата”* [Евангелле ад Мамы]; *“Ад бацькавай хаты ўранні дадымліваўся дымок”* [Вечалле]. Як бачна з прыведзеных вышэй прыкладаў, вялікая сэнсаўтваральная роля ў семантызацыі малой радзімы належыць прыметнікам. Самымі распаўсюджаннымі з іх з’яўляюцца такія лексічныя адзінкі, як *ушацкі (край), (в)ушацкая (хата, зямля, старана)*. У сваім значэнні яны змяшчаюць указанне на геаграфічнае размяшчэнне малой радзімы паэта. У мове даследаваных вершаў паняцце “Радзіма” знаходзіць шырокую рэалізацыю праз вобраз маці, таму аўтар вельмі часта ўжывае словазлучэнне *матчына хата*, праз якое якраз і семантызуецца паняцце малой радзімы.

У працэсе характарыстыкі лінгвакраіназнаўчай спецыфікі паэтычнай мовы Р. Барадуліна выяўлены не толькі агульныя словазлучэнні-намінацыі, праз якія рэпрэзентуецца паняцце “Радзіма”, але і ўласныя найменні, што непасрэдна звязаны з месцам нараджэння аўтара. Менавіта праз ужыванне айконімаў у паэтычным дыскурсе рэалізуецца другая дэфініцыя назоўніка *Радзіма* – ‘месца нараджэння’. Вялікая колькасць яго вершаў прысвечана менавіта ўшацкаму краю: “Заінелая Ушаччына”, “Трыпціх Ушаччыны” і інш. Як адзначае А.Э. Астраух, “Р. Барадуліна няма без зялёна-блакітнай Ушаччыны. Ён адкрыў яе, заявіў пра яе ўсяму свету” [5, с. 25].

Нацыянальная спецыфіка мовы паэзіі Р. Барадуліна выразна выяўляецца не толькі праз сістэму лексічных адзінак-апелятываў, але і праз шматлікія ўласныя імёны, у першую чаргу тапонімы, якія ўяўляюць сабой значную частку анамастыкону паэта і, выступаючы ў якасці носьбітаў лінгвакраіназнаўчай інфармацыі, даволі поўна і глыбока рэпрэзентуюць этнакультурны змест паняцця “Радзіма”.

У працэсе даследавання мовы паэзіі аўтара выяўлены разнастайныя словаформы айконіма *Ушаччына.* У іх ліку такія тапанімічныя найменні, як *Ушаччына: “Сцежка да кладак травой пазначана… Дзень добры, мама! Паклон, Ушаччына”* [Белая яблыня грому]; *“Спакоем мяне сустракае Ушаччына”* [Абсяг]; *Вушаччына: “Нават страшна дыхнуць – маладыя аблокі над Вушаччынай ціха плывуць”* [Збор твораў 1]; *Вушача: “Табе ў вякі, а мне ў Вушачу”* [Трэба дома бываць часцей]; *“Рыпіць расчулена бярэзіна. Шэпча стрыманы чарот: – Ву-ша-ча”* [Збор твораў 3]; *“У згадках ксцілася Вушача”* [Руны Перуновы]; *Вушачы: “Начуе золь па шатах. Па некім каня плача. Вушачы – мой пачатак, і мой канец – Вушача”* [Евангелле ад Мамы]. Як сведчыць прыведзены ілюстрацыйны матэрыял, пераважаюць размоўныя, народна-гутарковыя варыянты геаграфічнага наймення з прыстаўным гукам *в*, што не з’яўляецца нарматыўным і не кадыфікавана ў афіцыйнай назве гарадскога пасёлка *Ушачы*.

Паэт, як вядома, нарадзіўся на хутары Верасоўка, што на Ушаччыне. З асаблівай любоўю і пяшчотай аўтар паэтызуе родны хутар, які ласкава называе *Верасовачкай: “Ці прымеш госця, Верасовачка – дачка вясёлых верасоў?”* [Трэба дома бываць часцей]; *“Ля Верасовачкі стаю. Ралля шарэе ў снегастоі”* [Евангелле ад Мамы]; *“Упала з пагорка галавою на захад, і асірацела роднае котлішча – Верасовачка”* [Трэба дома бываць часцей]. Адзначым, што назва вёскі *Верасоўка* паходзіць ад назвы вечназялёнай расліны *верас*, якая ў духоўнай культуры беларусаў выступае сімвалам вернасці, памяці і надзеі на лепшую будучыню.

У якасці ўласных лексічных рэпрэзентантаў сваёй малой радзімы Р. Барадулін ужывае шматлікія айконімы – найменні блізкіх і дарагіх з дзяцінства вёсак і мястэчкаў, у аснову назваў якіх пакладзены асаблівасці прыроды Беларусі ці сацыяльна-культурныя адметнасці жыцця нашага народа ў мінулыя часы: *“…каб наведаць свае мясціны – Глыбачкі,*

Жывалкі, Замошшы” [Збор твораў 3]; *“Я сцяжыне далонь залачу жаўталісцем з бяроз Беразвечча”* [Евангелле ад Мамы]; *“Дзе сцежкамі сінімі ступаюць калядачкі, ёсць вёска па імені Мокрыя Кладачкі”* [Абсяг]; *Завецца Ушацкай старана, там Селішчы і Старына, Бычкі, і Дольцы, і Гарані, і Чарапоўшчына”* [Трэба дома бываць часцей]; *“У Кавалёўшчыне ўтравеў курганок ад хаты, дзе жылі Грышчаняты”* [Збор твораў 3]; *“Заўжды я ў цяжкую часіну ўспамінаю блакаду, лес каля вёскі вушацкай Пліна і маму гукаю – Куліна”* [Збор твораў 3] і інш.

Найбольш поўна мясцовы каларыт у мове паэтычнага кантэксту Р. Барадуліна ствараюць айконімы, праз якія выразна семантызуюцца прыродна-ландшафтныя асаблівасці роднай яму Ушаччыны. У мове паэзіі аўтара ўжываюцца айконімы, утвораныя ад лексічных адзінак, якія абазначаюць жывёльны і раслінны свет або даюць уяўленне пра геаграфічныя асаблівасці пэўнай мясцовасці: *Гайкі* (утворана ад *гай* ‘невялікі лісцёвы лес’): *“Боль жыве, па Гайках, па Ваўчах – вытыркаюцца вёсак скабіны”* [Вечалле]; *Арэхаўка* (утворана ад *арэх* ‘плод некаторых дрэў, кустоў з ядомым ядром у цвёрдай абалонцы, шкарлупіне, а таксама дрэва ці куст, які дае такія плады’), *Замошша* (утворана ад *мох* ‘споравая расліна без каранёў і кветак, якая сцелецца або расце прама ў вільготных мясцінах, на дрэвах ці камянях’), *Плігаўкі* (утворана ад *плігаўка* ‘дыялектная назва пліскі, невялікай птушкі атрада вераб’іных’): *“Арэхаўка, Замошша, Плігаўкі – прыціхлі вёскі ў веснім гудзе”* [Трэба дома бываць часцей]; *Журавінка* (утворана ад *журавіны* ‘ягадная вечназялёная расліна, якая расце на мохавых балотах, а таксама ягады гэтай расліны’), *Кулікі* (утворана ад *кулік* ‘невялікая птушка памерам з дразда’): *“Бяруць у прымакі і вёска Журавінка, і вёска Кулікі”* [Абсяг] і інш.

Як паказвае прааналізаваны моўны матэрыял, для іменавання тапанімічных аб’ектаў сваёй малой радзімы Р. Барадулін ужывае вялікую колькасць айконімаў. Яны выконваюць не толькі намінатыўную функцыю, але і адлюстроўваюць ментальнасць землякоў паэта, змяшчаюць у сабе звесткі пра духоўную і матэрыяльную культуру беларусаў, сацыяльна-эканамічнае развіццё і прыродна-геаграфічнае асяроддзе Беларусі.

4.2 Семантызацыя паняцця “народ”

Для Р. Барадуліна змест паняцця “Радзіма” быў дастаткова шырокім і сэнсава ёмістым. Радзіма – гэта гэта не толькі тое месца, дзе ён нарадзіўся і сталеў, дзе прайшло яго маленства і юнацтва, але гэта яшчэ і людзі, якія жылі і працавалі побач з ім. Аўтар у пэўнай ступені збліжае сэнс паняццяў “Радзіма” і “народ”, паказваючы іх непарыўнае адзінства: *“Без радзімы народа няма, без народа няма радзімы”* [Вечалле]. Нягледзячы на шматлікія перашкоды і выпрабаванні, якія на працягу гісторыі выпалі на лёс нашага

народа, беларусы як нацыя захавалі сябе. Аптымістычны настрой аўтара адчуваецца ў наступным метафарычным выразе: *“У дзяжы гісторыі вякі пакідаюць на завод рашчыну Нацыі”* [Міласэрнасць плахі].

Паводле манаграфічнага даследавання К.С. Півавар “Беларуская ментальнасць у моўнай прасторы мастацкага тэксту”, паняцце “народ” (у аўтара канцэпт “народ”) выступае як увасабленне дамінантных рыс беларускай ментальнасці і “ў мове хрэстаматыйнай літаратуры рэпрэзентуецца праз наступныя моўныя адзінкі: *беларусы, браты, братцы, народ, мой народ, наш народ, беларускі народ, нашчадкі Каліноўскага, сыны Радзімы, дочкі, сыны, землякі, сцішаны і грозны народ, …, грамадзяне беларускія, нашы людзі, мужны і адвечны народ, беларускі сярмяжны народ, сын герояў і багоў, унукі Скарыны, ліцвіны, тутэйшыя, русіны, люд, беларускія людзі, грамада, мазольных рук мільёны, дзеці Беларусі, люд паспаліты, палешукі”* [90, с. 56]. Значная частка прыведзеных лексічных адзінак мае выразную нацыянальна-культурную канатацыю і дастаткова шырока ўжываецца ў мове паэтычных твораў Р. Барадуліна.

У аўтара сустракаецца вельмі дакладнае апісанне ўласцівых беларусам рыс характару, асаблівасцей іх менталітэту і светабачання, а таксама нормаў моўных паводзін. Найбольш яскрава дадзена характарыстыка асноўных рыс характару беларускай этнічнай супольнасці ў вершы “Мы – беларусы”, у якім паэтызуюцца такія якасці нашага народа, як сціпласць і самаахвярнасць. Станоўчую характарыстыку беларусам дае паэт у наступных выразах: *“Саміх сябе хваліць нам не з рукі…, …гатовы ўсё аддаць – і тым багаты”* [Збор твораў 1], заўважаючы таксама і нашы недахопы, у тым ліку гістарычнае беспамяцтва: *“Ахвотна забываем, што мы, хто мы”* [Збор твораў 1].

У барадулінскіх паэтычных творах за кошт выкарыстання яркіх і трапных метафарычных выразаў вельмі дакладна апісваюцца асаблівасці менталітэту беларусаў як этнічнай супольнасці ў цэлым, іх паводзіны і рысы характару. Так, адной з вызначальных рыс нашага народа з’яўляецца працавітасць. Уменне і жаданне працаваць, адказнасць за вынікі сваёй працы ва ўсе часы высока цаніліся ў беларусаў. Пацверджаннем гэтага з’яўляецца метафарычны выраз *з сёмым потам кнігу ворыва гарталі*, у структуры якой паэт трапна і семантычна ёміста называе ворную зямлю *кнігай ворыва*: *“Я – арыец, гэта значыць з аратаяў. На зямлі жылі не для харчоў, з сёмым потам кнігу ворыва гарталі”* [Выбраныя творы]. У значэнні прыведзенай метафары рэпрэзентуецца думка пра тое, што паэт паходзіць з працоўнай сялянскай сям’і, чым вельмі ганарыцца. Сцвярджаецца таксама, што беларусы, якія са старажытных часоў займаліся пераважна земляробствам, спасцігалі “філасофію жыцця” менавіта праз авалоданне гэтай сялянскай справай.

З мэтай паказу свайго народа-працаўніка пісьменнік выкарыстоўвае і іншыя метафарычныя выразы, у структуры якіх утрымліваюцца

лексічныя адзінкі-рэпрэзентанты *плуг*, *ток*, *цэп*, *сноп*, *хлеб* і інш., што семантызуюць асноўныя віды і прылады сельскагаспадарчай працы беларусаў, адлюстраваных у наступных паэтычных радках: *“Ад плугоў, а не ад мечаў мазалі”* [Евангелле ад Мамы], дзе выяўляецца не толькі працавітасць, але і міралюбівы характар беларусаў: *“На таку свой лоб не кволіць цэп”* [Евангелле ад Мамы]; *“Сноп засватаў ніву”* [Евангелле ад Мамы]; *“Надзеяй жыве земляроб, хлебароб, у рабстве надзённага хлеба”* [Евангелле ад Мамы]. Паэт зазначае, што толькі *“дурныя – не аруць, не сеюць”* [Евангелле ад Мамы], і раіць кожнаму, хто хоча ўбачыць плён сваёй працы, шчыраваць на зямлі кожны дзень: *“Аддай усё, што ёсць у цябе, раллі – субботы, гоням – нядзелі. Старайся раніцай у сяўбе”* [Евангелле ад Мамы].

У мове Р. Барадуліна адзначаюцца прыклады ўвядзення вобразных асабовых найменняў, якія нясуць у сабе надзвычай цікавую лінгвакраіназнаўчую інфармацыю. Для стварэння сацыяльнага партрэта нашага народа аўтар выбірае гаваркое прозвішча *Селянінавічы*, якое падкрэслівае сялянскае паходжанне беларусаў як нацыі: *“Шукалі работы самай цяжкой ільновалосыя Селянінавічы”* [Збор твораў 3]. Яшчэ адно трапнае гаваркое найменне ў дачыненні да характарыстыкі беларусаў паэт выкарыстаў у вершы “Бульбяная балада”, дзе назваў беларусаў *бульбянікамі*: “*Мы – бульбянікі, не абраза гэта фраза. Апошняю кропкаю ў канцы жыццёвага сказа стане некалі бульба сопкая…”* [Трэба дома бываць часцей].

У моўнай тканіне барадулінскіх паэтычных твораў сустракаецца метафара, якая сваім зместам семантызуе генезіс беларускага народа і вытокі такой вызначальнай рысы большасці нашых землякоў, як цярплівасць: *“Род наш радавод вядзе з таго, калі Гасподзь яшчэ ў лагодзе прымеркаваў, каго сяліць і дзе, суцешыў крывічоў: Трывай, Народзе!”* [Евангелле ад Мамы]. Цярпімасць беларусаў выяўляецца праз мову верша “Дык як?”: *“Плечы горбілі нам абраз хатулі́, гнеў свой насілі мы ў рэзгінах ды ў бярэмцах. Мы былі, мы жылі пры паляках, расейцах, пры немцах. Маўчалі ў кулак”* [Евангелле ад Мамы]. У апошнім паэтычным кантэксце аўтар згадвае складанае гістарычнае мінулае нашага народа ва ўмовах польскага, рускага ды нямецкага засілля. Выкарыстаныя Р. Барадуліным такія размоўныя словы з побытавай семантыкай, як *хатуль* ‘вялікі клунак рэчаў, звязаных у хустку ці посцілку, які звычайна носяць за спінай’, *рэзгіны* ‘прыстасаванне насіць сена, салому, зробленае з вяровачнай сеткі, нацягнутай на сагнутыя пруткі або дужкі’ ўзмацняюць семантычны змест паэтычнага выразу, падкрэсліваючы сялянскае паходжанне і беднасць занядбанага беларускага народа.

Імкненне да працы, адказнасць за яе вынікі ва ўсе часы высока цаніліся ў беларусаў, што і знайшло адлюстраванне ў вершаваных творах праз ужыванне парэміялагічных адзінак: *“…бо дурных – не аруць, не сеюць – нараджаюцца*

самі, каб не сумна на свеце было мудрацам” [Збор твораў 3]; *“Паміраць сабірайся, а жыта сей – крывічы спрадвеку казалі”* [Збор твораў 3]; *“Хто скупа сее, той скупа жне, хто шчодра сее, шчодра збірае”* [Збор твораў 3]. Прыведзеныя народныя афарызмы, якія ўжываюцца ў тых ці іншых вершаваных кантэкстах, яшчэ раз пацвярджаюць думку пра тое, што беларусы здаўна былі ратаямі, іх заняткам, як вядома, была праца на зямлі. Так, у вершы “Веды” аўтар з дапамогай фразеалагічных адзінак *стаяць рукі ў бокі* і *сядзець склаўшы рукі* апісвае штодзённыя гаспадарчыя клопаты сваёй маці-працаўніцы: *“Так і не спасцігла цяжкой навукі – стаяць рукі ў бокі, сядзець склаўшы рукі”* [Збор твораў 3]. Пры дапамозе ўстойлівых моўных адзінак аўтар дае людзям як станоўчую, так і адмоўную характарыстыку: *“А з цябе, з тваёй каргі, хцівы чалавечак, ані чорту качаргі, ані богу свечак”* [Збор твораў 3] – менавіта так кажуць у народзе пра хцівага і сквапнага чалавека.

Адмоўную семантыку змяшчае ў сабе нацыянальна-маркіраваны фразеалагізм *хварэць на пана* ‘доўга спаць, вылежвацца; лайдачыць, ухіляючыся ад працы’: *“Усміхнуўся бацька рахмана: абы сын не хварэў на пана”* [Збор твораў 3]. Ужытая фразеалагічная адзінка, на думку вядомага беларускага мовазнаўца-лексікографа і фалькларыста XIX ст. І.І. Насовіча, утворана пад уплывам устойлівага словазлучэння *панская хвароба*, якое ўжываецца іранічна пры ацэнцы таго, хто з-за ляноты прытвараецца хворым і не ідзе на работу.

Агульнапрынятых нормаў паводзін і ўзаемаадносін беларусаў прытрымліваецца і сам паэт, які звяртаецца да сваіх землякаў так: *“Хай жа ў зміры ўсе суседзі без нуды жывуць, не сварацца задзіры. Адзін другога просяць шчыра няхай на свежыну заўжды”* [Збор твораў 1]. Р. Барадулін неаднаразова падкрэсліваў гасціннасць, як адну з найважнейшых этнічных адзнак беларусаў, якія ва ўсе часы заўсёды былі рады гасцям: *“Мы ўсім сваёй гасціннасцю вядомы, надзейныя сябры і землякі”* [Збор твораў 1]. У хрэстаматыйным вершы “Трэба дома бываць часцей” аўтар зазначае, што чалавек не павінен забываць свой бацькоўскі дом – яму проста неабходна *“помніць свой на іржышчы цень, не забыць, як завуць суседа, не забыць, як пяе пад дзень за вясельным сталом бяседа”* [Збор твораў 1]. Для Р. Барадуліна Радзіма – гэта яшчэ і яго суседзі, родныя і сваякі паэта: *“Забытая радня, мае сябры, суседзі не ў невядомым недзе – усе ўва мне штодня”* [Вечалле].

Маўленчая дзейнасць чалавека, як і любыя іншыя яго сацыяльныя паводзіны, рэгламентуюцца пэўнымі правіламі моўнага этыкету. Станоўчую ацэнку ў моўнай карціне свету нашага народа атрымаў такі тып вербальных паводзін, які характарызуецца стрыманасцю і праўдзівасцю ў размовах: *“Трымайся, рабро, хоць не соладка. Гаварыць – серабро, маўчаць – золата* [Збор твораў 3]; *“Хлеб з соллю еш, – а праўду рэж!”* [Збор твораў 3].

У барадулінскім паэтычным радку знаходзім цікавую інфармацыю пра моўныя паводзіны беларусаў. Моўныя звароты ветлівасці, якія сустракаюцца ў даследаваным моўным матэрыяле, характарызуюць беларусаў як гасцінны народ, які мае трывалыя застольныя традыцыі: *“Позна прыйдзеш – ласкава скажуць: – хлопец не жвавы, каб шырэй ступаў, дык на чарку б папаў: пояць хмельнай сытою, кормяць стравай сытою. Адразаюць акрайчык, каб быў сын Мікалайчык”* [Збор твораў 1]. У сваіх творах аўтар звяртае ўвагу на яшчэ адну характэрную рысу моўнага этыкету беларусаў – добразычлівасць. Гэта рэпрэзентуецца праз трапныя народныя выразы:*“І па-вушацку зноў я хачу пажадаць сваяку, каб даў яму Бог здароўя у ручкі, у ножкі і паміж рог трошкі”* [Збор твораў 3]; *“Пажадалі брату Іваньку, бы з казкі герою, у дарожным настроі: – Вялік расці, дзевак басці”* [Збор твораў 3].

Адносна шматлікіх народных традыцый Р. Барадулін гаворыць так: *“Традыцый многа павялося. Між іншых я люблю адну, калі – ці то зімой, ці ўвосень – сусед суседа шчыра просіць на навіну, на свежыну”* [Збор твораў 1]. Насамрэч, вясковым жыхарам спрадвеку былі ўласцівы цесныя стасункі паміж сабою ў паўсядзённым жыцці, таварыскасць, імкненне заўсёды прыйсці суседу на выручку або аказаць яму ў чымсьці дапамогу, што і падкрэсліваецца ў вершы “Дома”: *“Тут ні адзін не абміне, пагутарыць і распытае. І як жыццё, і як настрой... Зайшоў бы на бліны, – парой мне кіне цётка-жартаўніца”* [Збор твораў1].

Варта адзначыць, што паэт у сваіх творах уводзіць так званы вобраз “ушацкіх людзей”. Менавіта праз паводзіны і ўзаемаадносіны, лад жыцця, псіхалагічныя адзнакі характару яго землякоў з Ушаччыны адбываецца рэпрэзентацыя нацыянальнай карціны свету большасці беларусаў. Аўтар акцэнтуе ўвагу на такія іх ментальныя характарыстыкі, як залішняя сарамлівасць, жаданне быць “такімі, як усе”, а таксама асуджае ганарлівасць і пыху асобных людзей: *“На тых, хто шарахаўся зайцом у хлудзе, пазіралі з дакорам, бо вышэй над усім ушацкія людзі ставілі сорам; добра таго біць, каму баліць, добра таго лаіць, хто сорам маіць. Калі хто ў шляхту ціснуўся... з яго кпілі ўсмак”* [Збор твораў 3]. Адмоўная характарыстыка “ўшацкім людзям” даецца Р. Барадуліным у наступных радках, дзе дзякуючы прыёму гіпербалізацыі трапна высмейваецца неадукаванасць і п’янства некаторых з іх: *“Наогул паэзіі тут не чытаюць – ані класічнай, ані навейшай…, па выпітай гарэлцы раён наш займае першае месца ў вобласці”* [Збор твораў 3]. Між тым, нягледзячы на гэтыя сацыяльныя заганы ў жыцці сваіх землякоў, пісьменнік падкрэслівае іх працавітасць: *“Землякі мае выпіць могуць, але і не зломкі на працу”* [Збор твораў 3].

Асобную групу слоў, што ствараюць нацыянальна-гістарычны фон у паэтычным дыскурсе Р. Барадуліна, складаюць антрапонімы – імёны і прозвішчы герояў літаратурных твораў – прадстаўнікоў беларускага народа. Для Р. Барадуліна Радзіма – гэта яго маці, суседзі, аднавяскоўцы, родныя і

сваякі. Варта адзначыць, што аўтар шырока выкарыстоўвае традыцыі беларускага нацыянальнага іменаслова з захаваннем фанетычных асаблівасцей жывой беларускай мовы. Напрыклад, *Хвэлька*: *“Ад вясёлых жартаў Хвэлькі як не трэснуць з смеху бэлькі”* [Збор твораў 2]; *Піліп, Грышка*: *“Адпілікаў на скрыпцы Піліп, засталася без Грышкі Грышчыха”* [Вечалле]; *Стэхван, Зося, Тэкля*: *“Каб рэй вялі, касілі, храп’е секлі сяўцы і кавалі – Стахваны, Зосі, Тэклі”* [Трэба дома бываць часцей]; *Мікола, Варвара, Аўдакея*: *“Малацілі і веялі зярняты спагады, надзеі, заклапочаныя, ды не хмурыя Міколы ды Юр’і, Варвары ды Аўдакеі”* [Трэба дома бываць часцей] і інш.

Пры іменаванні жанчыны для гутарковай беларускай мовы характэрны адназоўнікавыя ўтварэнні з суфіксам *-іх*-(а), *-ых*-(а) са значэннем ‘жонка таго, хто названы словаўтваральнай асновай’, пра што сведчыць наступныя прыклады: *“Хоць Петушыху язычніцай звалі за доўгі язык…”* [Збор твораў 2]; *“Была жанчына краўчыхай Яніхай”* [Збор твораў 2]; *“Выбеглі ў сяле суседзі нашы з вёдрамі – Максіміха, Казліха”* [Трэба дома бываць часцей]; *“Дзе ходзіць боссю Барнасіха дасюль, ледзь толькі сыдзе снег”* [Трэба дома бываць часцей]; *“Ехала з вяселля баба Грышчыха”* [Вечалле] і інш. Р. Барадулін часам і сам адзначае самабытнасць народнага іменаслова беларусаў: *“Міклашэўская Феліцыя Антонаўна, матка хросная мая (па-ўшацку – Фэля)”* [Збор твораў 2].

Як заўважалася вышэй, у паэта паняцце “Радзіма” знаходзіць дастаткова шырокую рэпрэзентацыю праз вобраз маці, які з’яўляецца традыцыйным у беларускай літаратуры. Значнасць фігуры маці ў нацыянальнай свядомасці нашага народа мае сваю гістарычную перадумову. На Беларусі, дзе дзяржаўнасць на працягу апошніх стагоддзяў несла ў сабе адзнакі запаволенасці, а жыццё грамадства больш было “звернута да зямлі і зліта з зямлёй і прыродай”, – адпаведна паднялася фігура маці, як апора існавання менавіта беларускага этнасу.

Р. Барадулін фактычна стварыў культ маці ў сучаснай беларускай паэзіі (“Мама”, “Вогнепаклонніца”, “Не ведаючы тэорыі вольных вершаў”, “Веды”, “У адкрытым космасе”, “Ашуканка”, “Багіня”, паэмы “Трыпціх”, “Блакада”, “Вяртанне ў першы снег” і інш.). Па словах В. Быкава, вобраз маці паэта сведчыць пра сілу сыноўняй любові – “можа, самай самаадданай любові ў сучаснай беларускай паэзіі” [6, с. 4]. Сам Р. Барадулін пісаў так: “*І калі б была воля мая на тое – пачаў бы я азбуку менавіта з літары М: яе і ўсё на зямлі, усё ў нас пачынаецца з Маці. Усё ад маці, усё з-пад матчынага сэрца”*. Далей паэт падкрэслівае: *“Маці адна, маці незаменная… Маці адна, як і Радзіма”* [Збор твораў 1].

Вобраз маці Акуліны Андрэеўны, у імені якой увасобіліся традыцыі нацыянальнага іменаслова, амаль цалкам узяты з натуры і ўбірае ў сябе вобразы малой радзімы-Ушаччыны і Радзімы-Беларусі: *“Маці завуць Кулінай”* [Збор твораў 2]. У вершы “Радзіме” неаднаразова падкрэсліваецца

знітаванасць паняцця “Радзіма” з вобразам маці: *“Мамы не стала – не стала Радзімы”* [Евангелле ад Мамы]. Свой жыццёвы вопыт, багаты прыродны дар і незвычайную чуласць да слова Акуліна Андрэеўна перадала ў спадчыну сыну: *“Не ведаючы тэорыі вольных вершаў, не чуўшы нічога пра факт існавання авангардызму, мама лісты мне пісала верлібрам”* [Збор твораў 2]. Паэтам глыбока асэнсоўваюцца “веды” малапісьменнай маці, якая *“ведала, што да чаго на небе, у лузе, у хаце”* [Збор твораў 2]. У вершы “Багіня” аўтар зазначае, што яго маці была добрай гаспадыняй: *“Куліна – Багіня кухні. Багоўнічала ля катла”* [Евангелле ад Мамы]. Падобны сэнс закладзены таксама ў метафарычным выразе *слухалі цябе і нож, і сподак* [Вечалле].

У мове паэтычнай спадчыны Р. Барадуліна можна выдзеліць вельмі багаты асацыятыўны рад, звязаны з вобразам маці:

1) маці – пачатак жыцця: *“Зямля і маці кормяць усіх”* [Збор твораў 2];

2) маці – увасабленне ідэалу працавітасці, чалавечай шчодрасці і дабрыні: *“Маці сталярыла і цяслярыла без гэблі, без ватэрпаса”* [Збор твораў]; *“Мамы няма – шчырасці не стае, мамы няма – дні мае без яе…”* [Збор твораў 1];

3) маці – зберагальніца і ўвасабленне маральных каштоўнасцей, створаных чалавецтвам на працягу стагоддзяў: *“Сумленне, якое завецца словам кароткім – мама”* [Збор твораў 2];

4) маці – увасабленне святасці, пасрэдніца паміж Богам і зямлёй: *“Маці не нараджаюцца, іх пасылае Бог кожнаму, каб чалавекам застацца мог”* [Ксты]; *“Мама – пасрэдніцца паміж Богам і сынам – дзеліцца небам і хлебым адзіным”* [Ксты]; *“Мама – мая небадарная Біблія, якая мяне да жыцця прыручыла”* [Ксты];

5) маці – сімвал святла, чысціні (паэт часта параўноўвае маці з сонцам): *“Маці не стала – сонца зайшло”* [Ксты]; *“Пакуль жывая маці, сонца днюе й начуе ў хаце”* [Ксты].

Адзначым, што сонца ў разуменні беларусаў – гэта не толькі прыродная з’ява, але і прадукт культуры, які мае пэўны сэнс, накоплены ў выніку практычнага і духоўнага асваення прыроды. Менавіта таму гэтае слова, як сімвал дабра, цеплыні, пяшчоты, у славян акружана станоўчым сэнсавым арэолам і асацыюецца з матуляй.

Устойлівымі сімваламі барадулінскай паэзіі сталі словазлучэнні *матчына хата* і *матчын парог.* Ва ўяўленні аўтара матчына хата – гэта нібы летапіс народнага жыцця, сімвал Радзімы, з якой, “калі страціш сувязь, перастаеш існаваць як чалавек – нацыянальна” [116, с. 89]. Тое, што ў паэтычных творах, замест словазлучэння *бацькава хата, бацькоўская хата* (сустракаюцца толькі адзінкавыя выпадкі фіксацыі), вельмі часта ўжываецца словазлучэнне *матчына хата*, тлумачыцца, відаць, тым, што Р. Барадулін вельмі рана страціў бацьку і яго выхаваннем займалася маці, якая адна падымала яго на ногі і стала для будучага паэта галоўным апірышчам у жыцці. Аўтар метафарызуе словазлучэнне *матчына*

хата праз рысы, уласцівыя сваёй маці: *“Матчына хата слухае*: *...круглым вокам глядзяць шпакоўні, – матчына хата слухае”* [Збор твораў 3]; *“...матчына хата слухае, ці ўсё на зямлі спакойна?”* [Збор твораў 2]; *“Матчына хата пільнуе*: *і матчына хата пільнуе з-пад даху”* [Трэба дома бываць часцей]; *“Маміна хата сустракае*: *цяпер, калі б я ні прыязджаў, сустракае вечная маміна хата”* [Евангелле ада Мамы]. Падкрэсліваючы сваё вясковае паходжанне, аўтар параўноўвае матчыну хату са сціплай сялянкай: *“Сялянка сціплая – матчына хата пры самай дарозе ўдавее”* [Збор твораў 3]. Словазлучэнне *матчын парог* у мове паэта – сімвал неадназначны: парог – гэта і пачатак жыцця, і сімвал нараджэння, і, наадварот, адыход чалавека ў іншы свет: *“А я і канец і пачатак сваіх дарог як мог прывязваў, бывала, да парога матчынай хаты”* [Евангелле ад Мамы].

Такім чынам, даследаваны моўны матэрыял, які семантызуе змест паняцця “народ”, з’яўляецца дастаткова глыбокім і цікавым носьбітам нацыянальна-культурнай інфармацыі пра беларускі этнас і яго найважнейшыя ментальныя адзнакі.

4.3 Семантызацыя традыцыйнай народнай культуры

У рэпрэзентацыі нацыянальна-культурнай спецыфікі паняцця “Радзіма” ў мастацкім дыскурсе Р. Барадуліна вялікую ролю адыгрываюць лексічныя адзінкі і моўна-выяўленчыя сродкі, праз якія адбываецца трансляцыя матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў.

Р. Барадулін праз сістэму моўных адзінак вельмі глыбока і дакладна адлюстроўвае традыцыйную народную культуру этнасу, да якога належыць. А гэта найперш духоўны змест жыццядзейнасці, традыцыі, вераванні, звычаі і асаблівасці рытуалаў беларусаў у мінулыя часы. Духоўная культура знаходзіць сваё адлюстраванне праз апісанне народных свят, звычаяў і традыцый беларусаў, асаблівасці іх светапогляду і інш.

Лексічнымі рэпрэзентантамі нацыянальнай духоўнай культуры нашага народа ў паэтычнай мове Р. Барадуліна выступаюць найперш уласныя імёны, якія семантызуюць блізкія і знаёмыя паэту з дзяцінства народныя абрады, звычаі і святы беларусаў, іх прыкметы і павер’і, рэлігійнае светабачанне, міфалагічныя ўяўленні продкаў пра існаванне звышнатуральных сіл.

Фарміраванне светапогляду беларускай нацыі адбывалася пад уплывам не толькі культурных традыцый і сацыяльных фактараў. Значную ролю ў жыцці людзей як у ранейшыя часы, так і сёння адыгрываюць рэлігія і міфалогія, як сродкі выражэння светабачання народа і яго ўяўленняў пра навакольны свет. Славянская этнічная супольнасць за доўгія стагоддзі свайго фарміравання выпрацавала цэлую сістэму рэлігійных вобразаў-сімвалаў, якія ўвасобіліся ў лексічных адзінках.

На тэрыторыі Беларусі з даўніх часоў існавала дзвюхвер'е: язычніцтва і хрысціянства. Язычніцтва, у асноўным, з'яўлялася бытавой рэлігіяй сялянства з яго натуральнай гаспадаркай, патрыярхальным ладам жыцця, поўным залежнасці ад сіл прыроды. У старажытнасці многія сяляне патаемна выконвалі язычніцкія абрады. Створанае дзвюхвер'е сустракаецца і сёння, дазваляючы славянскаму язычніцтву мірна суіснаваць з усходнім і заходнім хрысціянствам. Сінтэз язычніцкага і хрысціянскага светапогляду заўважаецца і ў паэзіі Р. Барадуліна.

У мове сваіх твораў аўтар даволі часта звяртаецца да беларускай міфалогіі. У яго паэзіі змешчаны амаль увесь пантэон язычніцкіх багоў. У іх ліку *Пярун* 'вярхоўны бог у старажытных славян-язычнікаў, бог нябеснага агню': *"Стаў між нябёсамі і зямлёй Пярун пасрэднікам душы"* [Вечалле]; *"Пярун зрабіў даміны са срэбраных бярвён"* [Збор твораў 3]; *Ярыла* 'старажытнае язычніцкае бажаство, якое сімвалізуе вясновую абуджаную прыроду і пачуццёвае каханне': *"Ярыла, вусы распрамень, расшчодрыся на свята"* [Збор твораў 3]; *Зюзя* 'міфічная істота, увасабленне холаду, бог зімы, яго ўяўляюць старым, з белымі, як снег, валасамі і доўгай сівой барадой': *"У белым расхрыстаным кажусе, босы ходзіць Зюзя сівабароды"* [Збор твораў 3]; *"Зюзя ў белым кажусе грукаецца…"* [Збор твораў 3]; *Велес* 'апякун багацця і хатняй жывёлы': *"Нябёсы ў жудасці сумеліся, ды помняць тую хмару шэрую, з якой зямля яшчэ пры Велесе свянцілася паганскай вераю"* [Евангелле ад Мамы]; *Жыцень* 'антрапаморфная істота ў міфалагічных павер'ях беларусаў, якая ўплывае на выспяванне ўраджаю': *"А Жыцень – дзяцюк невысокі, паджары, падцяты"* [Збор твораў 3]; *Чур* 'міфічная істота, добры дух, які засцерагае межы гаспадаркі': *"Праверыў межы нябачны Чур, надземную ўсю гасподу"* [Збор твораў 3]; *Ляля* 'багіня вясны, кахання, прыгажосці': *"Весялей расце трава. Гэта ў гожай Лялі жаўранкі вылятаюць з рукава"* [Збор твораў 3] і інш.

Узгадваюцца паэтам і такія міфічныя істоты, як *ваўкалак* 'у славянскай міфалогіі – чалавек-пярэварацень, які валодае звышнатуральнай здольнасцю ператварацца ў ваўка, а потым – зноў станавіцца чалавекам': *"...дзе плачуць шчырыя ваўкалакі"* [Збор твораў 3]; *дамавік* 'ва ўсходнеславянскай міфалогіі – дух-ахоўнік дамашняга ачага': *"А вось і Сам, Гаспадар, Дамавік ці з печы злез, ці выйшаў з запечка"* [Міласэрнасць плахі]; *"Чакаюць улазінаў дамавікі"* [Евангелле ад Мамы]; *русалка (русалачка)* 'жанчынападобная істота, увасабленне воднай і лясной стыхій': *"Русалачка-латгалачка, хмялей смялей"* [Збор твораў 3]; *лесавік* 'чалавекападобная казачная істота, якая жыве ў лесе і наводзіць жахі як нячыстая сіла': *"Сны аржаныя, сны баравыя – свае ў русалак, у лесуноў"* [Евангелле ад Мамы]. Паэт марыць стварыць запаведнік, *"дзе б жылі вясновыя сны, вадзянікі і чэрці, русалкі і лесуны"* [Трэба дома бываць часцей].

Як адзначалася вышэй, сёння ў большасці традыцыйных абрадаў беларусаў адлюстроўваюцца як хрысціянскія, так і язычніцкія рэлігійныя

плыні. Найбольш яскрава на сінтэз рэлігій указваюць народна-побытавыя святы, якія спрадвеку адзначаліся беларусамі. Многія з іх маюць "паганскія" карані, аднак падчас хрысціянізацыі набылі новы статус. У мове паэзіі Р. Барадуліна сустракаюцца шматлікія назвы свят і прысвяткаў беларускага народнага календара. Сабраны моўны матэрыял раскласіфікаваны намі паводле цыклаў, абумоўленых порамі года.

Зімовы цыкл ў паэтычнай мове Р. Барадуліна ўтрымлівае назвы некаторых свят, што спрадвеку адзначаліся беларусамі і былі знакавымі ў іх рэлігійным светапоглядзе.

Каляды – гэта свята, якое адзначаецца з 6 студзеня па 21 студзеня. Аўтар ў мове сваіх твораў вельмі ярка і дакладна апісаў калядныя святы, з усімі звычаямі і абрадамі іх святкавання. Паэт падкрэслівае, што менавіта з Калядамі ў нашага народа звязаны надыход зімы*: "Мы гаворым, як зіма ідзе недзе ў нас з Калядамі"* [Трэба дома бываць часцей]. У гонар гэтага свята ў кожнай хаце рабілі святую вячэру, на якой абавязковай стравай была куцця 'каша з абтоўчаных у ступе зярнят ячменю або пшаніцы': *"Цераз пушчы, цераз гаці, цераз ляды абагрэцца куццёю ў хаце ішлі Каляды"* [Евангелле ад Мамы]. Звараная куцця ставілася на покуце: *"Вядома, стаіць на куце куцця, ячмень адпакутваў у ступе"* [Міласэрнасць плахі]. Гэта свята суправаджалася абрадам хаджэння па хатах з віншаваннем і валачобнымі песнямі.

Да зімовага цыкла адносіцца таксама хрысціянскае свята *Хрышчэнне (Вадохрышча)*, якое адзначаецца 19 студзеня. У гэты дзень праводзіцца рытуал асвячэння вады, пра што ўзгадваецца ў паэтычным дыскурсе Р. Барадуліна: *"Вадохрышча – воля вадзе, марозу – сцюдзяная доля"* [Евангелле ад Мамы].

У паэтычнай мове аўтара комплекс звычаяў і абрадаў веснавога перыяду асабліва багаты і разнастайны. Іх семантызуюць шматлікія найменні. Напрыклад, *Масленіца* 'гадавое свята, якое адзначалася як праводзіны зімы і сустрэча вясны': *"Пост падняў кабыле хвост, а там – Масленіца"* [Збор твораў 3].

Самымі вялікімі гадавымі святамі вясны спрадвеку лічыліся *Благавешчанне, Вялікдзень, Радаўніца*. Свята *Благавешчанне (Звеставанне)* адзначаецца штогод 7 красавіка. Традыцыйна лічыцца, што на Благавешчанне звычайна прылятаюць буслы на Радзіму: *"Благавешчанне, Звеставанне – дзень прылёту буслоў"* [Збор твораў 2].

Вялікдзень (у аўтара – *Вялічка*) – веснавое хрысціянскае свята, прысвечанае ўваскрэсенню Ісуса Хрыста. Р. Барадулін па-мастацку дакладна апісвае звычаі і традыцыі гэтага свята: *"Прыходзіла Вялічка на сяло з чырвоным яйкам, з белатварым сырам"* [Руны Перуновы]; *"У сене – каб цёпла і цёмна – я памідоры бацьку спяліў і фарбаваў на Вялічка яйкі шалупкамі ад цыбулі"* [Збор твораў 3]. Як бачна з прыведзеных вышэй прыкладаў, у цэнтры велікоднай абраднасці знаходзіцца яе своеасаблівы

сімвал – пафарбаванае яйка. Аўтар, каб больш яскрава апісаць традыцыйную святочную ежу беларусаў, ужывае ў дадзеным кантэксце метафарычны выраз *белатвары сыр.*

Радаўніца – гэта дзень памінання памерлых ва ўсходніх славян, на якім са старажытных часоў адбываліся трапезы на магілах бацькоў і блізкіх сваякоў, пацверджанне чаму знаходзім у наступным паэтычным радку: *"На Радаўніцу свечку запалю. Схілюся. Змоўкну. Ціха памалюся…"* [Евангелле ад Мамы].

Самымі значнымі святамі летняга цыкла ў нашых продкаў былі *Купалле, Пятро, Ілля*, якія і сустракаюцца ў даследаваным моўным матэрыяле. *Купала* 'старажытнае свята летняга сонцастаяння ва ўсходніх славян, якое святкуецца ў ноч з 23 на 24 чэрвеня старога стылю': *"Сягоння ж Купала, што ні зробіш – прапала..."* [Збор твораў 3]. У сваіх вершах Р. Барадулін даволі цікава і падрабязна апісвае абрады і традыцыі гэтага свята. Купалле заўсёды суправаджалася песнямі і танцамі каля вогнішча, дзяўчаты апоўначы ішлі шукаць Папараць-кветку: *"Заціхла мора, ды шэпча ў скалы Купальскай песні прыбой ласкавы"* [Трэба дома бываць часцей]; *"Колы з'езджаныя паляць крывічы. Перад цемрай правінілася Купалле"* [Евангелле ад Мамы]; *"Кветка Папараць спалохана цвіце, як душа, што з раю вытурылі ў пекла"* [Евангелле ад Мамы]. У народнай свядомасці беларусаў гэтая кветка з'яўляецца сімвалам шчасця. Такім чынам, традыцыйнае свята беларусаў *Купалле* семантызуецца ў мове паэтычнага радка Р. Барадуліна праз наступныя моўныя адзінкі: *Купалле, купальская песня, кветка Папараць.*

Пятро – праваслаўнае свята, якое адзначаецца 12 ліпеня і звязана з ушанаваннем апосталаў Пятра і Паўла: *"Без мяне да Пятра венікаў навязалі"* [Трэба дома бываць часцей]. Варта адзначыць, што ўласныя імёны Павел і Пётр даволі актыўна ўжываюцца ў беларускім нацыянальным іменаслове. Аўтар пры апісанні гэтага свята выкарыстоўвае народную прыкмету: *"Прыйшоў Пятрок, сарваў лісток"* [Збор твораў 3].

Ілля – свята ў гонар Святога прарока Іллі, якое адзначаецца 2 жніўня: *"Прыйшла Ілля, нарабіла гнілля",* – сведчыць народная мудрасць [Евангелле ад Мамы]. Як бачым, нашы продкі прыкмецілі, што пасля свята Іллі псавалася добрае надвор'е і сонечныя дні змяняліся дажджлівымі.

Восеньскі цыкл свят у мове паэзіі Р. Барадуліна выглядае больш сціпла. Сустракаюцца такія найменні, як *Пакравы* – у праваслаўных вернікаў старажытнае рэлігійнае свята Пакрова Прасвятой Багародзіцы, якое адзначаецца 14 кастрычніка і ў беларускім народным календары азначала ў мінулыя часы канец збору ўраджаю, пачатак зімы і вяселляў, *Дзяды* – назва некалькіх народных свят, якія адзначаліся ў розныя часы года ў гонар памерлых продкаў: *"Дзякуй Пакравам, Дзядам, Калядам, што чакалі з даўнасці мяне"* [Збор твораў1]; *Траецкія* ці *Змітраўскія дзяды* 'абрад памінання нябожчыкаў, а таксама дзень, калі ён выконваецца': *"Калі не з Траецкімі па вясне, дык хоць жа са Змітраўскімі дзядамі…"*

[Евангелле ад Мамы]. Аўтар па-мастацку апісвае беларускія звычаі і абрады, звязаныя са святам *Дзяды: "Вылучна беларускі сапраўдны ён, звычай, звечаны святымі святамі, каб са жніва пакінуць на Дзяды галодным птушкам каласкі з зярняткамі"* [Руны Перуновы"]; *"Каб ты варыў заўсягды, як на Дзяды"* [Збор твораў 2]. Сапраўды, рознай смачнай ежы ў гэты дзень на стале ў нашых продкаў было даволі многа.

У традыцыйнай абраднасці беларусаў асобае месца займае *Піліпаўка* – перадкалядны пост у праваслаўных вернікаў, які, атрымаўшы назву ў гонар вялікага прапаведніка Святога апостала Піліпа, доўжыцца шэсць тыдняў перад Раством Хрыстовым. Гэты час вызначаўся раней самымі моцнымі маразамі і завеямі. У Піліпаўку ваўкі і сабакі пачынаюць ладзіць вяселлі: *"І ў лясах успамінаў замроеных цёпла выюць ваўкі ў Піліпаўку"* [Евангелле ад Мамы].

Сямейныя святы беларусаў таксама знайшлі адлюстраванне ў мове паэзіі Р. Барадуліна. Гэта такія назвы, як *хрэсьбіны (хрышчэнне)* 'адно з хрысціянскіх таінстваў, рэлігійны абрад прыняцця ў лік вернікаў, далучэнне да царквы і наданне асабовага імя: *"Там на хрэсьбінах, на запоінах ці завеі, ці й скрыпкі пілікаюць"* [Збор твораў 2]; *заручыны* 'ў вясельнай абраднасці абрад аб'яўлення жаніхом і нявестай', *запоіны* 'абрад выпівання чаркі як згоды сваякоў на заручыны': *"Ані заручын, ані запоін. Жывуць дагэтуль самі сабою"* [Збор твораў 1]; *агледзіны* 'бытавы абрад знаёмства жаніха і яго сваякоў з нявестай': *"Пасажыры аўтобуса глядзяць на поўню, як на агледзінах"* [Збор твораў 1].

Шматлікія сямейныя абрады, апісаныя паэтам, выконвала яго маці, Акуліна Андрэеўна, адпраўляючы бацьку на вайну: *"Мама ў паддзеўку бацькаву зашывала святы лісток з замовай ад кулі, ад пікі, ды лісток засланіць партызана не змог"* [Збор твораў 3]; *"Торкае маці ў сцяну купалкі ў купальскі вечар. ...Калі ... раскудлацяць галовы купалкі... – значыць... усе, на каго загадалі... – Здаровы..."* [Збор твораў 3].

У паэзіі Р. Барадуліна знаходзім апісанне не толькі абрадаў і звычаяў, звязаных з рэлігійнымі, сямейнымі святамі, але і інфармацыю пра разнастайныя прыкметы, павер'і, якія спрадвеку існуюць у беларусаў: *"Стол не змяталі ніколі на рог, каб не звесці на клін гаспадарку. Не сядаў у шапцы за стол маладзён, каб не была глухой цешча"* [Міласэрнасць плахі]; *"У цішыні са стала звалілася лыжка. Мне шэпча на вуха прыкмета: спяшае кабета"* [Міласэрнасць плахі]; *"Зляцеў са стала на падлогу нож – спяшае мужчына, мне шэпча прыкмета"* [Збор твораў 3]. Трэба адзначыць, што ў свядомасці беларусаў назоўнік *нож* сімвалізуе мужчынскі пачатак, а найменні *відэлец* і *лыжка* – жаночы. Многія з народных прыкмет, якія былі з дзяцінства вядомыя будучаму паэту, знайшлі ўвасабленне ў яго паэтычнай творчасці: *"Вуголле з печы ўранні скача, кот мыцца на вакне пачне, – і верыцца, што ты ка мне паспееш на пірог гарачы"* [Трэба дома бываць часцей].

У логіка-асацыятыўны рад найменняў, якія ў мове мастацкага дыскурсу Р. Барадуліна выяўляюць узаемасувязі паміж паняццямі

“Радзіма” і “духоўная культура”, уваходзяць таксама намінацыі, што семантызуюць паняцце “мова”, бо родная мова з’яўляецца важным духоўным набыткам кожнага народа і адной з найважнейшых прыкмет нацыі. Родная мова фарміруе кожнага з нас як асобу, аб’ядноўвае яе носьбітаў у адзін народ, служыць падмуркам этнічнага самаўсведамлення і асновай для развіцця нацыянальнай культуры. Апрача таго, родная мова выступае сродкам, з дапамогай якога мы далучаемся да сваіх продкаў і нашчадкаў. Яна дазваляе нам арганічна ўвайсці ў шэраг пакаленняў, што жылі да нас і прыйдуць пасля нас, выступае асноўнай праяваю нацыянальнага жыцця, моцным інструментам уздзеяння на свядомасць чалавека, з’яўляючыся адным са сродкаў фарміравання яго асобы і паўнавартаснага выхавання.

Р. Барадулін быў адным з тых майстроў слова, якіх асабліва востра хваляваў лёс беларускай мовы. У сваіх вершах ён імкнецца асэнсаваць той уклад, які ўнеслі ў яе развіццё героі яго вершаў-прысвячэнняў. Так, у вершы “У вянок Мацею Бурачку” аўтар высока ацаніў творчую і грамадскую дзейнасць беларускага паэта, аднаго з заснавальнікаў новай беларускай літаратуры Ф. Багушэвіча. Яго творы аказалі значны ўплыў на фарміраванне нацыянальнага светапогляду беларускага народа. Гэтая ідэя знайшла ўвасабленне ў метафарычным выразе *радкі паэта – ад упуду замова: “Паэта радкі – ад упуду замова. Народ жа саромеецца яшчэ і мовы сваёй, і сябе самога”* [Трэба дома бываць часцей]. Асноўную ж заслугу *“гордага Сакольніка беларускага крэўнага слова, беларускага вечнага слова”* Максіма Багдановіча Р. Барадулін бачыць у тым, што сваім паэтычным майстэрствам ён узняў родную мову да незвычайных вышынь, *“заручыў з небам”*, паяднаўшы з сусветнай паэзіяй сваю, нацыянальную: *“Паклон табе, горды Сакольнік беларускага крэўнага слова, беларускага вечнага слова, што ты заручыў яго з небам”* [Трэба дома бываць часцей]. У вершы, прысвечаным знакамітай беларускай паэтэсе, зямлячцы Еўдакіі Лось, паэт паказвае яе як простую сялянскую жанчыну, якая *“была гатовая штодзённа жаць, касіць, баранаваць, палоць”* і разам з тым тонка адчувала прыгажосць і непаўторнасць беларускай мовы, шанавала яе, што і семантызуецца праз метафарычны выраз *слова сакавітае любіла*: *“Слова сакавітае любіла – нарадзілася ў сакавіку”* [Самота паломніцтва]. І далей: *“Па-сялянску… кланялася кожнаму радку”* [Самота паломніцтва]. Моватворчасць Е. Лось рэпрэзентуецца праз метафарычны вобраз жніва на ніве паэзіі – *зажынала слоў калоссе*: *“Слоў калоссе зажынала дбала і як след закручвала вязьмо”* [Самота паломніцтва].

У мове Р. Барадуліна дастаткова часта сустракаюцца словазлучэнні *родная мова* і *роднае слова.* Аўтар зазначае: *“Родная мова ступала за мной ад калыханкі да галашэння”* [Выбраныя творы]; *“Не толькі думаць, дыхаць трэба на роднай мове, і тады табой не будзе неба грэбаваць”* [Евангелле ад Мамы]; *“Я ў роднае слова вярнуўся, без яго – сірата сіратою”* [Збор твораў 3] і інш. У прыведзеных радках прыметнік *родны*

падкрэслівае знітаванасць, “крэўную еднасць” аўтара са сваёй мовай. Апрача таго, родная мова ў яго паэтычным радку рэпрэзентуецца таксама праз іншыя словазлучэнні, у якіх важная сэнсаўтваральная роля адводзіцца прыметнікавым структурным кампанентам. Напрыклад, *матчына мова, матчына (маміна) слова: “Стараецца матчына слова прынесці душы суцяшэнне”* [Міласэрнасць плахі]; *“Маміна слова мяне пераксціла”* [Ксты]; *мова матчына: “У людзі выходзіла мова матчына”* [Выбраныя творы]. Прыведзеныя прыклады сведчаць, што паэт упершыню родную мову пачуў ад сваёй маці, якую называў “самым вялікім філолагам”, бо яна з маленства прывівала сыну павагу і любоў да роднага слова: *“Успыхнула роднае слова падлётам з цёплых далоняў матчынай песні”* [Збор твораў 1]. Наступныя барадулінскія словы ілюструюць сказанае вышэй: “Мова тады родная, калі яна пачута ад маці, калі кожнае слова сагрэта сэрцам матчыным... Мама перадала мне найвялікшы дар – мову нашую крывіцкую з вушацкай падсветкай, з вушацкім прысмакам. Мова Вушаччыны сягае да паганскіх каранёў і да біблейскага неба... Калі запрашаў вушацкія словы на паперу, мне чуўся голас мамы Куліны, галасы маіх крэўных і блізкіх. Гэта мой паклон да зямлі тым, хто пялегваў праз вякі нашае самабытнае слова. Дзякуй табе, мама!” [Збор твораў 3]. Матчына мова для Р. Барадуліна – гэта найперш сімвал яго нацыянальнай прыналежнасці: *“Сцвярджаюць гісторыкі і мовазнаўцы, што паступова сціраюцца грані нацый і, нібыта як перажытак, аджыць павінна абавязкова мова маці маёй – беларуская мова”* [Выбраныя творы].

Яшчэ адзін від метафарычных словазлучэнняў з этнакультурнай семантыкай, якія рэпрэзентуюць паняцце “родная мова”, – гэта словазлучэнні з ярка выражанай матываванай асновай. Напрыклад, *мова крывіцкая* (прыметнік паходзіць ад назвы племя *крывічы*, пра што ішла гаворка вышэй)*: “Вы мову зберaглі крывіцкую…”* [Евангелле ад Мамы]; *мова-крывічанка: “На плячах світае хустка-ахінанка. Ты ў вякоў святая, мова-крывічанка”* [Евангелле ад Мамы]; *слова крывічоў*: *“Дзе ты, слова крывічоў высокае? Чым далей, яна мілей, Радзіма”* [Евангелле ад Мамы]. Надзвычай чуйны да слова, Р. Барадулін неаднаразова падкрэсліваў самабытнасць і трапнасць сваёй роднай гаворкі, засвоенай ад нараджэння. Пра гэта сведчаць наступны прыклад: *“А ён іх лаяў па-польску ўстойлівымі ўшацкімі словазлучэннямі”* [Збор твораў 2].

У якасці аднаго з кампанентаў метафарычных выразаў, якія выяўляюць нацыянальна-культурную адметнасць роднай мовы, майстар слова выкарыстоўвае ёмістыя, трапныя эпітэты з нацыянальна-культурнай семантыкай. У прыватнасці, беларускае слова для яго – гэта *жытняе слова: “Ясенін жытнім словам вячэрае”* [Збор твораў 2]. “Нацыянальна-культурны падтэкст” адчуваецца і ў паэтычным выразе *цяплеюць слоў азяблых васількі*: *“На аржаных старонках роднай нівы цяплеюць слоў азяблых васількі”* [Амплітуда смеласці]. Праз трапныя метафары паэт

сцвярджае, што беларуская мова, нібы маладыя ўсходы збажыны, праз глыбіню стагоддзяў прабівалася на свет, заваёўвала сваё месца сярод іншых моў свету: *“Спагадна поўня вечнасці глядзела, як рунню прабіваліся радкі”* [Амплітуда смеласці].

Р. Барадулін балюча ўспрымаў сам факт выцяснення беларускай мовы ў апошнія дзесяцігоддзі са сферы штодзённага ўжытку: *“Без роднай мовы людзі ў родным краі, як тыя кватаранты-немтуры…”* [Ксты]. Пацвярджэннем таму, што наша родная мова ўжываецца пераважна жыхарамі вёсак і невялікіх мястэчкаў амаль выключна ў побытавай сферы, служыць метафара *словы гнездзяцца ў пунях, клецях* [Маўчанне перуна]. Словы беларускай мовы па-свойму свежыя, непаўторныя, мілагучныя, але арэал іх ужывання недастаткова шырокі, што і рэпрэзентуецца праз разгорнутую метафару *словы ластаўкамі сняжэюць, росяцца, у сэрцы пагрэцца просяцца* [Маўчанне перуна]. Разам з тым беларуская мова (як трапна называе яе Р. Барадулін, *жаўрукова мова*) шырока і натуральна, з уласцівай ёй першароднасцю і чысцінёй гучыць на Радзіме паэта – яго Ушаччыне*: “Нябёсы Ушаччыны зялёнай навучаць жаўруковай мове”* [Неруш]. Метафарычным эпітэтам *жаўрукова мова* аўтар падкрэслівае, што беларуская мова такая ж спеўная і мілагучная, як песня жаўранка.

У мове барадулінскага паэтычнага кантэксту сустракаецца нечаканая метафара *мова – суразмоўніца нябёс*. Паводле светаўспрымання паэта, яго мова мае боскае паходжанне, бо дадзена чалавеку Богам. Шкада толькі, што беларусы часам забываюць яе: *“Беларусь, цябе прынізіў лёс, памяць даў, што забывае часам мову – суразмоўніцу нябёс”* [Трэба дома бываць часцей].

Адначасова з рэпрэзентацыяй духоўнай культуры ў паэзіі Р. Барадуліна дастаткова глыбока і поўна выяўляецца спецыфіка матэрыяльнай культуры беларусаў. І гэта вытлумачальна, бо менавіта прадметы побыту з’яўляюцца неад’емнай часткай штодзённга жыцця чалавека. Практычна кожная рэч, апрача свайго функцыянальнага прызначэння, мае знакавы статус. Праз побытавыя найменні Р. Барадулін не толькі дакладна адлюстраваў матэрыяльную культуру беларускай вёскі, але па-майстэрску апісаў звычаі, традыцыі, святы, асаблівасці заняткаў і характару беларусаў. Даследаваныя лексічныя і фразеалагічныя адзінкі, які семантызуюць побыт беларусаў, можна падзяліць на наступныя тэматычныя групы:

1) назвы ежы і страў беларускай нацыянальнай кухні;
2) назвы адзення і абутку;
3) назвы прылад працы і прадметаў гаспадарчага ўжытку.

У мове пісьменніка пры стварэнні ім праўдзівай карціны сялянскага жыцця нашых землякоў істотную ролю адыгрываюць назвы страў беларускай нацыянальнай кухні, якая мае шматвяковую, багатую і цікавую гісторыю. Аўтар неаднаразова звяртаецца да апісання традыцыйнага сялянскага стала беларуса са штодзённай ежай. А гэта *поліўка* ‘вадкая

страва з мучной прыправай', *кісель* 'кіслая студзяністая страва з аўсянай мукі або ягаднага соку, заваранага на крухмале', *верашчака* 'рэдкая мучная страва з мясам, каўбасой і рознымі прыправамі', *сырапеня* (дыял.) 'сыроватка, вадкасць, якая атрымліваецца пры адтопліванні ці адстойванні кіслага малака': *"Мы на бульбу не наракалі, бульбу есці звыкліся ўсякую – з селядцом, з грыбамі, з гуркамі, з поліўкаю, з кісялём, з верашчакаю, з сырапеняю"* [Міласэрнасць плахі]; *праснак* 'тоўсты блін з прэснага цеста': *"У дзяжы душы хлеб надзённы замесціцца – на дарогу будуць праснакі"* [Евангелле ад Мамы] і інш. Заўважым, што паўсядзённы стол беларусаў не быў багаты на нейкія адмысловыя стравы, прыгатаванне якіх займала шмат часу. *Нішчымніца* 'посная ежа; бясхлебіца' не так ужо і рэдка, на жаль, была спадарожніцай нашых продкаў': *"Нішчымніца – злая дзядзіна – з ёй ніяк не згаворышся"* [Збор твораў 3].

Немалаважная роля ў барадулінскім мастацкі кантэксце адводзіцца апісанню святочнай ежы, без якой не абыходзіліся многія традыцыйныя святы беларускага народа: *клёцкі з душамі*, ці *сарокі* 'галушкі з дранай бульбы з мясной начынкай унутры', *куцця* 'каша з цэлага абтоўчанага ячменю як традыцыйная абрадавая ежа': *"Вядома, стаіць на куце куцця… і клёцкі з душамі ў гонар дзядоў дымяцца бакамі крутымі і зварана некалькі клёцак даўгіх, завуцца сарокамі"* [Збор твораў 3] і інш.

Адным з галоўных прадуктаў харчавання ў беларускага народа ва ўсе часы была бульба, якая ў Беларусі была вядома ўжо з першай палавіны XVIII ст., хаця трывалыя пазіцыі сярод іншых сельскагаспадарчых культур заняла толькі ў другой палавіне XIX ст. Бульбу здаўна спажывалі ў вараным, печаным, смажаным і тушаным выглядзе, выкарыстоўвалі яе і як самастойную ежу, і як кампанент розных страў. У беларускай мове, як у літаратурнай, так і дыялектнай, сустракаецца шмат слоў, якія з'яўляюцца назвамі ежы і страў, прыгатаваных з гэтага віду гародніны, і выступаюць як багатая крыніца ведаў пра народны побыт і звычаі нашых землякоў.

Без бульбы не абыходзілася ніводнае свята, без яе нельга было ўявіць раней (ды і зараз) паўсядзённую ежу, а па разнастайнасці бульбяных страў з беларусамі, відаць, не можа параўнацца ніводны іншы славянскі народ. Пра гэта сведчаць шматлікія назвы вершаў Р. Барадуліна: "Чышчу бульбу", "Паляць бульбоўнік", "Бульбяная балада". У апошнім творы паэт адзначае: *"Бульба з намі ідзе вякамі, бульба тоўчаная, цалкамі, бульба параная, бульба вараная і нішчымная, і заскварана́я"* [Міласэрнасць плахі]. У прыведзеным радку аўтар не толькі называе традыцыйныя стравы з бульбы, але і паказвае цяжкае матэрыяльнае жыццё селяніна з яго святамі і буднямі, а таксама традыцыйны сялянскі стол, на якім заўсёды галоўнай стравай была бульба: на святы – *заскварана́я*, у будні дзень – *нішчымная*. Спажыванне ў якасці штодзённай ежы бульбы *(тоўчанай, паранай, варанай, цалкамі)* тлумачылася, хутчэй, дастаткова простай тэхналогіяй яе

прыгатавання, а таксама тым, што не патрабаваліся іншыя харчовыя інгрэдыенты, якія не заўсёды былі ў хатняй гаспадарцы.

У любую пару года бульба не знікае з сялянскага стала беларусаў, якіх з гэтай прычыны часта называюць бульбашамі. У Р. Барадуліна сустракаюцца назвы разнастайных беларускіх нацыянальных страў, прыгатаваных з бульбы. А гэта найперш *дзяронікі (дранікі)* ‘блін з дранай бульбы’ і *клёцкі* ‘галушкі з дранай бульбы (мукі), звараныя ў вадзе або малацэ’: *“Маннай з неба не кармі беларуса, ляжа спаць – сняцца клёцкі, дзяронікі”* [Міласэрнасць плахі]; *клёцкі з душамі* ‘галушкі з дранай бульбы з мясной начынкай унутры’: *“Там бульбаю адбывалі святы ўсе: на клёцкі бульбу дралі на хаўтуры, з душамі клёцкі дзень віталі хмуры ў кроплях пáры. Нібы ў расе і на Дзяды таксама клёцкі елі…”* [Руны Перуновы]; *бульба ў панчошках* ‘звараная з лупінамі бульба’: *“Да капусты – «бульба ў панчошках»* [Збор твораў 3] і інш.

Пры апісанні роднага краю паэт выкарыстоўвае метафарычны эпітэт-неалагізм *планета бульбападобная: “Гэта з пары над бульбай хмары над планетай бульбападобнаю”* [Трэба дома бываць часцей]. Невыпадкова паэт з гонарам называе беларусаў *бульбянікамі*: *“Мы – бульбянікі, не абраза гэта фраза”* [Трэба дома бываць часцей]. Бульба, як складнік матэрыяльнай культуры нашага народа, якую называюць другім хлебам беларусаў, стала своеасаблівым культурным сімвалам Беларусі. І гэта дастаткова глыбока і пераканаўча пацвярджаюць паэтычныя творы Р. Барадуліна.

Як вядома, хлеб спрадвеку лічыўся самым сакральным з усіх прадуктаў харчавання. Усё нават самае смачнае прыядаецца, а хлеб – ніколі, хоць мы ядзім яго кожны дзень. Хлеб – гэта сімвал дастатку і матэрыяльнай забяспечанасці і дабрабыту ў хаце. У народзе кажуць: *хлеб будзе, дык і ўсё будзе; у каго хлеб, у таго і шчасце; без кавалка хлеба кепская бяседа; хлеб над усім пануе* і інш. Як сведчаць прыведзеныя народныя афарызмы, хлеб у беларусаў сімвалізуе дабрабыт, прыбытак і багацце ў гаспадарцы.

У мове паэзіі Р. Барадуліна лексічная адзінка *хлеб* – таксама сімвалічная. Гэты прадукт харчавання ўспрымаецца аўтарам як божы дар, які патрабуе да сябе паважлівых адносін і пашаны: *“На покуць, на шчаслівы стол няхай пачэсна завітае хлеб чорны, чэрсты, як падзол”* [Абсяг]; *“Так, помню, вучылі мяне хлеб не кідаць пад ногі”* [Збор твораў 3]. Назоўнік *хлеб* (які б ён ні быў – чорны, чэрствы) у моўнай карціне свету беларусаў акружаны станоўчым сэнсавым арэолам, пра што сведчаць наступныя барадулінскія радкі: *“Як чорны хлеб, свой чорны дзень цані”* [Збор твораў 3]. Аўтар нездарма двойчы ўжывае прыметнік *чорны*, звяртаючы ўвагу на тое, што хлеб здабываецца цяжкай працай, якая патрабуе фізічных сіл і цярпення. Невыпадкова Р. Барадулін пры ўжыванні назоўніка *хлеб* карыстаецца глыбокімі з пункту гледжання сваёй нацыянальна-культурнай спецыфікі эпітэтамі *надзённы (хлеб): “У коласа не пра сябе самога – пра хлеб надзённы*

клопат з даўніны” [Евангелле ад Мамы]; *трывалы (хлеб): “І з цеста пячэцца трывалы хлеб, якому на абрусах вельмавацца”* [Руны Перуновы].

Трэба дадаць, што хлеб як прадукт харчавання ў мове паэзіі Р. Барадуліна рэпрэзентуецца праз разнастайны лексічны матэрыял з лінгвакраіназнаўчай афарбоўкай. Гэта найменні *луста аржаная* ‘адрэзаны вялікі плоскі кавалак хлеба’: *“А я на лусту аржаную шапчу: “Кусціся, ярына!”* [Збор твораў 2]; *жытняя скіба* ‘адрэзаны кавалак хлеба’: *“Чаму ж ты з жытняй скібай дрыжыш, мая рука?”* [Неруш]; *скарынка* ‘цвёрды вонкавы слой хлеба’: *“І прагнуцьмеш кроплі віна, яшчэ дрыжучы над скарынкаю”* [Ксты]; *каравай* ‘вясельны абрадавы пірог круглай формы або вялікая булка, спечаная для якой-небудзь урачыстасці: *“І ўзыдзе наш каравай на куце, асвеціць нашыя сасмяглыя душы”* [Руны Перуновы]. Каравай – гэта сімвал будучага сямейнага шчасця, дабрабыту, абавязковы атрыбут не толькі вясельнай абраднасці, але і іншых свят і абрадаў беларусаў. У народзе спрадвеку існаваў звычай, паводле якога першым паспытаць хлеб (каравай) новага ўраджаю павінен земляроб: *“Трэба, каб земляроб-працавік першы пакаштаваў караваю”* [Евангелле ад Мамы].

У мове паэта лексічная адзінка *колас*, якая асацыятыўна звязана з намінацыяй *хлеб*, сустракаецца пры апісанні дзяржаўнага герба Беларусі, які абрамлены вянком з залатых каласоў, пераплеценых справа кветкамі канюшыны, а злева – кветкамі лёну: *“Калоссем герб абвіт, зямля спавіта”* [Белая яблыня грому]; *“Звіні, мая азёрная, шахцёрская, маторная, у коласе герба зярнятамі адборнымі!”* [Вечалле].

Этнічныя традыцыі, духоўныя памкненні і густ беларусаў даволі выразна дэманструюць назвы адзення. Нацыянальна-культурную семантыку нясуць у мове Р. Барадуліна наступныя лексічныя адзінкі: *лапаць, шапка-вушанка, валёнкі* і інш.

Этнаграфічныя матэрыялы сведчаць, што лапці ў якасці абутку былі вядомы беларусам з даўніх часоў. Між тым пляценне лапцей не было характэрна для гараджан, бо лічылася справай простага люду. Апрача таго, лапці былі не проста традыцыйным сялянскім абуткам і выкарыстоўваліся з практычнымі мэтамі: яны ўжываліся амаль ва ўсіх сферах духоўнага жыцця чалавека (на наваселлі, у пахавальнай абраднасці, у якасці ахвярапрынашэння продкам) [88, с. 219]. Аднак большасць народных прыкмет і павер’яў, у якіх ужывалася лексічная адзінка *лапаць*, была звязана ў нашых продкаў з гаспадарчай дзейнасцю селяніна: каб дзяжа “выправілася” і ў ёй удаваўся хлеб, яе абкурвалі, падпальваючы стары лапаць; каб на гурках была добрая завязь і не было пустацвету, гаспадыня валачыла па градках стары лапаць, кажучы: “Як густа гэты лапаць плёўся, так каб і гуркі мае пляліся” [58, с. 96].

У нацыянальнай карціне свету беларусаў назоўнік *лапаць* традыцыйна асацыіруецца з даўнішнім сялянскім абуткам, які быў сплецены з лыка, бяросты ці вяровак і выступаў як сімвал беднасці і адсутнасці матэрыяльнага дабрабыту ў сялянскім асяроддзі. Раней па абутку можна было меркаваць

пра сацыяльны статус чалавека. Пацверджанне гэтай думкі знаходзім у мове радкоў Р. Барадуліна: *“Пан-мужык ... што мог павесіць веташку на рогі сушыцца лапаць з цёплаю зямлёю”* [Збор твораў 2].

У халодную пару года нашы продкі насілі *валёнкі* ‘зімовы абутак з воўны, звалены ў выглядзе ботаў’ і *сярмягі* ‘верхняе адзенне з грубага саматканага сукна’: *“Валёнкі не грэюць. Кажэрка злубела – на торг сабіралася цётка да дня”* [Трэба дома бываць часцей]; *“Аж скінуў …сярмяжку”* [Збор твораў 3].

Сярод даследаваных лексічных адзінак з этнакультурнай семантыкай сустракаюцца назвы галаўных убораў тыпу *шапка-вушанка* ‘цёплая шапка з вушамі’: *“Шапка-вушка вусата хрумстала канюшыну”* [Збор твораў 2]; *“Што вушанка? Апусціўшы вушы, усю зіму праходзіць”* [Збор твораў 1]; *хустка* ‘кавалак тканіны ці вялікага палатна, звычайна квадратнай формы, які завязваюць на галаву, шыю ці накідваюць на плечы’: *“На хустцы ў Бянігны жалобяцца шпакі”* [Збор твораў 1] і інш. У барадулінскіх вершах адлюстраваліся ашчадныя, беражлівыя адносіны практычных па характары беларусаў да свайго адзення: *“Немаладая ўжо аладка-шапка, саперніцу вушанку ненавідзячы. І толькі аднаго яна баіцца, каб гаспадар вясною не надумаўся аддаць яе вароне на гняздо, – не паўтарыць бы сумны лёс бабулі”* [Збор твораў 1].

У мове барадулінскага тэксту цікавы лінгвакраіназнаўчы змест змяшчаюць у сабе назвы прылад працы і прадметаў гаспадарчага ўжытку. Пісьменнік, як карэнны жыхар вёскі, па-мастацку трапна і вобразна выкарыстоўвае назвы разнастайных прылад працы, без якіх селяніну не абысціся ў гаспадарцы. Сярод іх адзначым такія назоўнікавыя намінацыі, як *рэзгіны* ‘прыстасаванне з вяровачнай сеткі, нацягнутай на сагнутыя драўляныя дужкі, у якім носяць сена ці салому’: *“А папеўка пра рэзгіны малечае вока не абмінула”* [Збор твораў 1]; *аброць* ‘прадмет вупражы, які надзяваецца каню на галаву’: *“Шукаеш аброць ад каня, што вазіў снарады”* [Збор твораў 3]; *даёнка* ‘пасудзіна, у якую дояць малако’; *матыка* ‘ручная земляробчая прылада для рыхлення глебы, акучвання бульбы, буракоў’; *карыта* ‘прадаўгаватая пасудзіна, збітая з дошак або выдзеўбаная з дрэва, якая звычайна выкарыстоўваецца для кармлення жывёлы’: *“Мама, калі жыла, выходзіла ў космас цемры і святла, у космас адкрыты, дзе чакалі даёнкі, матыкі, карыты, у космас лесу, гарода, саду”* [Трэба дома бываць часцей]; *качалка* ‘драўляны валік для раскачвання цеста або разгладжвання бялізны качаннем’: *“Дасюль на хлапчуку кашуля не зліняла, што маці на цямку качалкаю качала”* [Збор твораў 2].

У сялянскай гаспадарцы беларусу нельга было абысціся без такіх прылад працы, як сякера, каса, барана, серп і інш. Сякера ў сялянскім побыце была пераважна “мужчынскай” прыладай працы. Па словах Т. Валодзінай, “сякера, як і серп, нож, у беларусаў успрымаецца як сіла, якая выступае ў якасці абярэга супраць варожых уплываў” [21, с. 102].

У барадулінскім паэтычным кантэксце таксама ўжываюцца назвы пералічаных вышэй прылад працы. У іх ліку *серп* ‘ручная прылада для жніва’, *сякач* ‘разнавіднасць матыкі’ і інш.: *“Сярпом і секачом, матыкаю крывою дзе з песняй, дзе з плачом ты білася з травою”* [Трэба дома бываць часцей]; *барана* ‘сельскагаспадарчая прылада для паверхневага рыхлення глебы’: *“Барана, што ляжыць дагары зубамі…”* [Трэба дома бываць часцей]; *коска* ‘каса, ручная сельскагаспадарчая прылада, якая служыць для скошвання травы, збожжа і інш.’: *“І коску некляпаную, як коску, сціраюць на балонні паплавоў”* [Збор твораў 2]. Між тым аўтар адзначае, што ў сувязі са зменамі ў побытавым жыцці людзей, заменай ручной працы на механізаваную спрадвечныя “атрыбуты” земляробства паступова становяцца незапатрабаванымі і адыходзяць у нябыт: *“Цапавільні, тапарышчы, касавільны – як вырабы са слановай касці: у музей хоць сёння!”* [Збор твораў 2], дзе назоўнікі з лінгвакраіназнаўчай семантыкай *цапавільна* (дыял.) ‘цапільна, дзяржанне цэпа ў выглядзе доўгай палкі, да якой прымацоўваецца цэп, якім у ранейшыя часы малацілі збожжа’, *тапарышча* ‘ручка тапара’, *касавільна* (дыял.) ‘кассё, ручка ў касе’ рэпрэзентуюць тыя ці іншыя часткі прадметаў гаспадарчай дзейнасці, якімі з глыбокай старажытнасці карысталіся нашы продкі.

Значную колькасць даследаванай побытавай лексікі з краіназнаўчым зместам складаюць назвы гаспадарчых пабудоў і іх частак (або частак хаты). Гэта назоўнікі тыпу *клець* ‘традыцыйная сялянская будыніна для захавання збажыны ці маёмасці’: *“Мамулечка, у клець вядуць”* [Збор твораў 3]; *покут* ‘покуць – ганаровае месца ў хаце за сталом пад абразамі’: *“Газетамі покут спачатку абклеілі”* [Збор твораў 3]; *двор* ‘участак зямлі паміж гаспадарчымі будынкамі; сялянскі дом з усімі будынкамі каля яго’, *хлеў* ‘памяшканне для жывёлы і хатніх птушак’, *паветка* ‘павець – пляцоўка пад дахам на слупах для хавання чаго-небудзь ад дажджу ці непагоды’: *“І хаты ў бабылі пайшлі б, ды моцна гэтак двароў, хлявоў, паветак трымаюць хатулі”* [Збор твораў 1].

На Беларусі з даўніх часоў адным з найбольш распаўсюджаных традыцыйных відаў заняткаў было ткацтва. Найменнні, звязаныя сваёй семантыкай з гэтым відам народнага рамяства, дастаткова шырока ўжываюцца сярод даследаваных лексічных адзінак. Гэта такія этнаграфізмы, як *верацяно* ‘прылада для ручнога прадзення ў выглядзе круглай драўлянай палачкі з завостранымі канцамі, патоўшчанай унізе’: *“Верацяно гудзе, гырчыць, якоча, ные”* [Евангелле ад Мамы]; *калоўрот* ‘прыстасаванне для ручнога прадзення кудзелі’: *“Вурчэлі, як тыя каты, калаўроты”* [Збор твораў 3]; *прасніца* ‘прыстасаванне, на якое падвешваецца кудзеля пры прадзенні’: *“Як у сераду на «Масленіцу» певень узляцеў на прасніцу, яечка знёс”* [Збор твораў 3]; *красенцы* ‘кросны – ніцяная аснова, якая навіваецца на навой ткацкага станка’: *“Гаспадыня ткала красенцы”* [Збор твораў 3] і інш.

Заўважым, што сярод шматлікіх назваў побыту, якія адлюстроўваюць нацыянальную спецыфіку абагульненых вобразаў, што трывала замацаваліся ў моўнай свядомасці беларусаў, сустракаюцца гістарычна абумоўленыя словы-сімвалы, якія не толькі валодаюць пэўным этнакультурным зместам, але і дапамагаюць чалавеку больш поўна зразумець навакольную рэчаіснасць і яе праявы.

Адным з асноўных не толькі гаспадарчых, але і рытуальных цэнтраў сялянскага жытла ў нашых продкаў лічылася печ. Са старажытнасці і да сённяшніх дзён печ з'яўляецца сімвалам непагаснага хатняга ачага і дабрабыту, а таксама, паводе міфалагічных звестак, месцам знаходжання дамавіка – ахоўніка дома і гаспадаркі. У вуснай народнай творчасці беларускага народа даволі шырока (а гэта больш за 40 парэміялагічных адзінак) прадстаўлены народныя афарызмы з лексічным кампанентам *печ.* Іх змест адлюстроўвае як матэрыяльныя, так і духоўныя бакі жыцця селяніна, а таксама гаспадарчыя клопаты, абавязкі жанчыны-гаспадыні, адказнасць яе за хатнія справы. Напрыклад: *у гультая і страха цячэ, і печ не пячэ; сказаў бы, ды печ у хаце; добрая слава ў хаце на печы ляжыць, а дрэнная слава па хатах бяжыць; гаспадыня, твая рэч – глядзі ў печ; бабіна дарога – ад печы да парога* і інш.

У мове барадулінскіх твораў печ сімвалізуе сабой наступныя культурныя коды: 1) "дух продкаў": *"Душу ласкава ахінае дух печы, продкаў вечны дух"* [Збор твораў 2]; 2) цэнтр сялянскага жытла: *"Смяецца печ – апора хаты – на ўвесь залатазубы рот"* [Збор твораў 2]. Сапраўды, у інтэр'еры беларускай сялянскай хаты печ – найважнейшая частка. У слоўнікавым складзе беларускай мовы сустракаецца больш за дзясятак лексічных адзінак, якія называюць тую ці іншую частку печы. У паэзіі Р. Барадуліна таксама шмат такіх найменняў. Напрыклад, *загнет* 'ямка з левага ці правага боку прыпечка, куды заграбаюць жар': *"Шануеш дух, з якога хлеб надзённы, чысцец і пекла полымя – загнет"* [Трэба дома бываць часцей]; *каптур* 'пярэдняя частка печы, якая ўзвышаецца над чалеснікамі': *"Душа гібее ля чужых двароў, ёй зябка ля казённых каптуроў"* [Збор твораў 2]; *комін* 'труба для адводу дыму з печы': *"Чакае хмуры комін перакуру"* [Збор твораў 2]. У народнай свядомасці сялян-беларусаў комін спрадвеку лічыўся сімвалам роднага жытла і непагаснага хатняга ачага. Пра гэта сведчаць наступныя аўтарскія радкі, у якіх назоўнік *комін* выступае сімвалам бацькоўскага дому: *"Наведвайце бацькоў, пакуль яны жывыя, пакуль дымяцца коміны – пагрэйцеся ў бацьцоў"* [Збор твораў 1].

Парогу, як цэнтральнай частцы інтэр'ера сялянскага жытла, ва ўсе часы надавалася вялікае значэнне. У традыцыйнай народнай культуры беларусаў сустракаецца вялікі пласт народных прыкмет і павер'яў, звязаных са словам *парог.* Яшчэ ў старажытнасці даволі пашыранай прыкметай у нашых продкаў была забарона вітацца праз парог, з якой развіўся шэраг іншых забараняльных прыкмет. З цягам часу з'явілася перасцярога цалавацца

ці падаваць руку праз парог пры сустрэчы. Апрача таго, на яго нельга было наступаць, садзіцца ці скакаць праз яго, бо гэта ўяўлялася вялікім грахом і тлумачылася міфалагічным знаходжаннем пад парогам дамавіка.

Парог – гэта сімвал мяжы паміж хатай як асвоенай часткай прасторы, чалавечым жытлом, якое абараняецца дамавіком, і прасторай "за парогам" – неасвоенай, нежылой, а значыць, небяспечнай, варожай для чалавека" [58, с. 116]. Нагадаем, што ў старажытнасці парог лічыўся месцам знаходжання душ продкаў, бо памерлага чалавека спальвалі (гэта было недзе паміж VI–XIV стст.), "а урну з прахам, – як адзначае Я. Крук, – хавалі пад парогам. Значыць, гістарычна парог – зона захавання продкаў" [64, с. 301]. З гэтай прычыны "чалавек, які знаходзіцца «там», «за парогам» мог успрымацца душамі продкаў як магчымы непрыяцель або нават вораг; адпаведна той, хто знаходзіцца «па гэты бок парога», у памяшканні, успрымаецца продкамі як свой, блізкі чалавек, на адносіны з якім нельга ўплываць неяк адмоўна" [58, с. 116]. Адсюль і пайшло трапнае народнае выслоўе, адрасаванае таму, з кім склаліся непрыязныя ці варожыя адносіны: *каб нагі тваёй на маім парозе не было*. У ім даволі выразна рэалізуецца бінарная супрацьлегласць "свой – чужы", характэрная для міфапаэтычнай мадэлі свету ўсходніх славян.

Сімвалізацыя лексічнай адзінкі *парог* у якасці мяжы паміж "хатняй" прасторай і тэрыторыяй за межамі жытла відавочная ў наступных радках Р. Барадуліна: *"Мне гэты прыпечак знаёмы і кожны вілачнік сухі, парог, што ў шлях адзін – дадому – заўжды злучае ўсе шляхі. Парог пасечаны, шурпаты (зрабіў яго чарнейшым час): зімой дрывотняй і варштатам служыў ён удаве не раз"* [Збор твораў 1]. Як бачым, назоўнік *парог,* дзякуючы працэсу метафарызацыі, найперш сімвалізуе малую радзіму і родны дом паэта, а ў некаторых выпадках гэты вобраз узнімаецца да вобраза ўсёй Беларусі. Пацверджанне гэтаму знаходзім у метафарычным словазлучэнні *парог Беларусі*: *"І дагэтуль не разбяруся – скуль будзе вяртацца блудны сын на сумны парог Беларусі?"* [Збор твораў 2]. Між тым гэтая лексічная адзінка, дзякуючы свайму лексічнаму акружэнню, усё ж такі часцей семантызуе родны дом і бацькоўскую хату (пра гэта ішла гаворка ў раздзеле 4.2). Напрыклад, *родны парог: "Да роднага парога на паклон ідуць усе парогі і сцяжыны"* [Руны Перуновы]; *парог роднай хаты: "З-за парога роднай хаты – з запарожжа пачалося падарожжа"* [Трэба дома бываць часцей]; *матчын парог: "Дзе б ні быў, адсюль па ім, як ганчак па следу, дарогу дадому знайду, да матчынага парога"* [Белая яблыня грому] і інш.

Паўсядзённы побыт, нялёгкую працу, а таксама традыцыйную абраднасць нашых продкаў немагчыма ўявіць без галоўнага атрыбута-спадарожніка – ручніка. У народнай культуры беларусаў ручнік − рэч глыбока сімвалічная і шматзначная. У мове паэзіі Р. Барадуліна ручнік выступае сімвалам зямнога існавання беларуса – ад моманту нараджэння да моманту апускання труны ў магілу: *"У свата цераз плячо, на покуці*

на абразах, на крыжах, на магільніках, на раздарожжах, на смутных вачах, на вясёлых вазах ручнік – ілляная дарога…” [Евангелле ад Мамы]; *“Белы ручнік перакідваю цераз плячо і, як сват маладых вітаю: сонца і Раданіцу”* [Белая яблыня грому]. Разгорнутая метафара *ручнік – ілляная дарога*, эпітэт *белы (ручнік)* надзелены глыбокім нацыянальна-культурным зместам і сімволікай. Варта адзначыць, што раней ручнікі ткаліся з ільнянога ачэсанага валакна – кужалю, з якога выраблялісь прыгожыя і трывалыя тканіны.

Сярод іншых назваў ткацкіх вырабаў сустракаюцца такія найменні беларускага побыту, як *ка́па* ‘ўзорыстае пікейнае пакрывала на ложак’: *“Мама капу ткала ткала, ткала «ў дымкі»”* [Збор твораў 2]; *пасцілка* ‘посцілка – лёгкая саматканая коўдра або прасціна, якую рассцілаюць на пасцель або якой накрываюць ці засцілаюць ложак; кавалак тканіны, якой накрываюць ці завешваюць што-небудзь’: *“Чаму тут пасцілкі завуцца пледамі?”* [Збор твораў 2].

У паэзіі Р. Барадуліна сустракаюцца фразеалагічныя і парэміялагічныя адзінкі, якія ў сваёй структуры ўтрымліваюць назвы прадметаў побыту і рэалій паўсядзённага жыцця беларусаў. Напрыклад, *хоць закладай касу* ‘пра вялікую колькасць чаго-небудзь’ (дзе *каса* ‘ручная сельскагаспадарчая прылада’): *“Ну а ў бары па верасу грыбоў – хоць закладай касу”* [Збор твораў 1]; *хоць кол на галаве чашы* ‘пра ўпартага, няўступчывага чалавека, якога немагчыма ў чым-небудзь пераканаць’ (дзе *кол* ‘завостраная тоўстая палка’): *“Хоць кол на галаве чашы, не разумею, каму мае вераб’і перашкаджалі”* [Збор твораў 3]; *неба з аўчынку* ‘пра таго, хто вельмі спужаўся’ (дзе *аўчынка* ‘выраблена авечая шкура’): *“Неба мядзведзю – з аўчынку”* [Збор твораў 3]; *добраму чалавечку добра і ў запечку* (дзе *запечак* ‘месца паміж сцяной і печчу’, кут ‘частка памяшкання, прастора паміж дзвюма сценамі’): *“Хіба што прыказка і суцяшала: добраму чалавечку добра і ў запечку, а якой благаце блага і на куце”* [Збор твораў 1]. Сэнс гэтай прыказкі становіцца зразумелым, калі звернешся да некаторых акалічнасцей традыцыйнай народнай культуры беларусаў, у якіх здаўна лічылася, што кут – гэта самае пачэснае месца ў хаце за сталом пад абразамі, а ў запечку – цёмным месцы паміж сцяной і печчу – трымалі непатрэбныя хатнія рэчы, а ўзімку часам і свойскую жывёлу. Фразеалагізм *лахі пад пахі* ‘браць свае пажыткі з сабой’: *“А дзеці і ўнукі лахі пад пахі – папкі – і абтрэслі рукі ад радыёактыўнай бабкі”* [Збор твораў 2] – увайшоў у літаратурны ўжытак з паўднёва-заходніх гаворак Беларусі, дзе назоўнік *лахі* з’яўляецца агульнай назвай вопраткі, адзення.

Такім чынам, прааналізаваныя моўныя адзінкі з нацыянальна-культурнай семантыкай, якія функцыянуюць у мове паэтычнага дыскурсу Р. Барадуліна, у сваёй пераважнай большасці маюць выразную лінгвакраіназнаўчую маркіраванасць і выяўляюць у сваім змесце ментальныя

характарыстыкі і традыцыйную абраднасць нашага народа, а таксама нясуць цікавую і пазнавальную інфармацыю пра паўсядзённае жыццё беларусаў-сялян і адметнасці іх матэрыяльнай культуры як у мінулыя часы, так і сёння.

Як сведчыць даследаваны матэрыял, Рыгор Барадулін не проста закаханы ў сваю Радзіму і родную мову. Ён прыкуты да свайго роднага кутка і беларускага слова. Ён – яго палонны і яго ўладар. Метафарычныя выразы, створаныя паэтам для рэпрэзентацыі паняцця "Радзіма" праз сферу традыцыйнай народнай культуры, дапамагаюць выявіць этнапсіхічныя адметнасці беларусаў як самастойнай нацыі, асаблівасці іх духоўнага свету, а таксама рэпрэзентуюць не толькі аўтарскую канцэптасферу, але і спецыфічную нацыянальную карціну нашага народа.

4.4 Рэпрэзентацыя хрысціянскага светапогляду беларусаў

Рэлігійная культура кожнага этнасу мае шэраг сваіх асаблівасцей і адрознівальных прыкмет. Адным з базавых культурных канцэптаў, на аснове якога фарміравалася ментальна-псіхічная і каштоўнасная арыентацыя беларускага народа, з'яўляецца канцэпт "Бог". Гэтае лінгваментальнае ўтварэнне даволі паслядоўна і змястоўна рэпрэзентавана ў мове вершаваных твораў Р. Барадуліна, знайшоўшы моўную рэпрэзентацыю ў яго паэтычных зборніках "Евангелле ад Мамы" (1995), "Ксты" (2005), "Вяльмуе Бог абраннікаў сваіх" (2011), "Anima" (2011) і інш. У апошнія гады сваёй творчай дзейнасці паэт дастаткова часта звяртаўся да асэнсавання хрысціянскага веравучэння, біблейскіх сюжэтаў, матываў і вобразаў. Гэта найбольш відавочна ў яго вершаваных цыклах "Трыкірый", "Ружанец", "Псалмы Давідавы", зборніках "Евангелле ад Мамы", "Ксты" і "Вяльмуе Бог абраннікаў сваіх".

Нагадаем, што на Беларусі спрадвеку суіснавалі дзве асноўныя канфесіі – праваслаўная і каталіцкая. Прычым праваслаўная па колькасці вернікаў лічыцца больш распаўсюджанай. Сам жа аўтар па веравызнанні з'яўляецца католікам, бо быў ахрышчаны ў Кубліцкім уніяцкім касцёле. У творчасці паэта выяўляецца рэальны факт знішчэння Кубліцкага касцёла, што на Ушаччыне. У 30-я гады XX ст. гэтае культавае збудаванне было "расцягнута" жыхарамі на будаўнічыя матэрыялы: *"Калі разбіралі царкву, бацька, ад пылу шэры, навазіў паўцагелкаў, а потым з іх склалі печку. Відаць, Усявышні злосць затаіў, бо нашу хату спалілі першую, а гліне святой абгарэць давялося яшчэ раз"* [Збор твораў 3]. У прыведзеных радках выразна рэпрэзентаваны распаўсюджаны ў хрысціянстве матыў справядлівага Божага пакарання, што семантызуецца праз метафарычны выраз *Усявышні злосць затаіў.*

У цэлым Бог у свядомасці паэта асацыіруецца са справядлівасцю, добразычлівасцю і спагадлівасцю ў дачыненні да людзей.

Важную сэнсавую нагрузку ў рэпрэзентацыі гэтай цэнтральнай асобы ў хрысціянскім веравучэнні нясе ўласнааўтарскі неалагізм-метафара *людалюбны Бог: "Падняў па Сваёй людалюбнасці мяне, што ў бяспамяці спачываў"* [Вяльмуе Бог абраннікаў сваіх]. Як бачна з прыведзенага прыкладу, Р. Барадулін перакананы, што менавіта Бог праз сваю любоў да людзей дапамагае ім у цяжкіх жыццёвых сітуацыях. На карысць гэтага сведчыць таксама метафарычны выраз *Хрыстос – зорка выратавання: "У моры адчаю светлы Хрыстос – зорка выратавання"* [Вяльмуе Бог абраннікаў сваіх]. Бог усведамляецца беларусамі як заступнік чалавечага роду, збавіцель ад няшчасцяў і зла на Зямлі. Так, аўтар падкрэслівае гэтую думку праз выкарыстанне разгорнутага метафарычнага выразу *ён* [Бог] *нашыя адмольвае грахі у Звышняга. І воляй незямною зло хоча супыніць"* [Руны Перуновы]. У самыя складаныя моманты існавання чалавек звяртаецца па дапамогу да неба, да Бога, сведчаннем чаму з'яўляецца створаны паэтам наступны метафарычны вобраз: *"Душой нябёсам кленчыць верніца, каб на зямлю зірнуў Гасподзь"* [Руны Перуновы].

У паэтычным кантэксце Р. Барадуліна Бог семантызуецца не толькі як выратавальнік людскога роду, але і як творца ўсяго жывога і нежывога на Зямлі. Адным з вобразаў, якія служаць для рэпрэзентацыі Бога-Стваральніка, з'яўляецца вобраз сейбіта, які "засявае" Зямлю людзьмі, а неба – зорамі. Праз гэты метафарычны вобраз аўтар падкрэслівае роднасць і боскае паходжанне ўсяго на планеце: *"Чэрпаў шчодрае зерне Бог з сяўні і засяваў пустэльныя абсягі. Рунелі мройна зоркі ў вышыні. І зоркі й мы з адной сяўні…"* [Калі рукаюцца душы].

Шматлікія метафары, уключаныя паэтам у моўную тканіну сваіх твораў, служаць пацверджаннем таму, што, згодна з народным светапоглядам, жыццё чалавеку падаравана Богам і толькі ён вырашае, колькі адвесці гадоў зямнога існавання кожнаму з нас. Так, чалавек – гэта нібы гадзіннік, заведзены Усявышнім на пэўны час: *"Чалавек – гадзіннік, які не ведае, на колькі Усявышнім заведзены ён"* [Ксты]. Лексема *гадзіннік*, як сімвал часу, ужыта ў метафары *Бог пазірае на свой гадзіннік*, якая служыць для семантызацыі надыходу старасці і набліжэння смерці: *"Ашчэрыцца паспееш, лёх, не размярзай, зямля сырая! А недзе ўжо на небе Бог на свой гадзіннік пазірае"* [Міласэрнасць плахі]. Сярод метафар-рэпрэзентантаў чалавечага жыцця, як Боскага наканавання, звяртае на сябе ўвагу метафара *аржаны акрайчык жыцця*: *"Дзякуй Табе, Гасподзь, за акрайчык жыцця аржаны"* [Ксты]. Менавіта праз выкарыстанае паэтам словазлучэння *аржаны акрайчык* даволі трапна характарызуецца жыццё беларускага народа-працаўніка і змагара за лепшую долю.

Як бачым, метафары, створаныя паэтычным геніем Р. Барадуліна, грунтуюцца ў асноўным на нацыянальна-культурнай аснове, адлюстроўваючы асаблівасці светаўспрымання нашага народа. Так, у вершы "Ісціме…" Р. Барадулін выкарыстаў яркі і семантычна ёмісты метафарычны

выраз: *“душа беларуская йсціме да Бога з нябеснаю свечкаю – з васільком”* [Руны Перуновы]. Важную сэнсавую нагрузку ў прыведзеным паэтычным кантэксце нясе лексічная адзінка *васілёк* – сімвал Беларусі, вобраз глыбокага патрыятычнага значэння, сімвал роднай старонкі і любові да яе, да народа і яго мастацтва. Менавіта з васільком – часцінкай сваёй Радзімы – душа беларуса ідзе да Бога. Паказальным з’яўляецца той факт, што назоўнік *васілёк* ужываецца аўтарам і ў іншым метафарычным выразе: *“Трымае Сына Дзева Марыя, а ў* [Ісуса] *Немаўляці ў руцэ – васілёк”* [Руны Перуновы]. Праз гэты вобраз паэт сцвярджае думку, што Беларусь знаходзіцца пад боскай аховай, што яе лёс – у руках Бога.

Адной з галоўных святынь хрысціянства з’яўляецца Галгофа – невялікая гара, на якой быў укрыжаваны Ісус Хрыстос. Матыў Галгофы як сімвала смерці прасочваецца і ў некаторых паэтычных творах Р. Барадуліна. Пра ўкрыжаванне Хрыста паэт напісаў ў вершы “Наканаванне”. Дзеля паказу абсурднасці рашэння пакараць смерцю менавіта Ісуса Р. Барадулін выкарыстоўвае дзеяслоўны наватвор *укажанець*: *“І лямант «укрыжуй!» укажанеў, нябёсы нылі зорнымі цвікамі”* [Ксты]. Семантычна важным для рэпрэзентацыі людскога гора з нагоды смерці Ісуса з’яўляецца і выкарыстанне метафарычнага выразу *нябёсы нылі зорнымі цвікамі*. У аснову дадзенай метафары пакладзена пераасэнсаванне зорак на начным небе ў якасці цвікоў, якімі быў укрыжаваны Ісус Хрыстос.

Як вядома, адным з найважнейшых сімвалаў і атрыбутаў хрысціянскай веры з’яўляецца крыж. У мове паэтычных твораў Р. Барадуліна трывала замацавалася традыцыя семантызацыі крыжа ў пэўным сэнсе як персаніфікаванай істоты з распрасцёртымі рукамі: *“Крыжы распрасцерлі рукі”* [Самота паломніцтва]. У аснове прыведзенага метафарычнага вобраза ляжыць даволі празрыстая семантыка, бо ў першую чаргу крыж у свядомасці хрысціян-беларусаў асацыіруецца з укрыжаваннем Ісуса Хрыста. Акрамя таго, у вершы “Рымскі дыпціх” паэт выкарыстоўвае іншы метафарычны вобраз: *“Крыж – вольны птах, застыглы на імгненне…”* [Руны Перуновы], у якім галоўным сэнсаўтваральным кампанентам выступае прыметнік *вольны*, бо ў аўтарскай свядомасці крыж суадносіцца з птушкай, якая застыла на імгненне ў паветры.

У вершы “Просьба” Р. Барадулін трапна падкрэсліў, што ў жыцці бывае вельмі лёгка памыліцца, стаць на няправільны шлях і ў выніку пасля смерці трапіць у пекла, дзе надзвычай складана выправіць свае памылкі, каб аказацца ў раі. Аўтар выкарыстаў у вершы запамінальны афарыстычны выраз: *“Да пекла шлях – з крумкачыны крок, да раю – жыцця зямнога замала”* [Ксты]. Такім чынам, у свядомасці Р. Барадуліна (і ўсяго беларускага народа, прадстаўніком якога ён з’яўляецца) Бог паўстае стваральнікам жывой і нежывой прыроды на Зямлі, абаронцам і збавіцелем людзей, надзеяй на выратаванне і шчаслівае існаванне, а таксама пачаткам і завяршэннем усяго існага на свеце.

У творах паэта дастаткова частым з'яўляецца зварот да вобраза Ісуса Хрыста – цэнтральнай асобы ў хрысціянскай веры, заступніка людзей, што нёс ім праўду. Для хрысціян Ісус выступае як збавіцельная ахвяра за людскія грахі. Само канфесійнае імя *Ісус* утрымлівае ў сабе шматлікую колькасць дадатковых паняццяў і актуалізуе ў свядомасці чалавека асацыятыўныя фонавыя веды: Біблія, збавіцель, хрысціянства, пісанне, сын Божы, уваскрашэнне, распяцце, рэлігія, ісціна, вера і інш.

Імя *Ісус* адносіцца да ўніверсальна-прэцэдэнтных імёнаў са сферы хрысціянскай рэлігіі. Рыгор Барадулін неаднаразова выкарыстоўвае гэтае імя, адсылаючы чытача да падзей, якія апісваюцца ў сакральным тэксце: *"Не стылі доўга на крыжы цвікі. Ісуса пахавалі на гародзе, каб узышоў у чалавечым родзе нанова дух Ягоны на вякі"* [Ксты]. Паэт-хрысціянін выкарыстоўвае лексічную адзінку *Ісус*, каб паказаць духоўную моц і ўвекавечыць памяць гэтай цэнтральнай постаці хрысціянства. Гэта відаць нават у звароце да сваіх землякоў-беларусаў: *"Хай беларус беларуса будзе любіць як брата. Светлая Імем Ісуса наша крывіцкая хата"* [Ксты].

У фарміраванні рэлігійнага светапогляду Рыгора Барадуліна як паэта-хрысціяніна значнае месца займае прэцэдэнтнае біблейскае імя *Дзева Марыя*. Пра гэта сведчыць наяўнасць у мове яго твораў такіх асабовых найменняў, як *Багародзіца Дзева, Вечнадзева Марыя, Багародзіца Прасвятая, Маці Божа, Прачыстая Багародзіца, Свяцейшая Панна, Панна Марыя*. Згадваючы біблейскае імя *Дзева Марыя* – адно з самых ушанаваных імён у праваслаўнай рэлігіі, аўтар выказвае сваю пашану і ласку зямной маці Ісуса Хрыста, якая не толькі дала жыццё Месіі, але і вытрымала ўсе чалавечыя нягоды, каб даць людзям веру ў лепшую будучыню, да якой на працягу ўсяго свайго зямнога існавання імкнецца чалавек. Дзева Марыя, нібы родная маці, аберагае ўсіх нас ад нягод і няшчасцяў сваёй мацярынскай пяшчотай. Свяцейшая Панна займае важнае месца ў сістэме нацыянальна-каштоўнасных ідэалаў беларусаў: *"Багародзіца, Вечнадзева Марыя, мы ўсе перад табой малыя. Дабраслаўленая між усіх маладзіц, не пярэч, каб перад ценем ценю Твайго мы ўпалі ніц"* [Ксты]. З гэтага вынікае, што паняцце *Багародзіца* з'яўляецца неад'емнай часткай хрысціянскай культуры нашага народа і рэпрэзентуе асаблівасці яго рэлігійнага светаўспрымання.

Ной – біблейскі персанаж, дзякуючы якому чалавечы род захаваў сваё існаванне, нягледзячы на ўсе злачынствы людзей, што насялялі Зямлю ў мінулым і вялі няправеднае жыццё. З гэтым імем звязаны біблейскі міф аб Ноевым каўчэгу. *Ной* (імя паходзіць з яўрэйскай мовы) 'той, хто супакойвае', паводле Бібліі, – гэта апошні (дзясяты) з дапатопных старазапаветных патрыярхаў, нашчадак Адама. Згодна з Бібліяй, Ной быў выратаваны Богам ад Сусветнага патопу і стаў прадаўжальнікам чалавечага роду. Гэтае імя выклікае ў хрысціян наступныя асацыятыўныя паняцці: каўчэг, Сусветны патот, выратавальнік, праведнік і інш.

Рыгор Барадулін у вершы “Ной” перадае змест рэлігійнага міфа пра тое, што чакае людзей за іх грахі і парушэнне маральна-духоўных правіл жыцця. Аўтар у мастацкай форме апісвае падзеі, якія адбываліся падчас вандравання на каўчэгу, а таксама думкі герояў міфа пра тое, калі вада сыдзе і можна будзе зноў стаць на сухую зямлю: *“І першы крумкач вылятаў з каўчэгу зірнуць, ці паменеў патоп, а пасля галубка, бялейшая пер’ем ад снегу, ляцела глядзець, ці падсохла зямля”* [Ксты]. Ной жыве па духоўных прынцыпах, нясе свету дабро і чысціню, цярпімасць і самаадданасць. Ён гатовы ахвяраваць сабою і прыняць чужую ношу на свае плечы. Як бачым, гэты біблейскі персанаж выяўляе ў сабе рысы, уласцівыя характару і паводзінам беларусаў: вернасць, любоў да чалавека, адказнасць і працавітасць. Імкненне выратаваць сябе і сваю душу, а таксама ўнутраны свет блізкіх людзей – гэта тая мэта, якую, як і Ной, павінен ставіць перад сабой кожны хрысціянін-беларус: *“На схіле веку кожны з нас, як Ной, які ў каўчэг сваёй душы забраць павінны, і рупна ратаваць хоць тыя напаміны, што моўчкі пойдуць за глухой труной”* [Ксты].

Сабраны і даследаваны лексічны матэрыял дазваляе зрабіць пэўныя высновы пра хрысціянскі светапогляд аўтара, які вельмі часта ў сваіх вершах у якасці аб’екта параўнання выбірае словы з “канфесійнай” семантыкай: *крыж*, *касцёл, царква*, *ікона*, *абразы*, *Ісус Хрыстос*, *душа*, *грэх*, *анёл*, *пекла, рай, ксты* і інш.

Адной з найбольш цікавых і глыбокіх па сваім змесце лексічных адзінак, якія ўдзельнічаюць у аб’ектывацыі цэнтральнага для хрысціян паняцця “Бог”, выступае у мове барадулінскай паэзіі назоўнік *ксты.* Упершыню гэтае найменне Р. Барадулін ужыў у перакладзе “Слова пра паход Ігаравы” на беларускую мову. Старажытнарускае *“...своя вещиа пръсты на живая струны въскладаше...”* перакладзены як *“...клаў свае ксты вешчыя на струны жывыя, вечныя...”* [Слова пра паход Ігаравы], дзе стараславянізм *прьстъ* ‘палец, перст’ заменены на слова *ксты*.

Заўважым, што ў старабеларускай мове ўжываўся назоўнік *кстины* ‘хрысціны, хрэсьбіны’. У народных гаворках Віцебшчыны канца XIX – пачатку XX ст. у такім значэнні бытавала назоўнікавая форма *кста*. Яшчэ ў 1897 г. даследчык беларускага фальклору М.Я. Нікіфароўскі ў зборніку “Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи” зазначаў: “…зрэзаныя пры «ксце» валасы дзіцяці святар кідае ў купель”; “мяне шалёны поп ксціў”; “калі дзіцяці крычыць пад «кстом» [аўт. крыжом], то яно будзе злосным чалавекам”. Такім чынам, назоўнік *ксты* мае даволі празрыстую этымалогію: яго паходжанне звязана са старажытнарускім словам *крестъ* ‘крыж’. А таму, відаць, можна меркаваць, што *ксты* – гэта пальцы, якімі хрысцяцца. Магчыма, Р. Барадулін наўмысна ўжывае семантычна ёмістую лексічную адзінку *ксты*, якая нясе ў сабе своеасаблівую асацыятыўнасць, непаўторнасць і надае мове перакладу нацыянальны каларыт і самабытнасць.

Назву “Ксты” носіць кніга духоўнай паэзіі Р. Барадуліна (2006), пра якую ішла гаворка вышэй. Гэты паэтычны зборнік можна з поўным на тое права назваць узорам хрысціянскай паэзіі як арганічнага складніка

нацыянальнай культуры беларусаў. У сваёй кнізе майстар слова разважае над пытаннямі зямнога прызначэння чалавека, знаёміць нас з асноўнымі пастулатамі хрысціянскай веры. Змешчаныя ў зборніку вершы выяўляюць духоўны вопыт беларусаў-хрысціян і маюць моцны выхаваўчы патэнцыял, даносяць да сучасніка аўтарскі погляд на жыццё і смерць, агульначалавечыя каштоўнасці ў цэлым.

У прадмове да кнігі ксёндз Уладзіслаў Завальнюк заўважае: "Арыгінальная назва кнігі. Слова «КСТЫ» – шматзначнае. Гэта і хрост (хрышчэнне), і крыжы, і пальцы, якія складваюцца, каб пераксціцца (пераажагнацца). Той жа корань у словах *ксціць, кшчоны, хрышчоны, ахрышчаны*. Гэтае слова паходзіць з усходнеславянскага ХРЕСТЪ, якое потым змянілася ў КРЕСТ" [Ксты]. Ідэйны змест барадулінскага зборніка паэзіі "Ксты" заключаецца ў наступным: кожны ахрышчаны чалавек павінен усвядоміць, што на працягу жыцця ён нясе свой крыж, што ён – хрысціянін, а таму павінен жыць па Боскіх запаведзях. У адным са сваіх вершаў паэт, звяртаючыся да Усявышняга, кажа: *"У бажбе, у шчырай мальбе да Цябе ксты зводзяцца самі. У неба грукаюся не кстамі – словамі ціхай малітвы. Пачуй мяне, Божа Вялікі…"* [Ксты].

Наколькі актуальная лексічная адзінка *ксты* ў сучасным моўным дыскурсе? Заўважым, што ў народных гаворках Віцебшчыны, у тым ліку Ушаччыны, якая з'яўляецца малой радзімай Р. Барадуліна, і сёння шырока функцыянуюць словы *ксціць* 'хрысціць', *ксціцца* 'хрысціцца', *кшчоны* 'хрышчаны', *ксціны* 'хрэсьбіны'. Апрача таго, назоўнік *Ксты* афіцыйна ўжываецца ў беларускай мове ў складзе анамастычнай лексікі. Так, тапонім *Ксты* вядомы на геаграфічнай карце Беларусі як назва вёскі непадалёку ад старажытнага Полацка і назва хутара ў Глыбоцкім раёне Віцебскай вобласці.

Такім чынам, у сваёй паэзіі Р. Барадулін трывала і натуральна выяўляе сваё хрысціянскае светаадчуванне. Ён звяртаецца да паглыбленага паэтычнага асэнсавання біблейскіх сюжэтаў, матываў і сімвалаў. Напаўняючы хрысціянскія матывы сучасным "паэтычным дыханнем", Р. Барадулін фактычна будуе і сцвярджае новыя этычныя прынцыпы ўзнаўлення дыялога душы чалавека з Богам.

Даследаваны моўны матэрыял сведчыць пра тое, што Р. Барадулін выявіў сябе як тонкі знаўца хрысціянскага веравучэння, які, выкарыстоўваючы ўласнабеларускую моўна-культурную глебу, па-мастацку дакладна і пераканаўча адлюстраваў асабістае разуменне біблейскіх матываў і вобразаў. Ужытая паэтам рэлігійная лексіка выразна рэпрэзентуе спецыфіку ўспрыняцця хрысціянскага веравучэння беларусамі. Метафарычныя выразы выступаюць адным з асноўных моўных сродкаў выяўлення аўтарскай пазіцыі і іграюць важную ролю ў стварэнні рэлігійна-духоўнай карціны свету беларусаў, сведчаць пра спецыфіку іх ментальна-псіхічнай арыентацыі як самастойнага этнасу.

4.5 Семантызацыя гістарычнага мінулага беларускага народа

Для Р. Барадуліна паняцце “Радзіма” асацыіруецца не толькі з родным домам, бацькамі, матэрыяльнай і духоўнай культурай. Радзіма для паэта – гэта яшчэ яе гістарычнае мінулае, гераічная памяць беларускага народа. У сваіх вершах і паэмах (“Сафійка”, “Мая бацькаўшчына”, “На Беларусі...”, “Каменная балада”, “Аплакалі вырай совы...”, “У вянок Мацею Бурачку”, “Цётка”, “Споведзь калосся”, “Пліты”) аўтар задумваецца над гістарычным мінулым Айчыны, настойліва і таленавіта ўзнаўляе старонкі гісторыі Беларусі, постаці продкаў – аратых, ваяроў, кніжнікаў. З яго вершаў можна ўявіць старажытны Мінск, які ніколі не мяняў свабоду на ярмо, Полаччыну, вядомую святлом “кірыліцы Скарынавай” і інш. Гістарычнае мінулае ў мове паэзіі Р. Барадуліна перадаецца не толькі праз назвы канкрэтных гістарычных падзей, імёны гістарычных асоб, назвы помнікаў архітэктурнай даўніны, але і праз апісанне сваіх продкаў, свайго радаводнага дрэва.

Увагу паэта прыцягваюць цэлыя пласты гісторыі Радзімы, найбольш значныя для беларускага народа падзеі. Вобразна-сімвалічнае адлюстраванне тэмы гістарычнага мінулага Беларусі выклікала ў аўтара неабходнасць шырокага выкарыстання моўных адзінак рознага семантычнага напаўнення, аб’яднаных агульным значэннем ‘гісторыя’. На роднай пісьменніку віцебскай зямлі здаўна скрыжоўваліся найважнейшыя гістарычныя шляхі і адбываліся сумнавядомыя ў гісторыі ваенныя сутычкі: *“Віцебшчына! Ты лёсам не выпешчана – ты войнамі выпешчана”* [Трэба дома бываць часцей]. Р. Барадулін трагічна апісвае бітву пад Грунвальдам: *“Грунвальд – след страху крывы, Грунвальд – адвага нямая, Грунвальд – крывіцкай крыві голас, што змогі не мае”* [Евангелле ад Мамы]; бітву пад Оршай: *“Мы даказалі ў бітве пад Воршаю не толькі мечам, не толькі пікай”* [Евангелле ад Мамы]. Неаднаразова згадваецца і славуты гандлёвы шлях “з варагаў у грэкі”, які ў свой час вельмі дапамог Беларусі ў эканамічным развіцці: *“Выходзяць з-пад апекі рэкі, рунеюць руны, днеюць сагі. Каб шлях згадаць з вараг у грэкі – кіруйся з грэкаў у варагі”* [Вечалле]; *“З возера пад паветку плывуць на калёсах лодкі, як даўно іх сёстры далёкія «з вараг ў грэкі»”* [Збор твораў 1]; *“У вірах затаіўшы жаль, напамінаюць забыўлівым рэкі, што па іх ляжаў шлях «з вараг ў грэкі»”* [Збор твораў 3].

У гады Вялікай Айчыннай вайны Віцебшчына панесла вельмі вялікія страты. Пра жыццё ў акупацыі, блакаду, смерць блізкіх, страх, холад і голад Р. Барадулін ведае не з чужых слоў, таму ваенныя падзеі вайны займаюць значнае месца ў яго літаратурнай творчасці. Трагічнаму асэнсаванню лёсу блакаднай партызаншчыны і суровага пасляваеннага жыцця прысвечаны паэмы “Матчына хата”, “Блакада”, вершы “Жароўня”, “Палата мінёраў”, “Труба”, “Стэарынавая свечка”, “Хлебнічак”, “Цялушка” і інш. Вайна пакінула незагойны боль сіроцтва, азмрочыла пару

дзяцінства аўтара. У блакаду ў апошнім баі загінуў бацька Р. Барадуліна. У ліра-эпічнай паэме “Балада” аўтар выкарыстоўвае фальклорныя формы замовы, плачу, праклёну, народныя афарызмы, якія адлюстроўваюць барацьбу нашага народа з акупантамі.

У сваіх вершах наш слынны зямляк згадвае ўшацкую вёску Гвазды, якую напаткаў такі ж трагічны лёс, як і лёс Хатыні: *“Да цябе не багата хады, толькі хто дабрыдзе-дападзе. Можна ехаць гады і гады і не ўбачыць цябе нідзе. Дзе ты, ушацкая вёска Гвазды?”* [Руны Перуновы]. Яна, гэтая вёска, *“праплыла, як цень па вадзе, чорнай хмарай у неба пайшла, не вяртаецца на зямлю”* [Руны Перуновы]. Аўтар параўноўвае нярэдка ворага з крумкачом. Гэты прадстаўнік птушынага свету мае адмоўную канатацыю ў моўнай карціне свету беларусаў. Крумкач – нячыстая, д’ябальская, праклятая і злавесная птушка, звязаная з душамі памерлых і замагільным светам: *“Крумкачы па-над борам крумкаюць”* [Збор твораў 1]; *“Колькі год, як аглухла вайна. Дык чаго ж у лясах беларускіх пасівелыя крумкачы аж дасюль па-нямецку пытаюць пра нешта: – Warum?”* [Збор твораў 2].

Пры апісанні жудасных падзей варожай навалы з мэтай больш трагічнага паказу рэалій таго часу ў моўнай тканіне барадулінскага радка даволі часта выкарыстоўваецца метафара: *“Вайна ж, пазалёгшы за кожным кустом, глядзела навокал позіркам немым”* [Збор твораў 1]; *“А мне баліць, а мне смыліць, а мне вайна страляе”* [Збор твораў 1] і інш. Цяжкі лёс нашай краіны падчас фашысцкай акупацыі паказваецца праз трапнае параўнанне: *“Беларусь, як удава па вайне, – ні апірышча, ні прыпірышча”* [Евангелле ад Мамы], у якім аўтар вобразна прыпадабняе, збліжае лёс Беларусі з цяжкім, трагічным лёсам удавы.

Зварот да падзей вайны – гэта не даніна часу, а ўнутраная неабходнасць паэта, заснаваная на фактах уласнай біяграфіі: *“Век мой, не дужа багаты падзеямі, ад сінізны і да сівізны рэзка на два адрэзкі падзелены: вайна і пасля вайны”* [Збор твораў 1].

У мове паэтычных твораў Р. Барадуліна пры апісанні тых ці іншых культурна-гістарычных падзей сустракаюцца назвы архітэктурных помнікаў і культавых збудаванняў. Напрыклад, *Каложа* – Каложская царква: *“Каложа – беларуская ўдава, надзеяй і трымаецца над прорвай”* [Збор твораў 2]; *Сафія* – Сафійскі сабор: *“Чаўны бласлаўляе ў Рыгу Сафія залатаглавая”* [Трэба дома бываць часцей]; *“Не скажуць у Полацку: «Сафійскі сабор»”. Тут яго называюць ласкава: «Сафійка»”* [Белая яблыня грому] і інш. Нагадаем, што полацкі Сафійскі сабор – адзін з самых славутых помнікаў архітэктурнай даўніны. Некалькі разоў у XVII–XVIII стст. яго спальвалі і разбуралі розныя заваёўнікі, але палачане зноў і зноў адбудоўвалі свой знакаміты храм, які і сёння застаецца славай і гонарам гісторыі і культуры беларускага народа. Лёс Сафійскага сабора ўвасабляе

сабой складаны гістарычны шлях і духоўную моц беларускага народа, бо гісторыя Полацка – гэта неад'емная частка гісторыі Беларусі.

У гістарычным і культурным развіцці любога народа важную ролю адыгрываюць прэцэдэнтныя імёны, да якіх адносяцца імёны людзей, чыя роля надзвычай вялікая не толькі для нацыянальнай, але і для сусветнай гісторыі і культуры. Найбольш часта сустракаюцца ў барадулінскай паэзіі наступныя імёны: *Еўфрасіння Полацкая, Францыск Скарына, Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч, Васіль Быкаў*: *"Ёсць полацкі менталітэт – ад Еўфрасінні, ад Скарыны"* [Евангелле ад Мамы]; *"Пяць зорак каньяку ўпартай Беларушчыны – Купала, Багдановіч, Колас, Караткевіч, Быкаў"* [Руны Перуновы]; *"Васільком у жыце Беларушчыны назаўсёды застанецца Быкаў"* [Руны Перуновы].

Трэба адзначыць, што сярод імёнаў беларускіх пісьменнікаў паэт часцей за іншыя ўжывае імя Янкі Купалы, бо паэзія класіка беларускай літаратуры натхняла Р. Барадуліна для напісання вершаў, прысвечаных роднаму краю, беларускаму народу: *"Янкам Купалам бачым, Янкам Купалам верым, Янкам Купалам вяртаем Беларусь у Беларусь"* [Руны Перуновы]. Узгадваюцца таксама сусветнавядомыя мастакі – ураджэнцы Беларусі. У іх ліку *Марк Шагал*: *"...Віцебскія васількі захлынулі сінечай Шагала"* [Белая яблыня грому]; *Язэп Драздовіч*: *"Язэп Драздовіч – павятовы Мікеланджэла, знаёмы быў з Сатурнам і Ярылам"* [Евангелле ад Мамы] і інш.

У паэтычным радку Р. Барадуліна звяртаюць на сябе ўвагу і прэцэдэнтныя імёны беларускай гісторыі. Напрыклад, *Жыгімонт* – вялікі князь літоўскі з 1506 года, а з 9 снежня таго ж года – кароль польскі; *Барбара Радзівіл* – каралева польская і вялікая княгіня ВКЛ: *"...Жыгімонт стары пісаў лісты на мове нашае да Радзівілы"* [Збор твораў 2]; *Тадэвуш Касцюшка* – палітычны і ваенны дзеяч Рэчы Паспалітай, кіраўнік нацыянальна-вызваленчага паўстання 1794 года, нацыянальны герой Беларусі: *"На вольнасць у Расіі позірк косы, ён косіць луг нязломнікаў Касцюшкі"* [Збор твораў 2] і інш.

Для паэта гісторыя роднага краю непарыўна звязана з яго продкамі. Аўтар часта задае пытанне: *"Дзе карані твае, адкуль твой род пачаўся?"* [Евангелле ад Мамы]. Пісьменнік глыбока ўсведамляе сваю непарыўную сувязь з прашчурамі, таму самае галоўнае для яго – веданне сваіх каранёў, свайго радаводнага дрэва. Пацверджаннем гэтаму з'яўляецца шырокае выкарыстанне наступных словазлучэнняў: *наш радавод, ствол радаводнага дрэва, памяць продкаў, дух прашчураў, сцяжына прадзеда* і інш. Пра барадулінскі радавод па бацькавай лініі ўзгадваецца ў вершы "Вечалле": *"Човен дзеда Грышкі лёгкім сном торкаўся ў затоку ў асачэлую"* [Трэба дома бываць часцей], па матчынай – у "Паэме жытняй скібе": *"Мой дзед, рыжанін Галвіньш, механік па млынах, на грошы быў не галы і выпіць – не манах"* [Збор твораў 2]. Аўтар са шкадаваннем зазначае: *"Андрэя Галвіньша, дзеда свайго, я не бачыў ніколі"* [Збор твораў 2]; *"Я дзеда не бачыў ніколі і*

таму адчуваю прагал у душы, памяць мая без яго, як хата без столі” [Збор твораў 2]. Змены ў гучанні прозвішчаў беларусаў з прычыны русіфікацыі нашага краю ў часы Расійскай імперыі таксама не засталіся не заўважанымі Р. Барадуліным: *“Андрэя Гальвіньша, дзеда свайго ... зрабілі яго Галовіным царскія пашпартысты ці пісары”* [Збор твораў 2]. Даволі іранічна падкрэсліваецца спадчынная неўтаймаванасць духу ў вершы “Пра бароды і маю радаслоўную”: *“Традыцыяй бунтарскай, неспакойнаю ўсе бароды з роду Барадулінаў”* [Збор твораў 2].

Не засталася па-за ўвагай паэта і сучасная сацыялагічная праблема – праблема ўрбанізацыі і міграцыі вясковага насельніцтва ў горад, а таксама, як вынік гэтага працэсу, “выміранне” вёскі. Р. Барадулін востра адчувае гэтую праблему і па-мастацку ёміста рэагуе на яе, бо менавіта вясковае насельніцтва ва ўсе часы з’яўлялася захавальнікам адметных рыс беларускага этнасу, яго мовы і традыцыйнай народнай культуры. Аўтарская думка выяўляецца праз наступную метафару: *“А лясныя галубы ў гарады пераляцелі…”* [Міласэрнасць плахі], дзе *лясныя галубы* – гэта вясковыя жыхары. Але вясковых, чыстых думкамі і памкненнямі беларусаў горад *рассяленіў, разгалубіў*: *“Рассяленены яны – разгалублены”* [Міласэрнасць плахі]. Асноўную сэнсавую нагрузку выконвае тут ужыты неалагізм *рассяленіць* ‘перастаць быць сялянамі’. Разам з тым у метафарычнай форме паэт зазначае, што старэйшае пакаленне беларусаў, якое мае сялянскія карані, не зможа прыжыцца ў горадзе: *“Старыя яблыні, іх карані не прыжываюцца на асфальце”* [Евангелле ад Мамы]. Р. Барадуліна, як карэннага вясковага жыхара, засмучае з’ява “наступлення” горада на вёску, што рэпрэзентуецца ў яго мове праз наступныя метафарычныя вобразы: *“Пад жалезнай пятою, як пад магільнай плітою, трава ў абразе не ўстае”* [Міласэрнасць плахі]; *“Горад рос, як горб, заплеччу вёскі і, нарэшце, вёску перарос”* [Евангелле ад Мамы]; *“У рукавах драўляных вулак і снегавіцей, і цішэй”* [Маўчанне перуна], дзе метафара *рукавы драўляных вулак* семантызуе знаёмыя аўтару з дзяцінства вуліцы з драўлянымі хатамі. Заняпад, запусценне вёскі адлюстроўвае наступны паэтычны радок: *“Лапяць дзіравы дах аблачыны, і дзверы на ноч зачыняюць вятры”* [Калі рукаюцца душы].

Не пакінула абыякавым паэта і Чарнобыльская трагедыя. Гэтая жудасная падзея, якая адбылася ўжо ў пасляваенны час, знайшла сваё адлюстраванне ў такіх вершах, як “Малітва наступнасці”, “Спачатку”, “Апакаліпсіс”, “На тым свеце вугалькамі”, “Як у казцы” і інш. Аўтар называе Беларусь *гаратніцай, удавою*, а беларускі народ параўноўвае з вугалькамі: *“А сягодня і на гэтым свеце собіла, не гаворачы сякераю з беразнякамі, беларусам разабрацца вугалькамі, вугалькамі, што з рэактара, з Чарнобыля”* [Збор твораў 2]; *“Хай свяціцца імя Тваё, у палыновым вянку, гаратніца”* [Збор твораў 2]; *“Атам зрабіў Беларусь удавою”* [Збор твораў 2].

Як сведчыць даследаваны матэрыял, асэнсаванне гісторыі Беларусі выступае неад’емным кампанентам паняцця “Радзіма” ў мове паэзіі

Р. Барадуліна. Гістарычнае мінулае беларускага народа ў мове паэзіі Р. Барадуліна выяўляецца найперш праз ужыванне ім прэцэдэнтных імён культурных і гістарычных дзеячаў.

Увагу паэта прыцягваюць цэлыя пласты гісторыі яго Радзімы, тыя ці іншыя краіназнаўчыя рэаліі мінулых эпох, найбольш значныя для беларускага народа гістарычныя падзеі (Вялікая Айчынная вайна, Чарнобыльская трагедыя і інш.). Праз выкарыстанне аўтарам у мове сваіх твораў намінатыўных адзінак з нацыянальна-культурнай семантыкай выяўляецца стаўленне Р. Барадуліна да сваіх продкаў, свайго радаводнага дрэва.

4.6 Семантызацыя прыродных рэалій

Паэзія Р. Барадуліна выступае невычэрпнай крыніцай ведаў пра асаблівасці беларускай прыроды. Лінгвакраіназнаўчая адметнасць яго твораў выразна выяўляецца праз сістэму лексічных адзінак, якія ў сваёй семантыцы даволі поўна і глыбока выяўляюць краіназнанаўчы змест паняцця “прырода”. У мове паэтычнай спадчыны аўтара сустракаецца вялікая колькасць трапных метафарычных выразаў, якія рэпрэзентуюць тыя ці іншыя прыродныя рэаліі Беларусі.

Для Р. Барадуліна, як і для многіх іншых пісьменнікаў, паняцце “Радзіма” звязана не толькі з родным домам, дзе ён нарадзіўся, дзе прайшло яго маленства і юнацтва, але і з прыродным асяроддзем, якое акружала яго кожны дзень. Ушаччына, дзе ўбачыў свет і сталеў паэт, – вельмі маляўнічы куток, у якім безліч рэк і ручаёў, балот і азёр, гаёў і дуброў. Таму невыпадкова, што ў яго вершах шырока выкарыстоўваюцца вобразы прыроды. Яны з’яўляюцца не толькі ўвасабленнем хараства і прыгажосці роднага краю. Тыя ці іншыя прыродныя рэаліі дастаткова часта выступаюць у ролі традыцыйных народных сімвалаў, што прэзентуюць менталітэт беларусаў, спецыфічнае бачанне імі навакольнага свету і месца чалавека ў ім.

Заўважым, што ў аснову любога сімвала пакладзены канкрэтны вобраз, які выходзіць за межы прамога значэння і, дасягаючы шырокага абагульнення за кошт пашырэння сваёй семантыкі, выражае новы змест. Мастацкія сімвалы вызначаюцца канкрэтнасцю вобразаў, якія паходзяць з навакольнага, пераважна з расліннага ці жывёльнага свету. Якраз праз пэўныя вобразы-сімвалы прыроды і рэпрэзентуецца ў паэтычнай мове Р. Барадуліна паняцце “Радзіма”.

Як вядома, каля адной трэці тэрыторыі нашай краіны занята лясамі. У мове Р. Барадуліна лес увасабляецца праз метафару-перыфразу *зялёнабровы брат: “Зялёнабровы брат, спагаднік і дарадца, не хочацца з-за крат зялёных выбірацца”* [Маўчанне перуна]. Пра выкарчаваныя ляды паэт піша: *“Мроіцца аблясець выкарчаванаму ляду”* [Руны Перуновы],

дзе *ляда* – гэта дзялянка высечана лесу. У структуры метафары звяртае на сябе ўвагу аўтарскі дзеяслоўны неалагізм *аблясець*, ужыты ў значэнні ‘пакрыцца лесам’. Майстар слова неаднаразова звяртае ўвагу на адну з найважнейшых экалагічных праблем сучаснасці – высечку лясных масіваў і садоў, што з’яўляецца недапушчальным, бо яны – *жывучыя народы зялёнага мацерыка*: *“Сады – жывучыя народы зялёнага мацерыка. Не абмінаюць іх нарогі, кашчавай засухі рука”* [Адам і Ева].

Трэба заўважыць, што адным з самых частотных колераў у барадулінскай паэзіі з’яўляецца зялёны колер, які ў моўнай свядомасці беларусаў традыцыйна асацыіруецца з колерам прыроды, дрэў і травы: *“А зямля зялёна-маладая”* [Збор твораў 1]; *“Быў нядаўна шалёна-зялёны, быў нядаўна зусім малады, жоўты ліст”* [Збор твораў 2]. У аўтара гэта таксама колер прыроды: *“Падперазаў фарсісты дужы дуб зялёны пояс хмелю з кутасамі”* [Збор твораў 1]; *“Прыціхлі вязы ў пашане зялёнаю талакою”* [Збор твораў 1]; *“А твая парадзела чупрына, бор беларускі зялёнакрылы”* [Збор твораў 3].

Ушаччына – гэта край, які спрадвеку славіўся сваімі лясамі. Лес з’яўляецца вызначальным фактарам у жыцці і лёсе беларусаў. Р. Барадулін зазначае: *“Лес – калыска нашае паэзіі”* [Збор твораў 2]; *“Шануйце лес – ён багацце нашага краю”* [Збор твораў 3]. Для характарыстыкі роднага кутка паэт выкарыстоўвае звычайныя па форме эпітэты, праз якія ён паказвае любоў да сваёй Радзімы, сваю знітаванасць з прыродай. Напрыклад, *край лясны: “Не крыўдуй, край лясны, я пазбаўлен даверу”* [Абсяг]; *край ласкава-лясны:“Край ласкава-лясны: згадкі светлыя прывяла песня з краю ласкава-ляснога”* [Вечалле]; *старана лясная: “Чытаю Быкава – і зноў вяртаюся ў краіну сноў, у старану маю лясную”* [Збор твораў 2]. Вельмі часта творца адухаўляе лес, надзяляючы яго псіхалагічнымі адзнакамі чалавека. І гэта зразумела: беларускі народ здаўна вызначаўся сваёй сумленнасцю і непадкупнасцю, цярплівасцю і добразычлівасцю: *“Дрэвы за душой не носяць злосці…”* [Збор твораў 2]; *“Лес – беларус (усё стрывае), маўчыць, як дол (а ствол гудзе!)”* [Евангелле ад Мамы].

Адлюстроўваючы прыродна-кліматычныя ўмовы пражывання беларусаў, Р. Барадулін не абмяжоўваецца толькі родавай назвай *лес*. У яго сустракаюцца відавыя назвы асобных разнавіднасцей лесу. Напрыклад, *бор: “Што смуцен, родны бор? Даўно цябе не бачыў”* [Белая яблыня грому]; *“Беларусь, цябе задумаў лёс надзяліўшы борам, а не морам”* [Збор твораў 2]; *“І варта толькі прачнуцца – бароў беларускіх заныe звон”* [Збор твораў 3]; *пушча: “Ты галіну адну крані – пушча ўся ўва мне заныe”* [Збор твораў 1]; *гай: Рад я зорам, гаям белакорым* [Збор твораў 1]; *“Калі б усе гаі Беларусі хацелі сцяжыны ўслаць, дзе ногі твае ступалі, у іх бы лістоў не хапала…”* [Збор твораў 1] і інш.

Дрэва, як вядома, з’яўляецца неад’емнай часткай матэрыяльнай і духоўнай культуры народа. Як трапна адзначаў рускі лінгвіст А. Жураўлёў,

“матэрыяльная культура славян мае «драўляны характар» і роля дрэва такая вялікая, што можа лічыцца вызначальнай для развіцця як большасці бакоў знешняга, так і многіх бакоў унутранага, духоўнага жыцця чалавека са славянскага племені” [48, с. 132].

Дрэва ў славян – гэта матыў далучэння да свету продкаў, што абумоўлена і прыроднымі фактарамі, і фальклорна-абрадавымі традыцыямі, і векавым земляробчым укладам жыцця, і міфічнымі ўяўленнямі пра сусветнае дрэва – дрэва жыцця, якое з даўніх часоў лічылася пасрэднікам паміж небам і зямлёй. У лясах і гаях язычнікі хавалі нябожчыкаў. Апрача таго, дрэва выступае як сімвал памяці пра мінулае, вобраз самой вечнасці.

У творах Р. Барадуліна неаднаразова выкарыстоўваецца прыём адухаўлення, у аснове якога ляжыць параўнанне дрэва з чалавекам. Але, па меркаванні паэта, дрэвы, у адрозненне ад людзей, *“не носяць за душой злосці”* і дадуць прытулак любому чалавеку пасля заканчэння яго жыццёвага шляху, што і рэпрэзентавана ў структуры метафары *прытуляць на пагосце*: *“Дрэвы за душой не носяць злосці. Мы на іх з сякераю, з пілой. А яны прытуляць на пагосце, плачучы па нас жывой слязой”* [Амплітуда смеласці].

Вобраз дрэва ў паэзіі Р. Барадуліна дастаткова шматпланавы. Само паняцце “дрэва” асацыіруецца ў яго з вечнасцю і жыццястойкасцю і выступае як *дрэва жыцця*: *“Захавальніца дрэва жыцця стала дрэвам”* [Збор твораў 1]; *купалаўскае дрэва*: *“Няхай галініцца і карэніцца пявучае купалаўскае дрэва”* [Збор твораў 1]; *радаводнае дрэва*: *“Каб галінаю кожнай трымацца за ствол радаводнага дрэва – радзінаю”* [Евангелле ад Мамы]; *дрэва існасці: “Спадаюць дні, як ягады ў гарнушак, і мы – як з дрэва існасці лісты”* [Ксты]. Прааналізаваўшы моўныя сродкі, якія сустракаюцца ў мастацкім кантэксце Р. Барадуліна і звязаны з паняційным зместам назоўніка *дрэва*, можна выдзеліць іх наступныя асацыятыўныя рады:

1) дрэва – ідэя чалавечага пачатку: *“Чалавек, як і дрэва, расце, карэніцца, галее паволі ствол…”* [Збор твораў 3]; *“Людзі з падсечанымі каранямі, дрэвы з адсечанымі рукамі”* [Збор твораў 1]; *“Вечназялёнаму дрэву – чалавеку дазволіла вечнасць многа”* [Збор твораў 1];

2) дрэва – увасабленне жаноцкасці. У барадулінскай паэзіі досыць багатая палітра “жаночых адценняў”, асацыятыўна звязаных з вобразам дрэва, напрыклад, *ніцыя вярба: “Сівымі матулямі ніцыя вербы схінуцца”* [Збор твораў 3]. Звяртаючыся да дзяўчыны, паэт называе яе *маладой яблынькай*: *“І яблынькаю маладой стаіш ты з першай завяззю...”* [Збор твораў 2];

3) дрэва – сцвярджэнне бясконцасці жыцця: *“Адзелянее дрэва адно і зелянее на змену наступнае дрэва, яно жыве спадзяваннем, што зелянецьме вечна”* [Збор твораў 3];

4) дрэва – “інструмент” далучэння да свету продкаў*: “Але абміні той апошняй сасной, якой не жадаю нікому* [Збор твораў 3];

5) дрэва, як сімвал прыгнечанай, спаленай, зруйнаванай войнамі Беларусі, семантызуецца праз разнастайныя словазлучэнні. Напрыклад, *адзічэлая яблыня: “Беларусь – адзічэлая яблыня, хто ні ідзе – цябе трасе”* [Міласэрнасць плахі]; *адзіны дуб: “Край мой спаконны – адзіны дуб з выпаленай сэрцавінай”* [Абсяг].

У моўнай карціне свету беларусаў асобныя відавыя назвы дрэў – *бяроза, дуб, вяз, сасна, клён* – утрымліваюць дастаткова глыбокую нацыянальна-культурную канатацыю. Так, адным з самых распаўсюджаных дрэў на тэрыторыі Беларусі з’яўляецца бяроза. Ва ўсходніх славян бяроза нярэдка персаніфікуецца ў абліччы дзяўчыны, што, магчыма, звязана з колерам ствала: белы колер – сімвал нявіннасці і чысціні. У аснове пераважнай большасці аўтарскіх метафар-рэпрэзентантаў бярозы ляжыць менавіта адметнасць колеру гэтага дрэва. На аснове знешніх асацыяцый паэт стварыў трапную метафару *беразняк смяецца белазубай усмешкай* [Евангелле ад Мамы]. Прымаючы пад увагу белы колер бярозавай кары, Р. Барадулін выкарыстоўвае семантычна ёмісты неалагізм *белакоры*: *“Цень згарыць бярозак белакорых”* [Маўчанне перуна]. Гэтае найменне сімвалізуе жаночы пачатак. Менавіта таму яно стала ў беларусаў вызначальным атрыбутам шэрагу святочных рытуальна-абрадавых комплексаў.

У славян пладовае дрэва разглядаецца як двайнік чалавека. У паэзіі Р. Барадуліна такім дрэвам з’яўляецца яблыня: *“А маці, як яблыня, белая з гора”* [Збор твораў 1]. Таксама дрэвам-двайніком у паэта выступае вяз. Гэта дрэва – памяць сына пра свайго бацьку, які загінуў на вайне. Як вядома, вяз каля хаты быў пасаджаны бацькам паэта. Спалучэнне прыналежнага прыметніка *бацькаў* і назоўніка *вяз* стала ў паэзіі Р. Барадуліна ўстойлівым выразам, якое семантызуе родны бацькоўскі дом: *“І хацелася мне перанесці, як, хату, Вушачу ў падсуседзі Парыжу, каб вяз, бацькаў вяз на палях Елісейскіх зелянеўся на яблычны Спас”* [Евангелле ад Мамы]; *“Ля весніц толькі зноў твой вяз крануў галінкамі за плечы* [Белая яблыня грому]; *“І чуе бацькаў вяз, і чуе сад стары”* [Евангелле ад Мамы]; *“Пачуць ва Ушачы першы гром пад бацькавым раскрылым вязам”* [Вечалле].

Дуб у беларусаў – сімвал вечнага жыцця, дрэва лёсу. Дуб, як дзікарослае дрэва, асацыіраваўся ў мінулым з чужынай. У Р. Барадуліна стары дуб увасабляе мудраца ці старога чалавека: *“У дуба-ведуна з-пад караня прабілася бруістая крыніца”* [Збор твораў 1].

У традыцыйнай народнай культуры нашых продкаў сасна здаўна лічылася сімвалам даўгалецця і бессмяротнасці, жыццястойкасці і пераадолення бед. Гэтае дрэва, паводле міфа-паэтычных уяўленняў беларусаў, стварыў Бог. Сасна – адно з самых старажытных дрэў, вядомых чалавецтву ад пачатку яго існавання і адна з самых распаўсюджаных на тэрыторыі Беларусі парод, неад’емная частка беларускай флоры.

У мове даследаваных вершаваных тэкстаў гэтае дрэва паўстае ў метафарычным вобразе набожнага чалавека са свечкамі ў руках: *“У падзяку нябёсам у пракавечным зялёным храме сасна трымае ценькія свечкі, зацепленыя сонным святлом”* [Руны Перуновы]. У іншым метафарычным кантэксце сасновыя галіны пераўвасабляюцца ў вобразе *сасновых гуслей*: *“Звіняць галін сасновых гуслі”* [Выбраныя творы]. На Беларусі з даўніх часоў сасна лічылася якасным будаўнічым матэрыялам, які выкарыстоўваецца пры будаўніцтве і сёння: *“І стаць сасне сцяной – спіной вясёлай хаты”* [Збор твораў 1].

Як паказваюць шматлікія даследаванні па міфалогіі, яшчэ з часоў старажытнасці ў славян святым дрэвам лічыўся клён. Гэтае дрэва сімвалізавала здольнасці да магічнай абароны, каханне і матэрыяльны дабрабыт. У свядомасці носьбітаў славянскіх этнакультур клён атаясамліваецца з восенню. Гэтыя асацыяцыі з’яўляюцца характэрнымі і для Р. Барадуліна. Так, пры апісанні клёна аўтар выкарыстоўвае метафару *дрыгатлівы агонь павесіўся на суку*, якая семантызуе чырвона-жоўтае кляновае лісце: *“Скалануўся клён: дрыгатлівы агонь павесіўся на суку…”* [Евангелле ад Мамы]. Паколькі абрысы Беларусі на карце свету нагадваюць сваёй формай кляновы лісток, сэнсава зразумелай і вытлумачальнай з’яўляецца барадулінская метафара *ты* [Беларусь] *бласлаўляла даланёй кляновaю сваіх сыноў* [Евангелле ад Мамы].

У моўнай тканіне даследаваных паэтычных твораў рэпрэзентаваны і іншыя найменні дрэў з цікавай і багатай этнакультурнай сімволікай. З’яўляючыся неад’емнай часткай расліннага свету Беларусі, гэтыя дрэвы ўвасабляюць сабой яе некідкую прыгажосць і сціпласць, прыхаваную сілу і мяккасць, за якімі лёгка пазнаецца беларускі нацыянальны характар. Напрыклад, *рабіна: “Рабіны-дамы тлеюць полымнаверхія праз дождж, праз дымы”* [Выбраныя творы]; *ліпа: “І кулачкі засохлых лісцяў сціскаюць маладыя ліпы”* [Выбраныя творы]; *вярба: “Гітару вярбіны вясна настройвае – падкручвае белыя калкі каташкоў”* [Выбраныя творы]; *вішня: “Вішні плачуць белымі слязамі…”* [Руны Перуновы]; *таполя: “Галавой кіўнуў гулліва вяз таполі сарамлівай”* [Выбраныя творы] і інш. У апошнім паэтычным кантэксце знайшла адлюстраванне ідэя ўвасаблення мужчынскага пачатку ў вобразе вяза, а жаночага пачатку – у вобразе таполі, бо традыцыйна таполя сімвалізуе адзіноту, сумнае дзявоцтва і журбу.

Раслінны свет у паэзіі Р. Барадуліна нясе ў сабе таксама пэўную этнакультурную інфармацыю пра Беларусь. У мове аўтара назвамі такіх раслін выступаюць апелятывы *васілёк* і *лён.* Адзначым, што найбольшай частотнасцю словаўжыванняў у мове даследаваных твораў характарызуецца назоўнік *васілёк*, які выступае як сімвал святасці і павагі, пяшчоты і прастаты: *“Усміхаецца васілёк нябёсам”* [Кстыі]; *“А той галасок паяднае парыў неабдумны і клёк, і песню аб сінім Дунаі, і смутак палёў – васілёк”* [Евангелле ад Мамы]. Карціна ціхага сонечнага дня ўзнікае перад вачыма

пасля прачытання выкарыстанага паэтам метафарычнага спалучэння *васільковы спакой*: *“Васільковы спакой. Смутак верасу сіні”* [Выбраныя творы]. Як адзначалася вышэй, васілёк (адна з нешматлікіх кветак, якія носяць мужчынскае імя) – гэта яшчэ і этнакультурны сімвал Беларусі, адзін з самых папулярных элементаў беларускай народнай вышыўкі.

Лён вырошчваўся на Беларусі з даўніх часоў і лічыўся самым каштоўным матэрыялам для вырабу адзення. З ільнянога валакна ткалі палатно, выраблялі прыгожыя і трывалыя тканіны. Сёння яны з’яўляюцца гандлёвым брэндам нашай краіны. Кастрыцу (адходы лёну пасля пераціравання і трапання) выкарыстоўвалі як уцяпляльнік і паліва. У “Паэме-падарожніцы” Р. Барадулін адзначае: *“А на самай справе лён Алена не трэ, бо лён – ён прадмет старадаўняга экспарту, і старанна вывозіцца ў Еўропу, у Японію і потым ідзе да нас гатовым прадуктам”* [Збор твораў 2]. У пэўнай ступені гэтая лексічная адзінка сімвалізуе нашу краіну Беларусь. Менавіта таму Р. Барадулін зазначае: *“Смяецца лён – апошні сінявокі беларус”* [Евангелле ад Мамы]. Чытаеш гэтыя радкі і нібы бачыш, як нябесным блакітам разліваецца льняное поле.

Што да прадстаўнікоў жывёльнага свету, то паняцце “Радзіма” ў мове паэзіі Р. Барадуліна найбольш часта рэпрэзентуецца праз наступныя найменні птушак: *бусел, жаўранак, журавель, зязюля.* Неабходна заўважыць, вобраз птушкі вельмі часта выкарыстоўваецца беларусамі для перадачы духоўнага пачатку, нечага “нефізіялагічнага”, ідэальнага, часам для характарыстыкі з’яў, якія патрабуюць светапоглядных ацэнак. Напрыклад, у нацыянальнай карціне свету нашага народа карціны свету праз вобраз птушкі перадаецца думка пра каштоўнасць, шанаванне і ўсхваленне сваёй Радзімы і роднага дома.

Адной з найбольш ужывальных назваў птушак у моўнай тканіне барадулінскай паэзіі з’яўляецца назоўнік *бусел.* Паводле народных уяўленняў беларусаў, убачыць бусла ці мець каля свайго жытла буслянку – гэта добры знак для чалавека: *“І, вядома ж, абавязкова бусел – ён па традыцыі даўняй мусіць мой сон пераксціць, як некалі гэта рабіла мама”* [Трэба дома бываць часцей]. Згодна са старажытнай легендай, Бог ператварыў чалавека ў бусла, які праз сваю цікаўнасць развязаў мех з рознымі гадамі: *“Можа, сам развязаўся вузел, а звалілі ўсё на бусла. І збірае прапажу бусел аж дасюль па балоце, па лузе”* [Збор твораў 2].

Вобраз бусла вельмі часта ўспрымаецца ў якасці сімвала Беларусі, роднай зямлі. У асэнсаванні беларусаў бусел – гэта святая, “божая”, чыстая птушка, якая надзелена чалавечымі якасцямі: *“Хоць гавары з бусламі – у іх мудрэц любы”* [Збор твораў 1]. Акрамя агульнаўжывальнага, літаратурнага наймення гэтай птушкі, выкарыстоўваецца дыялектны варыянт, які даволі актыўна ўжываецца на Ушаччыне, – *бацян*: *“Бацян забытым клёкатам нясе ў гняздо цяпло”* [Збор твораў 1]; *“Хай твой бацян над апошнім балотам, ад асакі рудым, пераражагнае спагадліва ўзлётам”* [Вечалле].

Зязюля ў народнай свядомасці беларусаў – прарочая птушка, варажбітка, якая вызначае працягласць чалавечага жыцця, паведамляе пра надыход лета і будучы ўраджай: *“Лічыць гады зязюлям у маладых барах”* [Збор твораў 1]; *“Нам яны пакідалі свет белы, каб зязюлі гады нам лічылі”* [Збор твораў 1]. У мове паэтычных твораў Р. Барадуліна зязюля – абяздоленая, адзінокая жанчына, пакутніца, удава: *“З бароў вушацкіх, што зрабілі лядамі, апошняя зязюлька баравая над братам убіваецца, кукуе”* [Руны Перуновы]. Нагадаем, што ад назвы гэтай птушкі ўтвораны некаторыя назвы раслін, напрыклад, *зязюльчын мох* ‘род баравых імхоў’: *“Мохам зязюльчыным ідуць маладзіцы”* [Збор твораў 1]; *“Мох зязюльчын рос на вываратнях”* [Збор твораў 1].

Увасабленнем нечага значнага, вартага, каштоўнаснага і часта недасягальнага ў традыцыйнай карціне свету беларусаў выступае журавель: *“…Жураўля я не спаймаў у небе, а сініцу выпусціў з рукі…”* [Збор твораў 1]. Адлёт журавоў, як правіла, асацыіруецца ў чалавека з жалем, сумам, журбою: *“Спрадвечны сум апаў тужліва – лятуць у вырай журавы”* [Збор твораў 1]; *“Лятуць журавы над Ушачай курлыканнем сумным”* [Збор твораў 1].

Этнакультурная сімволіка наймення *журавель* набліжана да сімволікі назоўніка *жаўранак*. У народзе з прылётам гэтых птушак звязваюць надыход вясны і пачатак новага жыцця: *“Чакання жаўрукі твае вітаюць вёсны”* [Збор твораў 1]; *“Як захлынуўся ад радасці жаўранак, славячы сонца вясновага дня”* [Трэба дома бываць часцей].

Вобраз перапёлкі ці ластаўкі выкарыстоўваецца пісьменнікам для стварэння вобраза маці: *“Па зорках дарогу шукала, калі пад страхою нябеснай перапёлкаю начавала”* [Збор твораў 2]; *“А маці, як ластаўка, з усёй Вушачы цягнула да печы абгарак, аполак, цалёўку”* [Збор твораў 3].

Нярэдка аўтар выкарыстоўвае вобраз птушкі, каб апісаць ці ахарактарызаваць пэўнага чалавека, беручы пры гэтым за аснову народнае ўспрыманне таго ці іншага прадстаўніка птушынага свету. Так, лексічная адзінка *сарока* – гэта сімвал жаночай балбатлівасці: *“А на плоце – сляды сарочыя. Што прыносіла ўжо сюды? Што пляткарыла, белахвостая?”* [Збор твораў 3].

Такім чынам, сімволіка птушкі даволі пашырана ў мове паэзіі Р. Барадуліна. Паэт асэнсоўвае прадстаўнікоў птушынага свету праз прызму міфапаэтычнай мадэлі свету і традыцыйнай народнай культуры беларускага народа, уносячы сваё разуменне ў іх сімволіку, якая дапамагае аўтару паказаць звычаі, традыцыі, асаблівасці духоўнага свету яго землякоў.

Пры апісанні роднага краю побач з назвамі жывой прыроды Р. Барадулін шырока ўжывае найменні з’яў нежывой прыроды, у тым ліку водных аб’ектаў. Вада – гэта вызначальная прыродная стыхія ў жыцці славян, у тым ліку і беларусаў. Вобраз вады ў беларускай паэзіі духоўна значны, сэнсаўтваральны. Паэтызуючы водныя аб’екты – раку, возера,

ручай, майстар слова выяўляе сваё народнае светаўспрыманне, выкарыстоўваючы традыцыйную фальклорную сімволіку.

Родны край для паэта – гэта не толькі дарагія сэрцу вёскі і мястэчкі, але і яго азёрная Ушаччына, якая лічыцца адной з самых багатых на азёры мясцін у Беларусі: 8–10% тэрыторыі Ушацкага раёна займаюць менавіта гэтыя водныя аб'екты. Як заўважае аўтар, *"...іх у нас – усе 250 і яшчэ адно"* [Збор твораў 3] ; *"Уся пераліваецца ў азёрах ушацкая зямля з часінаў тых"* [Евангелле ад Мамы].

У вершы "Васількі" азёры Ушаччыны на аснове колеравага падабенства параўноўваюцца з сімвалам Беларусі – васільком, што адлюстравана ў метафары *азёр вушацкіх васількі* [Евангелле ад Мамы]. У свядомасці паэта рэкі і азёры Беларусі – гэта нібы ўзыходы зярнят, пасеяных рукой Усявышняга: *"З нябеснае сяўні ва ўпартыя разоры ляцелі з вышыні зярнятамі азёры. Зярняты прараслі, і зарунелі рэкі"* [Маўчанне перуна].

Як адзначалася вышэй, у аснове пераважнай большасці метафарычных выразаў Р. Барадуліна ляжаць асацыятыўныя сувязі з рэаліямі беларускай культуры. Так, пойма ракі асацыіруецца з кашуляй, падперазанай поясам: *"Унізе на пойме, падперазанай рэчкай, бляе навязаная авечка"* [Руны Перуновы]. Выяўлены метафары-рэпрэзентанты паняцця "вада", якія надаюць дадзенай стыхіі ўласцівасці свойскіх жывёл, найперш такіх, як карова і конь, на якіх у мінулым трымалася сялянская гаспадарка і якія гарантавалі гаспадарам матэрыяльны дабрабыт: *"Як камень-лізун карова, мора языком ад пяску казытлівым бераг ліжа, жмурачыся белаброва"* [Руны Перуновы]. У метафарычным вобразе каня паўстае луг, які *капытом хоча біць азяро: "Капытом хоча біць азяро луг, уздымлены туманамі"* [Адам і Ева]. Лексічная адзінка *мора* рэпрэзентуе стыхію вады і ў іншых паэтычных кантэкстах Р. Барадуліна, дзе ўжываюцца метафары-перыфразы, у склад якіх уваходзіць дадзены назоўнік, у значэнні якога актуалізуецца семантычны кампанент 'прастора, вялікая па памерах'. Так, жыта ў свядомасці паэта асацыіруецца з *морам бурштыновым* [Міласэрнасць плахі]; а лес – гэта *мора зялёнае* [Міласэрнасць плахі]. У аснове дадзеных метафар-перыфраз ляжаць колеравыя характарыстыкі прыродных аб'ектаў Беларусі – жыта і лесу.

Сімвалічна гучыць назва зборніка Р. Барадуліна "Вечалле". Вечалле – гэта назва аднаго з азёр на Ушачынне, якое мае надзвычай празрыстую і чыстую ваду. У значэнні гэтага ўласнага наймення асноўным семантычным кампанентам выступае прыметнік *вечны (векавы)*. Возера з'яўляецца матэрыялізаванай душой прыроды, крыніцай і захавальнікам адвечнай гісторыі. Усведамляючы значнасць і неабходнасць возера ў жыцці землякоў, паэт звяртаецца да яго са словамі вялікай павагі і пашаны, называючы спадчынным: *"Спадчыннае возера маё, вечнасцю прывечанае Вечалле"* [Збор твораў 3].

У моўнай тканіне вершаваных тэкстаў нашага земляка сустракаюцца і іншыя назвы водных аб'ектаў Ушаччыны, большая частка якіх мае выразную ўнутраную матывацыю. Напрыклад, рэчка *Крывуха*, возера *Ваўчэнскае*: *"Асіраціліся ўсе без яго – рэчка Крывуха, Ваўчэнскае возера"* [Руны Перуновы]; азёры *Чарсцьвяды, Чаравэчча: "І азёры мае – Чарсцьвяды, Вечалле, Чаравэчча таксама ад мора бяруць свой пачатак"* [Трэба дома бываць часцей]; рэчка *Задобрыца: "А мяне зачакалася рэчка Задобрыца – і перад ёю трэба задобрыцца"* [Збор твораў 3].

З непадробнай любоўю аўтар паэтызуе раку *Нёман*, якая спрадвеку лічылася сімвалам Беларусі: *"А недзе далёка каціўся Нёман"* [Неруш]; *"Нёман рупіцца з даўніны у спрадвечнае падарожжа"* [Вечалле]; *"І сапраўды, як хатняя рака, тутэйшы Нёман – б'е хвастом ля ганка"* [Евангелле ад Мамы]; *"Па Нёмне над ляскамі плывуць аблок вазы"* [Абсяг] і інш. Ствараючы вобраз гэтай мнагаводнай, знакавай для Беларусі ракі, паэт імкнецца паказаць звычаі і абрады заходніх беларусаў, якія спрадвеку жылі на яе ўзбярэжжы: на Купалле дзяўчаты пускалі на ваду вянкі, зробленыя з кветак, для таго, каб даведацца пра свой будучы лёс: *"Плывуць вянкі па Нёмну, як плыты, і жмурыцца байніцамі Каложа"* [Збор твораў 3].

Цікавую лінгвакраіназнаўчую інфармацыю нясуць у сабе назвы іншых даволі значных водных аб'ектаў Беларусі: *Дзвіна, Прыпяць, Свіслач, Шчара*. Рэкі і азёры Беларусі праз прызму светабачання Р. Барадуліна – гэта адметныя старонкі ў лёсе многіх беларускіх пісьменнікаў. Выкарыстоўваючы гідранімічныя назвы, паэт звяртаецца да сваіх сяброў-пісьменнікаў. Напрыклад, у вершы "Незабыты экспромт", які аўтар адрасаваў Алегу Лойку, узгадваецца рака *Шчара* (левы прыток Нёмана), што працякае па тэрыторыі Брэсцкай і Гродзенскай абласцей і сімвалізуе малую радзіму А. Лойкі, які сам быў родам са Слонімшчыны: *"Над Сенаю я ўспомніў Шчару"* [Збор твораў 3]. А ў вершы "Кромань" апісваецца родная старонка Казіміра Камейшы, дзе *Кромань* – возера ў Стаўбцоўскім раёне Мінскай вобласці': *"Знікаючы, пушча таропка шукае гаючага трунку. І Кромань – балючая кропка ў сказе, што просіць ратунку"* [Збор твораў 1].

Апрача названых, сустракаюцца назвы іншых даволі значных водных аб'ектаў Беларусі: *Дзвіна* – рака, праз якую ў старажытнасці праходзіў шлях "з варагаў у грэкі": *"Журавам Ушаччыны трымацца зямлі – іх любоўю звязала трывала рачулка Дзвіна"* [Вечалле]; *Прыпяць* – рака Брэсцкай і Гомельскай абласцях Беларусі, правы прыток Нёмана: *"Зямлі бацькоў лясамі пакланіцца, над Прыпяццю шумець, прасіць лясы"* [Міласэрнасць плахі]; *Свіслач* – рака ў Гродзенскай вобласці, левы прыток Нёмана: *"На Свіслачы праныры-галкі трываласць лёду правяраюць"* [Трэба дома бываць часцей] і інш. Як бачым, найменні-гідронімы ў мове паэзіі Р. Барадуліна – гэта сапраўды ўнікальны анамастычны матэрыял для краіназнаўства Беларусі.

Са сказанага вышэй вынікае, што для Р. Барадуліна прыродны свет Беларусі, які семантызуецца як праз апелятыўныя лексічныя адзінкі, так і дзякуючы тапанімічным найменням, з'яўляецца не толькі ўвасабленнем прыгажосці роднага краю, але і змяшчае ў сабе дастаткова багатую краіназнаўчую інфармацыю і традыцыйную народную сімволіку.

Вывады

Праведзены аналіз моўнага матэрыялу, праз прызму якога ў вершаваных творах Р. Барадуліна рэпрэзентуюцца тыя ці іншыя краіназнаўчыя звесткі пра Беларусь, дае падставы меркаваць пра светабачанне паэта-беларуса з Ушаччыны, а таксама яго асабістую ацэнку тым ці іншым з'явам нацыянальнай рэчаіснасці.

Вобразна-сімвалічнае адлюстраванне тэмы роднай зямлі выклікала ў мастака слова неабходнасць шырокага выкарыстання моўных сродкаў рознага семантычнага напаўнення, аб'яднаных агульным значэннем 'Радзіма'. Этнакультурная адметнасць мовы аўтара выразна выяўляецца праз сістэму лексічных, фразеалагічных і парэміялагічных адзінак, а таксама метафарычных выразаў. Для пісьменніка Радзіма – гэта Беларусь, яе вялікая гісторыя, матэрыяльная і духоўная культура, родны бацькоўскі дом, прырода, працавітыя і сціплыя па характары землякі.

Прааналізаваны моўны матэрыял з нацыянальна-культурнай семантыкай дазваляе сцвярджаць наступнае: разнастайнасць і значная частотнасць ужывання назваў розных народных свят і прысвяткаў выяўляе рэлігійны светапогляд нашага народа, яго назапашаныя стагоддзямі мудрыя назіранні за прыродай і сведчыць пра захаванне рэшткаў духоўнай культуры старажытнасці. Праз выкарыстанне адпаведных намінатыўных адзінак паэт падкрэслівае, што і сёння існуюць язычніцкія міфалагічныя ўяўленні аб існаванні "таго свету", адзначаюцца разнастайныя рэлігійныя святы, з пакалення ў пакаленне перадаюцца гісторыі пра міфічных істот.

Этнакультурная спецыфіка даследаваных моўных адзінак семантызуе агульнапрынятыя нормы паводзін беларусаў і пераканаўча сведчыць пра тое, што для нашага народа ва ўсе часы былі характэрны такія этнічныя адзнакі і якасці характару, як працавітасць і гаспадарлівасць, памяркоўнасць і таварыскасць, павага да хрысціянскіх традыцый і звычаяў, годнае стаўленне да людзей, шчырасць і гасціннасць, патрыятызм.

Шматлікія намінацыі з шырокім дыяпазонам побытавага значэння, якія ўжываюцца ў паэтычнай мове Р. Барадуліна, не толькі рэалістычна характарызуюць паўсядзённае жыццё беларусаў, але і адлюстроўваюць асаблівасці традыцыйнага народнага календара, які звязвае чалавека з прыродай і верай у звышнатуральныя сілы, выяўляюць любоў і пашану да зямлі, асаблівасці погляду нашага народа на прыроду і грамадскія адносіны, без чаго цяжка ўявіць яго матэрыяльную культуру.

Гістарычнае мінулае ў мове паэзіі Р. Барадуліна рэпрэзентуецца, як правіла, праз выкарыстанне ўласных, у тым ліку асабовых назоўнікаў, якія называюць гістарычныя падзеі, гістарычных асоб, помнікі архітэктурнай даўніны і інш.

Адметнасць прыроднага асяроддзя, жывёльнага і расліннага свету Беларусі знайшла шырокае адлюстраванне ў мове літаратурнай творчасці паэта. І гэта невыпадкова, бо многія назіранні за навакольным светам дапамагаюць чалавеку ў побытавай сферы яго дзейнасці. А ўласцівасці птушак, звяроў, свойскіх жывёл прадстаўнікі беларускай этнічнай супольнасці яшчэ з часоў глыбокай старажытнасці атаясамлівалі з рысамі характару чалавека. Расліны ж служылі неад'емным атрыбутам шматлікіх беларускіх свят, абрадаў, якія займалі не менш значнае месца ў жыцці нашага народа ў параўнанні з яго штодзённай гаспадарчай і працоўнай дзейнасцю.

Тапанімічныя назвы ў мове паэзіі Р. Барадуліна – гэта ўнікальны анамастычны матэрыял для вывучэння гісторыі і культуры, а таксама прыродных аб'ектаў Беларусі. Захоўваючы лінгвакраіназнаўчую адметнасць і этнамоўны каларыт, яны дазваляюць глыбей спасцігнуць канцэптасферу паэта і зразумець нацыянальную карціну свету беларусаў.

Як адзначалася вышэй, Рыгор Барадулін з'яўляецца выдатным прадстаўніком сучаснай метафарычнай паэзіі, прызнаным майстрам стварэння яркіх індывідуальна-аўтарскіх метафар, у аснове якіх ляжаць беларускія нацыянальна-культурныя рэаліі. Прэзентаваны моўны матэрыял дазваляе сцвярджаць, што метафара выступае адным з асноўных моўных сродкаў выяўлення такіх ключавых паняццяў, як "Радзіма" – "родная мова" – "маці", якія ў свядомасці творцы выступаюць як непадзельнае трыадзінства. Гэтыя знітаваныя паміж сабой паняцці знаходзяць моўную рэпрэзентацыю ў творчай спадчыне паэта-Сына ад першага зборніка "Маладзік над стэпам" (1959) да апошняй кнігі "Вушацкі словазбор" (2013), якую наш слынны зямляк з Ушаччыны назваў самай галоўнай кнігай усяго жыцця.

Раздзел 5
ЛІНГВАКРАІНАЗНАЎЧЫЯ РЭАЛІІ Ў ПАЭЗІІ ГЕНАДЗЯ БУРАЎКІНА

Клянуся полацкаму краю.
Г. Бураўкін

5.1 Лінгвакраіназнаўчы змест паняцця “Радзіма”

Як адзначалася ў папярэдніх раздзелах, у беларускай літаратуры “Радзіма” з’яўляецца адным з ключавых этнічна і сацыяльна абумоўленых паняццяў, якія трансліруюцца праз мову мастацкіх тэкстаў. У сваім інфармацыйным змесце яно выяўляе найважнейшыя, базавыя каштоўнасці беларусаў як нацыянальна-культурнай супольнасці. Сярод разнастайных моўных сродкаў, пры дапамозе якіх адбываецца аб’ектывацыя гэтага паняцця ў паэтычным дыскурсе сучаснага беларускага паэта Генадзя Бураўкіна, звяртаюць на сябе ўвагу лексічныя сродкі, што ствараюць у яго творах своеасаблівы этнакультурны фон.

Г. Бураўкін добра ведаў жыццё беларускага народа, яго гісторыю і сучаснасць, актыўна ўдзельнічаў у грамадска-палітычным жыцці краіны, клапаціўся пра лёс роднай мовы. Усе гэтыя акалічнасці абумовілі грамадзянскі характар яго паэзіі, якую вызначае арганічная сувязь са сваім народам і імкненне заглянуць у будучыню. Да канца адданы свайму, роднаму, беларускаму, паэт напісаў шмат вершаваных твораў, у якіх тэма Радзімы займае цэнтральнае месца.

Для рэпрэзентацыі паняцця “Радзіма” ў значэнні ‘родная краіна’ Г. Бураўкін выкарыстоўвае разнастайныя найменні. Напрыклад, *Беларусь: “З далёкай дарогі і з доўгай разлукі нас дома чакаюць гасцінны абрус, матуліны вочы, бацькоўскія рукі і шчодрае сэрца тваё, Беларусь”* [Выбранае]; *“Маёй песні калыска, майго шчасця калыска, непагаснае сонца маё, Беларусь!”* [Выбранае]; *“А я і ў радасці, і ў скрусе, і калі сцішуся ў труне, сніць буду сны аб Беларусі – маёй радзімай старане”* [Выбранае]; *“…мне сняцца сны аб Беларусі – маёй пакутнай старане”* [Выбранае]; *“Толькі дзе за морам ні жыў я, Беларусь мая снілася мне”* [Гняздо для птушкі радасці]; *“Няхай сабе ціха, няхай сабе глуха – імя Беларусі душа паўтарае”* [Узмах крыла].

Як і ў літаратурнай творчасці Р. Барадуліна, у паэзіі Г. Бураўкіна паняцце “Радзіма” дастаткова часта рэпрэзентуецца праз аднайменную лексічную адзінку *Радзіма: “І якія б шляхі ні схадзіў я, кліча полацкая сенажаць… А калі не спяваць аб Радзіме, дык навошта наогул спяваць?”* [Гняздо для птушкі радасці]; *“Ды гатовы заўжды, за Радзіму сваю*

без прынукі мы пакласці жыццё...” [Вершы пяці кніг]; *“Ёсць на свеце нямала прыгожых узлессяў, ёсць на свеце нямала чароўных дарог, толькі самыя лепшыя словы і песні для цябе я, Радзіма, збярог”* [Выбранае]; *“Калі суджана ўпасці, мы спакойна ўпадзём між бяроз за высокае шчасце – жыць Радзіме без гора і слёз”* [Выбраныя творы 2]; *“І свой пасад сярод народаў мая Радзіма заняла”* [Выбраныя творы 2]; *“Так ужо заведзена спрадвеку – можа, прымха, можа, Божы знак – толькі на Радзіме чалавеку ходзіцца і дыхаецца ўсмак”* [Узмах крыла]; *“Далёкай Радзімы забытыя цені выходзяць, нячутныя, з лесу старога”* [Узмах крыла]; *“Я ўдзячны лёсу, што ва ўсе часы мая блакітнавокая радзіма не засланіла мне чужой красы, мяне ад свету не адгарадзіла”* [Выбраныя творы 1]. Як сведчыць прыведзены ілюстрацыйны матэрыял, найбольш распаўсюджанымі семантычнымі складнікамі лексічнай адзінкі *Радзіма* ў паэта выступаюць такія кампаненты значэння, як ‘любоў да роднай зямлі’, а таксама ‘туга па Радзіме, страта чалавекам сэнсу жыцця на чужыне’.

У бураўкінскім паэтычным кантэксце звяртае на сябе ўвагу яшчэ адно найменне, праз якое адбываецца семантызацыя паняцця “Радзіма”, – гэта назоўнік *Бацькаўшчына*: *“Я праг для Бацькаўшчыны шчасця, гатовы быў хоць на вайну…”* [Выбранае]. Дастаткова пашыраным у мове твораў з’яўляецца назоўнік *край*, ужыты ў значэнні ‘вобласць, мясцовасць, што вылучаецца па якой-небудзь прымеце’, які выяўляе сваё значэнне праз пэўнае лексічнае акружэнне – прыметнікі *беларускі: “І лён, зусім, як неба, сіні, і ўсе ў рамонках берагі... Мой беларускі, мой адзіны край ад калыскі дарагі…”* [Выбраныя творы 1]; *родны: “І з кожным годам родны край мілей…”* [Выбранае]; *мілы:“Колькі вызнаў і вынес ты, краю мой мілы!.. І сягоння ўспамін твае грудзі пячэ…”* [Вершы пяці кніг]; *матчын: “Нідзе не здраджваў матчынаму краю, не набіваўся іншаму ў сыны. А ўсё часцей дадому прыязджаю я з адчуваннем даўняшняй віны”* [Выбранае]; *васільковы “Засталася спагаднай і годнай, разбудзіла маўклівы абшар, некрыклівая споведзь народа, васільковага краю душа”* [Выбранае]. Асноўную сэнсавую нагрузку ў гэтых словазлучэннях нясуць прыметнікі-эпітэты, кожны з якіх па-свойму выяўляе любоў паэта да сваёй Радзімы-Беларусі. Выразнай лінгвакраіназнаўчай спецыфікай вызначаецца апошні метафарычны эпітэт *васільковы (край)*, семантычна звязаны з валошкай (васільком) – кветкай, якая, як і наш народ, такая ж сціплая, някідкая і адкрытая.

Трэба адзначыць, што ў мове паэтычнай творчасці Г. Бураўкіна паняцце “Радзіма” неаднаразова рэпрэзентуецца праз словазлучэнні *бацькоўская зямля* і *родная зямля* са значэннем ‘родны кут’: *“І багацця мне не трэба, без прысмакаў пацярплю – толькі б хлеба, толькі б неба ды бацькоўскую зямлю”* [Выбраныя творы 1]; *“Хтось палюе на сініцу, нехта ловіць жураўля… Мне ж багацце і не сніцца – толькі родная зямля”* [Выбраныя творы 1]; *“Застанецца на роднай зямлі грудок. Застанецца на роднай мове радок…”* [Выбранае]. Лінгвакраіназнаўчую маркіраванасць

назоўнік *зямля* атрымлівае ў наступным паэтычным радку: *“Я не думаў, што так прывязаны да імшарнай, пясчанай зямлі, да пагоркаў з дубамі і вязамі, да бяроз, што ў паляны ўраслі”* [Выбранае], дзе прыметнікі *імшарны, пясчаны* ўжыты невыпадкова, бо характарызуюць асаблівасці прыроднага асяроддзя Беларусі. Любоў аўтара да сваёй Радзімы, яго шчырыя патрыятычныя пачуцці выяўляюцца таксама ў наступных радках: *“...чароўная наша зямля”* [Варта вернасці]; *“Я славы не малю, пашаны не вымольваю, люблю сваю зямлю, найлепшую, па-мойму”* [Гняздо для птушкі радасці] і інш.

У аб’ектывацыі паняцця “Радзіма” прымае ўдзел таксама назоўнік *старана* ‘мясцовасць, краіна’, які набывае лінгвакраіназнаўчы змест дзякуючы тым ці іншым прыметнікавым лексічным канкрэтызатарам: *“Ці абзавуцца ў небе гусі, ці дзяцел грукне па сасне, мне сняцца сны аб Беларусі – лясной, азёрнай старане”* [Варта вернасці]. У спалучэнні з займеннікамі *свая* / *наша* лексічная адзінка *старана* набывае дадатковы сэнсавы кампанент ‘родная, дарагая, блізкая сэрцу мясціна’: *“...і што праўда на свеце адна – без крупінкі маны, і што шчасця на свеце няма без сваёй стараны...”* [Жніво]; *“Заморскія далікатэсы не падыходзяць для мяне... Я выпечан з такога цеста, што толькі ў нашай старане”* [Выбранае]. Вернасць роднаму краю і абяцанне вярнуцца дадому, нягледзячы на тое, дзе б ты ні апынуўся і куды б ні закінуў цябе лёс, гучыць у вершы “Колькі б нам за жар-птушкаю ўслед ні ганяцца…”, які пакладзены на музыку: *“...усё роўна прыблудзім назад у сяло, дзе ў далёкім юнацтве, у шчаслівым юнацтве на цара-жураўля майстравалі сіло”* [Выбранае].

Г. Бураўкін неаднойчы выказваў сваю адданасць, любоў і вернасць роднаму краю, народу, дзяржаве, а таксама атрыбутам дзяржаўнасці Беларусі – гербу і сцягу, якія ва ўсе часы выступалі як сімвалы самастойнасці і незалежнасці краіны: *“Каб толькі быў у хаце хлеб нязводны, і соль, і дружбы вечнае цяпло, каб перад сцягам і зямлёю роднай мне каяцца патрэбы не было...”* [Выбранае].

Трэба адзначыць, што паняцце “Радзіма” для пісьменніка найперш звязана з Полаччынай. Аўтар доўгі час жыў у Полацку. Гэтаму гораду ён неаднойчы прызнаваўся ў любові. У аўтабіяграфіі паэт неяк зазначаў: “Я люблю сваю Полаччыну, свой родны кут так, як можна любіць толькі радзіму”. Гонар за тое, што ён з Полаччыны, са слаўнай зямлі Беларусі, якая дала свету вялікія імёны (Еўфрасіння Полацкая, Францыск Скарына, Сімяон Полацкі) адчуваецца ў наступных радках: *“Калі ў далёкіх краях на мяне заяўлялі правы я паўтараў, што са слаўнага Полацка родам”* [Вершы пяці кніг]. У апошнім паэтычным выказванні асноўную сэнсавую нагрузку нясе прыметнік-эпітэт *слаўны* ‘які набыў славу, славуты’, праз які выяўляецца гонар удзячнага паэта-сына за сваю Радзіму.

Любоўю да роднага краю прасякнуты таксама верш “Полацкая балада”, у якім паэт, услухоўваючыся ў гукі мінулых стагоддзяў,

прызнаецца: *“Я люблю тваю чуйную зімнюю ціш, мой абсыпаны зоркамі горад”* [Вершы пяці кніг]. Гэты верш адсылае сучаснікаў да багатай і цікавай гісторыі нашых зямель, у тым ліку да гісторыі і культуры Полацка – калыскі беларускай дзяржаўнасці ў мінулыя часы. З верша мы даведваемся, што гісторыя Полацка непарыўна звязана з іменем першадрукара, гуманіста і асветніка эпохі Адраджэння Францыска Скарыны: *“Гэта рыпнуў Скарыны друкарскі станок, гэта пахне друкарскаю фарбай… З хрустам плечы расправіў стамлёны друкар, мой разумны, няўрымслівы продак”* [Вершы пяці кніг].

Для наймення сваёй малой радзімы аўтар выкарыстоўвае таксама такія двухкампанентныя намінатыўныя адзінкі, як *полацкі край* ці *полацкая зямля.* Напрыклад: *“Вось і клянуся полацкаму краю, дзе над Дзвіной крутыя берагі, што аж да скону вернасць захаваю і песнямі аддам свае даўгі”* [Паміж зоркай і свечкай], а таксама ўласныя назвы *Полаччына, Полацк* і інш.: *“Не шукайце красы за морамі, узбярэжжаў з крыштальнымі зорамі, – прыязджайце да нас на Полаччыну, пахадзіце яе прасторамі”* [Выбраныя творы 1] і інш.

Рэалізацыя лінгвакраіназнаўчага зместу паняцця “Радзіма” ажыцяўляецца ў Г. Бураўкіна і праз айконім *Мінск.* І гэта невыпадкова, бо Мінск з’яўляецца сталіцай Радзімы – Беларусі, а сталіца дзяржавы, як правіла, асацыіруецца з Бацькаўшчынай: *“…і ў цябе я ў даўнім даўгу, Мінск любімы – мая сталіца. Слоў шукаю – і не магу да яшчэ не кранутых прабіцца”* [Вершы пяці кніг]. Самыя ўзнёслыя і светлыя пачуцці ў душы паэта заўсёды выклікаў старажытны Віцебск, які раскінуўся па абодва берагі Дзвіны. Пра гэта сведчаць наступныя радкі: *“…і сэрца аб Віцебску песню спявае. І ў сэрца мне хваляю плешча Дзвіна”* [Выбраныя творы]. Відавочна, што паняццевы кампанент ‘любоў да Радзімы’ аб’ектывуецца тут дзякуючы метафарам *сэрца спявае, у сэрца плешча Дзвіна.*

Заўважым, што паняцце ‘малая радзіма’ ў мове даследаваных твораў семантызуюць таксама двухкампанентныя найменні *бацькоўская зямля: “Уцякаюць хлопцы ў гарады, ад зямлі бацькоўскай уцякаюць”* [Вершы пяці кніг]; *“Зноў для кожнай травінкі свой я на мілай бацькоўскай зямлі, толькі маці стала сівой…”* [Вершы пяці кніг]; *бацькоўская страха: “Прывязу я дахаты, да бацькоўскай страхі не цяжкія дукаты, а цяжкія грахі”* [Паміж зоркай і свечкай]; *бацькоўскае жытло: “Як душа апахмяліцца хоча… хоць глытком жытнёвай цёплай ночы, хоць дымком бацькоўскага жытла!”* [Вершы пяці кніг]; *матчын край: “Нідзе не здраджваў матчынаму краю, не набіваўся іншаму ў сыны”* [Выбранае]; *матчына акно*: *“Маё гняздо – там, дзе твае барозны, дзе матчына вячэрняе акно”* [Выбраныя творы 2]; *матчын парог: “Кожная птушка ў сваё гняздо вяртаецца з выраю… дык ці ж магу я забыцца матчынага парогу?”* [Выбранае]; *бацькоўскі парог: “Толькі сум нахлыне часам, варухне душу трывога, што вяртаюся нячаста да бацькоўскага парога…”* [Выбранае].

Ужыванне назоўніка *парог* як сімвала бацькоўскага жытла і роднай хаты ў Г. Бураўкіна невыпадковае. Гэтая намінацыя выступае таксама як напамін пра гады маленства, сялянскі побыт і родную хату, у якой нарадзіўся і сталеў будучы паэт: *“Не думай, што забыў лучыну і нізкі ссечаны парог. Я ўсё, чаму мяне вучыла, у сэрцы беражна збярог”* [Выбранае]. Бацькоўскі дом – гэта тое месца, дзе цябе заўсёды чакаюць, дзе ты ніколі не будзеш чужым: *“Нас дома чакаюць гасцінны абрус, матуліны вочы, бацькоўскія рукі і шчодрае сэрца тваё, Беларусь!”* [Выбранае].

Такім чынам, у значэнні разгледжаных лексічных сродкаў, праз якія ў мове паэтычных твораў Г. Бураўкіна адбываецца лінгвакраіназнаўчая рэпрэзентацыя паняцця “Радзіма”, найперш рэалізуецца семантычны кампанент ‘месца нараджэння’, у якім замацавалася архетыпічнае ўяўленне беларусаў аб Радзіме як маці, сям’і, родным доме. Вобраз Радзімы, які з’яўляецца ключавым вобразам у грамадзянскай паэзіі Г. Бураўкіна, раскрываецца праз пачуццё патрыятызму, павагі да гісторыі і культуры свайго народа, гонару за сваю краіну, тое месца, дзе будучы паэт нарадзіўся, правёў дзяцінства і юнацкія гады.

5.2 Рэпрэзентацыя культурна-гістарычнай спадчыны беларускага народа

Даследаванне нацыянальна-маркіраваных слоў, якія функцыянуюць у моўнай прасторы мастацкага тэксту Г. Бураўкіна, паказала, што трансляцыя традыцыйнай народнай культуры адбываецца найперш праз выкарыстанне лексікі з этнакультурным кампанентам значэння, якая семантызуе адметнасці матэрыяльнай культуры беларусаў, асаблівасці іх светапоглядных ацэнак і характару, звычаі і абрады.

Са старажытных часоў традыцыйным сімвалам Беларусі з’яўляецца зубр. Гэты мудры і спакойны (калі яго не злаваць) звер і сёння сімвалізуе нашу краіну, выступаючы своеасаблівым эталонам характару беларусаў. З гонарам за сваю Бацькаўшчыну паэт заяўляе: *“І цяпер прыгажэй, даражэй удвая, ты стаіш, Беларусь, завадская, зубрыная. Я – пясчынка твая. Я – крывінка твая”* [Выбранае], дзе метафарычны эпітэт *зубрыная (Беларусь)* са значэннем ‘моцная, дужая, упэўненая ў сваіх сілах’ мае выразную нацыянальна-культурную канатацыю. Ужыванне побач эпітэтаў *завадская* і *зубрыная* паказвае, што ў вобліку нашай Радзімы даўняе, прыроднае, натуральнае спалучаецца з новым, індустрыяльным, да гэтага небывалым.

Г. Бураўкін неаднаразова акцэнтуе ўвагу на такіх найважнейшых этнічных характарыстыках беларусаў, як працавітасць і жыццялюбства: *“…і бярозкі, бярозкі, бярозкі, бярозкі ўзнімаліся ў неба за спатнелай спіной”* [Вершы пяці кніг]. Нягледзячы на ўсе выпрабаванні лёсам,

наш народ застаўся здольным захаваць любоў і прагу да жыцця, што пацвярджае наступны паэтычны радок з “лінгвакраіназнаўчым падтэкстам”: *“… а жыццялюбста вечнага запас на дне тваіх крынічак захаваны”* [Выбранае]. Праз метафару *жыццялюбства вечнага запас* аўтар выказвае ўпэўненасць: што б ні здарылася, беларусы ніколі не страцяць прагі да жыцця, як ніколі не перастануць бруіцца крыніцы на нашай беларускай зямлі.

Адметнымі этнічнымі якасцямі характару беларускага народа, як заўважалася вышэй, з’яўляюцца такія рысы, як памяркоўнасць і добразычлівасць, таварыскасць, сціпласць і свабодалюбства: *“Ты, Беларусь, не ўмела быць другой, жыла ў братэрстве і сяброў цаніла”* [Выбранае]; *“Не прымала маны і прынукі, не сцірала загару са шчок і хавала сялянскія рукі пад сатканы самой хвартушок”* [Выбраныя творы 1]. У вершы “Я прайшоў і праехаў столькі” Г. Бураўкін пытаецца: *“Дзе знайду я такую вось яснасць і такую славянскую ціш?”* [Выбранае]. У значэнні метафарычнага эпітэта *славянская (ціш)* актуалізуецца дадатковы сэнсавы кампанент ‘спакойны, стрыманы, ураўнаважаны характар беларусаў-славян’.

Міралюбівы характар нашага народа, павага да іншых этнасаў і разам з тым пачуццё нацыянальнай годнасці выяўляюцца ў наступным паэтычным кантэксце: *“Я ўдзячны лёсу, што ва ўсе часы мая блакітнавокая радзіма не засланіла мне чужой красы, мяне ад свету не адгарадзіла…”* [Выбранае]. Гордасць і самадастатковасць, сумленнасць і імкненне жыць у міры выяўляюцца ў вершы “Так ужо заведзена спрадвеку…”: *“Не хадзіў ты ніколі па свеце з іржавай жабрацкаю місай, і чужога не браў, і разбой не чыніў у жыцці”* [Узмах крыла]. Сапраўды, на Беларусі спрадвеку жылі дружалюбныя і добразычлівыя людзі. Цярплівасць беларусаў, іх імкненне жыць у сяброўстве і згодзе з суседзямі у многім прадвызначаны гісторыяй, азмрочанай незлічонымі войнамі, якія, варта адзначыць, самі беларусы ніколі не пачыналі першымі.

Беларус – гэта найперш селянін-земляроб, вясковы жыхар, працалюб. Ён ва ўсе часы шчыраваў на зямлі. Яго асноўным клопатам быў клопат пра тое, як апрацаваць глебу і сабраць добры ўраджай: *“Быць можа, д’яблу я душу аддаў бы, паслухаўшы, як маняць каралі, калі б зусім не ведаў простай праўды, вялікай праўды плуга і раллі”* [Выбранае]. Як бачым, *плуг, ралля* – гэта словы, якія, выступаючы ў якасці лінгвакраіназнаўчых адзінак, сімвалізуюць сваім зместам і цяжкую сялянскую працу на зямлі, і адначасова непадробную любоў да роднай зямелькі-карміцелькі, якая для беларускага этнасу ва ўсе часы выступала асновай жыццядзейнасці, была своеасаблівым падмуркам і асновай для існавання. На зямлі вырошчвалі хлеб. На зямлі будавалі хату. Імкненне мець уласную зямлю – гэта жаданне прывесці сваё жыццё ў адпаведнасць са сваёй сутнасцю. Зямля – гэта своеасаблівы архетып беларусаў, асноўнае багацце нашага народа і самога аўтара: *“Запахне жывіцай і хлебам,*

забомкаюць сонна чмялі… Нічога мне ў свеце не трэба – ні неба, ні зор – без зямлі” [Выбранае].

Цяжкасць паднявольнага жыцця сялян-мужыкоў у розныя гістарычныя эпохі, імкненне разбудзіць у іх чалавечую і нацыянальную годнасць перадаюць наступныя паэтычныя радкі: *“І клікаў я народам звацца забітых працай мужыкоў”* [Гняздо для птушкі радасці], дзе асноўную сэнсавую нагрузку ў рэпрэзентацыі думкі нясе метафарычны выраз *забітыя працай мужыкі.*

У шматлікіх вершах паэт з Віцебшчыны знаёміць чытача са звычаямі і традыцыямі сваёй Радзімы. У яго творах дастаткова часта можна сустрэць зварот да народных свят беларусаў. Традыцыйным сімвалам народнай культуры Беларусі можна лічыць ручнік. Вышываная, узорыста вытканая тканіна здольна выклікаць у прадстаўнікоў беларускага этнасу шмат пачуццяў і асацыяцый. Створаны па законах мастацтва, ручнік упрыгожвае паўсядзённы побыт і адначасова з’яўляецца сімвалічным напамінам аб нябачных сувязях, што знітоўваюць асобнага чалавека з Богам, яго родам, продкамі. Шчымлівыя ўспаміны пра родную хату, дзе прайшло маленства будучага паэта, знайшлі адлюстраванне ў наступным паэтычным кантэксце: *“Вуглы закопчаныя тыя, дзе ціха плакаў хлапчуком, дзе ахінуліся святыя вясковым белым ручніком”* [Вершы пяці кніг].

У змесце паэтычных твораў Г. Бураўкіна важнае месца належыць намінатыўным адзінкам з лінгвакраіназнаўчым зместам, якія абазначаюць спецыфічныя прадметы і рэаліі, характэрныя для побыту нашага народа – *гладыш, куфель (кухаль), палавік, сальніца* і інш.: *“На цеснай падмеценай кухні жыве душа на дне гладыша і ў прыцьмелым вымытым кухлі, у мяккім тканым палавіку, у старай драўлянай сальніцы і ў цёмным кутку…”* [Паміж зоркай і свечкай].

У вершы “Вясковая ідылія” краіназнаўчую інфармацыю нясуць у сабе шматлікія лексічныя адзінкі з нацыянальна-культурным кампанентам значэння, якія знаёмяць нас з традыцыйным сялянскім побытам беларусаў, іх святочнымі традыцыямі і побытавай сферай. У іх ліку назоўнікі *паркан* ‘агароджа з бярвёнаў ці штыкетніку’, *калодзеж* ‘вузкая і глыбокая яма, умацаваная зрубам для здабывання вады’, *калаўрот* ‘прыстасаванне для падымання вядра з калодзежа’, *парог* ‘бервяно або брус у ніжняй частцы дзвярнога праёму’, *ходнік* ‘саматканы палавік’, *масніцы* ‘дошкі ў падлозе’, *рушнік* ‘вузкі прадаўгаваты кавалак тканіны для выціранння твару, рук ці посуду’, *абразы* ‘ікона’ і інш. Звернемся да наступнага паэтычнага кантэксту:

Квецень асыпала вішня на росны гарод.
Певень заспаны ўзляцеў на паркан зухавата.
І над калодзежам рыпнуў стары калаўрот…
Гэта няспешна ступіла на вуліцу свята.
Зводдаль глядзяць вераб’і на памыты парог.
Ластаўка хоча бліжэй да акна прымасціцца.

Дыхае ў печы салодкі пшанічны пірог.
Пахнуць аерам пад ходнікам чыстым масніцы.
Дрэмлецца ціха на лаўцы рудому катку.
З-пад рушнікоў абразы ўзіраюцца строга [Паміж зоркай і свечкай].

Нацыянальная адметнасць культурна-гістарычнай спадчыны беларусаў выразна праяўляецца ў вершы "У звышсучаснай каламуці…", дзе аўтар з сумам і дакорам паведамляе, што сёння мы ўжо амаль не прытрымліваемся "старых правіл", па якіх жылі нашы продкі: *"У звышсучаснай каламуці, нібыта «іжыцу» і «яць», старыя правілы чамусьці мы пачынаем забываць"* [Гняздо для птушкі радасці]. "Старымі правіламі" з'яўляюцца парады і спрадвечныя маральныя ісціны: *"Не папракай кавалкам хлеба бацькоў, нашчадкаў і гасцей"; "У беднай хаце, дзе на цвіку вісіць сума, не заікайся пра багацце, бо тут яго даўно няма"; "І ўжо зусім ніякавата не знацца з ісцінай такой: пажар тушыць і ставіць хату найлепш суседскай талакой"* [Гняздо для птушкі радасці].

Адным з найбольш старажытных свят, вядомых яшчэ з часоў язычніцтва, у нашых продкаў было Купалле. Разам з цудоўнымі купальскімі песнямі яно захавалася і дайшло да нашых дзён. Паводле этымалагічных звестак, назва гэтага свята звязана са старажытнаславянскімі словамі *купа* 'агонь' і *купети* 'гарэць'. Заўважым, што на Палессі і зараз вогнішча, раскладзенае на вуліцы, называюць *купала.* Гэтае традыцыйнае свята лягло ў аснову аднайменнага верша "Купалле", у якім аўтар нібы нагадвае свайму сучасніку: *"З былых вякоў у новыя вякі плывуць, плывуць купальскія вянкі. Ля кветкі – кветка... Ля шчакі – шчака. Цячэ, цячэ купальская рака* [Выбранае], дзе асноўную сэнсавую нагрузку пры рэпрэзентацыі нацыянальна-культурнай інфармацыі пра традыцыйную абраднасць беларусаў нясуць метафарычныя словазлучэнні *купальскія вянкі* і *купальская рака.* Пра тое, што старажытны звычай адзначаць купальскае свята захаваўся да нашых дзён, сведчыць радок *"з былых вякоў у новыя вякі"*, у якім выразна семантызуецца пераемнасць хрысціянскіх традыцый на Беларусі.

Яшчэ адно традыцыйнае свята, якое згадваецца ў бураўкінскіх вершах, – свята Іллі, што адзначаецца 2 жніўня: *"Стаміўся свет ад млоснай цішыні. Пад пылам задыхаюцца прысады, хоць бы Ілля на вогненным кані рассёк глухую шэрасць далягляду"* [Вершы пяці кніг]. Святы Ілля – гэта персанаж беларускага фальклору, які ўвабраў у сябе спалучэнне вобразаў біблейскага прарока Іллі і язычніцкага бога Перуна. Ад апошняга Ілля пераняў уладу над громам, маланкай і навальніцамі. Ілля грукаціць па небе на калясніцы і кідае стрэлы-маланкі ў нячыстыя духі.

Беларусь – край, багаты на казкі, міфы і паданні. Фальклорная спадчына беларусаў заўсёды цікавіла Г. Бураўкіна: *"Плыве блакітнае сяйво – дымок над смольнымі карчамі, як сына блуднага свайго, мяне зноў казка прыручае"* [Выбранае]. Адметным у вершаваным радку з'яўляецца ўжыванне дыялектнага слова *сяйво*, са значэннем 'тое, што сыплецца, сеецца адкуль-небудзь'.

У мове твораў нашага земляка з Віцебшчыны неаднаразова сустракаюцца назвы міфічных істот, у тым ліку і такія, як *лесавік, русалка* і інш. Напрыклад: *“З гамонкай разам паплыву туды, дзе спіць мой лебедзь белы, дзе ходзіць добры лесавік, заве з бярэзніку русалку, дзе дрэва кожнае прывык лічыць жывым і родным змалку...”* [Выбранае]. Паводле міфалагічных звестак, лесавік – гэта істота, дух, які жыве ў лясных гушчарах. Абсяг яго “ўладанняў” – уся лясная плошча, за выключэннем вадаёмаў, дзе гаспадарыць Вадзянік. Русалкі – таксама міфалагічныя персанажы, чалавекападобныя істоты ці духі, якія жывуць у вадзе або каля яе, а падчас Русальнага тыдня, калі вада вельмі глыбока праграваецца сонцам, перасяляюцца з рачных і азёрных глыбіняў у лясы.

Нацыянальную музычную культуру беларусаў у Г. Бураўкіна семантызуюць назвы такіх спрадвеку вядомых на Беларусі народных музычных інструметаў, як цымбалы, жалейка, скрыпка, дудка: *“Пачуем цымбалаў чароўныя гукі – і светла прысняцца, дзе б мы ні былі, матуліны вочы, бацькоўскія рукі”* [Выбранае]; *“І чую, як у мудрай цішыні то ліпа раптам зарыпіць калыскай, то скрыпкаю яліна зазвініць”* [Вершы пяці кніг] і інш.

У адным з вершаў аўтар шчыра і даверліва прызнаецца чытачу: *“Каму патрэбнае «Поле-полечка», каб у душы запал закіпеў, а мне – «Купалінка», «Перапёлачка», і звон цымбальны, і дудкі спеў”* [Вершы пяці кніг], дзе інфармацыю пра духоўную культуру беларусаў змяшчаюць у сабе назвы беларускіх народных песень “Поле-полечка”, “Купалінка”, “Перапёлачка”, словазлучэнні *цымбальны звон і спеў дудкі.* Значнае месца ў музычнай культуры нашага народа ў розныя часы займаў такі народны духавы інструмент, як *жалейка*. З пачуццём гонару за сваю Радзіму, любові і пашаны да музычных традыцый былых пакаленняў паэт зазначае: *“Хто – стэп карнаямі агалошвае, хто – дудуком адгукаецца з гор. Мая жалейка – зусім не горшая, не сапсуе паважаны хор. Няхай дзівак ярлыкі развешвае, Багацце ўзважвае – дзе чыё. Маё – не горшае, хай і не лепшае. А Богам дадзенае – маё”* [Вершы пяці кніг]. Заўважым, што жалейка (музычны інструмент, на якім гралі пастушкі) часта ўпамінаецца ў беларускім фальклоры. Таму, відаць, невыпадкова Г. Бураўкін зазначае: *“Мяне з-пад сонца, як зазвычай, падкінуў бусел пад страху, і ад калыскі мне пазычыў жалейку, пугу* і *саху* [Гняздо для птушкі радасці], дзе назоўнік *жалейка* сімвалізуе традыцыйную духоўную культуру беларусаў, а побытавыя назвы *пуга* і *саха*, рэпрэзентуючы сялянскае асяроддзе, выступаюць сімваламі традыцыйнай матэрыяльнай культуры нашага народа.

У вершы “Скрыпка” Г. Бураўкін паказвае, як нараджаецца песня. А нараджаецца яна дзякуючы энергіі і ўменню скрыпача, здольнага разбудзіць *“усе чуйныя струны”* і перадаць ім свой боль і трывогі: *“А скрыпка грае. І ніхто на свеце спыніць не зможа і зламаць не зможа над чуйнымі разбуджанымі струнамі буслінае імклівае крыло”* [Вершы пяці кніг].

Выразную нацыянальна-культурную афарбаванасць набывае наступны радок, у якім смычок таксама параўноўваецца з бусліным крылом: *“А песня ўсё хаваецца гарэзна, смычок яе шукае і злуецца і ўжо ў адчаі па халодных струнах, нібы крылом бусліным, гулка б’е”* [Вершы пяці кніг].

Пісьменнік вельмі любіў народныя песні. Адной з прычын такой любові стала наступная акалічнасць: песенная спадчына нашага народа надзвычай багатая і разнастайная. Можна смела сказаць, што песня ва ўсе часы была спадарожнікам беларуса на яго жыццёвым шляху – ад нараджэння да смерці. Песні спявалі ў смутку і ў радасці. Песня ва ўсе часы была часткай жыцця беларуса: *“Сэрцу радасна і балесна ад таго, як прыходзіш зноў ты, мая беларуская песня да сваіх і чужых сыноў”* [Вершы пяці кніг]. Народныя песні на жывой, роднай беларускай мове заўсёды былі ў пашане простых людзей-беларусаў: *“Як крынічка, праз камні і наледзі ты прабілася з роднай зямлі і ніякія беды і нелюдзі замуціць цябе не змаглі”* [Выбранае]. Сапраўды, ніякія забароны на выкарыстанне роднай мовы, ніякія выпрабаванні гістарычнага лёсу не змаглі перашкодзіць беларусам складаць прыгожыя, мілагучныя народныя песні. Песня заўсёды была часткай народнага жыцця: *“І ўсё ж ты хочаш да вякоў данесці, ад ненажэрнай смерці ўберагчы матуляў нашых баравыя песні”* [Выбранае].

Для аўтара народныя песні незабыўныя з дзяцінства, надзвычай блізкія і дарагія сэрцу: *“Не кліч мяне музыкай модненькай – другое здаўна на душы: задумлівы голас гармоніка, дзявочая песня ў цішы…”*. І далей: *“Плыве мая песня-крынічанька – бярозавыя берагі. Даверліва шэпча-расказвае аповесць народнай душы”* [Вершы пяці кніг].

У паэта былі асаблівыя, надзвычай пяшчотныя адносіны да беларускага слова, да роднай беларускай мовы. Гэта неацэнны духоўны скарб народа, яго жыватворная сіла, яго душа. Акрэсліваючы месца і ролю роднай беларускай мовы ў жыцці сваіх землякоў, аўтар невыпадкова ўводзіць у моўную тканіну вершаваных твораў такія прэцэдэнтныя для беларускай культуры прозвішчы сапраўдных майстроў слова, як Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, А. Куляшоў, І. Мележ: *“Слова наша роднае, хапала на стагоддзі доўгія цябе. Багдановіч, Колас* і *Купала прыпадалі да цябе ў журбе… Матчына нявыцвілае слова, даўжнікі мы вечныя твае… Так нам не хапае Куляшова. Мележа так горка не стае”* [Гняздо для птушкі радасці]. Гэтыя вядомыя прадстаўнікі беларускай літаратуры, якія з’яўляюцца яе гонарам і славай, зрабілі вялікі ўнёсак у развіццё і пашырэнне роднай мовы: *“Так карцела – сляза закіпала – каб да сэрца хаця б здалёк прыплывалі жалейка Купалы, Багдановічаў васілёк…”* [Гняздо для птушкі радасці]. Метафарычныя выразы *жалейка Купалы* і *Багдановічаў васілёк* акружаны спецыфічным нацыянальна-культурным арэалам і нагадваюць нам пра такія літаратурныя “шэдэўры” нашых класікаў, як зборнік Янкі Купалы “Жалейка” і верш Максіма Багдановіча “Слуцкія ткачыхі”.

Як доказ таго, што Янка Купала з'яўляецца ўвасабленнем пачатку новай беларускай літаратуры ХХ ст. гучаць наступныя радкі: *"Каб ні крупінкі сонца не прапала з крывёю заваёваных сцягоў, каб кожны дзень да вас ішоў Купала народнай незарослаю сцягой…"* [Вершы пяці кніг], дзе вобраз класіка беларускай літаратуры выступае сімвалам пашаны і любові да сваёй роднай Беларусі, сімвалам непарыўнасці паміж мінулым і сучаснасцю. Пра знітаванасць Купалы і гістарычнага лёсу Беларусі сведчыць у тэксце метафара *народнай незарослаю сцягой.*

Добра разумеючы, што захаванне мовы з'яўляецца неабходнай умовай існавання нацыі, заклапочаны лёсам роднай мовы, аўтар заклікае сваіх сучаснікаў цаніць і берагчы слова беларускае, каб яно не адышло ў нябыт: *"І здаецца, не словы – народы адыходзяць моўчкі ў нябыт… Людзі!.. Ну што ж вы, людзі, не ратуеце, родных, іх?"* [Выбранае]. Між тым паэт лічыць, што сёння толькі ў вёсцы яшчэ можна знайсці па-сапраўднаму чыстую, сакавітую і багатую беларускую мову: *"Толькі недзе ў далёкай вёсцы з плёску рэк і шуму лясоў* [словы] *узляцяць, як забытыя вёсны, салаўямі на сто галасоў"* [Выбранае].

Вернасць роднай мове паэт пранёс праз усё сваё жыццё, імкнучыся зрабіць як мага больш для таго, каб наша слова гучала свабодна і шырока: *"І сэнс не ў тым, куды сягну, кім стану я ў наш век сталёвы, а ў тым, каб цвёрдую цану ніколі не згубіла слова"* [Вершы пяці кніг]. Аўтар лічыў, што ўніверсітэты і акадэміі могуць навучыць чалавека роднай мове, але калі ты не ўспрыняў яе з першакрыніцы – ад маці, дык ніколі не зможаш па-сапраўднаму адчуць смак слова, дзе кожны гук у ім выпеставаны ў матуліных вуснах. Мова родная таму і завецца матчынай: *"Матчына нявыцвілае слова, даўжнікі мы вечныя твае…"* [Гняздо для птушкі радасці].

Беларуская мова, як і сама Беларусь, спазнала шмат пакут на шляху свайго фарміравання і развіцця: у часы Рэчы Паспалітай, а пасля Расійскай імперыі ўлады не прызнавалі яе, забаранялі і не лічылі самастойнай, але яна ўсё ж гучала пад стрэхамі сялянскіх хат, пашыралася ў народзе і ўдасканальвалася: *"Не была ты ніколі пры знаці, не стаяла ў чарзе да стала, не прасіла слёзна «прызнайце» – проста з людам тутэйшым жыла"* [Гняздо для птушкі радасці]. Мова ва ўсе вякі была неад'емнай часткай традыцыйнай культуры беларускага народа: *"Лёс ягоны цярпліва дзяліла, не падсмейвалася з-за вугла, галасіла на ранніх магілах, гулкі рэй на вяселлях вяла"* [Гняздо для птушкі радасці].

Нягледзячы на ўсе выпрабаванні і перашкоды, якія сустрэліся на яе шляху, беларуская мова з'яўляецца сёння адной з самых мілагучных, дасканалых і высокаразвітых моў свету: *"Засталася спагаднай і годнай, разбудзіла маўклівы абшар, некрыклівая споведзь народа, васільковага краю душа"* [Гняздо для птушкі радасці]. Як сведчыць прыведзены ілюстрацыйны матэрыял, мова для Г. Бураўкіна – гэта душа народа, яго споведзь. Эпітэт *некрыклівая* ў спалучэнні з назоўнікам *мова* ўжыты

невыпадкова. Гэтым аўтар падкрэслівае, што спрадвечная мова беларусаў надзвычай прыемная на слых, някідкая, спакойная. Адчуваецца, што ён вельмі любіць родную мову, якая нават для яго застаецца яшчэ не да канца вывучанай, зведанай і спазнанай: *“Мова продкаў нашых і нашчадкаў – шэпт дубровы і пчаліны звон – нам цябе ласкава і ашчадна спазнаваць ажно да скону дзён…”* [Гняздо для птушкі радасці]. А потым зазначае: *“Па чужых краях не пабірацца, не аддаць цябе на забыццё, наша невычэрпнае багацце, наша несмяротнае жыццё”* [Гняздо для птушкі радасці]. Паэт заклікае сучаснікаў не забываць сваю родную мову, імкнуцца спасцігаць яе багацце і прыгажосць. Метафарычныя выразы *невычэрпнае багацце* і *несмяротнае жыццё*, праз якія семантызуецца беларуская мова – асноўны духоўны скарб народа і яго найважнейшая этнічная адзнака, нясуць асноўную сэнсавую нагрузку ў разуменні аўтарскай пазіцыі адносна таго, чаму беларусы не маюць права забыць сваё роднае слова ці адрачыся ад яго.

Паэт не разумее, чаму сёння ўсё больш і больш беларусаў становяцца абыякавымі да роднай мовы, да спрадвечных нацыянальных духоўных каштоўнасцей: *“Адно толькі сэрца сціскае: чаму, чаму іх так многа ў цябе, Мая Маці?”* [Выбранае]. Як сапраўдны паэт-грамадзянін, Г. Бураўкін усё болей не задаволены сучаснымі прадстаўнікамі беларускага грамадства: *“Ну што, Беларусь, у цябе за сыны? – ...як толькі праб’ецца хоць трохі ў чыны, забыць цябе лічаць сваім абавязкам”* [Выбранае]. Назоўнік *сыны* семантызуе маладое пакаленне беларусаў, якія ў апошні час забываюць сваю мову і амаль не карыстаюцца ёю ў паўсядзённых зносінах: *“І матчыну мову гатовы лічыць і «беднай», і «хамскай», і проста «мужычай»; не хочуць мець парадак новы. Наадварот, гатовы жыць без роднай мовы. Такі народ”* [Узмах крыла]. Майстар слова глыбока перакананы ў наступным: *“Хто не ведае матчынай мовы, той не любіць матулі сваёй”* [Узмах крыла]. Такім чынам аўтар гаворыць пра неабходнасць берагчы сваё, народнае, традыцыйнае, у тым ліку і мову, а не гнацца за чужымі духоўнымі набыткамі: *“Ты аглухла сягоння ад песень чужых, а свае ўсё паспела забыць”* [Выбранае]. З адчаем і роспаччу аўтар мусіць нагадаць сучаснікам, а разам з тым і нашчадкам, што страта мовы непазбежна вядзе да страты народа як самастойнага этнасу з этнічнай карты свету: *“І правілы прыдумалі не мы, што там, дзе не шануюць роднай мовы, мялеюць рэкі, нішчацца дубровы… народ там мёртвы, а той край – нямы”* [Узмах крыла].

Зварот да беларускага народа гучыць у наступных радках: *“І ў душы выспявае не просьба, а крык: Беларусь, свае таленты беражы, калі хочаш свабоднаю быць!... Беларусь, свае таленты беражы, калі хочаш славутаю быць,… калі хочаш магутнаю быць”* [Выбранае], дзе з дапамогай намінатыўнай адзінкі *Беларусь* Г. Бураўкін звяртаецца да ўсяго беларускага народа, які мае годных, таленавітых, здольных дачок і сыноў.

Адзін з іх – Пятро Клімук. У вершы “Пісьмо Пятру Клімуку з заснежанай Камароўкі” пісьменнік звяртаецца да нашага слыннага земляка, першага беларускага касманаўта П. Клімука, які быў родам з-пад Брэстчыны, з вёскі Камароўка. Ужо ў назве твора імя і прозвішча гэтага вядомага не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі чалавека з’яўляецца ў пэўным сэнсе носьбітам лінгвакраіназнаўчай інфармацыі. Радкі *“Слава, гонар, любоў Беларусі, прыязджай на радзіму, Пятро”* [Выбраныя творы 2], што рэфрэнам гучаць у вершы, падкрэсліваюць заслугі перад Радзімай гэтага чалавека, які тройчы пабываў у космасе, іменем якога названы вуліцы ў Рагачове, Клецку і іншых гарадах.

Для паэта Радзіма – гэта яшчэ і яе гістарычны шлях. У розныя гістарычныя часы на долю беларусаў выпала шмат гора і нястач, пакут і выпрабаванняў, што пацвярджаюць наступныя бураўкінскія радкі: *“Сярод балот, лясоў і выспаў ёсць занядбаны богам кут”* [Выбранае]; *“І ўжо куды ні сабяруся, куды дарога ні памкне, мне сняцца сны аб Беларусі – маёй пакутнай старане”* [Вершы пяці кніг]; *“І ў адказ, як апошняе слова, мне шапнуў мой знядужаны кут…”* [Паміж зоркай і свечкай]. Ужытыя аўтарам сродкі мастацкай выразнасці *занядбаны богам кут* ‘закінуты, пакінуты без нагляду’, *пакутная старана* ‘якая пераносіць, церпіць пакуты’, *знядужаны кут* ‘які страціў сілы, знясілеў, аслабеў’ акружаны спецыфічнай лінгвакраіназнаўчай афарбоўкай і ўтрымліваюць у сваім значэнні пэўную сацыяльна-гістарычную канатацыю, семантызуючы вялікую колькасць выпрабаванняў і цяжкасцей лёсу, якія Беларусь вынесла за сваю гісторыю.

Вобразна-сімвалічнае адлюстраванне тэмы гістарычнага мінулага Беларусі выклікала ў аўтара неабходнасць шырокага выкарыстання ўласных найменняў рознага семантычнага напаўнення, аб’яднаных агульным паняццевым кампанентам ‘гісторыя’. Увагу паэта прыцягваюць розныя гістарычныя эпохі, найбольш значныя для беларускага народа ваенныя падзеі ў старажытныя часы. За тое, што наша зямля сёння свабодная, незалежная і знакамітая на ўвесь свет, аўтар удзячны сваім продкам: *“І ў тым, што немач не скарыла наш край, няма ніякіх дзіў, бо тут калісьці жыў Скарына і Каліноўскі ў бой хадзіў…”* [Вершы пяці кніг].

Край паэтычных легендаў і песень – Полаччына – больш, як любая іншая частка Беларусі, захавала сляды старажытнасці, і, мабыць, таму так яскрава выступаюць тут наватарскія прыкметы нашага часу. У XI ст. узводзіцца Сафійскі сабор, які і сёння здзіўляе нас сваёй веліччу і шмат гаворыць пра сівую даўніну, высокі ўзровень дойлідства і сувязі Полацка з Кіевам і Ноўгарадам. Спаса-Ефрасіннеўская царква XII ст., якая, з’яўляючыся духоўнай рэліквіяй нашай беларускай зямлі, нагадвае сучасніку пра тое, як у яе мурах унучка полацкага князя Усяслава Чарадзея Еўфрасіння перапісвала кнігі, перакладала, пісала ўласныя творы дзеля пашырэння асветы ў родным краі. Домік Пятра Першага сведчыць пра наведванне

ў 1705 годзе Полацка рускім царом. Помнік Ф. Скарыну ўзнаўляе вобраз першадрукара і асветніка. Уславіў Полацк сваёй дзейнасцю таксама Сімяон Полацкі, помнік якому можна ўбачыць у скверы. Мінулае і сучаснае пераплятаюцца тут і дапамагаюць адчуць крокі гісторыі. Вершы "Полаччына", "Полацкая балада", "Зноў пабачыў цябе…", "Вочы сінія-сінія…" перапоўнены пачуццём любові да свайго роднага краю, да самага старажытнага горада Беларусі, што стаў для паэта блізкім і дарагім.

Г. Бураўкін глыбока перакананы, што гісторыю свайго народа, свае карані трэба ведаць кожнаму чалавеку. Разам з тым нельга забываць, якой цаной заваяваны наш сённяшні спакой і дабрабыт людзей. Сапраўды, на долю беларусаў выпала шмат выпрабаванняў. Але нягледзячы ні на што, Беларусь не скарылася. Аўтар зазначае: *"Колькі раз кожным нервам сваім, кожнай жылкаю перажыў я твой мужны і велічны лёс! Колькі вызнаў і вынес ты, краю мой мілы!"* [Вершы пяці кніг]. Аўтар на сабе неаднойчы адчуў тыя цяжкасці і пакуты, якія выпалі на долю яго народа. Гэта пацвярджаюць спалучэнні слоў *кожным нервам і кожнаю жылкаю перажыў я.* Эпітэты *мужны* і *велічны (лёс)* трапна характарызуюць наш беларускі край, поўны ўласнай годнасці і сілы.

Пра тое, што Беларусь за часы свайго існавання вельмі многа вызнала, сведчаць і наступныя вершаваныя радкі: *"Мой родны край, за што цябе скажы гісторыя так люта шкуматала – разворвала ўсіх войнаў рубяжы, каціла вал грымоткага метала?"* [Гняздо для птушкі радасці]. Ужыванне дзеяслова *шкуматала*, які мае значэнне 'матляючы, тузаючы ў розныя бакі, ірваць, імкнуцца парваць на часткі', можна лічыць моцнай пазіцыяй тэксту. Прыслоўе *люта* ўжыта таксама невыпадкова. Яно мае значэнне 'няшчадна, няўмольна, бязлітасна'.

На роднай аўтару віцебскай зямлі здаўна скрыжоўваліся найважнейшыя гістарычныя шляхі і адбываліся сумнавядомыя ў гісторыі ваенныя сутычкі. Паводле звестак з гісторыі, цар Пётр I, "прасякаючы акно ў Еўропу", неаднойчы наведваў Полацк. Упершыню – калі ў лютым 1701 г. кіраваўся ў Біржы да Польскага караля Аўгуста II. Праз чатыры гады Пётр I зноў прыехаў у Полацк, з'явіўшыся сюды ўжо з вялікім войскам на дапамогу Аўгусту II супраць шведаў. Як вядома, падчас Паўночнай вайны са шведамі старажытны Полацк стаў лагерам расійскага войска. Гэты гістарычны факт знайшоў сваё адлюстраванне ў вершы "Полацкая балада": *"Зарыпелі ўладарна батфорты. То ад Верхняга замка спяшае сюды ж Пётра Першы, суровы і горды…"* [Вершы пяці кніг].

Вайна 1812 года – гэта яшчэ адна спусташальная вайна ў гісторыі Беларусі, якая пакінула нам разрабаваныя, разбураныя, спаленыя гарады, мястэчкі і вёскі: *"…гэта шаблі аб ківеры звоняць, гэта цяжка даецца французам Дзвіна, заіржалі трывожныя коні…"* [Вершы пяці кніг].

Беларусь і сёння нельга ўявіць без горкай памяці пра Вялікую Айчынную вайну. Мужнасць і самаахвярнасць нашых дзядоў і прадзедаў

навекі захаваліся ў памяці народнай. Адным з такіх напамінаў з'яўляецца горад-герой Брэст, які выступае сімвалам гераічнага мінулага нашага народа ў гады фашысцкай навалы. Падчас Вялікай Айчыннай вайны Брэст быў поўнасцю разбураны. Вершы паэта "Брэсту", "Май у Брэсцкай крэпасці" і інш. дадаюць шмат істотнага да вобраза Бацькаўшчыны як аднаго з асноўных у творчасці паэта: *"Да вуснаў ён паднімае зямлі беларускай жменьку. О, якая яна цяжкая ад слёз і свінца! Навекі ў ёй запякліся клятвы, праклёны, енкі, расплаўленая цэгла Брэста, акрываўлены жвір Трасцянца"* [Вершы пяці кніг]. Устойлівыя маральна-патрыятычныя ідэалы героя верша выяўляюцца ў наступных вершаваных радках: *"Не, не турыстам, не сярод гасцей, – як сын, што доўга не бывае дома, я прыязджаю ў Брэст усё часцей"* [Выбранае]. Апрача таго, аўтар зазначае: *"Дзе б ні блукаў па свеце, абмінуць я не магу свяшчэнныя руіны"* [Выбранае], дзе эпітэт *свяшчэнныя (руіны)* мае значэнне 'асабліва дарагія, запаветныя'.

Словам пранікнёным, узнёслым, словам пяшчотным і гнеўным сцвердзіў паэт сваю любоў да Радзімы. Вельмі блізкая аўтару тэма спаленай разам з людзьмі вёскі Хатынь. Зімой 1943 ці ў пачатку 1944 года яму разам з іншымі аднавяскоўцамі давялося глядзець у твар смерці. У аўтабіяграфіі "Першая старонка" (1964) Г. Бураўкін пісаў: "Мы стаім на ўзгорку трыма радамі… На нас нацэлены кулямёт… Мы чакаем стрэлаў… Пад вечар нас сагналі ў лазню… Я тады не ведаў, што дзверы лазні забіты цвікамі, што лазня абкладзена саломай і паліцаі пайшлі шукаць газы ці бензіну". Выратаваў людзей немец, які быў радавым салдатам. З нагоды гэтага і нарадзілася паэма "Хатынскі снег", у якой адлюстраваны ўсе жахі масавага знішчэння жыхароў Беларусі. Вядома, што 22 сакавіка 1943 года карнікі па слядах партызанаў выйшлі да вёскі Хатынь, якую спалілі разам з усімі яе жыхарамі. Аўтар знаходзіць адпаведныя словы і вобразы, каб паказаць той страшны дзень: *"Страчылі кулямёты па агню, па стогнах і плачу. Радзеў і падаў ахрыплы пакутны крык"* [Выбранае]. І далей: *"…карнікі глядзелі вачамі пустымі…, як ляжаў, не таючы, у Хатыні чырвоны снег"* [Выбранае].

Прайшлі гады, адышлі ў нябыт падзеі самай жорсткай з усіх войнаў, якія зведаў за сваю гісторыю шматпакутны народ Беларусі. Але і сёння нельга забываць тых, хто стаў ахвярамі фашызму. Пра іх нам нагадваюць званы Хатыні. Хатынь – гэта вечная памяць і непазбыўны смутак Беларусі: *"А ў памяці вечна стыне белы снег, чырвоны снег, чорны снег нашай святыні – Хатыні"* [Выбранае]. Асноўную сэнсавую нагрузку тут нясуць эпітэты *белы, чырвоны, чорны.* Кожны з іх семантызуе адпаведна жыццё, смерць і памяць беларускага народа.

Заўважым, што ў творах Г. Бураўкіна вайна мае свае колеры – чырвоны і чорны. *Чырвоны: "Ды вочы я закрыў на міг – і мне прыпомніўся чырвоны колер сноў маіх і ран салдацкіх незагойных, агонь чырвоны ў вокнах хат, сцягоў святы чырвоны колер, чырвоны водсвет кананад"* [Выбранае]. *Чорны: "А я ж у памяці нясу яшчэ жахлівы чорны колер –*

заледзянелы чорны сум удоў і сірат незлічоных, і чорны дым парахавы, і чорны колер у травы, што агнямётамі палілі” [Выбранае].

Гераічнай можна назваць “Палескую баладу” Г. Бураўкіна, якая прысвечана братам Міхаілу і Івану Цубам, што былі загублены фашыстамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Героі твора жылі ў вёсцы Навіны, што на Случчыне, і мужна загінулі, абараняючы сваю Радзіму і сваіх землякоў. Іван Цуба паўтарыў подзвіг Івана Сусаніна, завёўшы фашыстаў у балота, дзе яны былі знішчаны партызанамі: *“Партызан ад нападу збярог, не прадаў нашых родных дарог”* [Вершы пяці кніг]; *“Я адпомсціў забойцам тваім, кінуў багну пад ногі ім”* [Вершы пяці кніг].

Пра шырока разгорнуты ў першыя ваенныя гады партызанскі рух на Беларусі паэт гаворыць так: *“Народныя мсціўцы, лясныя салдаты… па ворагу ўдарым з-за кожнага дрэва, насцігне чужынца ля кожнай сасны зялёнае полымя лесу”* [Выбранае]. Як бачым, нават у вершах на ваенную тэматыку адчуваецца, што барацьба з ворагам вядзецца менавіта на тэрыторыі Беларусі. Пра гэта сведчаць ужытыя ў мове вершаў лексічныя адзінкі з краіназнаўчай семантыкай, якія служаць назвамі тых ці іншых прыродных аб’ектаў: *багна, лясы* і інш.

Тым страшным ваенным часам аўтар прысвяціў таксама верш “Успамін”, дзе ён прыгадвае актыўны партызанскі рух ў часы ваеннага ліхалецця: *“Песень помню не спявалі маткі, а браты, бацькі пайшлі ў лясы…”* [Вершы пяці кніг]. Падчас вайны паэту было пяць гадоў, але ўжо тады ён добра разумеў, што на яго роднай зямлі адбываецца нешта страшнае. Як доказ гэтага, наступныя радкі: *“Адшукаўшы ў прыдарожным пыле груду шчэбня, без чаргі – усе па партрэту Гітлера лупілі…”* [Вершы пяці кніг].

Безліч цяжкасцей і выпрабаванняў, якія спазнала Беларусь на шляху свайго гістарычнага лёсу, мы бачым у іншых вершаваных творах: *“І колькі сквапных прыхапняў паўзло з агнём, з атрутай, з богам і без бога! Свінцом і здрадай рассявалі зло, каб зарасла нянавісцю аблога”* [Гняздо для птушкі радасці]. Але нягледзячы на спробы ворагаў зламаць дух нашага народа, заваяваць ці раздзяліць тэрыторыю Беларусі на асобныя часткі, далучыўшы да іншых дзяржаў, беларусы не сталі ненавіснікамі іншых народаў, а ўсё ж захавалі дабрыню і жыццялюбства, як адну з найлепшых рыс свайго характару: *“Не шкадавалі толу і брані на ціхія палеткі і прысады. Але сваёй славянскай дабрыні не затапталі танкі і снарады”* [Гняздо для птушкі радасці]; *“Узрушанаму людству напаказ ты ўзняў не крыўдаў звугленыя раны, а жыццялюбства вечнага запас”* [Гняздо для птушкі радасці] і інш.

Яшчэ адна сумнавядомая старонка ў гісторыі беларускага народа – чарнобыльская трагедыя ў 1986 годзе. Чорнае крыло Чарнобыля закранула і душу сапраўднага паэта-грамадзяніна Г. Бураўкіна: *“Роздум змрочным тыранам будзе роспач цвяліць. Незагойнаю ранай мне Чарнобыль баліць”* [Выбранае]. Жахлівую шкоду прыроднаму асяроддзю, расліннаму

і жывёльнаму свету прынесла аварыя на Чарнобыльскай АЭС, вельмі вобразна апісаная ў наступных паэтычных радках: *“У празорлівым воку ягоным сышліся вечаровыя здані і пачварныя сны: двухгаловыя рыбы, аблезлыя рысі і сляпыя бяздзюбыя бацяны”* [Выбранае].

Як адзначалася вышэй, Г. Бураўкін заўсёды захапляўся і ганарыўся родным краем, мужнасцю сваіх землякоў, дзякуючы якім беларуская зямля на працягу гісторыі вынесла ўсе выпрабаванні. Аднак у вершы “Беларусі 90-х гадоў” назіраецца нейкая расчараванасць грамадска-палітычным становішчам, у якім Беларусь знаходзілася ў той час: *“Ты начулася ўдосталь прамоўцаў пустых, у якіх паяднаны хлусня і хвала, і чамусьці даўно ўжо не слухаеш тых, каму таленты раздала”* [Выбранае]. Спадзяванні аўтара на лепшы лёс Радзімы з абсалютна іншай танальнасцю гучаць у наступным мастацкім кантэксце: *“Мне сняцца сны аб Беларусі – шчаслівай, вольнай старане”* [Вершы пяці кніг].

У цэлым пласт прааналізаваных найменняў з краіназнаўчай семантыкай (як уласных назоўнікаў, так і апелятыўнай лексікі), якая служыць дастаткова выразным і змястоўным сродкам рэпрэзентацыі паняцця “Радзіма” ў паэтычным дыскурсе Г. Бураўкіна, “працуе” на выяўленне лінгвакраіназнаўчай спецыфікі вершаванага тэксту і стварэнне моўнай карціны свету беларусаў, захоўвае нацыянальную адметнасць і этнамоўны каларыт, дазваляючы пранікнуць у духоўны свет лірычнага героя.

Даследаваўшы лексічныя адзінкі і моўна-выяўленчыя сродкі, якія семантызуюць культурна-гістарычную спадчыну беларусаў, можна зрабіць выснову, што асноўнымі рэпрэзентантамі нацыянальна-культурнай інфармацыі выступаюць уласныя назоўнікі, якія называюць гістарычныя падзеі або культурных ці гістарычных дзеячаў. Мінулае беларускага народа ў мове паэтычных зборнікаў Г. Бураўкіна выяўляецца таксама праз ужыванне ім прэцэдэнтных імёнаў культуры.

5.3 Рэпрэзентацыя прыродна-ландшафтных асаблівасцей Беларусі

Радзіма для Г. Бураўкіна – гэта не толькі яго краіна Беларусь, а найперш яго азёрная і баравая Расоншчына, якая на паўночным захадзе мяжуе з Латвіяй і Літвой, а на поўначы – з Пскоўшчынай. Нагадаем, што вучыўся будучы майстар слова ў Расонскай школе толькі да восьмага класа. Але любоў да родных мясцін, захапленне іх сціплай і някідкай прыгажосцю, кранальныя дзіцячыя ўспаміны і памяць пра свой родны куток ён пранёс праз усё жыццё: *“Павядзе дамоў сцяжынка ў жыце, камары зазвоняць талакой. І на сэрцы зноў, што ні кажыце, сыйдуць ачышчэнне і спакой”* [Паміж зоркай і свечкай]; *“Там, дзе вечар туманны і ветлы, дзе ў сурэпцы круты касагор, мой дзяцінны куток запаветны,*

мой абстуканы дзятламі бор” [Паміж зоркай і свечкай]; *“Ну а калі, быць можа, не паспею, віну не поўнай мераю сплачу, – туманам апушчуся на Асвею і жаўрам да Расонаў прылячу”* [Паміж зоркай і свечкай]; *“У мяне даўно адна дарога вызначана памяццю бяссоннай – да кутка азёрнага, лясного, дзе мае зялёныя Расоны”* [Паміж зоркай і свечкай]. Асаблівасці прыроднага ланшафту паэтавай малой радзімы – Расоншчыны – дастаткова выразна семантызуюцца праз наступныя моўна-выяўленчыя сродкі: *куток азёрны, лясны; Расоны зялёныя* і інш. Пры выяўленні нацыянальна-патрыятычных пачуццяў аўтара асноўную сэнсавую нагрузку нясе тапонім *Расоны*. Невыпадковым з’яўляецца ўжыванне займенніка *мае* ў спалучэнні з гэтым уласным найменнем. Словазлучэнне *мае Расоны* адлюстроўвае духоўную еднасць, знітаванасць паэта з тым месцам, дзе прайшло яго маленства.

Пэўную краіназнаўчую інфармацыю адносна прыроднага асяроддзя і расліннага свету нясуць шматлікія іншыя мастацкія кантэкты Г. Бураўкіна, у якіх ён прызнаецца ў сваёй шчырай і бязмежнай любові да Бацькаўшчыны. У іх ліку наступныя: *“Я не думаў, што так прывязаны да імшарнай, пясчанай зямлі, да пагоркаў з дубамі і вязамі, да бяроз, што ў паляны ўраслі”* [Паміж зоркай і свечкай]; *“Затопчуцца сцяжынкі і разоры. Вясёлая чаромха адцвіце. Ды застануцца сосны і азёры. І валуны на зубравай вярсце”* [Паміж зоркай і свечкай] і інш.

Беларусь – краіна, якая надзвычай багатая на рэкі і азёры. Каля адзінаццаці тысяч рэк і больш за дваццаць тысяч азёр даюць падставы называць нашу Радзіму сінявокай. На гэтай прыроднай акалічнасці якраз і засяроджвае сваю ўвагу Г. Бураўкін у шматлікіх вершах: *“О, рэкі, рэкі, Беларусі сярод лугоў, сярод лясоў! Калі я гімн саткаць збяруся з блакітных вашых паясоў?”* [Выбранае]. Захапляючыся незвычайнай прыгажосцю сваёй Радзімы, выказваючы глыбокія патрыятычныя пачуцці, мастак слова неаднаразова прыгадвае найбуйнейшыя водныя аб’екты – рэкі і азёры, якія працякаюць на тэрыторыі Беларусі і выступаюць у пэўнай ступені ў якасці яе сімвалаў. Так, пэўная лінгвакраіназнаўчая інфармацыя, у тым ліку звесткі пра геаграфічныя асаблівасці прыроднага асяроддзя, трансліруецца праз такія гідронімы, як *Дзвіна*: *“...глядзіцца ў Дзвіну сінявокая ніва ільну”* [Выбранае]; *“...вершы пішуцца на Радзіме. Сэрца цешыцца на Дзвіне”* [Узмах крыла]; *“...і вецер, прапахлы барамі і хлебам, пяшчотна калыша на хвалях Дзвіна”* [Выбранае]; *Днепр* і *Нарач: “Я ўдзячны лёсу, што з усіх краёў ён выбраў для мяне навекі гэты,...дзе Нарач мые сінія шаўкі і п’юць з Дняпра паўдзённыя вясёлкі”* [Вершы пяці кніг]; *Дрыса*: *“Тут ля Дрысы сасонкі звонкія, над Дзвіною бары пявучыя”* [Выбранае]; *Друць*: *“...там, дзе светла кахалі, дзе аб шчасці гадалі, дзе ў вячэрнім чароце плешча ціхая Друць...”* [Выбранае] і інш. У апошнім прыкладзе назва ракі Друць, якая з’яўляецца прытокам Дняпра і праходзіць праз Віцебскую вобласць, асацыіруецца ў паэта з яго бесклапотным, шчаслівым юнацтвам, пра што сведчаць словы *“дзе светла кахалі, дзе аб шчасці гадалі”*.

Адметнасці прыроднага асяроддзя, расліннага і жывёльнага свету Беларусі знайшлі шырокае адлюстраванне ў мове літаратурнай творчасці Г. Бураўкіна. Аўтар паэтызуе родную зямлю найперш праз фларыстычныя вобразы: *“Ад лясной паляны недалёкай хваляю густою зноў і зноў прыплывае з ліпеньскаю спёкай водар медуніц і палыноў”* [Паміж зоркай і свечкай]. Ён неаднаразова называе сваю родную зямлю *зялёнай: “...аб родным горадзе, аб родным заводзе, аб мілай зялёнай бацькоўскай зямлі”* [Вершы пяці кніг]. І гэта невыпадкова, бо зялёны колер – гэта сімвал прыроды, колер травы, расліннасці, колер лясоў, якіх на Беларусі вельмі багата.

Сціплыя, але надзвычай прыгожыя малюнкі беларускай прыроды вабяць і захапляюць паэта ў вершы “Край мой…”: *“Не залаты зусім, не срэбны, быў на табе заўсёды ўбор. Звычайны самы, самы зрэбны: зялёны луг ды сіні бор”* [Выбраныя творы 1]. Мастацка-рэалістычнае апісанне прыроднага асяроддзя ў гэтым вершы *(жыта ў полі, вярба ля ракі, аганькі рабін, бялюткая бяроста гаёў, блакіт азёр, сіні лён, рамонкавыя берагі і інш.)* дае ўнікальную краіназнаўчую інфармацыю пра адметнасці прыроды беларускага краю.

Лінгвакраіназнаўчы змест паняцця “Радзіма”, разгледжаны вышэй, раскрываецца ў бураўкінскіх вершах і праз назоўнік-дэмінутыў *куток* ‘зацішная, прыгожая, утульная мясцовасць’, які ў спалучэнні з прыметнікамі-эпітэтамі *азёрны, лясны, цяністы* і інш. дае вельмі выразнае ўяўленне пра адметнасці прыроднага ландшафту нашай краіны – Беларусі, якая спрадвеку славілася вялікай колькасцю рэк і азёр, а таксама сваімі лясамі, магутнымі дубамі з пышнымі кронамі, пад якімі прыемна паляжаць у летнюю спёку або схавацца падчас дажджу: *“І хай з тысяч рэк чужых нап’юся – толькі для апошняга глытка я прыйду сюды, да Беларусі, да свайго азёрнага кутка”* [Выбраныя творы 2]; *“Што так прыкуты да Радзімы? – часам чую хітранькі дакор. – Свой лясны куток незамянімы памяняй на ўвесь зямны прастор”* [Выбранае]; *“У той куток, маленькі і цяністы, дзе ў арабін цыганскія маністы, дзе клён свой ліст мне скінуў у душу. Іду каля прыземленых хацін, каля нядаўна беленых парканаў”* [Выбранае].

У вершы “Полаччына” аўтар захапляецца прыродай сваёй малой радзімы – полацкай зямлі, прыгожай і гераічнай, багатай на розныя гістарычныя і культурныя падзеі: *“Тут азёры, як неба сінія, у чаротах чароды гусіныя, а на дне Млечным Шляхам свецяцца трапяткія гурты язіныя… Тут дзяўчаты ўсе – чарнабровыя, на палях ільны двухметровыя… Тут пад кожным курганам і каменем – ці быліна, ці казка чароўная…”* [Вершы пяці кніг]. *“Звонкія сасонкі”* на ўзбярэжжы Дрысы, *“пявучыя бары”* ўздоўж берагоў Дзвіны, *“двухметровыя ільны”* на палях… Ці ёсць дзе на свеце больш прыгожы край за той, дзе нарадзіўся і жыў паэт? Аўтар невыпадкова гіпербалізуе прыметнік *двухметровыя*, паказваючы тым самым, наколькі ўрадлівая полацкая зямля і наколькі працалюбівыя яе жыхары. Апрача таго, як сведчыць прыведзены прыклад, наша зямля

багатая на казкі і быліны. Пра добразычлівасць, як адметную нацыянальную рысу характару беларусаў, сведчаць наступныя радкі верша: *“Тут вясёлкай сонца акружана, усміхаецца з кожнай лужыны. Тут на кожнага закаханага салаўёў па чатыры тузіны”* [Вершы пяці кніг]. Прыведзеныя вышэй радкі гучаць як выклік тым, хто “шукае красы” ў іншых краінах, за морамі, не спазнаўшы і не ацаніўшы прыгажосці родных мясцін, якія і сёння хаваюць у сабе безліч таямніц, шмат невядомых і не спазнаных яшчэ гістарычных фактаў.

Наколькі полацкі край дарагі аўтару, сведчаць шматлікія іншыя паэтычныя радкі: *“Не шкода песень і хвалы… Для Полацка, што купалы́ ў сонцы ранішнім купае”* [Вершы пяці кніг]; *“І багацця мне не трэба, без прысмакаў пацярплю – толькі б хлеба, толькі б неба ды бацькоўскую зямлю”* [Выбраны творы]; *“І якія б шляхі не хадзіў я, кліча полацкая сенажаць”* [Гняздо для птушкі радасці] і інш.

Вывады

Даследаваўшы намінатыўныя адзінкі і моўна-выяўленчыя сродкі, якія семантызуюць культурна-гістарычную спадчыну беларусаў у мове паэтычных твораў Г. Бураўкіна, можна зрабіць выснову, што найбольш пашыранымі найменнямі з нацыянальна-культурным кампанентам значэння выступаюць уласныя назоўнікі, якія намінуюць гістарычныя падзеі або культурных ці гістарычных дзеячаў.

Мінулае беларускага народа ў мове паэтычных зборнікаў Г. Бураўкіна выяўляецца як праз нацыянальна-маркіраваныя апелятывы, так і праз ужыванне прэцэдэнтных імён вядомых сыноў Беларусі, якія сваёй дзейнасцю пакінулі след у яе гісторыі і яе нацыянальна-культурным жыцці.

Аналіз вершаваных тэкстаў-рэпрэзентантаў, у якіх праз прыродна-ландшафтныя асаблівасці выяўляюцца краіназнаўчыя адметнасці нашай краіны, дапамагае больш поўна асэнсаваць духоўны свет лірычных герояў і спасцігнуць этнакультурную адметнасць бураўкінскай паэзіі, а ў цэлым глыбей зразумець нацыянальны генетычны код беларусаў і выявіць спецыфіку іх моўнай карціны свету.

Лексічныя адзінкі і вобразна-выяўленчыя сродкі, праз якія рэпрэзентуюцца прыродныя з’явы і аб’екты нашага краю, не толькі ў мастацкай форме характарызуюць хараство беларускай зямлі і апісваюць яе незвычайную прыгажосць, але і змяшчаюць у сабе разнастайныя жыццёвыя назіранні беларусаў і самым цесным чынам звязаны з іх асноўнымі этнічнымі характарыстыкамі.

ЗАКЛЮЧЭННЕ

Мова літаратурных твораў пісьменнікаў Віцебшчыны – У. Караткевіча, В. Быкава, Р. Барадуліна і Г. Бураўкіна, якія з'яўляюцца найбольш вядомымі і яркімі прадстаўнікамі сапраўды нацыянальнага беларускага мастацкага тэксту, – рэпрэзентуе сінтэз агульначалавечых і рэгіянальных сацыякультурных каштоўнасцей і выступае як надзвычай цікавая і вельмі змястоўная крыніца звестак пра народную культуру, менталітэт, сацыяльна-гістарычныя, грамадска-палітычныя і эканамічныя асаблівасці насельнікаў Беларускага Падзвіння, іх этнічныя прыярытэты.

Аналіз семантыкі лінгвакраіназнаўчых адзінак, якія, набыўшы ў этнакультуры беларускага народа сімвалічнае, эталоннае або вобразна-метафарычнае значэнне, дастаткова актыўна выкарыстоўваюцца ў мастацкім дыскурсе празаічных і паэтычных твораў пісьменнікаў Віцебскага рэгіёна, сведчыць пра тое, што мова літаратурных твораў выступае сродкам спасціжэння нацыянальнай рэчаіснасці, нацыянальнага характару і дамінантных рыс нацыянальнай ментальнасці беларускага народа.

Лінгвакраіназнаўчы кампанент значэння большасці прааналізаваных лексічных адзінак, якія функцыянуюць у моўнай прасторы мастацкіх тэкстаў даследаваных аўтараў, дапамагае нам "увайсці" ў свет традыцыйнай культуры беларусаў, зразумець яе асноўныя коды, якія рэпрэзентуюць нацыянальны склад псіхікі, мыслення, спецыфічныя адметнасці беларусаў на "фоне" іншых этнічных супольнасцей і сведчаць аб прыналежнасці нашага народа да пэўнага этнакультурнага арэалу, геаграфічнай і гістарычнай прасторы. Лінгвакраіназнаўчая інфармацыя, якая ўтрымліваецца ў выглядзе культурна-гістарычных канатацый у значэнні і структуры выяўленых і прааналізаваных найменняў, пацвярджае самабытнасць нацыянальнай мовы беларусаў і характарызуе яе як спецыфічную этнакультурную з'яву.

У межах даследаванага моўнага матэрыялу мастацкіх твораў У. Караткевіча, В. Быкава, Р. Барадуліна, Г. Бураўкіна шляхам метаду эксцэрпцыі зафіксавана дастаткова вялікая колькасць лінгвакраіназнаўчых рэалій, якія рэпрэзентуюць матэрыяльную і духоўную культуру беларускага народа, яго ментальныя рысы і выступаюць назвамі культурна-гістарычных падзей і з'яў інтэлектуальна-духоўнай сферы або этнаграфічна-бытавых артэфактаў. Аналіз нацыянальна маркіраваных слоў у лінгвакраіназнаўчым аспекце меў на мэце выяўленне асаблівасцей іх семантыкі, інфарматыўнага зместу, сэнсавых адценняў і канатацый на ўзроўні, максімальна набліжаным да ўспрыняцця носьбітамі беларускай мовы і культуры.

Шырокая прадстаўленасць назваў побытавых рэалій абумоўлена тым, што побытавая лексіка, акрэсліваючы паўсядзённую сферу жыцця чалавека, звязана сваёй семантыкай з яго працоўнай дзейнасцю, звычаямі, абрадамі, рытуаламі, асаблівасцямі светапогляду, што склаліся яшчэ ў даўнія часы. І гэта вытлумачальна: прадмет побыту з'яўляецца ў пэўнай ступені

апазнавальным знакам яго прыналежнасці да культуры той ці іншай этнічнай супольнасці людзей. Побытавы свет як неад'емная частка штодзённага жыцця беларусаў ва ўсе часы адрозніваўся сваім сімвалічным напаўненнем і характарызаваўся функцыянальна-семантычнай разнастайнасцю. Аб'екты побыту нашых продкаў выконвалі ў мінулыя часы тыя ці іншыя сімвалічныя функцыі. З гэтага вынікае, што найменні з побытавым значэннем, якія функцыянуюць у мастацкай тканіне даследаваных твораў, з'яўляюцца іх найбольш важнымі і статуснымі лексічнымі кампанентамі і дастаткова выразна рэпрэзентуюць асаблівасці ўспрымання свету беларускім народам.

Значная частка прааналізаваных лексічных адзінак з лінгвакраіназнаўчай семантыкай выступае ў якасці анамастычных назваў. Зафіксаванае багацце нацыянальна маркіраваных антрапонімаў у мове мастацкага дыскурсу сведчыць пра традыцыі нацыянальнага іменаслова нашага народа, а таксама пра тое, што беларусы як раней, так і сёння ўшаноўваюць памяць пра сваіх продкаў, слынных гістарычных постацей, вядомых і таленавітых людзей, якія заявілі пра сябе на ўвесь свет, імёны якіх можна разглядаць як прэцэдэнтныя ў сучаснай лінгвакультуры. Ужыванне аўтарамі тапанімічных найменняў дастаткова часта абумоўлена зместам твораў, неабходнасцю намінацыі тых ці іншых геаграфічных аб'ектаў, дзе адбываецца дзеянне. Выкарыстоўваюцца этнакультурныя тапонімы таксама з мэтай абазначэння месцаў, дзе героі літаратурных твораў нарадзіліся, знаходзяцца або жывуць, змагаюцца з ворагам і інш.

